4. Законодательство СССР [Электронный ресурс] / Законодательство СССР. — Режим доступа: http://www.lawmix.ru/sssr/14347. — Дата доступа: 03.03.2013.
5. ГАБО. — Ф. 1-п. — Оп. 13. — Д. 6. Постановления Совета Министров БССР и ЦК КПБ (том 2). 05.05.1956—27.07.1956 гг.
6. Там же. — Д. 59. Отчет облстатуправления об итогах работы отдельных отраслей народного хозяйства Брестской области за 1-е полугодие 1956 года.



7. Там же. — Оп. 16. — Д. 66. Перспективный план развития народного хозяйства Брестской области на 1959—1965 гг.
8. Там же. — Д. 81. Переписка Брестского ОК КПБ с партийными и советскими органами по вопросам работы учебных заведений и школ области.
9. Там же.— Оп. 17. — Д. 69. Переписка Брестского ОК КПБ по вопросам учебных заведений, школ и органов народного образования.
10. Там же.— Оп. 19. — Д. 31. Протоколы заседаний бюро Брестского обкома КПБ № 16—19.
11. Там же. — Ф. 2-п. — Оп. 63. — Д. 5. Протоколы заседаний бюро Брестского горкома КПБ № 20—29.
12. Там же. — Ф. 14-п. — Оп. 1. — Д. 274. Протоколы заседаний бюро Пружанского райкома КПБ № 5—19.
13. Там же. — Д. 306. Протоколы заседаний бюро Пружанского райкома КПБ № 3—17.
14. Там же. — Ф. 6991-п.
15. Там же. — Оп. 1. — Д. 65. Постановления и распоряжения Совета Министров СССР за 1964 г. Том. 2.
16. Там же. — Д. 68. Постановления ЦК КПБ и Совета Министров БССР.
17. Там же. — Ф. 6992-п.
18. Там же. — Ф. 815. — Оп. 7. — Д. 18. Постановления Совета Министров БССР за октябрь 1950 г.
19. Там же. — Ф. 815. — Оп. 10. — Д. 176. Постановления Совета Министров БССР за август—сентябрь 1959 г.

*Артыкул паступіў у рэдакцыю 24.05.2013*

**С. В. Кулинок,**
*начальник отдела информации и научного использования документов Белорусского государственного архива научно-технической документации;*
e-mail: svkulinok@tut.by

# «ПЕРЕЧНИ ВОПРОСОВ» И «ЗАДАЧИ» ПО ВЕДЕНИЮ ПАРТИЗАНСКОЙ РАЗВЕДКИ КАК ИСТОЧНИК ПО ИСТОРИИ ВЕЛИКОЙ ОТЕЧЕСТВЕННОЙ ВОЙНЫ

*(по документам Белорусского штаба партизанского движения)*

Отечественная историография располагает рядом работ, в которых рассмотрены источниковедческие и историко-методологические аспекты изучения партизанского движения и оккупационного режима [1—10, 18—20]. Однако некоторые виды и группы документов либо невостребованы, либо ограниченно востребованы историками. К последним относятся разведывательные документы руководящих партизанских органов и соединений. Между тем разведывательные документы, хранящиеся в фонде 1450 Национального архива Республики Беларусь, являются ценным историческим источником, использование которого позволит полнее освещать события партизанской войны в Беларуси. Внутренняя структура данного комплекса источников отличается целостностью, материалы поддаются видовой, хронологической, тематической и другим типам классификации, что позволяет выделять группы документов в зависимости от целей и задач конкретных исследователей.

Так как одной из важнейших форм борьбы с захватчиками на территории оккупированной Беларуси была разведывательная деятельность партизанских формирований, сохранилась большая группа разведывательных документов, различная по видам и назначению. Важное место среди них занимают «перечни вопросов» и «задачи» по ведению партизанской разведки. Данные документы можно отнести к организационно-распорядительным и планово-отчетным.

После создания в 1942 г. Центрального и Белорусского штабов партизанского движения (ЦШПД и БШПД) и разведывательных отделов (РО) в их структуре перед последними встала непростая задача — организация разведработы партизанских соединений. Начиная со второй половины 1942 г., в целях активизации разведывательной деятельности в нижестоящих партизанских структурах, ЦШПД приступил к практике использования «перечней вопросов» и «задач».

Определяя различие между этими понятиями и документами, следует отметить, что «перечень вопросов» обычно составлялся без привязки ко времени его исполнения и содержал вопросы более общего характера, без географических привязок, в то время как «задачи» ставились на определенный срок и касались конкретного географического пространства.

Разведывательный отдел ЦШПД, исходя из потребности в той или иной информации и разведданных, составлял и направлял в разведывательные службы партизанских органов узкоспециализированные («тематические») списки



вопросов, требующих освещения посредством сбора разведывательных данных. Такие «перечни вопросов» далее направлялись в партизанские формирования для их исполнения.

В качестве примера можно рассмотреть «Примерный перечень вопросов по организации политической и экономической разведке в районах, временно оккупированных немцами» [16, л. 81—84], изданный 8-м отделением Политуправления Западного фронта в июле 1942 г. С лета 1942 г. по лето 1943 г. одним из важнейших направлений разведывательной деятельности партизан была не военная, а экономическая и политическая разведки. Это было связано с тем, что линия фронта проходила на значительном удалении от территории Беларуси и активные боевые действия велись на других участках. Кроме того, в этот период времени немецкое руководство проводило широкие экономические (закон о землепользовании) и политические (создание коллаборационистских организаций и союзов) мероприятия среди местного населения с целью привлечения его на свою сторону. В этой ситуаций от Главного политического и разведывательного управлений требовалось немедленное и широкое ведение контрпропаганды, а это требовало точных и проверенных разведданных экономического и политического характера.

Документ создавался с целью активизации деятельности отделов и отделений фронтов и армий, курировавших вопросы партизанского движения, направленной на ведение экономической и политической разведки, а также полного учета полученных разведданных. В начале документа указывалось, что «отделения обязаны иметь полное представление о политических и экономических мероприятиях, проводимых немецким командованием и оккупационными властями перед участком фронта армии». Такая работа должна «коренным образом улучшить нашу контрпропаганду среди населения» [16, л. 81].

Основная часть документов состояла из перечня вопросов и рекомендаций (более 30 пунктов) по ведению политической и экономической разведки, объединенных в пять разделов: «Вопросы политической разведки», «Экономическая разведка», «Отношение немецкого командования к военнопленным», «Источники получения разведданных», «Оформление материалов по политразведке».

На основании полученных сведений рекомендовалось ведение на каждый район и крупный населенный пункт специальных формуляров, в которые должны были заноситься все факты и разведданные [16, л. 81—84].

Другой способ появления «перечней» и «задач» мог быть вызван получением разведывательного запроса от РО ЦШПД (например, о состоянии промышленных предприятий в областных центрах на оккупированной территории БССР или состоянии оборонительных сооружений). В свою очередь, РО БШПД готовил соответствующий «перечень» партизанским соединениям, действующим в заданном районе, в котором прописывал все необходимые вопросы по данной проблеме.

Тематика таких «перечней» довольно разнообразна. Так, 18 июня 1943 г. на имя начальника БШПД поступил документ за подписью начальника разведывательного отдела ЦШПД Кудрявцева. В нем говорилось: «В целях добывания более полных разведданных о состоянии железных дорог и сооружений на них в тылу противника, а также данных о способах и средствах, силах и сроках восстановления отдельных сооружений, о новом строительстве железных дорог, об организации и структуре железнодорожных войск и восстановительных организаций. Поставьте перед вашими разведорганами задачи в соответствии с приложенным к сему перечнем вопросов» [13, л. 5—6]. Далее прилагался перечень из 28 вопросов, которые охватывали практически все стороны означенной проблемы. Данный перечень вопросов является «тематическим», то есть он касался только одной проблемы.

Другим примером данного вида документа является «перечень» из 7 вопросов, которые касались деятельности на территории БССР частей союзных Германии армий. В частности, требовалось:

1. Установить, какие части венгерской армии находятся на оккупированной территории БССР, их состав, нумерацию и дислокацию.

2. Установить какие потери в личном составе и вооружении имеют части венгерской армии.

3. Сообщать о всех перебросках венгерских частей на оккупированной территории БССР; установить нумерацию, численный состав, вооружение, маршруты, пункты выгрузки войск.

4. Есть ли на оккупированной территории БССР венгерские части ВВС; количество эскадрилий, самолетов, где базируются.

5. Имеются ли на оккупированной территории БССР гарнизоны из словацких и болгарских частей; их численный состав, нумерация и назначение.

6. Следить за возможными перебросками словацких и болгарских частей в январе—марте 1943 г. Сообщать нумерацию и маршруты.

7. Следить за возможными перебросками итальянских войск и военных грузов на восточный фронт в январе—марте 1943 г. по маршруту Варшава—Минск—Гомель—Конотоп [14, л. 6].

Существовал и другой вид данного документа. Это был «распространенный» перечень, который включал вопросы по широким или нескольким более узким темам. Как правило, «распространенные» перечни касались вопросов военной разведки и содержали основные и ключевые вопросы ее ведения. Одним из первых таким документов был «перечень вопросов», разработанных по темам согласно работы отделения войсковой информации Разведывательного управления ЦШПД, подготовленный в ноябре 1942 г.

Вопросы были разбиты на 5 тем: «О состоянии мостов и переправ через р. Днепр», «О состоянии работ противника по укреплению западного берега р. Днепра, а равно изучение состояния укрепленных районов оккупированной территории», «О состоянии железнодорожного транспорта на оккупированной



территории», «О мероприятиях противника по подготовке химического нападения», «О националистических формированиях». Каждая тема включала от четырех до девяти вопросов по разведке. Так, в последней теме были определены такие из них, как дислокация и нумерация формируемых националистических частей и соединений, их комплектование и формирование, классовый состав, организация, вооружение и численность, командный состав, политико-моральное состояние.

В примечании к документу указывалось, что «при ответе на поставленные вопросы материал подбирать более обширно, располагая его в порядке поставленных вопросов [15, л. 45—46].

Успешное применение на практике вышеназванного документа привело к тому, что в январе 1943 г. был подготовлен расширенный и доработанный «перечень вопросов».

20 января 1943 г. заместитель начальника ЦШПД В. Сергиенко направил в БШПД документ, в самом начале которого указывалось: «Направляю перечень вопросов разведывательной работы, требующих освещения в 1-м квартале 1943 г. по армиям противника, действующим на оккупированной территории БССР и перебрасываемым через территорию БССР на Восточный фронт».

Вопросы в перечне были объединены в 8 тематических блоков, которые касались важнейших вопросов по немецкой армии:

1. «По армиям и перевозкам». В разделе ставилась задача: установить наличие резервов и частей противника в Минском, Гомельском, Борисовском, Полоцком, Оршанском, Гродненском и Лидском районах БССР; вести постоянный контроль за перебросками войск с запада на восток по направлениям (перечисление); установить, где и какие военно-учебные заведения противника (общевойсковые, гестапо, по подготовке кадров для националистических формирований) находятся на оккупированной территории БССР.

2. «По автобронетанковым войскам». В разделе требовалось установить: наличие бронепоездов, действующих на оккупированной территории БССР, их вооружение и тактическое применение; передвижение автобронетанковых войск противника; потери автобронетанковых войск на фронте, понесенные от партизанского движения; организацию ремонта танков, бронемашин и автотранспорта в армейских и фронтовых мастерских; какие заводы-мастерские производят ремонт автобронетанкового вооружения, производительные мощности, методы организации ремонта.

3. «По артиллерийским частям и вооружении». Раздел затрагивал вопросы: ведения постоянного контроля за перебросками артиллерийских частей по железным и шоссейным дорогам; установление нумерации частей и калибра матчасти; наличия артскладов, их дислокацию и какие калибры снарядов на хранении; меры ПВО складов и количество зенитной артиллерии; наличия артчастей, находящихся в тылу, их нумерация и калибр; переброски артиллерии на железнодорожной установке, калибр, тактико-технические характеристики;

переброски боеприпасов по железным и шоссейным дорогам, их количество и калибр.

4. «По военной химии». Ставилась задача: установить какое химическое имущество и в каких количествах находится на складах в Полоцке, Минске, Витебске, станции Заболотинка, Гомеле, Борисове; установить ТТХ стационарной химической аппаратуры, которая находилась в укреплениях на линии Витебск—Орша.

5. «По связи»: добыть официальное немецкое наставление по организации связи германской армии (основы и принципы в различных видах боя); добыть наставление по организации войск связи германской армии; достать приказы и распоряжения по связи, схемы организации связи, телеграфная связь и подвижные средства; выяснить состояние постоянных линий связи на временно оккупированной территории БССР, степень их восстановления и использования.

6. «По укреплениям»: уточнить характер немецких укреплений и проверить их наличие на следующих рубежах (перечисление); уточнить характер строящихся укреплений в Витебске, Борисове, Минске, Гомеле; добыть подробные сведения о предмостных укреплениях на восточном берегу Днепра в районе Могилева, Рогачева, Жлобина; добыть рабочие чертежи строящихся наиболее характерных сооружений долговременного типа, образцы бетона, цемента и стройматериалов, применяющихся немцами при строительстве, различные сведения, характеризующие строительные организации немцев, занятые на постройках укреплений (подчинение, внутренние настроения, численность и состав, снабжение материалами и предметами оборудования).

7. «По службе тыла и военным объектам»: выяснить организацию автотранспортной службы во всех звеньях германской армии; организацию, нумерацию, численный состав и техническое оснащение автотранспортных частей; производятся ли крупные автоперевозки людей и грузов на временно оккупированной территории БССР, как они организуются, снабжение горючим и ремонт в полевых условиях; организацию, нумерацию, техническое оснащение и функции войсковых автопарков Резерва главного командования, их связь с автозаводами и армейскими автопарками; дислокацию, нумерацию, численный состав и производственные мощности авто- и танкоремонтных батальонов, рот, эвакуационных заводов; дислокацию и емкость складов и баз снабжения в прифронтовой полосе и в тылу; дислокацию и нумерацию всех прочих транспортных частей.

8. «По транспорту»: установить, на каких станциях имеются бронепоезда и основная цель их использования; в каком состоянии находятся мосты через Днепр у станций Могилев, Жлобин, Речица, через Припять у станции Калинковичи, Лунинец; перешит ли путь на дорогах Орша—Кричев—Унеча и Могилев—Кричев—Рославль; в сообщениях о произведенных диверсиях на транспорте точно указывать, где совершено (между какими станциями), результаты диверсии и на какое время прекращено движение поездов [14, л. 5, 10—11 об].



Следует отметить, что «перечни вопросов» во многом определили появление такого вида разведывательного документа, как разведывательная сводка БШПД.

Похожим видом документа являются «задачи» по ведению партизанской разведки, которые ставили вышестоящие организации. Как и «перечни вопросов», задачи были «тематические» (основная масса) и «развернутые» (исключение). Принципиальным отличием документов было то, что для выполнения «задач» по разведывательной деятельности, как правило, отводились четко определенные временные и географические рамки.

«Тематические задачи» могли быть направлены на выяснение сведений по химической разведке [11, л. 36—37], армейской [14, л. 32], оборонительным сооружениям [14, л. 306—306 об] и другим важным вопросам.

«Задачи» по ведению разведки могли быть самостоятельным документом, а могли входить в качестве разделов в «задачи» по ведению и развитию партизанской борьбы в целом. Например, в задачах, поставленных Западным штабом партизанского движения перед Борисовским оперативным центром, из 11 позиций 9 касались разведывательной деятельности [17, л. 9—13].

Переход войны к затяжному характеру, утрата немецкой армией стратегической инициативы, значительные поражения на фронтах и трудновосполнимые потери в личном составе не исключали возможности принятия немецким руководством решения о начале химической войны, а продолжавшиеся научно-исследовательские работы немецких ученых в области развития химического оружия и реальная возможность его применения как на фронте, так и против партизан и мирных жителей, способствовали усилению внимания партизанских руководящих органов к проводимой партизанами химической разведке.

19 апреля 1943 г. премьер-министр Великобритании У. Черчилль в секретном послании сообщил И. В. Сталину, что до английского командования «доходят слухи о намерении немцев применить газы на русском фронте…». В ответном послании И. В. Сталин писал: «я всецело поддерживаю Ваше предложение, чтобы Вы выступили с предупреждением Гитлеру и его союзникам и пригрозили бы им мощным химическим нападением в случае их газового нападения на нашем фронте» [2, с. 149].

6 августа 1943 г. на имя начальника БШПД П. Калинина за подписью заместителя начальника ЦШПД С. Бельченко пришел документ, в котором говорилось, что «для уточнения действительных намерений противника по развертыванию химической войны и выявлению непосредственной подготовки к химическому нападению, прошу поставить следующие задачи», которые были объединены в 5 пунктов: «Химические части противника», «Химическое вооружение», «Химические склады и пути подвоза», «Химическая служба», «Захватить». Каждый пункт содержал от 1 до 13 разделов, в которых устанавливались конкретные задачи партизанским формированиям [13, с. 37—38].

Результатом появления данного документа стала целенаправленная разведдеятельность партизан по вопросам химической разведки, которая нашла свое отражение в донесениях и разведсводках, направляемых в БШПД и ЦШПД. Вся поступившая информация анализировалась секретным и разведывательным отделом, и на основании проверенных данных составлялись разведывательные сводки БШПД, которые рассылались во все руководящие партийные и военные органы страны. Только за 1943 г. БШПД было составлено 85 разведсводок, и в 18 из них (15%) содержатся данные о подготовке немецкой армии к применению химического оружия [12, л. 1—608].

Серьезные предупреждения государств антигитлеровской коалиции — СССР, США, Великобритании — о неотвратимости ответного химического удара, уязвимость Германии в связи с относительно небольшой территорией и высокой плотностью населения, утрата господства в воздухе способствовали тому, что немецкое военное и политическое руководство не решилось на широкое применение химического оружия на Восточном фронте. Значительный вклад в это внесли и белорусские партизаны, которые своевременно добывали необходимые разведывательные данные и передавали их в вышестоящие органы.

Еще одним примером «задачи» по разведывательной деятельности является документ, направленный С. Бельченко в БШПД 16 мая 1943 г., в котором указывалось: «В целях установления группировки и намерений противника, прошу срочно поставить перед разведорганами следующие задачи:

1. Установить принадлежность частей, прибывших в последнее время в район Витебск—Сураж.

2. Установить нумерацию итальянских частей, дислоцирующихся в городах Новозыбков, Бобруйск, Гомель, Осиповичи, Минск.

3. Усилить разведку гарнизонов добровольческих войск в городах Шклов, Толочин, Круглое, установить пункты и порядок формирования, систему подчинения, порядок снабжения, политико-моральное состояние и цели использования» [14, л. 32].

К достоинствам «перечней вопросов» и «задач» можно отнести возможность руководящих партизанских органов оперативно реагировать на необходимость получения определенных разведывательных данных по интересующей проблеме. РО просто определял круг вопросов по интересующей теме и направлял «задачи» к их исполнению по нисходящей иерархии в партизанские соединения. «Перечни вопросов» во многом определили появление и структуру такого вида разведывательного документа, как разведсводка БШПД. К недостаткам можно отнести отсутствие комментариев и рекомендаций по исполнению разведывательных вопросов. Как правило, просто указывалось о том, что для получения необходимых разведданных пересылается перечень вопросов или задач. Соответственно, не учитывались особенности географического и военного положения партизанских формирований и их возможности к исполнению



поставленных задач. Тем не менее, анализ данных документов позволяет проследить приоритеты в разведывательной деятельности партизан на разных этапах Великой Отечественной войны, а также изучить организационную работу руководящих разведывательных структур.

Источники и литература

1. Бяспалая, М. А. Паўсядзённыя клопаты партызанскага тылу (па старонках партызанскіх рукапісных часопісаў) // Партизанское движение в Беларуси и его роль в разгроме фашистских захватчиков в 1941—1944 годах: материалы Междунар. научно-практ. конф. (Минск, 25—26 июня). — Минск: Беларуская навука, 2009. — С. 342—349.
2. Доморад, К. И. Разведка и контрразведка в партизанском движении в Белоруссии 1941—1944 гг. — Минск: Навука і тэхніка, 1995. — 256 с.
3. Еленская, И. Э. Документы немецко-фашистских оккупационных органов управления учреждений как исторический источник: по материалам Госархива Брестской области: дис. на соиск. учен. степ. канд. ист. наук (07.00.09). — Минск: НАН Институт истории, 1999.
4. Ермолович, В. И. Листовки партизан и подпольщиков Беларуси периода Великой Отечественной войны как исторический источник (1941—1944): Автореф. дис. на соиск. учен. степ. канд. ист. наук (07.00.09). — Минск, 1993. — 24 с.
5. Каваленя, А. А. Некаторыя метадалагічныя падыходы ў даследаванні гісторыі Вялікай Айчыннай вайны // Беларусь у гады Вялікай Айчыннай вайны: стан і перспектывы даследавання праблемы: Матэрыялы «круглага стала» (Мінск, 22 лістапада 2002 г.). — Мінск: ДНУ «Інстытут гісторыі НАН Беларусі», 2005. — С. 18—26.
6. Киселев, В. К. Партизанская разведка. Сентябрь 1943 — июль 1944. — Минск: БГУ, 1980. — 128 с.
7. Козак, К. И. Германский оккупационный режим на территории Беларуси 1941—1944: историография и источники. — Минск: БГУ, 2006. — 267 с.
8. Кулинок, С. В. Опросные листы и протоколы бесед как источник по истории партизанской разведки в 1941—1943 гг. (по материалам фонда № 1450 Национального архива Республики Беларусь) // Беларускі археаграфічны штогоднік. Вып. 13. — Мінск: БелНДІДАС, 2012. — С. 72—79.
9. Кулинок, С. В. Разведывательные сводки Белорусского штаба партизанского движения как источник по истории Беларуси периода Великой Отечественной войны // Архивы и делопроизводство. — № 4, 2012. — С. 124—134.
10. Літвін, А. М. Стварэнне і баявая дзейнасць партызанскіх фарміраванняў на тэрыторыі Беларусі // Беларусь у гады Вялікай Айчыннай вайны. Праблемы гістарыяграфіі і крыніцазнаўства. Зборнік артыкулаў. — Мінск: Беларуская навука, 1999. — С. 90—122.
11. НАРБ. Ф. 1450. — Оп. 1. — Д. 1. Директивы и указания вышестоящих организаций по вопросам партизанского движения.
12. Там же. — Д. 4. Разведывательные сводки Белорусского штаба партизанского движения о действиях противника на территории Белоруссии.
13. Там же. — Д. 12. Программы по подготовке агентурных работников.
14. Там же. — Д. 15. Переписка с разведотделом ЦШПД, Главным разведуправлением Красной Армии, НКГБ СССР и НКГБ БССР о сборе сведений о противнике и другим вопросам разведывательной работы на оккупированной врагом территории Белоруссии.

15. Там же. — Оп. 2. — Д. 1244. Указание ЦШПД о проведении мероприятий по разложению антисоветских немецких формирований, комплектовании школы по подготовке кадров для разведки, информации и докладные записки о работе Особого сбора, потерях противника в результате бомбардировок его советской авиацией, боевые задания бригадам и отрядам и переписка с ЦШПД о передвижении и дислокации войск вермахта.
16. Там же. — Оп. 3. — Д. 42. Руководящие материалы оперативной группы при военном совете 61-й Армии.
17. Там же. — Д. 179. Копии постановления и приказа Военного совета 4-й Ударной армии о мерах расширения партизанского движения, докладных записок, оперативных сводок, боевых донесений, шифротелеграммы на имя т. Пономаренко о боевых действиях партизанских отрядов и бригад и истории партизанского отряда «Победа» и др. материалы.
18. Павлова, Е. Я. Личный состав партизанских формирований Беларуси в годы Великой Отечественной войны (1941—1944 гг.): источники и метод анализа: Дис. на соиск. учен. степ. канд. ист. наук (07.00.09). — Минск, 2003.
19. Павлова, Е. Я. О месте и особенностях партизанских документов в комплексе источников по истории партизанского движения // Крыніцазнаўства і спецыяльныя гістарычныя дысцыпліны: Зборнік. — 2011. — Вып. 6. — С. 103—119.
20. Шумейко, М. Ф. Делопроизводство в партизанских отрядах Беларуси в годы Великой Отечественной войны // Архівы і справаводства № 2 (38). — 2005. — С. 60—66.

*Артыкул паступіў у рэдакцыю 15.05.2013*



***А. С. Горны,***
*аспірант кафедры гісторыі Беларусі*
*факультэта гісторыі і сацыялогіі ГрДУ імя Я. Купалы,*
*магістр гістарычных навук;*
e-mail: litvin_horny@tut.by

## МАТЭРЫЯЛЫ АБ ДЗЕЙНАСЦІ БЕЛАРУСКІХ ПАЛАНАФІЛЬСКІХ АРГАНІЗАЦЫЙ У ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ (1921—1937 гг.) У ФОНДАХ ЦЭНТРАЛЬНАГА ДЗЯРЖАЎНАГА АРХІВА ЛІТВЫ

У міжваеннае дваццацігоддзе ў Заходняй Беларусі, якая ўваходзіла ў склад Польскай дзяржавы, адбываліся значныя грамадска-палітычныя працэсы. Унутры беларускага нацыянальнага руху ў гэтым рэгіёне паступова выкрышталізоўваліся асобныя палітычныя плыні, якія па-рознаму бачылі будучыню заходнебеларускіх зямель. Сярод іх пэўнае месца займала паланафільская плынь, вытокі якой можна аднесці да пачатку польска-савецкай вайны. Прадстаўнікі дадзенай плыні імкнуліся наладзіць кантакты з польскімі ўладамі і грамадскімі інстытутамі дзеля забеспячэння нацыянальна-культурных правоў беларусаў у Польшчы. Пасля заключэння Рыжскага міру 1921 г. яны разгарнулі актыўную дзейнасць па арганізацыйным афармленні. У 1920—1930-я гг. у Заходняй Беларусі з’явілася некалькі паланафільскіх арганізацый («Краёвая сувязь», «Часовая беларуская рада», «Цэнтрасаюз» і інш.), якія заклікалі беларускае насельніцтва да лаяльнага супрацоўніцтва з польскімі ўладамі ў галіне палітыкі, эканомікі і культуры.

Праблема дзейнасці беларускіх паланафільскіх арганізацый у Заходняй Беларусі знайшла пэўнае адлюстраванне як у айчыннай, так і замежнай гістарыяграфіі. У Беларусі дадзенаму аспекту прысвяцілі свае працы гісторыкі А. Пашкевіч [1] і А. Чарнякевіч [2; 3]. Сярод замежных даследчыкаў перш за ўсё трэба вылучыць польскіх гісторыкаў К. Гамулку [4] і І. Янушэўскую-Юркевіч [5], якія паспрабавалі зрабіць сістэматычны агляд беларускага паланафільскага руху. Тым не менш, існуючыя навуковыя напрацоўкі стварылі толькі падмурак для далейшага вывучэння. Праблема дзейнасці беларускіх паланафілаў у Заходняй Беларусі па-ранейшаму не мае глыбокага комплекснага даследавання, а некаторыя аспекты праблемы ўвогуле не распрацаваны. У айчыннай і замежнай гістарыяграфіі адсутнічае нават вызначэнне тэрміна «беларускае паланафільства» і яго крытэрыяў. Па-за полем зроку гісторыкаў засталіся перыядычныя выданні беларускіх паланафілаў, пытанні фінансавання іх дзейнасці, а біяграфіі многіх паланафільскіх дзеячаў па-ранейшаму знаходзяцца пад покрывам невядомасці. Таму важнае значэнне набывае актыўны пошук і вывучэнне пісьмовых крыніц па дадзенай праблеме, у тым ліку і ў замежных архівах, што дазволіць гісторыкам больш грунтоўна даследаваць дзейнасць беларускіх паланафільскіх арганізацый у міжваеннай Польшчы.

Адным з найбольш вялікіх сховішчаў дакументаў па гісторыі Заходняй Беларусі з'яўляецца Цэнтральны дзяржаўны архіў Літвы ў г. Вільнюсе (Lietuvos centrinis valstybės archyvas, далей — ЦДАЛ). Як вядома, міжваенная Вільня з'яўлялася значным культурным і палітычным цэнтрам т. зв. «крэсаў усходніх» Польскай дзяржавы. Тут канцэнтравалася не толькі грамадска-палітычнае жыццё літоўцаў, палякаў, яўрэяў, але і беларускай нацыянальнай меншасці ў Польшчы. У Вільне размяшчаліся галоўныя ўстановы амаль усіх беларускіх культурных і палітычных арганізацый, у тым ліку і паланафільскіх. Таму невыпадкова, што ў архівах будучай сталіцы Літвы адклалася даволі вялікая колькасць матэрыялаў, прысвечаных грамадска-палітычнай і культурна-асветніцкай дзейнасці беларусаў у Польшчы. Частка гэтых дакументаў да сённяшняга дня заставалася маладаследаванай і не ўведзенай у шырокі навуковы ўжытак. У дадзеным артыкуле зроблена спроба прадставіць кароткі агляд дакументаў, знойдзеных аўтарам падчас працы ў вышэйзгаданым архіве, якія маюць дачыненне да гісторыі беларускіх паланафільскіх арганізацый у Заходняй Беларусі. Вывучэнне разглядаемага корпуса дакументаў дапаможа больш глыбока высветліць розныя пытанні, звязаныя з функцыянаваннем паланафільскай плыні ў беларускім руху.

Пісьмовыя крыніцы аб дзейнасці беларускіх паланафільскіх арганізацый з фондаў ЦДАЛ можна ўмоўна разбіць на два блокі. Першы — найбольш значны блок — складаюць дакументы польскага справаводства: справаздачы польскіх службовых асоб, данясенні органаў паліцыі і дзяржаўнай бяспекі, прэсавыя агляды і г. д. У другі блок уваходзяць матэрыялы ўласна паланафільскага паходжання: унутрыпартыйнае справаводства і карэспандэнцыя, рэзалюцыі сходаў, статуты і г. д.

Багаты інфармацыйны патэнцыял у першым блоку дакументаў маюць справаздачы, рапарты, даклады, інфармацыйныя паведамленні польскіх чыноўнікаў аб грамадска-палітычным становішчы ў Вільне і дзейнасці палітычных арганізацый. Асноўная іх маса захоўваецца ў фондзе 15 «Упраўленне Камісара польскага ўрада г. Вільня», фондзе 51 «Віленскае ваяводскае ўпраўленне», фондзе 53 «Віленскае гарадское староства». У дадзеных дакументах прадстаўнікамі органаў паліцыі і дзяржаўнай бяспекі падрабязна фіксавалася грамадска-палітычнае жыццё нацыянальных меншасцей у Вільне і Віленскім ваяводстве, у тым ліку і дзейнасць беларускіх паланафільскіх арганізацый. Напрыклад, у «Сітуацыйнай справаздачы з грамадскага і палітычнага жыцця г. Вільні 1925 г.» даволі шмат увагі надавалася дзейнасці такой паланафільскай арганізацыі, як Часовая беларуская рада (ЧБР) [6]. Аўтар дакумента падрабязна асвятляў мерапрыемствы і сходы рады, звяртаў увагу на ўзаемаадносіны паміж яе сябрамі і прадстаўнікамі іншых беларускіх арганізацый, спрабаваў даць характарыстыку лідару ЧБР А. Паўлюкевічу і інш. Акрамя гэтага, у дакуменце можна знайсці цікавую інфармацыю аб супярэчнасцях паміж кіраўнікамі ЧБР і спробах беларускага пасла польскага сейма А. Аўсяніка дэзарганізаваць дзейнасць рады [6, арк. 37, 75—77, 120, 171].



Сярод справаводчых крыніц польскага паходжання варта звярнуць увагу на даклады чыноўнікаў, прысвечаныя асобным паланафільскім арганізацыям альбо дзеячам. Так, у фондзе «Упраўлення Камісара польскага ўрада г. Вільні» захоўваецца сакрэтны ліст кіраўніка экспазітуры (філіяла) палітычнай паліцыі Вільні С. Аленцкага, у якім утрымліваецца каштоўная інфармацыя аб беларускай паланафільскай арганізацыі Краёвая сувязь, якая дзейнічала на тэрыторыі Віленшчыны ў 1921—1922 гг. [8, арк. 9—9 адв.]. Дадзеная крыніца змяшчае важныя звесткі наконт працэсу ўтварэння Краёвай сувязі, фарміравання кіраўнічага складу, дзейнасці арганізацыі ў Вільне і правінцыі, яе паступовага заняпаду. Таксама цікавасць уяўляе сакрэтны даклад камісара польскага ўрада г. Вільні Б. Александровіча віленскаму ваяводзе, дзе даецца характарыстыка некаторых дзеячаў паланафільскага кірунку — Я. Станкевіча, М. Касцевіча, Я. Бекіша і інш. [19, арк. 29—29 адв.]. У дакуменце згадваецца праца Я. Станкевіча па арганізацыі праўрадавай Беларускай сялянскай партыі, прыводзіцца даволі падрабязная біяграфія беларускага дзеяча М. Касцевіча (Краўцова), у якой, між іншым, ёсць сведчанні аб яго супрацоўніцтве з ІІ аддзелам польскага Генштаба (дэфензіва).

У дакументах Віленскага ваяводскага ўпраўлення сярод агентурнай інфармацыі таксама сустракаюцца жыццяпісы Р. Астроўскага (лідара т. зв. «беларускай санацыі») і У. Більдзюкевіча (віцэ-старшыні Часовай беларускай рады), якія былі складзены польскай паліцыяй для службовага карыстання [13, арк. 15—15 адв., 18]. Гэтыя дакументы дапамагаюць удакладніць некаторыя вехі жыцця вышэйзгаданых дзеячаў.

Акрамя назірання за палітычнай дзейнасцю беларускіх паланафілаў польская паліцыя сачыла і за іх асабістай бяспекай. Напрыклад, у фондзе «Віленскага гарадскога староства» знаходзяцца цікавыя дакументы адносна арганізацыі аховы лідара Часовай беларускай рады А. Паўлюкевіча. Паводле інфармацыі аддзела бяспекі Віленскага ваяводскага ўпраўлення летам 1926 г. на Паўлюкевіча з боку яго палітычных праціўнікаў планаваўся замах [19, арк. 66]. Віленская паліцыя арганізавала назіранне за яго домам, а пры кожнай паездцы Паўлюкевіча суправаджаў спецыяльны ахоўнік [19, арк. 64]. Аднак пасля высветлілася, што чуткі аб замаху распаўсюджваў сам Паўлюкевіч, жадаючы такім чынам падняць у вачах улад свой аўтарытэт [19, арк. 63, 64].

Дакументы польскага справаводства дазваляюць таксама грунтоўна даследаваць дзейнасць Цэнтральнага саюза беларускіх культурна-асветніцкіх і гаспадарчых арганізацый (Цэнтрасаюза) і Таварыства беларускай асветы (ТБА) — беларускіх праўрадавых арганізацый, якія дзейнічалі ў Заходняй Беларусі ў 1930-я гг. пад кантролем т. зв. групы Луцкевіча—Астроўскага. У інфармацыйных паведамленнях, напісаных рознымі паліцэйскімі і следчымі структурамі (аддзел бяспекі і грамадска-палітычны аддзел Віленскага ваяводскага ўпраўлен-

ня, следчы аддзел Каменды дзяржаўнай паліцыі г. Вільня і г. д.), утрымліваюцца звесткі аб утварэнні Цэнтрасаюза, адносінах арганізацыі да вынікаў парламенцкіх выбараў 1930 г., аб дачыненні да іншых беларускіх партый; прааналізавана стаўленне Цэнтрасаюза да палітычных і эканамічных праблем Заходняй Беларусі [24, арк. 32—35, 38—39, 53, 54—55, 56, 64]. У дадзенай групе крыніц таксама маецца інфармацыя аб кіраўнічым складзе Цэнтрасаюза, у які ўваходзілі такія беларускія дзеячы, як А. Трэпка (старшыня), С. Кароль (віцэ-старшыня), Я. Шнаркевіч (сакратар), Р. Астроўскі (скарбнік), Р. Якубёнак, Я. Цеханоўскі, Ф. Акінчыц (сябры прэзідыума) [24, арк. 30]. Акрамя гэтага, выяўлены цікавыя паведамленні аб выхадзе з Цэнтрасаюза Ф. Акінчыца і нападзе на памяшканне арганізацыі невядомых злачынцаў, якія, паводле паліцэйскага данясення, маглі быць альбо «элементам камуністычна-падрыўным», альбо прыхільнікамі Беларускай хрысціянскай дэмакратыі [24, арк. 18].

Аналагічныя дакументы захоўваюцца ў асобнай справе Таварыства беларускай асветы (ТБА) [23]. Інфармацыйныя паведамленні, лісты і рапарты, прысвечаныя гэтай арганізацыі, даюць пэўнае ўяўленне аб працэсе рэгістрацыі ТБА [23, арк. 21], асвятляюць сходы і мерапрыемствы таварыства [23, арк. 17—19 адв.], утрымліваюць звесткі аб унутраным крызісе ў ТБА, выкліканым спыненнем урадавых субсідый [23, арк. 15]. Сярод цікавых дакументаў неабходна прыгадаць ліст кіраўніка аддзела бяспекі Віленскага ваяводскага ўпраўлення Т. Брунеўскага, у якім апошні просіць павятовых старастаў Віленскага ваяводства не рабіць перашкод працы ТБА па прычыне таго, што кіраўніцтва арганізацыі «блізка супрацоўнічае і ўзгадвае сваю дзейнасць з адміністрацыйнымі ўладамі» [23, арк. 24]. Таксама выклікаюць увагу інфармацыйныя паведамленні аб выніках грамадскага суда паміж Р. Астроўскім і А. Луцкевічам, які стаў завяршальнай кропкай унутранага расколу ў таварыстве [23, арк. 5—6 адв.].

Прэсавыя агляды, справаздачы і рапарты прадстаўляюць яшчэ адзін маладаследаваны від справаводчых крыніц польскага паходжання. Аўтары дадзеных дакументаў характарызавалі розныя газеты і часопісы, якія выходзілі ў Вільне, звяртаючы асноўную ўвагу на прэсу нацыянальных меншасцей. У дзейнасці беларускіх паланафільскіх арганізацый друк займаў адну з галоўных ролей, таму, безумоўна, ён знаходзіўся ў полі зроку мясцовых улад. У прэсавых справаздачах у асноўным утрымлівалася інфармацыя аб выдаўцах, змесце, накладзе перыядычнага выдання, падкрэслівалася яго ідэалагічная скіраванасць і партыйная прыналежнасць [7, арк. 2 адв.—3, 100, 115]. Больш таго, улады заводзілі асобныя справы на пэўны часопіс ці газету, дзе збіралі адносна іх розную дакументацыю. У такіх справах захоўваліся невялікія рапарты польскіх чыноўнікаў, у якіх фіксаваліся прозвішча выдаўца і рэдактара, адрас рэдакцыі, партыйная прыналежнасць, фінансаванне, сфера палітычных уплываў, адносіны выдання да ўлад і г. д. Таксама магла ўтрымлівацца афіцыйная перапіска паміж рэдакцыяй і ўрадавымі структурамі. Аўтарам артыкула ў фондах ЦДАЛ выяўлены справы, прысвечаныя наступным беларускім паланафільскім перыядычным выданням: «Грамадскі голас» [14], «Беларуская культура» [15], «Жаноцкая справа» [17], «Родны край» [16], «Наперад», «Народны звон», «Беларускі звон» [18].



Трэба заўважыць, што комплекс справаводчых дакументаў з першага блока мае афіцыйны характар і адлюстроўвае ўрадавы пункт гледжання на беларускі нацыянальны рух, не пазбаўлены пэўных суб'ектыўных і кан'юнктурных ацэнак. Тым не менш, польская справаводчая дакументацыя ўтрымлівае шматлікі фактычны матэрыял, які пры спалучэнні з іншымі крыніцамі будзе вельмі карысным для вывучэння дзейнасці беларускіх паланафілаў у міжваенны час.

Другі блок матэрыялаў з фондаў ЦДАЛ прадстаўляе ўласная дакументацыя беларускіх паланафільскіх арганізацый. Каштоўнасць для даследчыка ўяўляюць дакументы, прысвечаныя гісторыі паланафільскага аб'яднання Краёвая сувязь. У фондах архіва захоўваюцца дэкларацыя аб утварэнні гэтай арганізацыі [11, арк. 15], пералік яе сяброў [8, арк. 4], патрабаванні да Міністэрства ўнутраных спраў, асветы і харчавання аб падтрымцы дзейнасці Краёвай сувязі і выкананні яе намаганняў у сферы палітыкі, школьніцтва і кааперацыі [12, арк. 7—7 адв.]. У канцы 1921 г. Краёвая сувязь па прычыне надыходзячых выбараў у Віленскі сейм больш актыўна ўключылася ў грамадска-палітычнае жыццё Віленшчыны, арганізаваў т. зв «з'езд беларускага сялянства, партый і арганізацый Заходняй Беларусі». Вынікі працы гэтага з'езда знайшлі адлюстраванне ў шэрагу рэзалюцый, прысвечаных палітычнаму, школьнаму, эканамічнаму, аграрнаму і бежанскаму пытанням [11, арк. 126 —131 адв.]. Дадзеныя дакументы дазваляюць больш шырока прааналізаваць праграмныя ўстаноўкі і мэты, якія вылучалі ў сваёй дзейнасці беларускія паланафілы ў пачатку 1920-х гг.

Унікальнымі крыніцамі па гісторыі Краёвай сувязі з'яўляюцца лісты лідара арганізацыі П. Алексюка да дэлегата польскага ўраду ў Сярэдняй Літве. У сваіх лістах, Аляксюк закранае шэраг бягучых палітычных і адукацыйных пытанняў [12, арк. 21—21 адв., 24], выказвае прапановы па фарміраванні і падтрымцы паланафільскай дэлегацыі на Беларускую нацыянальна-палітычную канферэнцыю ў Празе [11, арк. 124—124 адв.]. У лісце ад 19 кастрычніка 1921 г. лідар Краёвай сувязі дае невялікі гістарычны агляд беларускага нацыянальнага руху і заклікае польскага чыноўніка актывізаваць працу ў напрамку польска-беларускага збліжэння, аказваючы грашовую і маральную падтрымку паланафільскім структурам [12, арк. 28—31 адв.].

Сярод матэрыялаў іншых паланафільскіх арганізацый у фондах ЦДАЛ выяўлены статут віленскага паланафільскага таварыства «Беларуская хатка» [21, арк. 1—2 адв.], некаторыя дакументы Беларускага грамадзянскага сходу [9], а таксама перапіска Прэзідыума Галоўнай Рады Цэнтрасаюза з віленскім гарадскім старастам аб рэгістрацыі арганізацыі, зменах у кіруючых структурах, правядзенні ўрачыстага мерапрыемства, прысвечанага 25-годдзю творчай дзейнасці Я. Купалы і інш. [24, арк. 28, 29, 31, 58, 65, 70, 72]. Акрамя гэтага, у архіве

ўтрымліваецца шэраг заяў розных паланафільскіх арганізацый аб дазволе на выданне ўласнага перыядычнага органа [10; 20; 22] і калекцыя рэдакцыйных дакументаў беларускіх праўрадавых газет «Наперад» [25] і «Беларускі звон» [26].

Такім чынам, у фондах ЦДАЛ захоўваюцца цікавыя і маладаследаваныя матэрыялы аб дзейнасці беларускіх паланафільскіх арганізацый у Заходняй Беларусі ў міжваенны час. Яны ўяўляюць значную каштоўнасць не толькі для вывучэння вышэйадзначанай праблемы, але і для разумення супярэчлівых грамадска-палітычных працэсаў у Заходняй Беларусі ў 1921—1939 гг. Найбольш шырокі блок пісьмовых крыніц складаюць матэрыялы польскага справаводства, якія ў сваёй большасці маюць інфармацыйна-даведачны і справаздачны характар (справаздачы, інфармацыйныя паведамленні, рапарты, лісты віленскай паліцыі і органаў дзяржбяспекі). У меншай ступені ў фондах ЦДАЛ прадстаўлена ўласна паланафільская дакументацыя, сярод якой вылучаюцца матэрыялы аб дзейнасці арганізацыі Краёвая сувязь. Інфармацыйны патэнцыял згаданых дакументаў дазваляе прасачыць некаторыя аспекты ўтварэння і дзейнасці Краёвай сувязі, Часовай беларускай рады, Цэнтрасаюза, Таварыства беларускай асветы, дапамагае раскрыць пытанні ўнутрыпартыйнага жыцця і адносін польскіх улад да паланафільскай плыні беларускага руху. Таксама ў крыніцах з фондаў ЦДАЛ можна сустрэць каштоўную інфармацыю аб асобных паланафільскіх дзеячах і перыядычным друку беларускіх паланафілаў. Тым не менш, выяўленне новых дакументаў у фондах ЦДАЛ па-ранейшаму застаецца актуальным і запатрабаваным для комплекснай распрацоўкі праблем, звязаных з дзейнасцю беларускіх паланафільскіх арганізацый у Заходняй Беларусі.

Крыніцы і літаратура

1. Пашкевіч, А. В. Беларускія паланафільскія арганізацыі і дзеячы падчас парламенцкіх выбараў у Польшчы ў 1922 г. / А. В. Пашкевіч // Problemy cywilizacyjnego rozwoju Białorusi, Polski, Rosji i Ukrainy od końca XVIII do XXI wieku / Pod redakcją Piotra Franaszka, Aleksandra N. Nieczuchrina. — Kraków: Wydawnictwo Uniwersytetu Jagiellońskiego, 2007. — S. 161—164.
2. Чарнякевіч, А. Беларускія паланафілы і Грамада. 1925 — пачатак 1927 г. / А. Чарнякевіч // Гістарычны альманах. — 2006. — Том 12. — С. 64—78.
3. Чарнякевіч, А. Беларуская Часовая Рада і яе месца і роля ў беларускім нацыянальным руху ў Польшчы сярэдзіны 1920-х гадоў / А. Чарнякевіч // Грамадскія рухі і палітычныя партыі ў Беларусі (апошняя чвэрць XIX — пачатак XXI ст.): Матэрыялы Рэсп. навук. канф. (Гродна, 23—24 кастр. 2008 г.) / ГрДУ імя Я. Купалы; рэдкал.: І. І. Коўкель (адк. рэд.) [і інш.]. — Гродна: ГрДУ, 2009. — С. 284—292.
4. Gomółka, K. Białoruskie partie i organizacje prorządowe w II Rzeczypospolitej / K. Gomółka // Białoruskie Zeszyty Historyczne. — 1997. — № 7. — S. 63 —74.
5. Januszewska-Jurkiewicz, J. Stosunki narodowościowe na Wileńszczyźnie w latach 1920—1939 / J. Januszewska-Jurkiewicz. — Katowice: Wyd. Uniwersytetu Śląskiego, 2010. — S. 630—632.
6. Lietuvoscentrinisvalstybėsarchyvas (LCVA). — F. 15. — Ap. 2. — B. 232. Sprawozdania sytuacyjne z życia społecznego i politycznego m. Wilno, 1925 г.



7. Там жа. — B. 380. Sprawozdania prasowe, 1927 г.
8. Там жа. — B. 483. Akta związku «Krajowajasuwiaź» — statut, korespondencja, listaczłonków związku, 1921—1925 гг.
9. Там жа. — B. 630. Białoruskie zgromadzenie obywatelskie, 1924 г.
10. Там жа. — B. 686. Akta w sprawie wydawania czasopisma «Białoruskaja chata» (póznej «Białoruski dzień») — deklaracja, korespondencja, 1926—1927 гг.
11. Там жа. — F. 22. — Ap. 1. — B. 42. Доклад о деятельности белорусских буржуазно-националистических организаций и их руководителей в Польше, Литве и странах Западной Европы с приложениями, характеризующими деятельность данных организаций, 1921 г.
12. Там жа. — B. 54. Сведения о буржуазно-националистических белорусских партиях и организациях Польши и Литвы, 1921 г.
13. Там жа. — F. 51. — Ap. 17. — B. 6. Życiorysy działaczy białoruskich, 1925 г.
14. Там жа. — Ap. 7. — B. 229. Sprawa dotyczące redogowenia czasopism «Kunst und Lebel» i «Gromadskij golos», 1924—1926 гг.
15. Там жа. — B. 356. Sprawa dotyczące redogowenia czasopisma «Białoruska kultura», 1927 г.
16. Там жа. — B. 763. Sprawa dotyczące redogowenia czasopisma «Rodny kraj», 1933—1936 гг.
17. Там жа. — B. 989. Redogowanie czasopisma pod tytułem «Sprawy Kobiece», 1931 г.
18. Там жа. — B. 1008. Redogowanie czasopism pod tytułem «Napierad», «Narodny Zwon», «Białoruski Zwon», 1929—1932 гг.
19. Там жа. — F. 53. — Ap. 23. — B. 1784. Akta w sprawie rejestracji i likwidacji związków i stowarzyszeń (statuty, sprawozdania z działalności, protokoły posiedzeń, korespondencja). Białoruski Związek Właścianski, 1925—1930 гг.
20. Там жа. — B. 1824. Akta w sprawie wydania oraz zajęcia nakładu czasopism (korespondencja, podania i inne). «Białoruskoje słowo», 1926 г.
21. Там жа. — B. 1836. Akta w sprawie rejestracji i likwidacji związków i stowarzyszeń (statuty, sprawozdania z działalności, protokoły, korespondencja). Stowarzyszenie «Białoruska Chatka», 1926 г.
22. Там жа. — B. 1944. Akta w sprawie wydawania i aresztowania nakładu czasopism i gazet (korespondencja, podania, zezwolenia i inne). «Białoruski Radny», 1927—1929 г.
23. Там жа. — B. 2005. Akta w sprawie rejestracji i likwidacji związków i stowarzyszeń (statuty, sprawozdania, protokoły, korespondencja). Towarzystwo Oświaty Białoruskiej, 1927—1935 гг.
24. Там жа. — B. 2078. Akta w sprawie rejestracji i likwidacji związków i stowarzyszeń (statuty, sprawozdania, protokoły, korespondencja). Związek Białoruskich kulturalno-oświatowych i gospodarczych organizacji i instytucji, 1928—1937 гг.
25. Там жа. — F. 368. — Ap. 1. — B. 46. Laikraščio «Naperad» redakcijos darbuotojų sąrašai, 1929 г.
26. Там жа. — B. 54. Įvairių laikraščių redakcijų pavieniai dokumentai, 1920—1936 г.

*Артыкул паступіў у рэдакцыю 11.03.2013*

**В. М. Бароўская,**
*аспірант ДНУ «Інстытут гісторыі» НАН Беларусі;*
e-mail: borovskaya-olga@mail.ru

# ПЕРЫЯДЫЧНЫ ДРУК ЯК НЕАД'ЕМНАЯ ГІСТАРЫЧНАЯ КРЫНІЦА ВЫВУЧЭННЯ ПОЛЬСКА-САВЕЦКІХ ПЕРАГАВОРАЎ 1919—1921 гг.

Перыядычны друк — сукупнасць друкаваных выданняў, якія выходзілі ў пэўныя прамежкі часу, выступалі ў якасці самастойных (незалежных) інфармацыйных пляцовак або друкаванага органа таго ці іншага партыйнага асяродка, кіруючай установы. Пры вывучэнні перыядычнага друку як значнай гістарычнай крыніцы па гісторыі польска-савецкіх перагавораў і вызначэння сутнасці беларускага пытання на іх, было прааналізавана больш за дзясятак выданняў за перыяд з 1919 г. па 1921 г., якія былі згрупіраваны ў тры адпаведныя комплексы.

Першы комплекс — беларускамоўны друк, які выходзіў на тэрыторыі Беларусі, занятай польскімі войскамі, — прадстаўлены друкаваным органам Часовага беларускага нацыянальнага камітэта. Выходзіў пад рэдакцыяй Я. Луцэвіч (Я. Лёсіка, К. Цярэшчанкі) з 25.08. па 19.10.1919 г. пад назвай «Звон», з 21.10.1919 г. па 1920 г. — «Беларусь».

З усіх нумароў выдання ў фондах Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі па газеце «Звон» адсутнічаюць № 22—27, астатнія прадстаўлены ў поўным аб'ёме. З выданняў «Беларусі» захоўваюцца № 1—56 за 1919 г., № 124 за 1920 г. (адсутнічаюць № 1—123, № 125—146).

Тэматычны комплекс абодвух выданняў падае сваё адлюстраванне падзей свету і рэакцыю беларускіх палітычных колаў на іх. Газеты яскрава ілюструюць стаўленне беларускіх палітычных прадстаўнікоў да магчымых шляхоў вырашэння беларускага пытання, якія прапаноўваліся польскімі, савецкімі ўрадавымі коламі, прадстаўнікамі «белай» Расіі, краінамі Антанты. У цэнтр увагі газет трапляюць падзеі, звязаныя з ходам працы Парыжскай мірнай канферэнцыі, у межах якой беларускае пытанне знаходзіла свае адлюстраванне праз разгляд польскай і рускай праблем. Ускладваліся надзеі на шматлікія намаганні дэлегацыі БНР пад кіраўніцтвам А. Луцкевіча і намеры кіруючых колаў краін Антанты і ЗША вырашыць нацыянальныя пытанні былой Расійскай імперыі згодна права самавызначэння нацый.

Значная колькасць артыкулаў газеты «Беларусь» прысвячалася разгляду пытання правядзення і арганізацыі плебісцыту на літоўска-украінска-беларускім абшары пад эгідай польскага ваеннага і цывільнага кіравання. Плебісцытарны шлях вырашэння беларускага пытання ўспрымаўся вельмі негатыўна беларускімі палітычнымі коламі, расцэньваўся як нелегітымны сродак далучэння часткі беларускіх зямель у склад польскай дзяржавы. Спалучалася з плебісцытарнай праблематыкай пытанне правядзення выбараў у мясцовыя органы кіравання (гарадскія і валасныя), якія фактычна з'яўляліся ніжэйшымі акупацыйнымі органамі кіравання Генеральнага камісарыята ўсходніх зямель. Выданні, акрамя простага інфармавання мясцовага насельніцтва аб ходзе выбараў, змяшчалі агульнае негатыўнае стаўленне да гэтай справы.



Агульная польская арыентацыя шматлікіх беларускіх палітычных прадстаўнікоў прымушалі рэдактараў газет звяртацца да праблематыкі польска-беларускай федэрацыі, прыводзіць усе за і супраць гэтага шляху вырашэння беларускага пытання. Агульныя настроі артыкулаў змяняюцца ад узнёслых выказванняў адносна ідэі федэрацыі, лозунгаў, абвешчаных Ю. Пілсудскім у «Адозве да жыхароў былога Вялікага княства Літоўскага» ад 22 красавіка 1919 г., да дастаткова скептычных настрояў, сітуацыі агульнага недаверу. У цеснай узаемасувязі з федэратыўнай праблематыкай знаходзілася пытанне арганізацыі беларускага нацыянальнага войска. Агульнае разуменне беларускіх палітычных колаў значнасці і важнасці гэтай праблемы паўставала праз афіцыйнае інфармаванне мясцовага насельніцтва аб факце арганізацыі беларускіх вайсковых адзінак, праз непасрэдныя заклікі ўступаць у войска, у агульнай ацэнцы ролі Беларускай вайсковай камісіі ў справе «незалежнасці і непадзельнасці» тэрыторыі Беларусі.

Перыядычныя выданні, якія групаваліся вакол Беларускай цэнтральнай рады Віленшчыны і Гродзеншчыны, фактычна не з'яўляліся афіцыйнымі друкаванымі органамі, прадстаўлены газетамі «Беларусь» (Гродна): выдавалася з 30.03.1919 г. па 18.05.1919 г.; «Незалежная думка» (Вільня) — з 8.06.1920 г. па 11.07.1920 г.; «Беларуская думка» (Вільня) — з 28.04.1919 г. па 27.07.1919 г., усяго выйшла 56 нумароў; «Бацькаўшчына» (Гродна) — з 15.03.1919 г. па 20.04.1919 г.; «Беларускія ведамасці» (Вільня) — 1921 г. Адзначаныя выданні прадстаўлялі цэнтрысцкую пазіцыю, не выказваючы падтрымкі ні польскаму, ні савецкаму боку. Праз артыкулы выданняў праступаюць шматлікія абвінавачванні ў «руйнаванні краю», незаконным далучэнні значнай часткі беларускіх зямель у склад Савецкай Расіі або Польшчы. Адзіным магчымым шляхам вырашэння беларускага пытання называецца незалежная беларуская рэспубліка, якая будзе ўключаць усе этнаграфічныя землі, плебісцыт разглядаецца выключна як шлях вырашэння спрэчных памежных пытанняў з суседнімі краінамі.

Другі комплекс — рускамоўныя выданні, якія выходзілі па-за межамі тэрыторыі Беларусі (эміграцкі перыядычны друк), — прадстаўлены газетамі «Сегодня», «Воля» (Рыга), «Новое Русское Слово», «Эхо», «Русь», «Голос России» (Берлін) — 1919—1922 гг. «Воля России» (Прага) — з 13.09.1920 г. у Нацыянальнай бібліятэцы захоўваюцца № 2—166 (акрамя 1, 4, 7, 44, 46, 48, 50, 52, 61, 103, 105, 155), выходзіла пад рэдакцыяй У. М. Занзінава, В. І. Лебедзева, А. С. Мінора, адстойвала інтарэсы дэмакратычнай федэратыўнай расійскай рэспублікі.

Беларуская праблематыка прадстае праз шматлікія вытрымкі з Беларускага прэс-бюро, якое падае стаўленне беларускага нацыянальнага руху да міжна-

родных падзей, да пытання мірнага вырашэння польска-савецкага канфлікту 1919—1921 гг. На старонках газеты вырашэнне беларускага пытання, як і іншых нацыянальных пытанняў, прапаноўвалася вырашыць шляхам поўнай рэалізацыі права на самавызначэнне, што фактычна ліквідавала любыя спрэчныя тэрытарыяльныя пытанні паміж бакамі. З гэтых пазіцый інтэрпрэтаваны Рыжскі мірны дагавор, як парушаючы тэрытарыяльную цэласнасць беларускіх зямель, фактычна незаконны. З лістапада 1920 г. беларускае пытанне знаходзіцца ў цеснай узаемазалежнасці з літоўскай (віленскай) праблематыкай. Узгадваецца мірны дагавор урада В. Ластоўскага з літоўскім урадам аб узаемасупрацоўніцтве і дапамозе; іх сумесная барацьба з войскамі Л. Жылігоўскага, непасрэдная зацікаўленнасць «віленскай праблемай» з боку Лігі Нацый, якая першапачаткова планавала ўвядзенне ваеннага кантынгенту, а пасля абмежавалася намерам арганізацыі плебісцыту («хатні плебісцыт») [1, с. 1—2].

Пытанне польска-савецкіх перагавораў 1919—1921 гг. прадстаўлена праз агляд мірных прапаноў Савецкай Расіі на барысаўскім этапе (снежань 1919 г. — чэрвень 1920 г.) шляхам канстатацыі факта накіравання дыпламатычных нот ад Народнага камісарыята замежных спраў РСФСР і выяўленнем пазіцыі Велікабрытаніі і Францыі да заключэння перамір'я (або міра) паміж Польшчай і РСФСР. Найбольш поўна прадстаўлены апошні этап перагавораў — мірная канферэнцыя ў Рызе (верасень 1920 г. — сакавік 1921 г.).

На старонках газеты «Воля России» прадстаўлена поўная, падрабязная карціна мірных перагавораў у Рызе. Пачынаючы з другога нумару (14.09.1920 г.) [2, с. 1, 5], адзначаецца магчымасць дасягнення кампрамісу паміж бакамі, жаданне Савецкай Расіі адмовіцца ад некаторых пастулатаў перыяду мінскіх перагавораў (жнівень—верасень 1920 г.), намер Польшчы часова адсунуць федэралістычны план вырашэння «ўсходняга пытання». Аўтарам газеты яшчэ да пачатку перагавораў станавілася зразумела, што магчымасць дасягнення мірнага паразумення паміж варожымі бакамі стане рэальнай толькі ў выпадку кампраміснага вырашэння спрэчных пытанняў, частковай або поўнай адмовы ад раней прытрымліваемых пазіцый (лінія 1772 г. і федэралістычная канцэпцыя, або лінія Керзана і ідэя рэалізацыі сусветнай пралетарскай рэвалюцыі). Непасрэднымі прычынамі жадання абодвух бакоў пайсці насустрач адзін аднаму, значна зменшыць свае патрабаванні, аўтары «Воли России» называюць значнае эканамічнае знясіленне Польшчы і Савецкай Расіі, і вострая неабходнасць савецкага боку весці ўзброеную барацьбу з войскамі П. М. Урангеля. Але адн000 адзначаецца наяўнасць палітычных сіл, якія прытрымліваліся ваенных шляхоў вырашэння спрэчных пытанняў. Інфармацыйныя паведамленні «Воля России» аб ходзе польска-савецкіх перагавораў верасня 1920 г. — сакавіка 1921 г. становяцца адметнай гістарычнай крыніцай, якая падае ў штодзённым фармаце звесткі аб агульным стане мірнага ўладкавання. Нягледзячы на значную колькасць паведамленняў аб ходзе перагаворнага працэсу, газета часта



змяшчае неправераную інфармацыю, напрыклад, аб наведванні Г. В. Чычэрына ці Я. Сапегі Рыгі падчас працы мірнай канферэнцыі.

На аснове паведамленняў замежных тэлеграфных агенцтваў, перыядычных выданняў «Воля России» падае стаўленне краін Антанты і ЗША адносна перагавораў у Рызе. Кіруючыя колы Велікабрытаніі выказваліся за хутчэйшае заключэнне мірнага дагавору паміж Польшчай і Савецкай Расіяй, ставілі ў прамую ўзаемазалежнасць свае гандлёвыя перагаворы з савецкім бокам і іх паспяховую рэалізацыю, нават, па версіі газеты, устанавілі дакладны тэрмін дасягнення прэлімінарнага мірнага дагавору, які супадаў з савецкім тэрмінам (да 5 кастрычніка 1920 г. на працягу 10 дзён). У адрозненне, кіраўніцтва Францыі настойвала на часовым зацягванні перагавораў, у выпадку падпісання дагавору паміж бакамі патрабавала пэўных ваенных гарантый ад савецкага боку, для забеспячэння знешняй бяспекі для войск П. М. Урангеля. Пазіцыя ЗША прыводзіцца ў пераказе ноты статс-сакратара Б. Кольбі на адрас Польшчы, у якой выказваюцца негатыўныя адносіны да мірнага дагавору паміж бакамі, калі ён парушае законныя інтарэсы зацікаўленых народаў былой Расійскай імперыі.

Пачынаючы з лістапада 1920 г. на старонках газеты з'яўляюцца дастаткова скептычныя звесткі аб недоўгачасовасці прэлімінарнага мірнага дагавору, аб агульных настроях абодвух бакоў, якія не ўспрымалі ўсур'ёз факт заключэння перамір'я. Ваенныя дзеянні атрадаў С. Булак-Балаховіча, Б. Савінкава, С. Пятлюры на ўкраінска-беларускім абшары пераводзіліся ў разрад схаванай барацьбы, пры непасрэднай маральнай і матэрыяльнай падтрымцы польскага боку. Фактычна другі этап польска-савецкіх перагавораў у Рызе зводзіцца на старонках «Воли России» да апісання ўзаемных абвінавачванняў бакоў у невыкананні прэлімінарнага дагавору і да працэсу па выпрацоўцы эканамічных умоў канчатковага трактату.

Трэці комплекс — перыядычныя рускамоўныя выданні савецкага кшталту — прадстаўлены выданнямі: «Савецкая Беларусь» — друкаваны орган Ваенна-рэвалюцыйнага камітэта БССР, выходзіў з 7.08.1920 г., з 8.09.1920 г. па снежань 1920 г. выдавалася пад новым найменнем «Известия ВРК БССР»; «Звезда», «Жизнь национальностей»: 9.11.1918 г. — 16.02.1922 г. (№ 33 ад 31.08.1919 г., № 10 ад 23.03.1919 г., № 22 ад 17.10.1921 г.) — друкаваны орган Нацыянальнага камісарыята нацыянальнасцей РСФСР.

«Звезда»: з 15.09 па 6.10.1917 г. — «Молот»; з 8.10 па 29.10.1917 г. «Буревестник» — як орган Паўночна-Заходняга абласнога камітэта РСДРП(б). З 1.11.1917 г. выдаецца пад першапачатковай назвай «Звезда». З пачатку сакавіка 1919 г. у Вільні — як орган ЦК КП(б) Літвы і Беларусі, а з мая па жнівень 1919 г. — зноў у Мінску. У час польскай акупацыі, з восені 1919 г., яна выдавалася ў Смаленску, а з 8 жніўня 1920 г. — у Мінску. У Нацыянальнай бібліятэцы захавалася з лютага па ліпень 1919 г. каля 40 нумароў газеты (выбарачна з № 360 па № 526). За 1920 г. — 78 нумароў (агульную колькасць нумароў, якія былі выдадзены ў гэты перыяд, выявіць не ўдалося). У залежнасці ад становіш-

ча ў краіне, месцазнаходжання змяняліся агульны сэнс, аб'ём і памеры (ад 4 да 16 старонак тэксту) газеты, змянялася і перыядычнасць выхаду (ад штодзённага выдання да выхаду адзін раз на тыдзень). Газета служыла не толькі ідэалагічным рупарам ЦК КП Літвы і Беларусі, але і з'яўлялася крыніцай неабходнай інфармацыі, своеасаблівым адлюстраваннем грамадска-палітычнага жыцця беларускіх земель.

Супярэчлівыя адносіны савецкага кіраўніцтва да беларускага пытання адлюстраваны ў артыкуле былога сакратара ЦК КП ЛіБ В. Кнорына ад 24 верасня 1919 г., у якім абгрунтоўвалася неабходнасць далучэння беларускіх земель да РСФСР, таму што «Беларусь як самастойная сацыялістычная рэспубліка страціла свой міжнародны і палітычны сэнс» [3, с. 2—4], тым самым падкрэсліваючы інтэрналістычную накіраванасць беларускага савецкага кіраўніцтва. Ва ўмовах супрацоўніцтва кіраўніцтва «беларускіх нацыяналістаў» (Беларускай Народнай Рэспублікі) з польскімі акупацыйнымі ўладамі існаванне пэўнага антыпода «контррэвалюцыйнай» формы дзяржаўнасці, гэта значыць беларускай савецкай рэспублікі, страчвае сваю неабходнасць. Але стаўленне савецкага кіраўніцтва адносна беларускага пытання ўвесь час карэкціравалася, у залежнасці ад становішча на акупіраваных беларускіх землях, адносін польскіх урадавых колаў да беларускага пытання. Намер польскіх улад арганізаваць плебісцыт на акупіраваных беларускіх землях падштурхнуў да пастаноўкі беларускага пытання ў якасці самастойнага. Шматлікія пратэсты супраць яго правядзення выказваліся на старонках газеты «Звезда», таму што плебісцыт будзе ўспрымацца «як фальсіфікацыя меркаванняў народа, галасаванне пад прымусам іншаземных войскаў» [4, с. 6].

Са старонак газеты «Звезда», як друкаванага органа камуністычнай партыі, чытач атрымліваў праз адпаведныя рубрыкі і артыкулы звесткі аб становішчы ў свеце, падзеях на франтах грамадзянскай вайны, аб унутранай сітуацыі ў Савецкай Расіі; знаёміўся з афіцыйнымі загадамі і распараджэннямі савецкага кіраўніцтва. Асноўны змест газеты быў вызначаны на пасяджэнні ЦК КП ЛіБ 13 лістапада 1919 г.: «Звезда» павінна была выдавацца выключна для акупіраваных тэрыторый, пры гэтым звяртаючы пільную ўвагу на становішча ў Савецкай Расіі, пытанні аграрнай палітыкі, такім чынам выклікаць у масах імкненне да звяржэння буржуазнага ладу» [5, с. 8].

Акрамя інтэрпрэтацыі непасрэдных ваенных дзеянняў, газета «Звезда» звяртае ўвагу чытача на праблему польска-савецкага мірнага ўрэгулявання. Пачынаючы з 11 мая 1919 г. і на працягу ўсяго месяца [6, с. 3], абмяркоўвалася пытанне абмену паміж бакамі заложнікаў, бежанцаў, ваеннапалонных і усталяванні добрасуседскіх адносін. Менавіта на гэты перыяд прыпадае «спецыяльная» місія А. І. Вянцкоўскага, вядомага польскага сацыяліста, прадстаўніка Міністэрства замежных спраў Польшчы. Накіраванне «спецыяльнай» місіі А. І. Вянцкоўскага ў Маскву адбылося для вырашэння справы місіі Расійскага таварыства Чырвонага Крыжа. Напярэдадні (у пачатку студзеня 1919 г.) адбылося забойства членаў Расійскага таварыства Чырвонага Крыжа на тэрыторыі Высока-Мазавецкага павета, што прывяло да інтэрніравання РСФСР членаў дэлегацыі Рэгенскага Савета і Камісіі па справах ваеннапалонных*. Міністэрства замежных спраў Польшчы прадпісвала Вянцкоўскаму «ўступіць у адносіны з савецкім урадам адносна розных пытанняў, узнятых апошнім, якія знаходзяцца ў інтарэсах абодвух урадаў і якія патрэбна ў хуткім часе вырашыць» [7, с. 68—70]. Савецкае кіраўніцтва напярэдадні перагавораў мела надзеі вырашыць мірным шляхам усе спрэчныя пытанні паміж бакамі, у тым ліку і «тэрытарыяльныя спрэчкі» з урадамі савецкіх рэспублік Літвы і Беларусі, «да якіх мы маем намер звярнуцца з прапановай нашых паслуг з мэтай дапамагчы вырашэнню гэтых пытанняў» [8, с. 129—130] і стварэння змешанай камісіі з прадстаўнікоў Літвы, Беларусі і Польшчы [9, с. 76]. Але гэтыя разлікі не былі рэалізаваны.



«Спецыяльная» місія А. І. Вянцкоўскага прыбыла ў пачатку сакавіка 1919 г. у Маскву і прадставіла ўраду РСФСР матэрыялы следчай камісіі па расследванні справы забойства членаў Расійскага таварыства Чырвонага Крыжа. Пасля азнаямлення з прадстаўленымі дакументамі савецкае кіраўніцтва вызваліла частку інтэрніраваных асоб, была створана змешаная польска-савецкая камісія па вырашэнні справы заложнікаў, у склад якой уваходзіла па тры прадстаўнікі ад кожнага боку. Прапановы аб пачатку перагавораў па тэрытарыяльных пытаннях, а таксама прыняцце ўмовы аб правядзенні плебісцыту на тэрыторыі Літвы і Беларусі засталіся без адказу. Адносна прапаноў савецкага кіраўніцтва М. Касакоўскі, старшыня прадстаўніцтва Генеральнага камісарыята ўсходніх земель у Варшаве, у сваіх успамінах адзначаў, што прыняцце рашэння аб плебісцыце з'яўлялася б вельмі рызыкоўнай справай, па прычыне правядзення на «ўсходніх» землях моцнай агітацыйнай працы бальшавікоў» [10, s. 114—115]. Польскі ўрад, які не разглядаў магчымасць дасягнення паразумення дыпламатычным шляхам, заявіў, што «паўнамоцтвы Вянцкоўскага абмяжоўваюцца толькі вызваленнем заложнікаў» [11, с. 7].

Працяглы час, з 29 студзеня па 11 сакавіка 1919 г., на старонках выдання разглядалася пытанне ўдзелу савецкіх прадстаўнікоў на канферэнцыі на Прынцавых астравах. Непасрэднай прычынай стаў зварот Савета дзесяці Парыжскай мірнай канферэнцыі 22 студзеня 1919 г., у якім змяшчалася запрашэнне «ўсім арганізаваным групам, якія ажыццяўляюць або спрабуюць ажыццяўляць палітычную ўладу і ваенны кантроль дзе-небудзь у Сібіры або ў межах Еўрапейскай Расіі» прыняць удзел у сустрэчы з прадстаўнікамі краін Антанты і ЗША пры ўмове спынення ваенных дзеянняў як на тэрыторыі Расіі, так і па-за яе межамі [12, с. 88]. На зварот далі станоўчы адказ прадстаўнікі РСФСР, УССР. Тэрмінова да вырашэння справы прыступілі і прадстаўнікі ЛітБел ССР. Так, на

* Рэгенскі Савет быў створаны 12 верасня 1917 г. пры непасрэднай падтрымцы сіл Германіі і Аўстра-Венгрыі. У верасні 1918 г. пад яго эгідай была накіравана спецыяльная дэлегацыя з членаў Рэгенскага Савета для вядзення перагавораў з кіраўніцтвам РСФСР для вырашэння справы ваеннапалонных.

пасяджэнні ЦВК ЛітБел ССР 26 лютага 1919 г. была прынята дэкларацыя, якая даручала ўраду «тэрмінова ўстанавіць сувязь з Антантай па пытанні мірных перагавораў на Прынцавых астравах і прыняць самыя рашучыя меры па абароне Савецкай Рэспублікі Літвы і Беларусі» [13, с. 2]. Ужо 1 сакавіка 1919 г. была накіравана спецыяльная нота да краін Антанты з выказваннем сваёй гатоўнасці пачаць мірныя перагаворы «ў імя спынення брацкага кровапраліцця, у імя ўсталявання міру ў нашай змучанай краіне» [14, с. 1]. Прадстаўнікі Рады Міністраў Беларускай Народнай Рэспублікі (БНР) пакінулі зварот Савета дзесяці без адказу, магчыма сказвалася слабая інфармаванасць аб становішчы спраў на Парыжскай мірнай канферэнцыі. Таму што адзіным накіраваным зваротам перыяду студзеня—сакавіка 1919 г. да Парыжскай мірнай канферэнцыі ад урада БНР з'яўляўся «Мемарыял Беларускага Ураду старшыні мірнай канферэнцыі ў Парыжы» ад 22 студзеня 1919 г., у якім змяшчалася просьба аб допуску беларускай дэлегацыі для ўдзелу ў канферэнцыі [15, с. 321—327]. Справа з скліканнем канферэнцыі на Прынцавых астравах засталася не вырашанай, таму што прадстаўнікі Расійскай палітычнай нарады не прынялі прапановы Савета дзесяці, «не жадаючы садзіцца за адзін стол перагавораў з бальшавікамі» [16, с. 245].

Газетай «Звезда» вельмі падрабязна была разгледжана справа аб ўдзеле савецкіх прадстаўнікоў у адзначанай канферэнцыі. Першы ўспамін аб звароце Савета дзесяці заўважаецца ў нумары ад 29 студзеня 1919 г., дзе на першай старонцы быў змешчаны артыкул «Зварот «саюзных» імперыялістаў». Прапанова прыняць удзел у перагаворах была ўспрынята савецкім кіраўніцтвам дастаткова пазітыўна: «як ускоснае прызнанне савецкай улады краінамі Антанты і ЗША і як першы крок да нармалізацыі ўзаемаадносін» [17, с. 1]. Узгадваецца аб прыняцці дадзенай прапановы, але «не для таго, каб ажыццявіць мір для больш зручнай эксплуатацыі буржуазіі, а для таго, каб мір стаў шчасцем у руках пралетарыята». 1 лютага 1919 г. артыкул «Міратворцы» пад аўтарствам Б. Белагорскага дае сваю інтэрпрэтацыю звароту Савета дзесяці, «як спробу своеасаблівай разведкі адносна пазіцыі Савецкай Расіі да краін Антанты і ЗША, як зварот поўны туманных абяцанняў, няясных патрабаванняў» [18, с. 1]. Сапраўды, сам факт прапановы Парыжскай мірнай канферэнцыі да «ўсіх арганізаваных груп» можна ўспрымаць дваяка, як прапанову аб пачатку перагавораў, так і пэўны стратэгічны разлік «саюзных» краін, якія імкнуліся такім чынам дыскрэдытаваць Савецкую Расію ў вачах грамадскасці, і ў выпадку адхілення ёю гэтай прапановы, мець дастаткова добрае абгрунтаванне замежнай інтэрвенцыі.

Аднак надзеі на арганізацыю канферэнцыі на Прынцавых астравах не спраўдзіліся, аб чым і паведамлялася ў газеце 14 лютага 1919 г. [19, с. 2]. Пасля толькі выказваліся разлікі на новыя прапановы «саюзных» краін для пачатку мірных перагавораў з мэтай спынення грамадзянскай вайны, выказаныя ў нумары ад 4 сакавіка 1919 г. [20, с. 2], не былі нічым канкрэтным падмацаваны, прыводзіліся як пэўныя згадкі.



Перыядычны друк трох вышэйзгаданых комплексаў прадстаўляе своеасаблівую карціну падзей, якая складваецца з вытрымак з розных тэлеграфных агенцтваў і замежных перыядычных выданняў. Тры варыянты вырашэння беларускага пытання, прадстаўленыя ў рамках вылучаных комплексаў перыядычных выданняў, з'яўляюцца ўзаемавыключнымі: прапаноўваюць або шлях стварэння самастойнай беларускай рэспублікі, або плебісцытарны шлях, або варыянт стварэння польска-беларускай федэрацыі, або аўтаномнай часткі ў складзе дэмакратычнай федэратыўнай расійскай рэспублікі. Перыядычныя выданні часцей выконвалі не толькі інфарматыўную функцыю, але часцей з'яўляліся арэнай распаўсюджвання і прапаганды пэўных ідэалагічных схем, адлюстраваннем пазіцыі палітычных і грамадскіх колаў. Увага да асноўнага ходу польска-савецкіх перагавораў 1919—1921 гг. звяртаецца выключна толькі на этапах афіцыйных міжнародных сустрэч паміж бакамі (барысаўскі, мінскі, рыжскі), не закранаючы іх неафіцыйны фармат і працэс натавання.

Літаратура і крыніцы

1. Воля Росии — № 96. — 1921.
2. Воля России. — № 2. — 1920.
3. Звезда. — 1919. — № 512.
4. Звезда. — 1919. — № 523.
5. Звезда. — 1919. — № 519.
6. Звезда. — 1919. — № 434.
7. Нота министра иностранных дел Польши от 7 февраля 1919 г. // Документы внешней политики СССР: в 24 т. — Т. 2: 1 января 1919 г. — 30 июня 1920 г. / ред. коллегия Г. К. Деева [и др.]. — М., 1958. — 803 с.
8. Черных, М. М. Юлиан Мархлевский о советско-польских отношениях в 1918—1921 гг. / М. М. Черных. — М.: ИСБ, 1990. — 229 с.
9. Документы внешней политики СССР: в 24 т. — Т. 2: 1 января 1919 г. — 30 июня 1920 г. / ред. коллегия Г. К. Деева [и др.]. — М., 1958. — 803 с.
10. Tajne rokowania polsko-radzieckie w 1919 r. / zebrała i oprac. W. Gostyńska. — Warszawa: Państwowe Wydawnictwo Naukowe, 1986. — 414 s.
11. Польско-советская война 1919—1920 гг. (ранее не опубликованные документы и материалы): в 2 ч. / И. И. Костюшко. — М.: ИСБ РАН, 1994. — Ч. 1: 15 января 1919 — 19 августа 1920 г. / И. И. Костюшко. — 1994. — 215 с.
12. Штейн, Б. Е. «Русский вопрос» на Парижской мирной конференции (1919—1920 гг.) / Б. Е. Штейн. — М.: Госполитиздат, 1949. — 464 с.
13. Звезда. — 1919. — № 388 (4 сакавіка).
14. Звезда. — 1919. — № 392 (8 сакавіка).
15. Архівы Беларускай Народнай Рэспублікі: у 2 кн.: Кн. 1: 1917—1920 гг. / склад. С. Шупа. — Вільня; Нью-Ёрк; Менск; Прага, 1998. — 803 с.
16. Сазонов, С. Д. Воспоминания / С. Д. Сазонов. — Минск: «Харвест», 2002. — 368 с.
17. Звезда. — № 358. — 1919.
18. Звезда. — № 362. — 1919.
19. Звезда. — № 373. — 1919.

20. Звезда. — № 388. — 1919.

*Артыкул паступіў у рэдакцыю 27.05.2013*



***А. Э. Фірыновіч,***
*навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі,*
*кандыдат гістарычных навук;*
e-mail: firinowicz@rambler.ru

## ПАДЗЕІ 1863—1864 гг. У ЖАНОЧАЙ МЕМУАРНАЙ І ЭПІСТАЛЯРНАЙ СПАДЧЫНЕ

Жыццё, як рака, не стаіць на месцы. Хутка бягуць дні, пакаленне змяняецца пакаленнем, непрыкметна сціраюцца з памяці падзеі. І нават тое, што было ўчора, маментальна становіцца нашым мінулым, гісторыяй. А вывучэнне мінуўшчыны, як вядома, пачынаецца з дакумента (крыніцы) — неад'емнага звяна гістарычнай рэканструкцыі, якое праз стагоддзі злучае даследчыка і існаваўшую рэчаіснасць. На сучасным этапе пад «гістарычнай крыніцай» разумеюцца акты заканадаўства, справаводства, кіруючая, праектная, канструктарская, тэхналагічная, картаграфічная і другая спецыяльная дакументацыя, кіна- і фотадакументы, мікрафільмы, гуказапісы, навуковыя, літаратурныя, мастацкія, музычныя і другія рукапісы, малюнкі, дзённікі і мемуары [8], іншымі словамі — любы матэрыяльны аб'ект, што нясе інфармацыю пра былое: ад пісьмовага дакумента да твораў мастацтва і прамысловых вырабаў [6]. Праўда, не ўсім адзначаным відам дакументаў удалося заняць заслужанае месца ў навуковых даследаваннях. Так склалася, што гісторыкі надалі прыярытэтную роль і звыкліся карыстацца пераважна заканадаўчымі матэрыяламі, дакументацыяй афіцыйнага справаводства, статыстыкай. Дакументы ж асабістага паходжання (эга-дакументы) не засталіся ў забыцці, але адышлі на другасныя пазіцыі і сталі проста ілюстратыўнай базай. Вылучаная група крыніц — гэта «зборнае найменне сукупнасці пісьмовых сведчанняў, створаных у прыватным парадку з мэтай самавыяўлення, самапазнання, самасцвярджэння асобы аўтара» [2, с. 394]. Вось гэтае «сама» і вызначыла іх галоўны недахоп — вялікую долю суб'ектывізму зафіксаванай інфармацыі, якая выражаецца ў яе не дакументальным, а апавядальным (інтэрпрэтацыйным) характары, што падаецца скрозь прызму аўтарскіх інтарэсаў і адчуванняў.

Аднак любая крыніца ў постмадэрнісцкім разуменні не можа ўспрымацца абсалютна аб'ектыўнай, бо яна ёсць прадукт мэтанакіраванай чалавечай дзейнасці, феномен пэўнай культуры, які ўзнікае ў прасторы канкрэтнай гістарычнай рэчаіснасці (палітычнай, прававой, сацыяльнай, культурнай, канфесійнай і г. д.) [9]. Таму штамп сацыяльнага і палітычнага заказу, мэтавай устаноўкі і ўмоў стварэння крыніцы не з'яўляецца вызначальным толькі для дакументаў асабістага паходжання. Проста ступень іх суб'ектывізму ярчэй выражана. Справа ў тым, што іншымі мемуары, успаміны, дзённікі, асабістыя лісты быць не могуць. Іх суб'ектыўнасць ёсць аб'ектыўна ўласцівая ім якасць. Гэта не толькі абыякавая фіксацыя падзей мінулага, але і роздумы, меркаванні, ўражанні, эмоцыі асобы, якія непазбежна нясуць на сабе адбітак свайго часу, а тым самым глыбей раскрываюць тагачасныя рэаліі, іх атмасферу, дапаўняюць фактагогію

прыватнасцямі, без чаго немагчыма стварыць паўнавартасную карціну даследуемай з'явы. Шчырасць, паўната, дакладнасць звестак залежаць ад той эпохі, у якую яны пісаліся і публікаваліся. Немалаважнае значэнне мае і аб'ект апавядання. Зразумела, асоба аўтара, яго жыццёвыя пазіцыі, палітычныя погляды і сімпатыі, сацыяльны статус, роль у фіксуемых падзеях, дасведчанасць аб іх, чыста індывідуальны склад розуму і характару значна ўплываюць на адбор фактаў і іх інтэрпрэтацыю. З другога боку, нязвязанасць з фармальнымі канонамі дазваляе аўтару падаць звесткі, якія звычайна не змяшчаюцца ў цэлых фаліянтах афіцыйных дакументаў з іх сухімі і строга фіксаванымі рамкамі. Відавочна, без крытычнага падыходу тут не абысціся, як, у прынцыпе, і пры аналізе кожнага з відаў гістарычных крыніц. Абавязковымі ўмовамі навуковай верыфікацыі мемуарнай і эпісталярнай спадчыны з'яўляюцца вызначэнне асобы аўтара, пабуджальных матываў стварэння крыніцы, месца і часу напісання, формы выкладання матэрыялу (літаратурная, публіцыстычная, дзелавая проза і г. д.) і супастаўленне звестак з розных інфармацыйных носьбітаў [7].

Комплекс дакументаў асабістага паходжання па гісторыі паўстання 1863—1864 гг. прадстаўлены пераважна польскамоўнымі і рускамоўнымі дзённікамі, успамінамі відавочцаў. Пры колькасным параўнанні заўважаецца іх некаторая перавага ў польскай гістарычнай літаратуры. Яны напісаны ў традыцыі рэчпаспалітаўскага патрыятызму, характэрнага для другой паловы 60-х гг. XIX — пачатку XX ст., ахопліваючы геаграфію падзей на польскай, украінскай тэрыторыі і ў беларуска-літоўскіх губернях [17].

Рускамоўная мемуарыстыка апублікавана пераважна ў другой палове 1860-х гг. вядомымі тагачаснымі палітыкамі, публіцыстамі і прадстаўнікамі ўрадавых колаў. Канцэптуальна ўсе творы адпавядаюць вялікадзяржаўнай ідэі аб справядлівай абароне інтарэсаў Расійскай імперыі ў «Паўночна-Заходнім краі». Канцэнтрацыя фактаў аб падзеях у беларуска-літоўскіх губернях, якія пададзены праз агульнакраёвую прызму, нязначная [3; 5; 10; 14].

Непасрэдна 1863—1864 гг. на Беларусі прысвечаны ўспаміны Гэлены Скірмунт — мастачкі, скульптаркі з Піншчыны. Упершыню фрагменты яе дзённіка былі апублікаваны Баніславам Залескім на польскай мове ў 1876 г. у Гданьску, а ў 2009 г. быў зроблены іх беларускі пераклад [4].

У рускамоўных і польскамоўных дакументах асабістага паходжання акрамя ідэйна-зместавых асаблівасцей назіраюцца значныя відавыя адрозненні твораў. У польскамоўнай групе пераважаюць дзённікі-хронікі, дзе падзеі апісваюцца дзень за днём, галоўная ўвага засяроджана на фактах з невялікім аб'ёмам асабістых разважанняў. Рускамоўныя творы прадстаўлены ўспамінамі і дзённікамі-разважаннямі. У іх цэнтральнае месца займаюць ацэнка і аналіз згаданых падзей. У першую чаргу гэта абумоўлена асобай аўтара, што адлюстроўвае іх большую ці меншую ступень суб'ектывізму і абгрунтоўвае неабходнасць скрупулёзнага навуковага падыходу пры выкарыстанні такіх дакументаў і дэталёвай верыфікацыі іх факталагічнага матэрыялу.



Калі звярнуцца да гендэрнага аспекту ў характарыстыцы дакументаў асабістага паходжання па гісторыі паўстання 1863—1864 гг., то з упэўненасцю можна казаць, што ў гэтым накірунку жанчыны пакінулі істотную спадчыну. Зыходзячы з псіхалагічных асаблівасцей, жаночыя ўспаміны адрозніваюцца ад мужчынскіх большай яркасцю, эмацыянальнасцю, напоўненасцю рознымі фактагалічнымі дробязямі. Ім уласцівы амаль аднолькавы набор сюжэтных ліній, што ўказвае на аб'ектыўную наяўнасць «жаночага фактару» ў падзеях 1863—1864 гг. Пэўная стандартызацыя сітуацыйных аповедаў дае магчымасць высветліць распаўсюджанасць, заканамернасць гэтай з'явы і яе састаўляючых (ступень удзелу, функцыі і месца жанчын у рэаліях 60-х гг. XIX ст.).

Так, цэнтральнае месца сведчанняў займаюць падзеі маніфестацыйнага перыяду — касцёльныя спевы, жалобныя літургіі, вулічныя дэмаршы. Гэлена Скірмунт апісвае іх наступным чынам: «Амаль у кожнай ваколіцы знаходзіўся хтосьці з тых, хто ставіўся да таго, што адбывалася, больш аддана, узнёсла, браў на сябе ініцыятыву і выдатна арганізоўваў маніфестацыі. Штораз да іх гарнулася ўсё большае кола людзей. У другой палове ліпеня масава сабраліся ва ўзгаданым ужо намі Асовай, каб увесці на набажэнстве гімн «Boże, coś Polskę». Пасля літургіі адразу ж голасна і з запалам выступае самае меншае дваццаць асоб, з якіх шмат хто за шэсць міляў прыехаў. С. задае тон вельмі добра і я падтрымліваю наколькі хапае сіл. Ад запалу і радасці, якія з'яўляюцца ад усведамлення, што гэта мы паклалі пачатак, доўга яшчэ гамонім на магілках» [4, с. 123]. Аўтар вельмі ўзнёсла распавядае пра падобныя спевы неаднаразова, згадвае канкрэтную дату, месца, колькасць удзельнікаў (31 ліпеня ў Пінску каля паўсотні чалавек, у жніўні ў Дарашэвічах і г. д.). Жанчына падкрэслівае і іх размах: «… набажэнствы з духам патрыятызму множыліся адзін за другім, то за віленскіх замардаваных, то з нагоды Гарадзенскай уніі, то зноў жа за душу арцыбіскупа Фіялкоўскага» [4, с. 127].

Акрамя патрыятычных спеваў Г. Скірмунт згадвае і пра іншыя спосабы антыўрадавых маніфестацый у Пінску. У прыватнасці, пра з'яўленне 24 кастрычніка 1861 г. крыжа перад касцёлам францысканцаў з нацыянальнымі эмблемамі і выявамі Ядвігі з Ягайлам. Дарэчы, адзначаны выпадак пацвярджаюць і архіўныя матэрыялы, якія ўдакладняюць інфармацыю, прадстаўленую Г. Скірмунт, бо яна пазбягае падрабязнасцей. У рапарце ваеннага начальніка горада паведамлялася, што ў ноч з 23 на 24 кастрычніка 1861 г. перад дзвярамі касцёла ля выявы Хрыста Збаўцы быў пастаўлены чорны з белымі абводамі крыж. Пасярэдзіне ўтрымліваўся надпіс вялікімі літарамі на польскай мове «сумленне Варшавы 27 жніўня». Хутчэй за ўсё гэтым узгадваліся жнівеньскія падзеі 1831 г., калі рускія войскі 25 жніўня занялі Волю — прадмесце Варшавы, а 27 верасня польскае войска на чале з генералам Я. Крукавецкім капітуліравала і паўстанне 1830—1831 гг. было падаўлена, што ўскладвалася на сумленне галоўнага ворага. На правым баку крыжа — абраз Маці Божай Вострабрамскай, а пад ёй, як сімвал будучай перамогі, намаляваны аднагаловы арол, які едзе кон-

на. З левага боку змяшчаўся партрэт караля Ягайлы і каралевы Ядвігі, польскі герб з подпісам «памяці першага яднання Польшчы з Літвой» — напамін дынастычнага саюзу ВКЛ і Польшчы — Крэўскай уніі 14 жніўня 1385 г. Знізу перакрыжавання пад словамі «сумленне Вільны 23 студзеня» знаходзілася эмблема — сэрца, крыж, якар, што нагадвала аб канвенцыі другога падзелу Рэчы Паспалітай 23 студзеня 1793 г., па ўмовах якой да Расіі адыходзілі Правабярэжная Украіна, частка Полацкага, Віцебскага, Мінскага, Навагрудскага, Брэсцкага і Віленскага ваяводстваў да лініі Дынабург (Дзвінск) — Пінск [11, арк. 1—1 адв.].

Традыцыя ўсталявання крыжоў абапал дарог, у прыватных і касцёльных дварах існавала ў народзе здаўна. Калі ў доме панавала няшчасце, моцная хвароба ці смерць члена сям'і, разбурэнні ад прыродных катаклізмаў, крыж служыў сімвалам ухвалы Бога і просьбы аб уратаванні. Таму такі спосаб выказвання патрыятычных ідэй быў даволі пашыраным на тэрыторыі беларуска-літоўскіх зямель, што выклікала адпаведную рэакцыю з боку дзяржавы. Цыркулярам Галоўнага начальніка края ад 8 жніўня з дапаўненнямі ад 19 верасня 1864 г. забаранялася ўсталяванне святых выяў на палях, дарогах [11, арк. 7].

З архіўных дакументаў вынікае, што днём 24 кастрычніка, у адзначаным касцёле ў Пінску прайшло жалобнае набажэнства, на якім прысутнічала даволі шмат памешчыкаў, дваран і мяшчан. Пасля малітвы большая частка народа ўкленчыла перад крыжам і праспявала забаронены гімн «Яшчэ Польшча не загінула» [11, арк. 2].

Не менш арганічна адлюстравала карціну маніфестацыйных падзей на Украіне (Крэмянец—Львоў—Кіеў) у сваім дзённіку 13-гадовая Марыйка Бахавітынь-Казярацкая. Яна пісала: «1 жніўня 1861 г., калі прыходзім на набажэнства, то бачым — касцёл закрыты і стаіць паліцыя, усе кленчаць на двары, молімся з плачам і спяваем «Божа яшчэ Польшча» і «З дымам пажараў». Паліцыя нічога не можа зрабіць. Калі заходзілі з маці ў касцёл, нас затрымаў паліцэйскі і пачаў крычаць за жалобнае адзенне; дарэмна маці яму тлумачыла, што гэта звычайнае адзенне, нас вялі праз пару вуліц, а знаёмыя габрэі выбягалі паглядзець, што з намі зробяць, думалі, што павесяць. Але адпусцілі, бо спраўнік успомніў, што тата шмат вылячыў людзей ад розных хваробаў. Аднак пані Схалінскую з дачкамі арыштавалі і павезлі да Дубна. Цяпер пані нашываюць каляровыя паскі на чорныя сукенкі (каб зналі, што гэта пад прымусам), носяць хустачкі з чорнымі каляровымі паскамі, завязваюць іх пад бараду. Так, як бы маскарад, наперакор Маскалям… На месцы смерці першых 5 мучанікаў* кожную ноч з'яўляюцца свежыя кветкі, цяпер там вартуе салдат, а варшаўцы смяюцца, што маскаль ганарова трымае варту на магіле польскага безабароннага. Хлопцы ў Варшаве пільнуюць забаў і б'юць вокны, калі чуюць балёвую музыку. А паненак і паноў у каляровым адзенні абліваюць чарніламі ці смалой» [20, с. 52—54].

* Аўтарам згадваюцца пяць маніфестантаў, застрэленых у Варшаве 27 лютага 1861 г.



Удакладняе ролю жанчыны ў патрыятычных набажэнствах фрагмент з дзённіка Соф'і Рамановіч, з якога вынікае, што акрамя «запявалаў» яны выконвалі функцыю «зборшчыкаў касы» (матэрыяльных сродкаў на карысць паўстання): «Я хадзіла з падносам; думала, што нічога не збяру, бо цяпер кожны, хто колькі можа аддае там, а значнай часткі моладзі ўжо няма — аднак сабрала 7 злотых, як ніколі. Замест звыклага «Божа заплаці» казала маладым «Бог з вамі!» [19, с. 7].

Бывала, што касцёльныя патрыятычныя акцыі суправаджаліся сцэнічнымі набажэнствамі, маленькімі спектаклямі, прымеркаванымі да гадавін найважнейшых падзей у гісторыі Рэчы Паспалітай. Аб тым, як яны выглядалі, піша ў сваім лісце да сяброўкі нейкая Альдона, якая з'яўлялася арганізатарам урачыстасцей па ўшанаванні дня падпісання Люблінскай уніі: «…Абход пачнецца або скончыцца набажэнствам. Калі асабіста сабраная публіка будзе ўжо ў касцёле, выйду я ў ролі Айчыны і ўкленчу перад алтаром. Касцюм (строй) ужо выдумала, сапраўды ўрачысты, слухай: чорная сукенка, фальбон — вельмі доўгі і свабодны, кроем нагадвае незавязаную кашулю Лілії Венеды, абвязаны ў сцёгнах чырвоным паскам, сімвалізуючым мучэнні. На галаве вялікі белы вэлюм аж да зямлі, распушчаныя валасы і цярновая карона (дай параду мне, ці з сапраўдных церняў, ці са зробленых), рукі, акутыя ў ланцугі, а калі напрыканцы набажэнства пачнуць спяваць гімн, устану, выпраўлю рукі, сарву ланцугі (будуць падпіленыя) і выйду… Добра было б, каб набажэнства было жалобнае. Я хацела б ляжаць на катафалцы і ў патрэбную хвіліну падняцца (да ўваскрасення, натуральна, думала ўбрацца ў белае), але ксёндз Фульгенціуш забараніў, бо касцёльныя правілы не дазваляюць, каб жывая асоба падчас набажэнства ляжала ў труне. Што за глупства! Што за цемната каталіцкага Касцёла. А Карлу V можна было! Прывілей! Заўсёды прывілей…» [18, с. 97]. Далей аўтар просіць парад у сяброўкі наконт упрыгожвання касцюма: «…што зрабіць з гербамі, якія павінна мець на сукенцы… Усіх трох змясціць спераду не атрымліваецца, а калі змяшчу Анёла на спіне, то смяротна пакрыўджу Русінаў, і слушна. Хузаравічава параіла Арла (сімвал Рэчы Паспалітай — *А. Ф.*) пасадзіць на галаву, а Пагоню (сімвал ВКЛ — *А. Ф.*) і Анёла (сімвал украінскіх зямель — *А. Ф.*) на плечы. Арыгінальна, але цяжка. Заканчваю, усіх трох — Арла, Рыцара і Анёла — змяшчу спераду, але калі ў цябе ўзнікне іншая думка, то падзяліся са мной, бо гутарка ідзе не пра мяне, а пра айчыну» [18, с. 98]. З дакумента яскрава бачна, што касцёльныя маніфестацыі ўзнікалі не хаатычна, а ў выніку спланаванай, прадуманай, палітычна арыентаванай дзейнасці.

Пра хуткае спыненне масавых спеваў, жалобных шэсцяў сведчаць усе тры аўтары, а прычынай называюць жорсткую палітыку ўлад, якая праявілася не толькі ў арыштах і грашовых спагнаннях, але і ў ганебным зняважанні каталіцкай веры: «Па дарогах валяць крыжы і статуі, кажучы, што гэта польскі Бог і яму нявольна жыць на «зямлі рускай» [20, с. 60]. Праўда, імі дакладна адзначана, што ад гэтага «патрыятычны рух» не спыніўся, а набыў іншы характар, які пра-

явіўся ў канспірацыйнай дзейнасці агітацыйна-асветніцкага напрамку [4, с. 130]. Жанчыны ў ёй таксама прымалі ўдзел. Г. Скірмунт успамінае, што сама перапісвала дзве варшаўскія пракламацыі аб святкаванні першай і другой уніі (1385 г., 1569 г.), моцна скардзячыся на іх велізарны недахоп: «карысць ад усялякіх падобных народных заклікаў будзе тады, калі яны перастануць пісацца мовай геніяў, у стылі Цэзара ці Напалеона» [20, с. 127]. А пасля спрабавала ўстанавіць добрыя адносіны з сялянамі, падарыла іх школе падручнікі і нават сама навучала дзяцей чытанню, бо, па сведчаннях М. Бахавітынь-Казерадскай, было распаўсюджана сцвярджэнне, што «замест паўстання, якое не можа ўдацца, трэба працаваць па-ціху: па школах, вёсках несці асвету, т. зв. праца арганічна» [20, с. 47]. Напэўна таму яна была актыўнай удзельніцай маладзёжных патрыятычна-асветніцкіх вечарын, якія збіраліся ў яе доме, распаўсюджвала «Залатую грамату», дзе Польшча абяцала вольнасць і зямлю тым, хто пойдзе бараніць край і дапаможа знайсці незалежнасць [20, с. 108].

У гэтай жа сферы дзейнічала і С. Рамановіч. У дзённіку зафіксаваны эпізод, калі яна развіталася з чытачамі сваёй нядзельнай чытальні, давала ім асвенчаныя крыжыкі і блаславіла [19, с. 8].

Зразумела, такую сітуацыю пакінуць без умяшальніцтва ўлады не маглі. Тым больш што моцны антыўрадавы настрой сярод жаночай часткі насельніцтва быў заўважаны імі задоўга да пачатку 1860-х гг., асабліва ў беларуска-літоўскіх губернях: «В Западных губерниях число женщин, недоброжелательствующих правительству, несравненно превышает число мужчин вредного образа мыслей, и дух свободы и непокорности развит в женщинах сильнее, нежели в мужчинах» [13, с. 355]. 1860-я гг. гэтае меркаванне яшчэ больш падмацавалі. Нездарма прадпісанне віленскага генерал-губернатара ад 12 верасня 1863 г. засяроджвала ўвагу на маральным абавязку апякунак паўстанцкіх арганізацый: «Каждая опекунша заведывает женским полом, порученного ей округа, кроме заботливости о раненых, **нравственно действует** (вылучана аўтарам. — *А. Ф.*) на женщин и детей» [1, арк. 1]. У выніку, сродкам барацьбы з жаночым уплывам, па словах М. Бахавітынь-Казерадскай, сталі традыцыйныя штодзённыяператрусы дамоў, асабліва ў асоб, за якімі вялося назіранне. Пад кантроль трапляла прыватная перапіска. Забіралася ўся хатняя літаратура, лісты ад родных і блізкіх. Любое выказванне магло стаць падазроным, і даказаць яго бязвінны сэнс было немагчыма [20, с. 114].

Хроніка падзей і іх інфармацыйная напаўняльнасць змяняюцца з пачаткам паўстання. Фіксацыя звестак адбываецца радзей і губляецца яе перыядычнасць. Відавочна, тут мала змяшчаецца фактаў аб ваенных сутычках, але яскрава падкрэсліваюцца шляхі заангажаванасці жанчын у справе, удзел у якой, здавалася б, у сілу іх жаноцкасці, не з'яўляўся вострай неабходнасцю. Вышэйадзначанае пацвярджаюць і словы Г. Скірмунт: «У Літве не было такой разгалінаванай, як у Каралеўстве, арганізацыі паўстанцаў, бо саюз рыхтаваўся не так доўга, але Літоўскае аддзяленне вызначыла ваяводскіх і павятовых начальнікаў. Спосаб



ліставання паміж імі арганізоўваўся даволі лёгка — з дому ў дом перавозілі дэпешы. Нашы жанчыны з вялікай рызыкай, з сапраўдным гераізмам выконвалі падобныя ўказанні, нягледзячы на тое, што самі абсалютна да ніякіх саюзаў і змоў не належылі. Яны пагаджаліся на гэта толькі з-за патрыятычных пачуццяў» [4, с. 153]. Сама ж Гэлена была кур'еркай у атрадзе Траўгута. З карэспандэнцыяй для паўстанцаў яна была затрымана ў ваколіцах Століна, арыштавана і выслана ў Тамбоўскую губерню. Пасля вярнулася на Радзіму, памерла 1 лютага 1874 г. на Піншчыне.

Пра жанчын-кур'ерак згадвае і С. Рамановіч. Яна распавядае, што звычайна карэспандэнцыя перавозілася абозам у складзе некалькіх маладых дзяўчын, пераапранутых у мужчынскія касцюмы [19, с. 23]. Згодна з яе ўспамінамі, мясцовыя жанчыны арганізавалі таксама камітэт, мэтай якога была дапамога паўстанцам у двух напрамках — грашовымі ахвярамі і працай (падвозам ежы, рэчаў). Для яго папулярызацыі была нават напісана адозва. Камітэт складаўся з 7 чалавек: «гаспадыні», «сакратаркі», «касіркі», «старшыні» і трох дапаможных асоб. Члены камітэта павінны былі знайсці да 10 знаёмых чалавек, якія б штомесяц давалі ім па 1 злотым у касу [4, с. 11]. Соф'я не мела дачынення да гэтай арганізацыі, яна пераважна даглядала са сваімі сяброўкамі параненых, працавала ў лазарэце [4, с. 30].

Па сведчаннях М. Бахавітынь-Казярацкай, патрыёткі найчасцей выконвалі функцыю забеспячэнцаў. Яны дастаўлялі ў атрады правіянт і адзенне. Так, у чэрвені 1863 г. «цэлы дзень і ноч пані і паненкі і мы, дзеці, правялі на кухні, ляпілі пірагі, выраблялі пляцкі і абаранкі, пяклі хлеб і булкі. Залівалі бутлі з кавай і малаком, смятанай, мёдам, півам, рыхтавалі папяросы і тытунь, каб пазбавіць гэта ад кацапаў…Разам з пані Вандай садзілі на воз інваліда, якога апраналі ў маскоўскі мундыр, і адвозілі ўсё» [20, с. 116].

Аказвалася і проста маральная дапамога вязням і ссыльным з боку патрыятычна настроеных абывацелек. Параўнаць яе можна з дабрачыннымі акцыямі. Многія маладыя дзяўчаты суправаджалі вязняў пры перавозцы іх з аднаго месца зняволення ў другое. Такія ўспаміны змяшчаюцца ў дзённіку Марыі Бахавітынь-Казярацкай, калі ў верасні 1863 г. «вывозілі партыю вязняў і пані Хана ўбралася ў шэрую сукенку і грубыя боты, узяла кій і ўвязала галаву хусткай і яшчэ з дзвюма іншымі панямі правялі партыю за Днепр» [20, с. 140]. Гэтая ж аўтарка згадвае і пра хітрыкі, на якія ішлі жанчыны, каб падтрымаць вязняў. Яны падкуплялі варту, перадавалі паштоўкі, лісты, ежу. Сама Марыя часта хадзіла ў царкву, бо ў ёй была капліца з галерэяй і відамі на двор, па якім дазвалялі вольна хадзіць вязням. Размовы і ліставанне вяліся праз вакенца [20, с. 120]. Гэлена Скірмунт, выкарыстоўваючы талент скульптаркі і мастачкі, выказвала падтрымку ўдзельнікам падзей 1863—1864 гг. сваімі творамі — крыжамі з сімволікай аб'яднанай Польшчы і Літвы, выявамі святых, якія распаўсюджваліся сярод арыштантаў.

Як вядома, у 60-я гг. XIX ст. за прыватным ліставаннем быў усталяваны пільны нагляд, а таму асабістыя лісты падвяргаліся маментальнаму знішчэнню. Аднак тагачасная эпісталярыя, якая была асноўным сродкам дыстанцыйнай камунікацыі, захавалася ў дастатковай колькасці. Тым не менш, кожны выяўлены ліст з'яўляецца ўнікальным і ў плане прадстаўніцтва адзначанагу віду крыніц, і ў плане інфармацыйнага патэнцыялу. Відавочна, што перапіска вялася нелегальна і распаўсюджвалася рознымі канспірацыйнымі метадамі. Аб гэтым сведчыць ліст дачкі надворнага магілёўскага саветніка Людвіга Шышко Соф'і да маці: «Письмо мое имел отвезти Г. Милевский*, но случай изменил, то тебе передаст оное Турский**… Моя Маминька, я бы писала к тебе обширно, но боюсь, потому что все мои письма читаются /как мне об этом передано/, потому не желаю подвергать себя такой цензуре…» [12, арк. 62 адв.]. Падобную інфармацыю ўтрымлівае і ліст роднага брата да яе: «Здесь присовокупляю просьбу Юрася… 2) Чтобы вы прислали адрес Г. Садалии***, потому что он хочет к кому-то писать, а иначе не может, как под ее адресом, адрес пришлите ко мне, я перешлю в Москву, только постарайтесь скоро прислать. Также посылаю одно письмо, постарайтесь, чтоб оно было отослано и вручено по адресу…» [12, арк. 64 адв.].

У лістах аўтары пераважна вырашаюць сямейныя праблемы, дзеляцца сваімі перажываннямі, большасць з якіх непасрэдна звязана з агульнапалітычнай, сацыяльнай і эканамічнай сітуацыяй 1863—1864 гг. Так, Соф'я Шышко просіць маці: «уведомь меня, что у вас слышно в Минске, — я слыхала, что Камилия Мартинкевич**** сидела в доме умалишенных и что Урбасевича***** и других студентов вывезли, извести меня правда ли это и за что, а также поете ли и нет ли чего нового, то снабди и меня, потому что у нас на Белой Руси ничего невозможно получить, к этому поводу, помещиков очень мало таких, которые хотели бы об этом знать. Трауры носят едва ли только в двух домах, и прочие смеются над черными платьями» [12, арк. 62 адв.]. У сваю чаргу, яна таксама паведамляе пра здарэнні з асабістага жыцця: «возвратясь из Могилева, поехала в Сенно, проведать знакомых в тюрьме и попала вовремя, когда выводили

* Апалінарый Мілеўскі — дваранін Магілёўскай губерні, актыўны ўдзельнік падзей 1863—1864 гг.

** Стэфан Турскі — дваранін Мінскай губерні, Барысаўскага павета, удзельнік паўстання 1863—1864 гг.

*** Дакладна вызначыць асобу са згаданым прозвішчам не ўдалося.

**** Каміла Марцінкевіч — дачка знакамітага драматурга Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча. За свае палітычныя погляды супраць расійскіх улад была змешчана на некаторы час у багадзельню для вар'ятаў.

***** Хутчэй за ўсё, згадваецца прозвішча былога студэнта Санкт-Пецярбургскага ўніверсітэта Урбасевіча Антона, які паходзіў з Мінска і быў высланы ў Сібір за арганізацыю маніфестацыйных пратэстаў у горадзе.



шесть: Хморовича, Самуйлы, Каплинского* и других незнакомых тебе, мы их провожали за 26 верст… Два дня как возвратилась из дороги; была у Важинских в Яново, в Сенно у Богушевских**, в Левкове, в Орше, в Копысе, в Шклове и наконец в Могилеве, где первым моим старанием было видеть Мечислава, билета получить не могла, потому что никому не дают, скрытно с помощью одного офицера удалось мне попасть в госпиталь и два часа была с ним… У нас в Могилеве арестантам разрешается бракосочетаться и женам следовать в Сибирь за мужьями, — один брак на днях и бракосочетается — весь город имеет тому присутствовать» [12, арк. 63—63 адв.]. Здавалася б, вельмі прыватная інфармацыя, але, як паказвае аналіз іншых дакументаў, даволі стандартная для тых часоў. Уласныя перажыванні аўтаркі ліста выкліканы вынікамі падзей 1863—1864 гг. Яны з'яўляюцца ілюстрацыяй тагачасных абставін грамадскага жыцця беларуска-літоўскіх губерняў.

Акрамя сведчанняў аб асабістым дачыненні да паўстання, паведамляюцца звесткі аб удзеле сваякоў, знаёмых, перадаюцца іх думкі, перакананні, апісваецца агульнае становішча краю. А гэта ўжо не асобны пазл, а цэлая карціна.

Такім чынам, жаночая мемуарная і эпісталярная спадчына аб паўстанні 1863—1864 гг. вызначаецца багатым і цікавым інфармацыйным патэнцыялам, які сваёй навізной пашырае праблематыку гісторыі 1863—1864 гг. Доля суб'ектывізму, якая выклікае скептычнае стаўленне да адзначанага віду гістарычных крыніц, чым прыніжаецца іх роля ў навуковых даследаваннях, значна змяншаецца пры супастаўленні факталогіі з іншымі дакументальнымі матэрыяламі. Прааналізаваныя ўспаміны, дзённікі, лісты распавядаюць пра падзеі 60-х гг. XIX ст. у розных рэгіёнах (беларуска-літоўскія, украінскія, польскія землі), але ў іх выяўлены шэраг падабенстваў, аналагічных з'яў і тыповых рысаў, што падкрэслівае аб'ектыўнасць заключэння аб яўным і шматгранным удзеле жанчын у паўстанні. Адкрыта на адзначаны аспект яшчэ ў другой палове XIX ст. указвалі менавіта дакументы асабістага паходжання. Хаця да сённяшняга дня ў гістарыяграфіі праблемы ён вывучаны слаба. Мемуарная літаратура дапамагае вылучэнню формаў і метадаў удзелу жанчын у рэаліях 1863—1864 гг., уносіць пэўнае ўдакладненне ў матывацыю ўчынкаў, пашырае ўяўленні ў дачыненні адносінаў да грамадскага жыцця. Гісторыку даецца магчымасць адлюстраваць не толькі іх вонкавы выгляд (знешнія формы праяўлення), але і пранікнуць унутр (сутнасны бок), а тым самым больш паўнавартасна расставіць сацыяльныя і палітычныя акцэнты ў паўстанні 1863—1864 гг., акрэсліць значэнне падзеі ў гісторыі беларускага народа і яго суседзяў.

* Дакладна вызначыць асобы з узгаданымі прозвішчамі не ўдалося.

** Аўтарка згадвае прозвішчы ўладальнікаў маёнтка Янава, дваран Магілёўскай губерні, удзельнікаў паўстання 1863—1864 гг. Важынскіх Апалона і Аляксандра, і ўладальнікаў маёнтка Сянно — Багушэўскіх Аляксандра і Франца.

Крыніцы і літаратура


1. Архіў аддзела гісторыі беларускай дзяржаўнасці ІГ НАН Беларусі. — Папка «Восстание 1863 г.». — № 108.
2. Голиков, А. Г., Круглова, Т. А. Источниковедение отечественной истории / А. Г. Голиков, А. Т. Круглова. — М.: РОССПЭН, 2000. — 400 с.
3. Граф Михаил Николаевич Муравьев. Записки его об управлении Северо-Западным краем и об усмирении в нем мятежа, 1863—1866 гг. — СПб. — 46 с.
4. Залескі, Б. Ф. З жыцця літвінкі / Б. Ф. Залескі. — Мінск: Выдавецтва Віктара Хурсіка, 2009. — 338 с.
5. Захарьин, И. Н. (1839—1906) Встречи и воспоминания / И. Н. Захарьин (Якунин). — СПб.: Издатель М. В. Пирожков, 1903. — 368 с.
6. Исторический источник [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу: http://cde.osu.ru/demoversion/course123/3_1.html. — Дата доступу: 28.09.2012.
7. Источниковедение истории СССР 19-нч. 20 в. / под. ред. И. А. Федосова, И. И. Астафьего, И. Д. Ковальченко. — М.: Изд-во Московского ун-та, 1970. — 469 с.
8. Источниковедение: Теория. История. Метод. Источники Российской истории: учебное пособие для гуманитарных специальностей / И. Н. Данилевский, В. В. Кабанов. — М.: Издательский центр РГГУ, 2000. — 701 с.
9. Медушевская, О. М. Метод источниковедения и междисциплинарные аспекты / О. М. Медушевская. — Рэжым доступу: http://avorhist.narod.ru/publish/istved1-3-2.html. — Дата доступу: 10.09.2012.
10. Мосолов, А. Н. Виленские очерки, 1863—1865 гг. / А. Н. Мосолов. — СПб.: Тип. А. С. Суворина, 1898. — 253 с.
11. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (Мінск) (далей — НГАБ). — Ф. 295. — Воп. 1. — Спр. 1437.
12. НГАБ. — Ф. 1418. — Воп. 1. — Спр. 13.
13. Россия под надзором. Отчеты III отделения. 1827—1869 / сост. М. В. Сидорова, Е. И. Щербакова. — М.: РФК, 2006. — 768 с.
14. Сочинения Н. И. Павлищева: в 4 т. / Н. И. Павлищев. — СПб.: Типография В. С. Балашева, 1885—1887. — Т. 4: Седмицы польского мятежа, 1861—1864 г. / Н. И. Павлищев. — СПб.: Типография В. С. Балашева, 1887. — 257 с.
15. Brukczyński, S. (1847—1934) Moje wspomnienie / S. Brukczyński. — Warszawa; Kraków: Gebethner i Wolff, 1908. — 225 s.
16. Dąbrowski, J. (1876—1926) Rok 1863 / J. Grabiec. — 3-e wyd. — Poznań: Karol Rzepecki, 1929. — 470 s.; Matras, S. Podróż do Syberii po moskowskich etapach w 1863 i 1864 roku / S. Matras. — Lublin, Werset, 2008. — 411 s.
17. Ogorodnikow, P. Dziennik więźnia, 1862—1863 / P. Ogorodnikow. — Warszawa: Państwowe Wydawnictwo naukowe, 1986. — 599 s.
18. Polska myśl polityczna XIX wieku. Wybór tekstów źródłowych z komentarzem. — Wrocław: Wyd-wo Uniwersitetu Wrocławskiego, 1999. — 208 s.
19. Rok 1863. — Lwów: Nakładem Towarzystwa im. P. Skargi, 1922. — 40 s.
20. Świderska, M. Dziennik małej patriotki (Maryjki Bohowityń Kozieradzkiej), 1860—1865 / M. Świderska. — Tarnowa: J. Pisz. — 193 s.


*Артыкул паступіў у рэдакцыю 26.04.2013*



***А. А. Лашкевіч,***
*вядучы навуковы супрацоўнік НГАБ, кандыдат гістарычных навук*

## ВІЦЕБСКАЕ ГУБЕРНСКАЕ ЖАНДАРСКАЕ ЎПРАЎЛЕННЕ НАПЯРЭДАДНІ І Ў ЧАС ПЕРШАЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ

*(па матэрыялах фонду Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі)*

Дадзены артыкул з'яўляецца працягам мінулагодняй публікацыі ў «Беларускім археаграфічным штогодніку». Крыніцамі для яго паслужылі дакументы з фонду «Віцебскае губернскае жандарскае ўпраўленне» Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі (НГАБ). Яны ўключаюць матэрыялы самага рознага кшталту спраў, што ўваходзілі ў кампетэнцыю асобнага корпусу жандараў, перапіску з калегамі з іншых губернскіх упраўленняў і жандарскіх паліцэйскіх упраўленняў на чыгунках, кіраўніцтвам губерні, органамі агульнай і вышуковай паліцыі, саслоўнага і мясцовага самакіравання і іншымі дзяржаўнымі структурамі. У ім робіцца спроба паказаць асноўныя напрамкі дзейнасці Віцебскага губернскага жандарскага ўпраўлення (ГЖУ) у перадваенны і ваенны час, перыяд апошняй спробы мадэрнізацыі дзяржаўнага і грамадскага ладу Расійскай дзяржавы (пошукі балансу інтарэсаў паміж манархічнай уладай і Дзяржаўнай Думай, стварэнне земстваў у заходніх губернях імперыі, сталыпінскія рэформы ў сельскай гаспадарцы і г. д.), а таксама першай спробы гвалтоўнага перадзелу свету паміж вядучымі краінамі планеты ў мінулым стагоддзі.

Як і ў ранейшы час, асноўным напрамкам працы Віцебскага губернскага жандарскага ўпраўлення ў дадзены перыяд з'яўлялася барацьба з рэвалюцыйным падполлем самага рознага палітычнага накірунку (сацыял-дэмакраты, сацыялісты-рэвалюцыянеры, бундаўцы, сацыялісты-сіяністы, анархісты, прадстаўнікі нацыянальных рухаў і інш.). Усе гэтыя плыні, нягледзячы на паражэнне рэвалюцыі 1905—1907 гг., імкнуліся аднавіць сваю актыўнасць і працягваць барацьбу супраць існаваўшага тады грамадска-палітычнага ладу Расійскай імперыі. У канцы дзевяцісотых гадоў паліцэйскія службы дзяржавы працягвалі займацца справамі аб «эксах»(экспрапрыяцыях грашовых сродкаў). Іншым разам гэта прымала форму прымусовых ахвяраванняў альбо, кажучы сучаснай мовай, рэкету. Гэта рабілі ўсе вышэйзгаданыя рэвалюцыйныя арганізацыі. Прыкладам можа служыць справа, якую ў верасні—снежні 1908 г. вялі паліцыя горада Дзвінска і памочнік начальніка ўпраўлення ў Дзвінскім, Рэжыцкім, Себежскім і Люцынскім паветах ротмістр Праватвораў. Яна датычылася мяшчан Шмуйлы Ігаля, Меера Каца, Моўшы Рыца і Іцека Цырэна. Апошнія абвінавачваліся ў тым, што падрыхтавалі і спрабавалі паставіць выбуховую прыладу на кватэры дзвінскага купца Мендэля Іофэ. Але прывесці яе ў дзеянне ім не ўдалося і ў выніку іх усіх арыштавалі. Яны жадалі зрабіць выбух у кватэры М. Іофэ ў якасці пакарання за адмову даць грошы на карысць іхняй арганізацыі анархістаў-камуністаў. Трэба адзначыць, што з вывучаных намі дакументаў цяжка з поўнай пэўнасцю вызначыць іх партыйную прыналежнасць. У сваім лісце да Мендэля Іофэ з патрабаваннем грошай вышэйзгаданыя асобы назвалі сябе

анархістамі-камуністамі. Але падчас вобыску на іх кватэрах, як паведаміў 2 кастрычніка 1908 г. начальніку ўпраўлення ротмістр Праватвораў, знайшлі талонныя кніжкі з пячаткай «Дзвінскі камітэт Расійскай сацыял-дэмакратычнай рабочай партыі». Можна выказаць меркаванне, што гэтыя рэвалюцыянеры-экспрапрыятары жадалі такім чынам прыхаваць сваю прыналежнасць да РСДРП. Звестак наконт далейшага лёсу дадзенай справы і саміх абвінавачаных у архіўных фондах пакуль што не знойдзена. Вядома толькі тое, што 2 снежня 1908 г. віцебскі губернатар паведаміў начальніку жандарскага ўпраўлення наконт траіх з чатырох вышэйзгаданых асоб, а менавіта: Шмуйлы Ігаля, Меера Каца і Моўшы Рыца. У адпаведнасці з загадам міністра ўнутраных спраў яны перадаваліся з агульнага судаводства пад юрысдыкцыю Віленскага вайскова-акруговага суда з тым, каб судзіць іх па законах ваеннага часу. Такі падзел, на наш погляд, можна патлумачыць тым, што Шмуйла Ігаль зрабіў выбуховую прыладу, а Меер Кац і Моўша Рыц мелі намер прывесці яе ў дзеянне, але былі затрыманы паліцыяй. Удзел жа Іцека Цырэна заключаўся ў напісанні ліста да Мендэля Іофэ з патрабаваннем грошай [1, арк. 4—5, 6—7, 25—26 адв.].

У 1910 г. цяпер ужо падпалкоўніку Праватвораву давялося займацца справай аб дзейнасці арганізацыі «Ваенна-рэвалюцыйны саюз» у дзвінскім гарнізоне. Яшчэ ў 1909 г. ад калег з Віленскага губернскага жандарскага ўпраўлення была атрымана інфармацыя аб існаванні ў Дзвінску арганізацыі вышэйзгаданага саюза. Шляхам далейшай агентурнай распрацоўкі падначаленыя падпалкоўніка Праватворава змаглі даведацца, што дадзеная арганізацыя створана сумеснымі намаганнямі прадстаўнікоў як партыі сацыялістаў-рэвалюцыянераў, так і Расійскай сацыял-дэмакратычнай рабочай партыі. Члены гэтых партый вялі сярод дзвінскіх вайскоўцаў рэвалюцыйную прапаганду і распаўсюджвалі сярод іх нелегальную літаратуру эсэраўскага і сацыял-дэмакратычнага характару. Акрамя таго, адзін з удзельнікаў дзвінскага падполля Шмуль-Берка (Барыс) Багарад заявіў аб сваім жаданні ўступіць у ствараемы ў Паўночна-Заходнім краі «лятучы баявы атрад» і выказваў прапановы наконт арганізацыі замаху на жыццё тагачаснага камандуючага Віленскай вайсковай акругай генерал-лейтэнанта Гершэльмана. На падставе гэтых дадзеных па прапанове Дэпартамента паліцыі МУС было вырашана ліквідаваць падпольную арганізацыю і ў ноч з 19 на 20 сакавіка 1910 г. у Дзвінску арыштавалі шэраг асоб, у тым ліку мяшчанку Мусю Гінзбург, мяшчан Шмуля-Берку (Барыса) Багарада і Меера-Лейбу Атласа, мяшчанку Геню Каб, мешчаніна Іоселя Генкіна, мяшчанку Басю Гуровіч, мешчаніна Аўрума-Або (Альберта) Брука і іншых асоб, а таксама вайскоўцаў: радавога Дзвінскага артылерыйскага склада Якава Майса, радавога таго ж склада Мацвея Жыватова, радавога 100-га пяхотнага Астроўскага палка Лейбу Мядовага і вольнанапісанага таго ж палка Мікалая Баранава [3, арк. 157—159 адв., 164]. На жаль, інфармацыі пра далейшы лёс справы і яе фігурантаў пакуль што не выяўлена.



Трапляліся ў полі зроку супрацоўнікаў Віцебскага губернскага жандарскага ўпраўлення і анархісты. Так, 5 ліпеня 1910 г. у мястэчку Краслаўка Дзвінскага павета па загаду памочніка начальніка ўпраўлення ў Дзвінскім і іншых паветах затрымалі свянцянскага мешчаніна Мордуха Залгалера. Апошні, па агентурных дадзеных, належаў да анархісцкай арганізацыі (падпольная мянушка «Якаў») і падлягаў вышуку адпаведна цыркуляру Дэпартамента паліцыі ад 9 верасня 1909 г. [3, арк. 407, 411, 416, 430].

У кастрычніку 1910 г. пад назіраннем філёраў Віцебскага ГЖУ аказаўся лёзненскі Аршанскага павета Магілёўскай губерні мешчанін Залман Брайнін. Апошні прыбыў у Віцебск з мэтай арганізацыі страйку ў тым выпадку, калі Дзяржаўная Дума адхіліць альбо ўнясе змены ў прапанаваны сацыял-дэмакратычнай фракцыяй законапраект наконт святочнага адпачынку прыказчыкаў і канторшчыкаў яўрэйскай нацыянальнасці. Дзеля гэтага Залман Брайнін сустракаўся з членамі Віцебскага камітэта яўрэйскай сацыял-дэмакратычнай арганізацыі «Бунд» Шаломам Ізраэлітам і Фейгаю Хазак. 9 кастрычніка З. Брайніна арыштавалі на віцебскім чыгуначным вакзале. Трэба адзначыць, што ён, па апаратыўных дадзеных, і раней займаўся нелегальнай грамадска-палітычнай дзейнасцю. У 1907 г. Залман Брайнін патрабаваў ад аршанскага купца Гінзбурга грошы на патрэбы арганізацыі анархістаў-камуністаў. Калі той адмовіўся, то першы пагражаў яму смяротным пакараннем. У сувязі з усім вышэйзгаданым начальнік Віцебскага ГЖУ генерал-маёр М. Д. Загоскін прапанаваў выслаць яго пад нагляд паліцыі ў тыя мясцовасці, што не мяжуюць з Віцебскай, Магілёўскай і Мінскай губернямі. Адпаведна гэтай прапанове пастановай міністра ўнутраных спраў імперыі Залмана Брайніна выслалі ў Валагодскую губерню пад публічны нагляд паліцыі тэрмінам на два гады [3, арк. 469—473, 493—495 адв., 507—507 адв.].

У сувязі з распаўсюджваннем сярод латышскага насельніцтва губерні друкаваных выданняў сацыял-дэмакратыі Латвійскага краю і згодна з адпаведным прадпісаннем Дэпартамента паліцыі ад 24 лютага 1912 г. памочнікам начальніка ўпраўлення ў Дзвінскім, Рэжыцкім, Себежскім і Люцынскім паветах у лютым—красавіку 1912 г. былі зроблены захады з мэтай стварэння агентурнай сеткі для асвятлення дзейнасці вышэйзгаданай арганізацыі [6, арк. 57—58 адв.]. У кастрычніку 1913 — красавіку 1914 г. ротмістрам Бакурынскім, які на той момант займаў дадзеную пасаду, расследавалася справа аб перахоўванні жыхарамі мястэчка Лівенгоф Дзвінскага павета братамі Андрэем і Янам Крумінамі адозваў і ўлётак на латышскай, а таксама і на рускай мовах, дакументаў латвійскай сацыял-дэмакратыі і РСДРП наогул. На жаль, больш падрабязнай інфармацыі па гэтай справе ў архіўных фондах пакуль што не выяўлена [7, арк. 1—75].

У ліпені 1915 г. памочнік начальніка ўпраўлення ў горадзе Віцебску, Віцебскім, Веліжскім, Гарадоцкім, Невельскім, Полацкім і Лепельскім паветах ротмістр Гаваровіч атрымаў ад сакрэтных супрацоўнікаў Торапава і Кантралёра інфармацыю аб стварэнні ў сярэдзіне ліпеня па ініцыятыве прысяжнага павера-

нага Пісарэўскага і пры актыўным удзеле прысяжных паверaных Лузгіна і Шулепнікава арганізацыі па аказанні дапамогі палітычным зняволеным і адпраўленым у ссылку дэпутатам Дзяржаўнай думы («Рэвалюцыйны Чырвоны Крыж»). Дадзеная група мела надпартыйны характар, паколькі ў яе склад уваходзілі прадстаўнікі самых розных рэвалюцыйных партый: сацыял-дэмакраты, сацыялісты-рэвалюцыянеры, бундаўцы [16, арк. 374—376, 390—391 адв.].

Пад пільным наглядам жандармерыі знаходзіўся і легальны рабочы друк, у тым ліку і газета «Правда», якая пачала выходзіць у Санкт-Пецярбурзе з мая 1912 г., іншым разам змяняючы назвы з-за цэнзурных перашкод. Супрацоўнікі палітычнага вышуку імперыі разумелі, што такія выданні з'яўляюцца легальным дахам для прыкрыцця падпольнай дзейнасці сацыял-дэмакратаў. Таму яны адсочвалі інфармацыю, якая накіроўвалася ў газету з месцаў і, у прыватнасці, з Віцебскай губерні. Такім чынам, у справах губернскага жандарскага ўпраўлення былі зафіксаваны звесткі аб пасылцы ў студзені 1914 г. жыхаром Дзвінска гандлёвым служачым Рафаілам Антыколем грашовых ахвяраванняў у «Праўду», а таксама аб меўшым месца страйку на шкляным заводзе мястэчка Лівенгоф у красавіку 1914 г. [8, арк. 1 адв.—2, 3, 4—4 адв., 58 адв.—59, 60].

Пад такім жа наглядам знаходзіліся і прафесійныя саюзы. Яны лічыліся, і небеспадстаўна, легальным «дахам» для рэвалюцыйнага падполля. У якасці канкрэтнага прыкладу можна прывесці справу аб закрыцці ў Віцебску ў 1908 г. мясцовага аб'яднання работнікаў па вырабе верхняга адзення і галаўных убораў. Як бачна з адпаведнага пратакола, у выніку праведзенага супрацоўнікамі гарадской паліцыі разам з жандарскімі ўнтэр-афіцэрамі 26 мая т. г. вобыску ў памяшканні вышэйзгаданага прафесійнага аб'яднання там знайшлі шэраг выданняў сацыялістычнага накірунку, у прыватнасці, творы вядомых дзеячаў расійскай і міжнароднай сацыял-дэмакратыі (Л. Мартава, А. Парвуса, Л. Троцкага, К. Каўцкага, Э. Вандэрвельдэ і інш.). Сярод затрыманых падчас гэтага вобыску два з'яўляліся, па агентурных дадзеных, членамі РСДРП: віленскі мешчанін Веніямін Трахтэнберг (падпольная мянушка Абрам) і даўгінаўскі Вілейскага павета Віленскай губерні мешчанін Тэвель-Лейба Грап (падпольная мянушка Барыс). Інфармуючы наконт гэтага віцебскага губернатара, начальнік жандарскага ўпраўлення палкоўнік Сямёнаў прапанаваў спыніць дзейнасць прафесійнага аб'яднання работнікаў па вырабе верхняга адзення і галаўных убораў, паколькі «…оно является местом для чтения и собеседований всякого рода по программам, вовсе не соответствующим его цели и деятельности, и в оном производятся незаконные денежные сборы в пользу других обществ…» Апошняе тлумачыцца тым, што падчас вобыску былі знойдзены дакументы аб зборы грашовых ахвяраванняў на карысць страйкуючых шчаціннікаў. Падобныя дзеянні па тагачасным заканадаўстве лічыліся крыміналам. Па хадайніцтве кіраўніка губернскага жандарскага ўпраўлення дадзены прафесійны саюз пастановай віцебскай губернскай па справах таварыстваў прысутнасці ад 13 чэрвеня 1908 г. быў закрыты [4, арк. 1—7, 10—10 адв.].



У лютым—сакавіку 1910 г. памочнікі начальніка ўпраўлення ў горадзе Віцебску палкоўнік І. Я. Пратапопаў і ў Дзвінскім і іншых паветах падпалкоўнік Праватвораў займаліся расследаваннем справы аб меўшым месца ў кастрычніку 1909 г. з'ездзе рабочых-шчаціннікаў як Віцебскай губерні, так і суседніх рэгіёнаў (сучасныя Беларусь, Латвія, Літва і Польшча). Падставай для гэтага паслужыла паведамленне, атрыманае ад калег з Сувалкаўскага губернскага жандарскага ўпраўлення (Царства Польскае). Там у лістападзе 1909 г. арыштавалі Хаіма Фэнстэра (ён жа Кальман-Гірша Зільбердзік), прадстаўніка кіраўніцтва «Бунда» на вышэйзгаданым з'ездзе шчаціннікаў у Дзвінску. На ім абмяркоўвалася пытанне аб барацьбе рабочых за захаванне васьмігадзіннага працоўнага дня, дасягнутага ў час рэвалюцыйных падзей 1905—1907 гг. Магчыма ў падтрымку гэтых дзеянняў збіралі грошы члены віцебскага прафесійнага саюза работнікаў па вырабе верхняга адзення і галаўных убораў, пра які ўжо згадвалася раней. Але, як паведамілі свайму кіраўніцтву палкоўнік І. Я. Пратапопаў і падпалкоўнік Праватвораў, ніякіх новых звестак наконт правядзення з'езда Усеагульнага саюза шчаціннікаў і яго ўдзельнікаў з ліку жыхароў Віцебскай губерні за выключэннем Фэнстэра (Зільбердзіка), які з'яўляўся жыхаром Дзвінска, пасля арышту апошняга не выявілі, і таму справу («перапіску») спынілі [3, арк. 95, 99—101 адв., 104—106, 111—115].

У сакавіку 1910 г. ад'ютант начальніка ўпраўлення ротмістр Прудэнтаў высвятляў матывы дзейнасці жыхара Віцебска шаўца Іцкі Смулакоўскага, якога западозрылі ў зборы грошай на «революционные цели». Адпаведна агентурным дадзеным за некалькі дзён да свайго арышту 3 сакавіка апошні заходзіў у шавецкую майстэрню Эгінтава, дзе заклікаў яе работнікаў да страйку. Акрамя таго, падчас вобыску ў яго знайшлі дакументы, што сведчылі аб зборы грашовых сродкаў. Расследаванне паказала, што гэты збор не меў палітычных мэтаў, грошы збіраліся на патрэбы саюзу шаўцоў [3, арк. 121, 122, 134, 138—140 адв.].

Жандармерыя разам з агульнай паліцыяй ажыццяўляла нагляд і за дзейнасцю іншых грамадскіх арганізацый. Так, у лютым—красавіку 1912 г. унтэр-афіцэр дадатковага штату ўпраўлення ў Полацку Мацэлі займаўся праверкай ананімных лістоў наконт «2-га Полацкага грамадскага сходу», у якіх даваліся звесткі аб выкарыстанні гэтага грамадскага клуба ў якасці легальнага прыкрыцця для вядзення антыўрадавай прапаганды. Але ў выніку расследавання дадзеная інфармацыя не знайшла свайго пацвярджэння [6, арк. 36—55 адв.].

Упраўленне з асаблівай цікавасцю адсочвала дзейнасць грамадскіх арганізацый у час Першай сусветнай вайны, паколькі апошнія выкарыстоўваліся апазіцыйнымі палітычнымі сіламі ад памяркоўных правых да рэвалюцыянераў для ўмацавання свайго ўплыву ў грамадстве. Начальнік упраўлення палкоўнік А. Р. Шульц у сваім данясенні дырэктару Дэпартамента паліцыі ад 15 кастрычніка 1915 г. паведаміў аб стварэнні ў Віцебску эвакуацыйнага аддзела Вайскова-прамысловага камітэта Паўночна-Заходняга краю і даў характарыстыку некаторым членам дадзенага камітэта з пункту гледжання іх палітычнай добранадзей-

насці. Напрыклад, у адносінах да гандляра льном купца першай гільдыі Мота-ля-Макса Тубіна было адзначана, што на яго кватэры 29 студзеня 1913 г. адбылася нарада прадстаўнікоў яўрэйскага насельніцтва Віцебскай губерні. На ёй ішла гаворка аб удзеле ў абмеркаванні ў дэпутата Дзяржаўнай думы Фрыдмана ў Санкт-Пецярбурзе яўрэйскага пытання і, у прыватнасці, праблемы мяжы аселасці. Асаблівую ўвагу кіраўнік упраўлення звярнуў на двух членаў наноў створанага аддзела, якіх абралі ў якасці прадстаўнікоў віцебскіх рабочых. Гэта былі кіраўнікі агульнагарадской бальнічнай касы Бэр Мітаў-Гінзбург (старшыня) і Залман-Абель Баграчоў (сакратар). Спасылаючыся на агентурную інфармацыю і дадзеныя філёрскага (вонкавага) назірання, палкоўнік А. Р. Шульц ахарактарызаваў першага як сацыяліста-сіяніста, а другога — як бундаўца [16, арк. 576—578 адв.].

Супрацоўнікі жандармерыі вялі назіранне за паводзінамі мясцовых абшарнікаў, продкі якіх належалі да шляхты і магнацтва былой Рэчы Паспалітай, і палітычная лаяльнасць якіх заўсёды ставілася расійскімі ўладамі пад сумненне, і кіраўнікоў іх маёнткаў. У іх ліку знаходзіўся і былы віленскі каталіцкі біскуп барон Эдуард Роп. Яму за ўдзел у апазіцыйнай палітычнай дзейнасці царскім загадам забаранялася пражываць у Паўночна-Заходнім краі, за выключэннем маёнтка Нішча Себежскага павета Віцебскай губерні. Хутчэй за ўсё, менавіта таму віцебскі губернатар у канцы сакавіка 1912 г. звярнуўся ў мясцовае жандарскае ўпраўленне з хадайніцтвам аб патаемным наглядзе за жыццём Э. Ропа. Як бачна з вывучаных намі дакументаў, такі нагляд ажыццяўляўся супрацоўнікамі ўпраўлення на працягу красавіка 1912 — жніўня 1915 г. [6, арк. 217—268]. Такое ж назіранне вялося ў маі—кастрычніку 1912 г. і за графіняй Веранікай Зіберг-Плятэр, што жыла ў сваім маёнтку Ліксна Віцебскай губерні, тэрцыяркай (свецкім членам) французсканскага манаскага ордэна, якая лічылася прыхільніцай і прапагандыстам «рускага каталіцызму», г. зн. далучэння расійскіх праваслаўных вернікаў да ўсходняга (уніяцкага) абраду каталіцкай царквы [6, арк. 356—368]. У красавіку 1915 г. упраўленне высвятляла па запыце начальніка Петраградска-Віндаўскага жандарскага паліцэйскага ўпраўлення чыгунак падданства ўладальніцы маёнтка Варкляны Рэжыцкага павета і пагрузачнага шляха ў 690 вёрст Маскоўска-Віндаўскай чыгункі княгіні Тэрэзіі Сапега. У выніку аказалася, што апошняя, фармальна з'яўляючыся расійскай грамадзянкай, знаходзілася на сталым жыхарстве ў Аўстра-Венгрыі. Кіраўнікі ж вышэйзгаданага маёнтка шляхціч Здзіслаў Бартэль-дэ-Вэйдэнталь і ковенскі мешчанін Уладзіслаў Краўзэ з пачаткам вайны распаўсюджвалі сярод мясцовага насельніцтва паражэнчыя чуткі, а ў сакавіку 1915 г. адмаўляліся выдаваць з маёнтка кароў па вайсковай рэквізіцыі. У сувязі з гэтым віцебскі губернатар паставіў пытанне аб высылцы іх у аддаленыя губерні імперыі [16, арк. 295—297].

Нягледзячы на тое, што кампетэнцыя жандарскіх упраўленняў не прадугледжвала вядзення палітычнага вышуку ў войску, яны ажыццяўлялі ў гэтым плане нагляд за тымі, хто прызываўся на вайсковую службу. Напрыклад, Віцебскае ГЖУ восенню 1909 г. правярала палітычную добранадзейнасць навабранцаў чарговага прызыву. Інфармацыя наконт тых з іх, хто быў заўважаны альбо западозраны ў нелегальнай дзейнасці, перадавалася камандаванню адпаведных вайсковых злучэнняў і кіраўнікам Віленскага, Гродзенскага, Іркуцкага, Мінскага і Сувалкаўскага губернскіх жандарскіх упраўленняў, а таксама Туркестанскага раённага ахоўнага аддзялення [2, арк. 47, 59, 81, 82, 84, 95, 98, 100, 152, 183, 184]. З мэтай прадухіліць пранікненне ў дзеючую армію рэвалюцыйна настроеных асоб, а таксама патэнцыйных агентаў варожых дзяржаў начальнік упраўлення палкоўнік А. Р. Шульц накіраваў 15 студзеня ў штаб Дзвінскай вайсковай акругі прапанову наконт арганізацыі сістэматычнай праверкі добранадзейнасці накіроўваемых у войскі афіцэраў і вольнанапісаных запасу, а таксама тых прызыўнікоў, якіх меркавалася пасылаць для навучання ў школы прапаршчыкаў [16, арк. 20—20 адв.]. Упраўленне імкнулася адсочваць настроі сярод «ніжніх чыноў» Віцебскага гарнізона і іншых вайсковых злучэнняў. Так, палкоўнік А. Р. Шульц у сваіх данясеннях у Дэпартамент паліцыі і ў канцылярыю галоўнага начальніка Дзвінскай вайсковай акругі паведамляў аб пагаршэнні настрояў сярод гэтай катэгорыі вайскоўцаў, іх выказваннях наконт як мага хутчэйшага заключэння мірнага дагавору, падзенні аўтарытэту камандзіраў [16, арк. 519, 520—520 адв.].



Разам з агульнай паліцыяй жандарскае ўпраўленне ажыццяўляла нагляд за падданымі іншаземных дзяржаў, якія стала альбо часова пражывалі на тэрыторыі губерні. Звесткі аб замежніках накіроўваліся ўпраўленнем у штаб Віленскай вайсковай акругі, хутчэй за ўсё, для інфармавання супрацоўнікаў контрразведкі. Асаблівая ўвага надавалася назіранню за грамадзянамі Германскай і Аўстра-Венгерскай імперый, краін, што з'яўляцца праціўнікамі Расіі ў маючай хутка адбыцца Першай сусветнай вайне. Супрацоўнікі паліцыі і жандармерыі пільна прыглядаліся да тых з іх, хто знаходзіўся на ваеннай службе ў арміях Германіі ці Аўстра-Венгрыі. Лічылася, і небеспадстаўна, што яны прыязджалі ў Расію з разведвальнымі мэтамі, у прыватнасці, дзеля знаёмства з будучым тэатрам ваенных дзеянняў. Так, у красавіку 1911 г. у Віцебскае ўпраўленне паступіла інфармацыя ад калег з Віленскага губернскага жандарскага ўпраўлення аб тым, што два афіцэры аўстра-венгерскай арміі, обер-лейтэнанты Генрых Бабкоўскі і граф Уладзімір Тышкевіч плануюць паездку ў Расію і, магчыма, наведаюць Віцебшчыну. У красавіку—кастрычніку 1911 г. жандарскае ўпраўленне і паліцыя адсочвалі ад'езд з Віцебскай губерні тых нямецкіх грамадзян, якія належалі да рэзервістаў германскай арміі ў сувязі з атрыманымі звесткамі ад зноў-такі Віленскага ўпраўлення, а таксама ад разведвальнага аддзялення штаба Віленскай вайсковай акругі аб магчымым прызыве гэтай катэгорыі рэзервістаў у войска. 25 і 26 жніўня таго ж года начальнік упраўлення М. Д. Загоскін атрымаў ад полацкага паліцмайстра і мясцовага жандарскага ўнтэр-афіцэра Мацэлі паведамленне аб тым, што 23—24 жніўня ў горадзе знаходзіліся германскія афіцэры Эміль

Тэйнер і Курт Ульферт [5, арк. 39, 117—121 адв., 135—135 адв., 142—143, 146, 147, 148, 149—149 адв.].

З пачаткам Першай сусветнай вайны афіцэры і ўнтэр-афіцэры Віцебскага ГЖУ разам з супрацоўнікамі вайсковай контрразведкі займаліся выяўленнем у зоне франтавога тылу, у склад якога ўвайшла і Віцебская губерня, разведвальнай агентуры праціўніка, а таксама асоб, што маглі аказаць ёй усялякага кшталту дапамогу. Прыкладам таму можа служыць справа аб дзейнасці дзвінскага мешчаніна Гіршы Ляка, уладальніка гасцініцы «Вакзальная», якую вёў у кастрычніку—лістападзе 1914 г. памочнік начальніка ўпраўлення ў Дзвінскім і іншых паветах ротмістр, а потым падпалкоўнік Бакурынскі. Гэтая справа была распачата на падставе атрыманых ад афіцэра контрразведкі штабс-капітана Аляксеева дадзеных аб тым, што вышэйзгаданы Гірша Ляк мае кантакты з агентамі германскай разведкі і дапамагае ім у зборы патрэбнай інфармацыі. У прыватнасці, меліся звесткі, што ў верасні 1914 г. у яго гасцініцы знаходзіліся германскія падданыя, якія з дазволу гаспадара не прадставілі ніякіх дакументаў для рэгістрацыі. Падчас вобыску ў Г. Ляка знайшлі шэраг пашпартоў і пасведчанняў, выдадзеных розным асобам. У выніку адпаведных аператыўна-следчых мерапрыемстваў высветлілася, што іх уладальнікамі з'яўляліся былыя пастаяльцы гасцініцы «Вакзальная», якія ў розныя часы пражывалі ў ёй. Гірша Ляк, у сваю чаргу, пад рознымі нагодамі (затрымка ў паліцыі на прапісцы, святочныя дні і г. д.) не вяртаў іх дакументы, і яны, не маючы часу чакаць, вымушаны былі з'язджаць без іх. Хутчэй за ўсё, ён рабіў гэта, каб мець магчымасць прадаць пакінутыя дакументы замежнай агентуры альбо прадстаўнікам крымінальнага свету. Апошняе цалкам верагодна, паколькі, як стала вядома ў час расследавання, Гірша Ляк яшчэ перад вайной меў кантакты з апошнімі. У 1911 г. ён атрымаў два месяцы турэмнага зняволення за пасрэдніцтва ў збыце крадзеных каштоўных папер. Акрамя таго, у тым жа годзе яго штрафавалі за парушэнне правілаў прапіскі пастаяльцаў гасцініцы. У выніку кіраўніцтва жандарскага ўпраўлення прыйшло да высновы, што ўладальнік гасцініцы «Вакзальная» з'яўляецца патэнцыяльна небяспечным у сацыяльным плане элементам, асабліва ў ваенны час, і, нягледзячы на тое, што канкрэтных доказаў аб яго ўдзеле ў разведвальнай дзейнасці на карысць Германіі не выяўлена, хадайнічала перад мясцовым губернатарам аб высылцы вышэйзгаданага Г. Ляка ў аддаленыя мясцовасці імперыі на ўвесь тэрмін знаходжання Віцебскай губерні на ваенным стане, што і было зроблена [9, арк. 1—2, 3, 6, 27, 30, 40—40 адв., 71, 94—94 адв., 97—97 адв.].

У маі—чэрвені 1915 г. падпалкоўнік Бакурынскі займаўся справай западозранага ў шпіянажы жыхара Рыгі спадчыннага ганаровага грамадзяніна Вільгельма Шульца. Апошняга затрымала мясцовая паліцыя ў маёнтку Васілева Дзвінскага павета 12 мая ў час кантрольна-праверачных мерапрыемстваў перад праездам імператара Мікалая II па гэтай тэрыторыі як асобу, што не мела пры сабе ніякіх дакументаў і пэўных заняткаў. Акрамя таго, ва ўпраўленні мелася



арыенціроўка ад начальніка контрразведвальнага аддзела Дзвінскай вайсковай акругі на тэатры ваенных дзеянняў капітана Аляксеева наконт нейкага Шульца, які, па дадзеных контрразведкі, з'яўляўся нямецкім шпіёнам, і прыкметы якога ў нейкай ступені супадалі з прыкметамі арыштаванага Вільгельма Шульца. У час следства падпалкоўнік Бакурынскі не знайшоў канкрэтных доказаў наконт таго, што менавіта Вільгельм Шульц займаўся шпіянажам на карысць Германіі, але адсутнасць асабістых дакументаў і сталай працы, а таксама надзейных паручыцеляў давалі падставы лічыць яго патэнцыйна небяспечнай асобай, што магла б працаваць на карысць спецслужбаў праціўніка. Таму па хадайніцтве начальніка Віцебскага ГЖУ і адпаведнаму загаду галоўнага начальніка Дзвінскай вайсковай акругі Вільгельма Шульца выслалі ў Іркуцкую губерню пад публічны нагляд паліцыі на ўвесь тэрмін ваенных дзеянняў [13, арк. 1—2, 3, 31—72 адв., 91—91 адв.].

У ліпені—верасні 1915 г. памочнік начальніка ўпраўлення ў Віцебску, Віцебскім і іншых паветах ротмістр Гаваровіч праводзіў праверку палітычнай добранадзейнасці земляроба (па саслоўнай прыналежнасці) вёскі Томчына Полацкага павета Бенцыёна Шмейліна. Апошняга 19 ліпеня затрымалі ў цягніку вайскоўцы за антываенныя і антыўрадавыя выказванні, да таго ж западозрыўшы яго ў шпіянажы, і перадалі прадстаўнікам чыгуначнай жандармерыі на станцыі Невель. Нягледзячы на тое, што не мелася доказаў удзелу Бенцыёна Шмейліна ў зборы інфармацыі для разведак варожых з Расіяй дзяржаў, яго таксама выслалі як патэнцыяльна небяспечную асобу ў Іркуцкую губерню на ўвесь час вайны. На наш погляд, гэтаму паспрыялі наступныя абставіны, акрамя антыўрадавых размоў Б. Шмейліна са спадарожнікамі ў цягніку. Па-першае, ён у час затрымання прад'явіў чужы пашпарт і назваўся веліжскім мешчанінам Бэрам Шацам і толькі ў час следства даў сапраўдныя звесткі аб сваіх імені, прозвішчы і саслоўнай прыналежнасці. Па-другое, фармальна прыпісаны да земляробчага саслоўя, Бенцыён Шмейлін на самой справе зарабляў на жыццё выкладаннем яўрэйскай і рускай моў, не маючы пры гэтым сталага месца жыхарства і раз'язджаючы па розных мясцінах [12, арк. 7—8, 9, 23—24, 35—35 адв., 38].

У час ваенных дзеянняў супрацоўнікі жандармерыі і вайсковай контрразведкі вымушаны былі весці пільнае назіранне за паводзінамі расійскіх грамадзян нямецкай нацыянальнасці, у тым ліку і астзейскага дваранства Прыбалтыйскага краю, частка якога ўваходзіла ў склад Віцебскай губерні, з-за распаўсюджанасці сярод яго моцных германафільскіх настрояў. Сярод западозраных у вышэйзгаданым аказаўся і земскі начальнік 6-га ўчастка Дзвінскага павета Мікалай Мертэнс. З пачаткам ваенных дзеянняў на працягу 1914—1915 гг. у адрас мясцовых цывільных, паліцэйскіх і вайсковых улад неаднаразова паступалі ананімныя паведамленні аб злачыннай дзейнасці апошняга, пачынаючы ад злоўжывання ўладай у карысных мэтах да вядзення шпіянажу на карысць Германіі. Праверка дадзеных заяў супрацоўнікамі ўпраўлення ў Дзвінскім павеце не пацвердзіла іх сапраўднасці. Тым не менш па хадайніцтве камандавання 5-й

дзеючай арміі віцебскі губернатар у кастрычніку 1915 г. загадаў Мікалаю Мертэнсу пакінуць тэрыторыю павета. Яго перавялі на аналагічную пасаду ў Гарадоцкі павет [10, арк. 100—105, 121—121 адв., 126—126 адв.]. Акрамя таго, у дакументах жандарскага ўпраўлення ёсць згадка аб спісе мясцовай нямецкай інтэлігенцыі, які прадставіў свайму кіраўніцтву 19 лістапада 1915 г. памочнік начальніка ўпраўлення ў Дзвінскім і іншых паветах [17, арк. 483]. На жаль, больш падрабязная інфармацыя наконт гэтага спіса адсутнічае.

У кастрычніку—снежні 1915 г. памочнік начальніка ўпраўлення ў Дзвінскім і іншых паветах разам са сваімі падначаленымі займаўся справай бежанца з горада Шаўлі Ковенскай губерні Антона Крыштапайціса, затрыманага 28 верасня ў прыфрантавой паласе ў раёне мястэчка Крэйцбург і горада Якабштат як западозранага ў разведвальнай дзейнасці на карысць Германіі. Нягледзячы на тое, што следства не выявіла прамых доказаў удзелу А. Крыштапайціса ў занятках шпіянажам, тым не менш начальнік упраўлення палкоўнік А. Р. Шульц 17 снежня хадайнічаў перад вышэйстаячымі інстанцыямі аб высылцы падследнага ў аддаленыя мясцовасці імперыі на ўвесь тэрмін ваенных дзеянняў як патэнцыяльна небяспечную асобу. Падставай для такога рашэння паслужылі дадзеныя аб тым, што Антон Крыштапайціс даволі працяглы час знаходзіўся на тэрыторыі, непасрэдна прылягаючай да лініі фронту, адкуль на той час ужо было выселена цывільнае насельніцтва. Пры гэтым у час сваіх вандраванняў ён уважліва прыглядаўся да вайскоўцаў, звяртаючы асаблівую ўвагу на іх знакі адрознення, імкнуўся ўступаць з імі ў размовы. А. Крыштапайціс тлумачыў свае паводзіны тым, што ён жабраваў сярод салдат і афіцэраў, але, як было ўстаноўлена, рабіў гэта не вельмі часта. У выніку загадам галоўнага начальніка Дзвінскай вайсковай акругі Антона Крыштапайціса выслалі ў Іркуцкую губерню пад публічны нагляд паліцыі на час вайны [11, арк. 1—4, 7, 20, 23—23 адв., 27—27 адв., 45—47].

Такі ж лёс спасцігнуў і жыхара Кутаісі Шапату Пічкадзе, якога 21 кастрычніка 1915 г. затрымалі жандарскія ўнтэр-афіцэры Ягор Акуленка і Міхаіл Мядзведзеў у Рэжыцы. Яны западозрылі Ш. Пічкадзе ў шпіянажы таму, што апошні займаўся гандлем каўказскімі шаўковымі вырабамі толькі на чыгуначных станцыях і цягніках Паўночна-Заходняй і Маскоўска-Віндаўскай чыгунак, прапануючы свой тавар вайскоўцам. У горадзе ён гэтага не рабіў. Прамых доказаў таго, што Шапата Пічкадзе займаўся разведвальнай дзейнасцю на карысць варожых з Расіяй дзяржаў, расследаваўшыя справу падпалкоўнік Бакурынскі і яго пераемнік ротмістр Ксянзенка не знайшлі. Але начальнік губернскага ўпраўлення палічыў, «что по роду своей профессии Шапата Пичкадзе представляет собой благодарный материал для использования в целях шпионажа наших противников» і прапанаваў ужыць у адносінах да яго тую ж самую прэвентыўную меру, што і да вышэйзгаданага А. Крыштапайціса. Можна выказаць меркаванне, што на вырашэнне лёсу Шапаты Пічкадзе паўплывала інфармацыя, атрыманая з контрразведвальнага аддзялення штаба Мінскай вайсковай



акругі аб перакідванні германскімі спецслужбамі за лінію фронту групы турэцкіх разведчыкаў. Апошняя складалася з асоб, якія да вайны пражывалі ў Расіі і добра валодалі рускай мовай. У дадзенай сітуацыі мінскія контрразведчыкі раілі праяўляць асаблівую пільнасць да затрыманых з усходняй знешнасцю [14, арк. 1—2, 3, 19—20, 29—29 адв., 56].

У кампетэнцыю ўпраўлення ўваходзіла і барацьба з карупцыйнай злачыннасцю. Напрыклад, у чэрвені 1915 г. памочнікам начальніка ўпраўлення ў Віцебску, Віцебскім і іншых паветах ротмістрам Гаваровічам разам з падначаленымі яму ўнтэр-афіцэрамі на падставе звестак, атрыманых ад сакрэтных супрацоўнікаў Дабраахвотніка і Хана Малкіна, была выяўлена ў Полацку, кажучы сучаснай мовай, арганізаваная злачынная групоўка. Апошняя займалася вызваленнем дэзерціраў і навабранцаў ад вайсковай службы. Яе кіраўнікамі з'яўляліся полацкія мяшчане Нохім-Шмуйла Зарэцкі, Абрам Крывін, Берка Свердзіол (Свярдлоў), Файвіш Шнэйвас і віцебскі мешчанін Мота Крупенін. Дадзеная крымінальная супольнасць ажыццяўляла свае мэты шляхам подкупу службоўцаў мясцовых упраўленняў этапнага каменданта і павятовага вайсковага начальніка. Акрамя таго, Файвіш Шнэйвас дапамагаў жадаючым зрабіць членашкодніцтва. Паколькі з-за адсутнасці прамых улік вышэйзгаданых асоб немагчыма было прыцягнуць да судовай адказнасці, начальнік упраўлення палкоўнік А. Р. Шульц хадайнічаў перад віцебскім губернатарам аб іх высылцы за межы губерні на ўвесь час ваенных дзеянняў у адміністрацыйным парадку [16, арк. 345—359 адв.]. У снежні 1915 г. супрацоўнікі вышэйзгаданага памочніка начальніка ўпраўлення разам з контрразведкай Дзвінскай вайсковай акругі раскрылі злачынную групу ва ўпраўленні Віцебскага павятовага вайсковага начальніка, якая за хабар дапамагала жадаючым вызваліцца ад прызыву ў войска шляхам падробкі дакументаў. У яе склад уваходзілі непасрэдна сам вайсковы начальнік палкоўнік Аляксандр Бейнар, яго пляменнік Уладзімір Бейнар, служачы Рыжска-Арлоўскай чыгункі і шэраг пісараў дадзенага ўпраўлення [16, арк. 865—865 адв.].

Упраўленне разам з мясцовай паліцыяй прымала ўдзел у барацьбе з эканамічнай злачыннасцю. Так, на падставе агентурных дадзеных, атрыманых начальнікам упраўлення, у віцебскага гандляра тытунём Мендэля Хейфэца была выяўлена ў жніўні 1915 г. значная колькасць неаплачаных акцызам цыгарэт [16, арк. 489—489 адв.]. Восенню 1915 г. супрацоўнікі ўпраўлення садзейнічалі Віцебскаму аддзяленню Маскоўска-Рыжскага жандарскага паліцэйскага ўпраўлення чыгунак у раскрыцці злоўжыванняў служачых чыгуначнай станцыі Віцебск пры адпраўцы грузаў [16, арк. 566, 569—570]. Разам з агульнай і вышуковай паліцыяй яны займаліся выдаленнем з бліжэйшага тылу дзеючай арміі асабліва небяспечных у сацыяльным плане асоб, у тым ліку і крымінальнікаў. Так, па прапанове палкоўніка А. Р. Шульца ад 10 жніўня 1916 г. вайсковыя ўлады выслалі ў Разанскую губерню віцебскага мешчаніна Гіршу Сіроціна (ён жа Марканд), паколькі той не меў пэўных заняткаў і сістэматычна займаўся крадзя-

жамі [18, арк. 284—285, 286—287]. Супрацоўнікі ўпраўлення дапамагалі агульнай паліцыі весці барацьбу з падпольным вінакурэннем. Як бачна з данясенняў памочніка начальніка ўпраўлення ў Віцебску, Віцебскім і іншых паветах ротмістра Гаваровіча свайму кіраўніцтву ад 23 і 26 жніўня 1916 г., унтэр-афіцэры Лепельскага і Веліжскага жандарскіх пунктаў Кандрацьеў і Мікалай Васкабовіч выявілі ў маі і жніўні 1916 г. у жыхароў мястэчка Бешанковічы Лепельскага павета Хаіма-Янкеля Фрыдмана і Хаіма-Давіда Глікмана, а таксама ў селяніна вёскі Мацюхі (прозвішча неразборліва — *А. Л.*) Веліжскага павета запасы нелегальна выробленых спіртных напояў [18, арк. 326—328, 331—333].

З канца 1914 г. на жандарскі корпус усклалі функцыі нагляду за эвакуацыяй параненых і хворых з зоны ваенных дзеянняў. Па нашым меркаванні, наданне жандармерыі кантрольных абавязкаў у гэтай сферы можна патлумачыць наступнымі прычынамі. Па-першае, эвакуацыяй займалася не толькі вайскова-медыцынская служба, але і структуры, створаныя земскімі і гарадскімі органамі самакіравання. Як першыя, так і другія з'яўляліся легальным апірышчам для дзейнасці разнастайнай апазіцыі ад акцябрыстаў і кадэтаў да эсэраў і сацыял-дэмакратаў. Па-другое, забеспячэнне медыцынскіх устаноў лекамі і прадуктамі харчавання магло служыць спрыяльнай глебай для ўсялякага кшталту злоўжыванняў і карупцыйных здзелак. Такія дзеянні аб'ектыўна, асабліва ў ваенны час, набывалі палітычную афарбоўку. Акрамя таго, трэба дадаць, што ўдзел у эвакуацыйнай працы арганізацый, якія адносіліся да самых розных структур, як грамадскіх, так і дзяржаўных, пашыраў магчымасці пранікнення ў медыцынскія ўстановы агентаў варожых з Расіяй дзяржаў для вядзення разведвальнай дзейнасці. Нездарма начальнік упраўлення палкоўнік А. Р. Шульц у сваім рапарце ад 19 студзеня 1915 г., накіраваным вярхоўнаму начальніку санітарнай і эвакуацыйнай часці, прапанаваў папярэдне запытваць у адпаведных губернскіх жандарскіх упраўленняў звесткі наконт тых асоб, якія збіраюцца працаваць з паранеными і хворымі вайскоўцамі [15, арк. 5—8 адв.]. У лістападзе 1915 — студзені 1916 г. упраўленне займалася па заданні Дэпартамента паліцыі высвятленнем прычын масавага скаплення на працягу ўсяго 1915 г. на чыгуначнай станцыі Віцебск вагонаў з эвакуіраванымі грузамі — адзін з прыкладаў разладу, які пачаўся ў працы чыгуначнага транспарту [16, арк. 592—603 адв.].

У функцыі ўпраўлення ўваходзіла таксама адсочванне сацыяльных зрухаў і настрояў у мясцовым грамадстве. Да прыкладу, памочнік начальніка ўпраўлення ў Дзвінскім і іншых паветах ротмістр Ксянзенка 2 снежня 1915 г. дакладваў свайму кіраўніцтву аб павышэнні цэн на тавары першай неабходнасці ў сваім рэгіёне. Па яго звестках, мясцовыя гандляры з недаверам адносіліся да расійскага рубля, лічачы апошні ненадзейнай валютай. Да таго ж, яны дапускалі магчымасць прыходу немцаў і таму меркавалі за лепшае прыхаваць як мага больш тавараў з тым, каб потым атрымаць за іх больш устойлівыя, на іх думку, нямецкія маркі. Росту дарагоўлі садзейнічала і хабарніцтва з боку чыгуначных агентаў, у чые абавязкі ўваходзіла адпраўка грузаў [16, арк. 809—810]. У сваю чаргу,



палкоўнік А. Р. Шульц накіраваў 6 снежня 1915 г. начальніку штаба мінскіх вайскова-акруговых упраўленняў рапарт аб грамадскіх настроях у Віцебскай губерні. Нягледзячы на агульнасупакаіцельны тон гэтага дакумента (лаяльнасць насельніцтва да ўлады, адсутнасць арганізаванага рэвалюцыйнага падполля), ён, тым не менш, адначасова адзначаў у якасці трывожных тэндэнцый імкненне мясцовага жыхарства да хутчэйшага дасягнення і падпісання мірнага пагаднення, якое ўзнікла пасля ваенных паражэнняў і шматлікіх мабілізацый мужчынскага насельніцтва ў дзеючую армію, незадавальненне ростам цэн на прадметы першай неабходнасці альбо іх адсутнасцю, хабарніцтвам паліцэйскіх улад, асабліва пры прызыве ў войска ці адпраўцы на абарончыя работы [16, арк. 795—798].

Як мы бачым, галоўны напрамак працы Віцебскага ГЖУ быў накіраваны на нейтралізацыю актыўнасці рэвалюцыйнага падполля і прафілактычнае назіранне за дзейнасцю памяркоўнай апазіцыі. У перадваенны і, асабліва, ваенны час да гэтага дадалося выяўленне ў супрацоўніцтве з вайсковай контрразведкай замежнай агентуры, у першую чаргу германскай. Асноўны націск рабіўся на выкарыстанні прэвентыўных мер, гэта значыць высылцы з тэрыторыі, прылягаючай да прыфрантавой паласы, усіх патэнцыяльна небяспечных асоб, якія маглі б працаваць на спецслужбы варожых з Расіяй дзяржаў, нягледзячы на ступень юрыдычнага доказу іх канкрэтнай віны. Упраўленне прымала ўдзел і ў барацьбе з карупцыйнай і эканамічнай злачыннасцю там, дзе апошняя закранала бяспеку дзяржавы (злоўжыванні пры прызыве на вайсковую службу, на транспарце і г. д.). Трэба адзначыць, што ўся вышэйзгаданая дзейнасць Віцебскага ГЖУ ажыццяўлялася ў супрацоўніцтве з агульнай і вышуковай паліцыяй, асабліва пры правядзенні аператыўна-пошукавых мерапрыемстваў.

Крыніцы

1. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі. — Ф. 2499. — Воп. 1 — Спр. 125.
2. Там жа. — Спр. 126.
3. Там жа. — Спр. 127.
4. Там жа. — Спр. 128.
5. Там жа. — Спр. 137.
6. Там жа. — Спр. 141.
7. Там жа. — Спр. 147.
8. Там жа. — Спр. 153.
9. Там жа. — Спр. 154.
10. Там жа. — Спр. 159.
11. Там жа. — Спр. 163.
12. Там жа. — Спр. 167.
13. Там жа. — Спр. 179.
14. Там жа. — Спр. 181.
15. Там жа. — Спр. 191.
16. Там жа. — Спр. 202.
17. Там жа. — Спр. 209.

18. Там жа. — Спр. 244.

*Артыкул паступіў у рэдакцыю 01.03.2013*



***В. В. Гарбачова,***
*дацэнт кафедры этналогіі, музеялогіі і гісторыі мастацтва гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, кандыдат гістарычных навук*

## МУЗЕЙ АДАМА МІЦКЕВІЧА Ў ПАРЫЖЫ І ЯГО РУКАПІСНЫЯ ЗБОРЫ

Раскіданасць беларускай рукапіснай спадчыны па архіўных установах розных дзяржаў вымушае звяртацца да гісторыі фарміравання іх калекцый. Адной з такіх устаноў, якая ўтрымлівае найкаштоўнейшую спадчыну перыяду XVIII—XIX стст., з'яўляецца Музей Адама Міцкевіча ў Парыжы.

Перадгісторыя гэтага музея сягае ў пачатак Вялікай эміграцыі і распачынаецца з 1832 г., калі паўстае ідэя заснавання Польскай бібліятэкі. Адным з першых, кім выказваецца ідэя аб стварэнні ў эміграцыі агульнадаступнай нацыянальнай бібліятэкі быў Аляксандр Галынскі, занатаваўшы гэта ў сваім праграмным дакуменце, напісаным напрыканцы 1832 г. у Дрэздэне [6]. У снежні гэтага ж года ў Ліёне незалежна ад А. Галынскага дадзеная ідэя ўхваляецца ў праекце Леана Вадзінскага, які не толькі падкрэсліў неабходнасць заснавання бібліятэкі, а вызначыў і дакладнае для яе месца. На яго думку, ім павінна была стаць сталіца Францыі [3]. У наступным годзе ідэя аб заснаванні бібліятэкі агучваецца генералам Жыліберам Лафаэтам, пад уплывам якога Адам Міцкевіч піша прамову, адрасаваную еўрапейскім народам [14, s. 8]. Аднак, нягледзячы на ўсе гэтыя захады, у першыя гады эміграцыі не дайшло да ўтварэння адзінай бібліятэчнай установы.

Выказаныя прапановы заклалі глебу для стварэння асобных невялікіх бібліятэк. Першая з такіх дробных бібліятэк была заснавана Дамінікам Бялінскім пры Польскай вайсковай школе ў Парыжы ў 1834 г. Праіснавала яна ўсяго некалькі месяцаў і ў далейшым яе кніжныя зборы трапілі ў чытальню Таварыства навуковай дапамогі. І хаця гэтыя ўстановы былі не ў стане выконваць тыя функцыя, якія ў далейшым былі ўскладзены на Польскую бібліятэку ў Парыжы, аднак з іх дзейнасці распачынаецца працэс па зборы і захаванні кніжнай і рукапіснай спадчыны народаў Рэчы Паспалітай.

Наступныя некалькі гадоў прайшлі ў дыскусіях, сярод якіх трэба вылучыць выступленне Юльяна Нямцэвіча ў сярэдзіне 1838 г., на якім ён у чарговы раз выступаў з прапановай аб стварэнні адзінай публічнай бібліятэкі [15, s. 105]. Нарэшце, 24 лістапада 1838 г. быў падпісаны акт аб заснаванні бібліятэчнага фундуша, а 24 сакавіка 1839 г., у гадавіну пачатку паўстання 1794 г., Польская бібліятэка ўпершыню адчынілася для чытачоў. Бібліятэка аб'яднала некалькі асобных збораў. Перш за ўсё, гэта была калекцыя Таварыства навуковай дапамогі (засн. у 1832 г.), якая налічвала каля 1 тыс. тамоў. Сярод іншых вылучаліся таксама зборы гістарычнага (засн. у 1836 г.) і статыстычнага (засн. у 1838 г.)

аддзяленняў Польскага літаратурнага таварыства*. У снежні 1838 г. агульны кнігазбор налічваў ужо 2085 тамоў [14, s. 10; 15, s. 105]. Адначасова з гэтым у бібліятэку трапілі разнастайныя мапы, нумізматыка, рукапісы, а таксама мастацкія і музычныя творы.

Пачынаючы са снежня 1844 г. паўстае ідэя заснавання пры бібліятэцы тайнага Нацыянальнага архіва, які аб'ядноўваў бы матэрыялы паўстання 1830—1831 гг. і дакументы прыватнага характару. Сама дадзеная ідэя не была асабліва наватарскай. Ужо ў 1832 г. Таварыства літоўскіх і рускіх зямель стварае архіў рукапіснай спадчыны, прысвечанай падзеям паўстання на тэрыторыі Літвы, Беларусі і Украіны. Аднак менавіта Польская бібліятэка спрабуе акумуляваць у сваіх зборах найбольш каштоўныя дакументы па палітычнай гісторыі XIX ст.

Адной з істотнейшых крыніц паступлення рукапіснай спадчыны ў Польскую бібліятэку становяцца прыватныя ахвяраванні. Так, у чэрвені 1841 г. у бібліятэку трапляе збор Ю. Нямцэвіча [25, s. 411]. Шматлікія рукапісы, успаміны і кнігі перадаюцца ў бібліятэку яго пляменнікам Каралем Нямцэвічам**. У наступным годзе да бібліятэкі адыходзіць збор генерала Караля Князевіча. У 1848 г. Феліксам Уратноўскім перадаюцца ў бібліятэку матэрыялы, якія пачаткова знаходзіліся ў архіве Таварыства літоўскіх і рускіх зямель, а затым выкарыстоўваліся Ксаверыем Бранікоўскім для выдання *«Pamiętników polskich»* [11, s. 16]. У справаздачы Польскага гісторыка-літаратурнага таварыства за 1852 г. занатавана, што Яўстафій Янушкевіч змясціў у тайны архіў 36 лістоў Іаахіма Лялевеля [14, s. 14].

Зборы бібліятэкі павялічваліся настолькі хутка, што ў сярэдзіне 40-х гадоў XIX ст. паўстала праблема з набыццём будынка для іх захавання. У выніку правядзення чатырох кампаній па зборы сродкаў на 26 снежня 1853 г. на гэтую мэту было сабрана каля 39 тыс. франкаў***, што дазволіла эмігрантам напрыкан-

* Польскае літаратурнае таварыства — эміграцыйная арганізацыя палітычна-культурнага накірунку, створаная 29 красавіка 1832 г. у Парыжы, якая праіснавала да 1854 г. Заснавальнікамі былі Юзаф Бем, Людвік Плятэр, Тэадор Мараўскі і інш. Старшынёй таварыства з'яўляўся А. Чартарыйскі. У якасці галоўнай мэты таварыства абрала распаўсюджванне інфармацыі па польскім пытанні ў Заходняй Еўропе. Сябры таварыства актыўна друкаваліся ў заходняй прэсе. У 1836 г. у межах таварыства адкрываецца гістарычны аддзел, сябрамі якога праводзіліся архіўныя даследаванні па гісторыі Рэчы Паспалітай у еўрапейскіх сховішчах (старшыня Ю. У. Нямцэвіч). У 1851 г. з Літаратурнага таварыства ў якасці самастойнай структуры вылучаецца гістарычны аддзел, які ўтварае самастойнае Гістарычнае таварыства. У 1854 г. гэтыя дзве арганізацыі аб'ядноўваюцца і ўтвараюць Гісторыка-літаратурнае таварыства.

** Матэрыялы са збору Ю. Нямцэвіча занатаваны ў адным з каталогаў Польскай бібліятэкі пад № 492—507 [8, s. 112—119].

*** У апошняй кампаніі паўдзельнічала больш за 800 чалавек. Ахвяраваныя сумы істотна адрозніваюцца паміж сабой. Разам з так званым «вдовім грошам» сустракаюцца сумы ў 1000 франкаў. Сярод значных ахвярадаўцаў зафіксаваны Яўстафій Янушкевіч (100 франкаў), Віктар Зянковіч (100 франкаў), граф Чапскі (500 франкаў) [24, s. 1—3].



цы 1853 г. набыць будынак на Quai d'Orleans, 6 у Парыжы. Гэты дом на выспе Святога Людвіка, пабудаваны ў 1655 г., у свой час з'яўляўся рэзідэнцыяй сакратара Людовіка XIV. Напачатку 1854 г. туды перавозяць кнігі, каля 30 тыс. спраў, каштоўную рухомую спадчыну і бібліятэка пераўтвараецца ў месца дыслакацыі эміграцыйных арганізацый на чале з Польскім гісторыка-літаратурным таварыствам [29].

У 60-я гг. XIX ст. бібліятэка ўзбагацілася шэрагам каштоўных рукапісаў, маючых непасрэдныя адносіны да гісторыі Беларусі. Так, Яўстафій Янушкевіч перадае лісты свайго брата Адольфа да маці і сваякоў, а таксама ягоныя ўспаміны перыяду ссылкі [27, s. 9]. Браніслаў Залескі перадаў некалькі каралеўскіх лістоў, а Валяр'ян Калінка копію двух тамоў успамінаў Станіслава Аўгуста Панятоўскага. Акрамя гэтага, з беларуска-літоўскіх зямель трапляе яшчэ 72 дакументы, датаваныя часамі падзелаў Рэчы Паспалітай [28, s. 9]. У 1876 г. у бібліятэку перадаецца каштоўнейшы збор перыяду паўстання 1830—1831 гг. — архіў сойма. Сярод дакументаў гэтага збору знаходзіўся акт дэтраніцазыі Мікалая І, пошук якога актыўна праводзіўся царскай паліцыяй [13, s. 109—114].

Акрамя ахвяраванняў, зборы бібліятэкі папаўняліся таксама за кошт пошукавай працы. Падмуркі гэтага закладаюцца сябрамі гістарычнага аддзела Польскага літаратурнага таварыства, якімі з 1836 г. праводзіўся пошук і капіраванне палоннікаў у бібліятэчных сховішчах Францыі, Англіі, Італіі, Злучаных Штатаў, Партугаліі, Гішпаніі*. Дзякуючы намаганням сяброў таварыства былі набыты дакументы ў Бібліятэцы Ватыкана, закладзены стасункі для адпаведных дзеянняў з архіўнымі ўстановамі Мадэны, Дрэздэна, Вроцлава і інш. [26, s. 12]. З 50-х гг. XIX ст. Уладзіслаў Міцкевіч мэтанакіравана збіраў спадчыну свайго бацькі і ягонага асяроддзя. Сярод каштоўных набыткаў магчыма назваць паперы Ігнація Дамейкі, сярод якіх эпісталярыя за 1831—1888 гг., выступленне на святкаванні гадавіны паўстання ў 1833 г.**, фрагменты з *«Пана Тадэвуша»*, карэспандэнцыя А. Міцкевіча за 1836—1839 гг. і г. д. [10, s. VIII—IX, 66—70].

Каштоўнасць сабраных у будынку Польскай бібліятэкі ў Парыжы матэрыялаў вызначалася самімі эмігрантамі. Аднак, улічваючы той факт, што яны былі адкрытымі не для ўсіх жадаючых, у 1865 г. прымаецца рашэнне аб выданні *«Штогодніка Гісторыка-літаратурнага таварыства»*. Ён выходзіў на працягу 1866—1878 гг. Пачаткова выданне здзяйснялася ў Парыжы, а з 1872 г. у Познані. За адзначаны час было выдадзена сем тамоў. Зразумела, што туды не маглі трапіць дакументы павышанай сакрэтнасці, у большасці выдаваліся матэрыялы па старажытнай гісторыі, скапіраваныя ў еўрапейскіх архівах, а таксама там змяшчаліся звесткі аб дзеячах, якія памерлі ў эміграцыі [17—23]. Адрадзілася гэтая традыцыя толькі ў канцы XX ст. У 1991—1999 гг. былі выдадзены чатыры тамы недрукаваных раней бібліятэчных рукапісных матэрыялаў [5].

* Аб дзейнасці сяброў гістарычнага аддзела Літаратурнага таварыства, сярод якіх было шэраг ліцвінаў, гл.: [25—28].

** Дадзеная прамова І. Дамейкі надрукавана [2, с. 41—51].

Істотнейшыя змены ў функцыянаванні Польскай бібліятэкі адбываюцца ў пачатку XX ст. У кастрычніку 1901 г. Уладзіславам Міцкевічам, старэйшым сынам паэта, які на працягу 1899—1926 гг. з'яўляўся дырэктарам бібліятэкі, выказваецца прапанова аб заснаванні пры гэтай установе Музея Адама Міцкевіча. У перспектыве У. Міцкевіч спадзяваўся, што музей пераедзе ў незалежную Польшчу, і ў якасці месцаў ягонага размяшчэння называў Вільню ці Кракаў*. Ініцыятыва з размяшчэннем музея паэта ў Кракаве падтрымлівалася і мясцовай навуковай супольнасцю [10, s. XI].

Ідэя стварэння пры бібліятэцы музея, прысвечанага знакамітаму паэту, знаходзіць падтрымку ў Акадэміі навук у Кракаве, да якай з канца XIX ст. па рашэнні Польскага гісторыка-літаратурнага таварыства пераходзіць парыжскі будынак бібліятэкі і яе зборы. У 1903 г. У. Міцкевіч перадае застаўшыеся пасля бацькі і набытыя амаль за пяцьдзесят гадоў эміграцыі матэрыялы і стварае пры бібліятэцы Музей Адама Міцкевіча [10, s. IX—X].

30. Паўлюк Багрым: зб. / М-ва культуры Рэсп. Беларусь, Рэпертуар.-рэд. калегія, Часоп. «Тэатр. Беларусь»; Уклад.: В. Ляшук, А. Майсейчык; Прадм. А. Сабалеўскага; Пад рэд. А. Сабалеўскага. — Мінск: Навука і тэхніка, 1994. — 256 с.
31. Павлюк, К. К. История 51-го пехотного Литовского Его Императорского Высочества Наследника Цесаревича полка: в 2 т. / К. К. Павлюк. — Одесса: типо.-лит. штаба Одесс. воен. окр., 1909. — Т. 1. — 490 с; — Т. 2. — 400 с.
32. Писаревский, Г. Г. К истории польской революции 1830 г. / Г. Г. Писаревский. — Баку: изд-во АзГНИИ, 1930. — 80 с.
33. Пузыревский, А. З. Польско-русская война 1831 г.: в 2 т. / А. З. Пузыревский. — СПб: тип. Штаба войск гвардии и Петерб. воен. окр., 1886. — Т. 1. — 440 с.; — Т. 2. — 195 с.
34. Пыпин, А. Н. Общественные движения при Александре I / А. Н. Пыпин // Общественные движения в России в первую половину XIX века: сб. ст. / А. Н. Пыпин. — Спб: книгоизд-во М. В. Пирожкова. — 1905. — Гл. 1. — С. 11—205.
35. Смит, Ф. История Польского восстания и войны 1830 и 1831 годов: в 3 т. / Ф. Смит. — СПб.: тип. В. Спиридонова и К°, 1863—1864. — Т. 1. — 1863. — 497 с.; Т. 2. — 1863. — 496 с.; Т. 3. — 1864. — 768 с.
36. Соколовская, Т. Материалы по истории масонства в прежней русской армии / Т. Соколовская // Русская старина. — 1907. — № 6. — С. 659—668; № 7. — С. 197—216; № 8. С. 405—432; № 9. — С. 643—653.
37. Толстой, Ю. В. Очерк жизни и службы Е. А. Головина / Ю. В. Головин // Девятнадцатый век / П. Бартенев. — М.: тип. Ф. Иогансона, 1872. — Кн. 1. — С. 1—64.
38. Федоровский. Полковая памятка 50-го пехотного Белостокского его высочества герцога саксон.-альтенбурского полка / Федоровский. — Севастопль: типо-литография Д. О. Харченко, 1895. — 72 стр.
39. Швед, В. В. Асобны Літоўскі корпус / В. В. Швед // Энцыкл. гіст. Беларусі: у 6 т. — Мінск: БелЭн, 1993—2002. — Т. 4. — С. 235.
40. Швед, В. В. Беларускія старонкі гісторыі дзекабрыстаў / В. В. Швед. — Мінск: БелНДІДАС, 1998. — 125 с.



41. Швед, В. В. Масоны і ложы на землях Беларусі ( канец XVIII — першая чвэрць XIX ст.) / В. В. Швед. — Гродна: ГрДУ, 2007. — 275 с.
42. Швед, В. В. Паміж Польшчай і Расіяй: грамадска-палітычнае жыццё на землях Беларусі / В. В. Швед. — Гродна: ГрДУ, 2001. — 416 с.
43. Шевяков, Т. Н. Потери знамен и штандартов российской императорской армии в 1797—1917 гг. / Т. Н. Шевяков. — М., 2002. Электронный ресурс. — Режим доступа: http://lib.rus.ec/b/175731/read — Дата доступа: 15.10.2011.
44. Щербатов, А. П. Генерал-фельдмаршал князь Паскевич: в 3 т. / А. П. Щербатов. — СПб.: тип. Р. Голике, 1888—1904. — Т. 4: 1831 год. — 1894. — 240 с.
45. Bielecki, R. Słownik biograficzny oficerów powstania listopadowego: w 3 t. / R. Bielecki. — Warszawa: TRIO, 1995—1998. — T. 1: A—D. — 1995. — 410 s.
46. Sliwowska, W. Zeslancy polscy w Imperium Rosyjskim w pierwszej polowie XIX wieku: Slownik biograficzny / Inst. hist. PAN. — Warszawa: DiG, 1998. — 835 s.
47. Tokarz, W. Wojna polsko-rosyjska, 1830 i 1831 / W. Tokarz. — Warszawa: Volumen, 1993. — 588 s.
48. Zajewski, W. Powstanie listopadowie, 1830—1831 / W. Zajewski. — Torun: Marszalek, 2002. — 150 s.

*Артыкул паступіў у рэдакцыю 22.05.2013*

**Г. М. Брэгер,**
*вядучы палеограф*
*аддзела старажытных актаў НГАБ;*

**Л. А. Лінская,**
*старшы навуковы супрацоўнік НМГКБ*

## АРХІЎ СЛУЦКАГА ТРАЙЧАНСКАГА СВЯТА-ТРАЕЦКАГА МАНАСТЫРА (Т. 1: ДАКУМЕНТЫ 532а—538 за 1738—1747 гг. (ЗАКАНЧЭННЕ); Т. 2: ДАКУМЕНТЫ 1—60 за 1747—1749 гг.)

Працягваем публікацыю апісання дакументаў Архіва Слуцкага Трайчанскага Свята-Траецкага манастыра, які захоўваецца ў Нацыянальным музеі гісторыі і культуры Беларусі, распачатую ў мінулых выпусках «Беларускага археаграфічнага штогодніка» [1].

Прадстаўлена 66 дакументаў за 1738—1749 гг. (№ 532а — 538 з 1-га тома, № 1—60 з 2-га тома, № 57 адсутнічае). Значная колькасць з іх — гэта судовае справаводства камісараў, прызначаных каралём Аўгустам III, у справе праваслаўных іерархаў і святароў Слуцкай архімандрыі з уніяцкай царквой (універсалы, позвы, суплікі і інш.). Сярод гэтай падборкі выдзяляецца важны і цікавы рэестр дакументаў Слуцкага Трайчанскага манастыра, прадстаўлены ў Камісарскі суд (№ 33). Маецца цэлы шэраг дакументаў па судовым разбіральніцтве над мазырскім пратапопам Тэадорам Савіцкім, абвінавачаным у злоўжыванні службовымі абавязкамі і перавышэнні ўлады. Знакавымі з'яўляюцца лісты Г. Ф. Радзівіла аб прызначэнні М. Казачынскага слуцкім архімандрытам (№ 59), прызначэнні святаром Скрыгалаўскай царквы Яна Каржанеўскага (№ 536, 537) і інш. Захавалася некалькі дакументаў (скаргі, дэкрэт Галоўнага Трыбунала ВКЛ) па зямельнай спрэчцы рэктара Слуцкага езуіцкага калегіума з іерархамі і святарамі Слуцкай архімандрыі. Маюцца асобныя лісты прыватнай карэспандэнцыі паміж мясцовай шляхтай і духавенствам архімандрыі.

### Т. 1 (заканчэнне)

Без №. [532а]. а) Рэестр сялян Петрыкаўскай воласці, былых прыхаджан праваслаўных цэркваў, пераведзеных ва ўніяцтва, складзены губернатарам маёнтка Петрыкаў Паўлам Ржэвускім. Петрыкаў, 24.01.1747.

Копія подпісу: Павел Ржэвускі.

б) Нататка аб адпаведнасці гэтай копіі арыгіналу. Без месца і даты.

Подпіс: Грыгоры Змаровіч, пратапоп петрыкаўскі.

Тагачасная копія. Пол. м. Філіграні. Стар. сігн.: № 4; № 4-to; 22. 2 арк. (арк. 1152—1153).

533. Універсал камісараў ЯКМ, прызначаных каралём Аўгустам III для разбіральніцтва спрэчак паміж праваслаўнымі і ўніятамі, аб пачатку судовага разгляду скаргаў 6.11.1747. Варшава, 15.12.1746. (Друк). Спіс камісараў ЯКМ: Антоні Себестыян Дэмбоўскі, біскуп плоцкі; Аўгуст Чартарыйскі, ваявода і



генерал зямель Рускіх; Юзаф Накваскі, кашталян ваяводства Раўскага; Караль Падоскі, падкаморы Ражаньскі; Міхал Сускі, рэгент Канцылярыі Вялікай Кароннай.

Пячатка на кустодыі і подпіс: Ант[оні] Себ[естыян] Дэмбоўскі, біскуп плоцкі, камісар ЯКМ (лацін. м.).

Арыгінал (друк). Пол. м. Філігрань. Стар. сігн.: № 3-tio; № 84-й. 1 арк. (арк. 1155, 1158; 1 арк. вялікага фармату (in folio), перакладзены напалам і прапагінаваны абедзве паловы аркуша).

534. Тое ж, што № 533 (рукапіс).

5 пячатак на чырвоным сургучы і подпісы камісараў ЯКМ (гл. № 533).

Арыгінал. Пол. м. Філіграні. Стар. сігн.: № 84-й. 2 арк. (арк. 1156—1157; арк. 1157 чысты, з затылкам).

535. Выпіс з кніг Вялікай Каронная Канцылярыі (Каронная Метрыкі), 7.12.1746. Ліст караля Аўгуста III да плоцкага біскупа Антонія Себестыяна Дэмбоўскага, рускага ваяводы Аўгуста Чартарыйскага і інш. дыгнітарыяў Кароны Польскай і Вялікага Княства Літоўскага аб прызначэнні іх камісарамі для разбіральніцтва спрэчак паміж праваслаўнымі і ўніятамі. Варшава, 7.12.1746.

Копія подпісу: Ян Вольскі, стольнік Хенцінскага павета, сакратар Вялікай Каронная пячаткі.

Копія 18 ст. Пол. і лацін. м. Філіграні. 4 арк. (арк. 1159—1162).

536. Выпіс з кніг Мазырскага гродскага суда, 13.05.1747. Ліст-прэзента (прадстаўленне) рэчыцкага войскага і гродскага пісара, скрыгалаўскага дзяржаўцы Міхала Даніэля Келчэўскага паводле загаду рускіх ваявод кн. [Чартарыйскіх] айцу Яну Каржанеўскаму на святара Скрыгалаўскай царквы. Скрыгалава, 30.12.1738.

Пячатка на кустодыі Мазырскага гродскага суда (мазырскага падстаросты Віктара Яленскага).

Подпіс: карыгаваў Рудзеўскі, рэгент гр[одскі] мазыр[скі].

Арыгінал. Пол. м. Філіграні. Стар. сігн.: 28. 2 арк. (арк. 1163—1164).

537. Выпіс з кніг Мазырскага гродскага суда, 13.05.1747. Ліст-прэзента і фундуш мінскай войскай Петранэлі з ЗавішаўВаладкевічавай скрыгалаўскаму святару Яну Каржанеўскаму на заведванне царквой і парафіяй у яе маёнтку Скрыгалава Мазырскага павета па смерці былога адміністратара царквы Пархома Хмялеўскага. Скрыгалава, 12.05.1742.

Пячатка на кустодыі Мазырскага гродскага суда.

Подпіс: карыгаваў Рудзеўскі, рэгент гр[одскі] мазыр[скі].

Арыгінал. Пол. м. Філіграні. Стар. сігн.: 29.

Штамп: Беларускі дзяржаўны музей, № 872. 2 арк. (арк. 1165—1166).

538. Выпіс з кніг Мазырскага гродскага суда, 13.05.1747. Ліст-прэзента (прадстаўленне) мінскай войскай Петранэлі з Завішаў Валадкевічавай айцу Лук'яну Шуневічу на пажыццёвае святарства ў царкве св. Міхала ў яе вёсцы

Слабада Скрыгалаўская з правам карыстання царкоўнымі зямельнымі ўгоддзямі. Скрыгалава, 6.05.1742 (гл. таксама № 501).

Пячатка на кустодыі Мазырскага гродскага суда.

Подпіс: карыгаваў Рудзеўскі, рэгент гр[одскі] мазыр[скі].

Арыгінал. Пол. м. Філіграні. 2 арк. (арк. 1167—1168).

**Том 2**

1. Супліка (скарга) празбітара Капыльскай праваслаўнай царквы Кліменція Маўчановіча да намесніка Кіеўскай мітраполіі, слуцкага архімандрыта аб захопе 40 год назад да Пацейкаўскай уніяцкай парафіі в. Завулкі, а таксама аб прымушэнні да ўніяцтва ў сакавіку 1747 г. брэсцкім афіцыялам, слуцкім і капыльскім плябанам кс. Янам Рэакурам жыхароў вёсак Вайшкоты і Мазалі, якія належалі да Капыльскай праваслаўнай парафіі. Без месца і даты (пададзена 14.03.[1747]).

Подпіс: Кліменты Маўчановіч, празбітар царквы Капыльскай.

Арыгінал. Пол. м. Філіграні. 2 арк. (арк. 1—2; верхнія краі аркушоў пашкоджаны).

2. Супліка празбітара Бялевіцкай царквы Яна Біруковіча да слуцкага архімандрыта, намесніка Кіеўскай мітраполіі аб гвалтах і шкодах з боку мазырскага падкаморыя Казіміра Вольбека, арандатара Бялевіцкага двара, а таксама аб няслушным прыцягненні святароў царквы да суду Бялевіцкага двара, калі святары знаходзяцца пад юрысдыкцыяй духоўнага суда. Без месца і даты [1747] г.

Подпіс: Ян Біруковіч, празбітар царквы Бялевіцкай.

Арыгінал. Пол. м. Філіграні. 2 арк. (арк. 3, 6; арк. 6 чысты, з затылкам).

3. Анатаваны пераклад на рускую мову дакумента № 2. Без месца і даты (1-я пал. 19 ст.).

Арыгінал. Рус. м. Фрагмент філіграні. 2 арк. (арк. 4—5; арк. 5 чысты).

4. Выпіс з кніг Навагрудскага гродскага суда 2.06.1747. Рэляцыйны квіт енерала ЯКМ Навагрудскага ваяводства Антонія Драніцкага атаксавання (ацэнкі кошту) рухомых рэчаў казнадзея Любчанскага кальвінскага збору кс. Стэфана Ізбіцкага, астаўленых Яну Феліцыяну Абрамовічу пры облігу на пазыку ад апошняга С. Ізбіцкаму 400 зл. Без месца, 2.06.1747.

Пячатка на кустодыі навагрудскага падваяводы Антонія Юрыя Рдултоўскага (Навагрудскага гродскага суда).

Подпіс: карыгаваў Яновіч, S. M.(?), н[амеснік] г[родскі] в[аяводства] Н[авагрудскага].

Арыгінал. Пол. м. Філіграні. 2 арк. (арк. 7—8).

5. а) Позва Мазырскага земскага суда залужскаму празбітару айцу Яну Дзіліеўскаму ў Камісарскі суд ЯКМ у Варшаве па скарзе слуцкага архімандрыта, намесніка Кіеўскай мітраполіі кс. Юзафа Аранскага аб захопе і прылучэнні да ўніі ў 1725 г. царквы і прыхаджан у с. Залужжа, якія належалі да Жыцінскай праваслаўнай парафіі, і інш. прэтэнзіях. Без месца, 8.07.1747.



Подпіс: Юзаф Вольбек, пісар земскі п[авета] Мазырскага, староста дамавіцкі.

б) Рэляцыйны квіт енерала ЯКМ Навагрудскага ваяводства Андрэя Паўловіча аб падачы вышэйзгаданай позвы айцу Яну Дзіліеўскаму ў Залужскай плябаніі Мінскага ваяводства. Без месца, 5.08.1747.

Подпіс: Андрэй Паўловіч, енерал ЯКМ в[аяводства] Н[авагрудскага].

в) Нататка аб актыкацыі енералам А. Паўловічам свайго рэляцыйнага квіта (б) у кнігах Мінскага гродскага суда. Без месца, 12.08.1747.

Подпіс: Пушкін, нам[еснік] грод[скі] мін[скі].

Арыгінал. Пол. м. Філіграні. Стар. сігн.: № 1mo; 10. 2 арк. (арк. 9—10).

6. а) Позва Старадубскага земскага суда горбаўскаму старосце Бярнарду Аборскаму ў Камісарскі суд ЯКМ у Варшаве па скарзе слуцкага архімандрыта, намесніка Кіеўскай мітраполіі кс. Юзафа Аранскага аб захопе і прылучэнні да ўніі ў 1744 г. царквы і прыхаджан у яго м-ку Горкі Навагрудскага ваяводства, якія належалі да Языльскай праваслаўнай парафіі. Без месца, 8.07.1747.

Подпіс: Грыг[оры] Ант[оні] Гімбут, пісар зем[скі] п[авета] Стар[адубскага].

б) Рэляцыйны квіт енерала ЯКМ Навагрудскага ваяводства Андрэя Паўловіча аб падачы вышэйзгаданай позвы Б. Аборскаму ў яго м-ку Горка Мінскага ваяводства. Без месца, 4.08.1747.

Подпіс: Андрэй Паўловіч, енерал ЯКМ в[аяводства] Н[авагрудскага].

в) Нататка аб актыкацыі А. Паўловічам свайго рэляцыйнага квіта (б) у кнігах Мінскага гродскага суда. Без месца, 12.08.1747.

Подпіс: Пушкін, нам[еснік] грод[скі] мін[скі].

Арыгінал. Пол. м. Філіграні. Стар. сігн.: № 2do; 11. 2 арк. (арк. 11—12).

7. а) Позва Старадубскага земскага суда петрыкаўскаму плябану кс. Тамашу Яленскаму ў Камісарскі суд ЯКМ у Варшаве па скарзе слуцкага архімандрыта, намесніка Кіеўскай мітраполіі кс. Юзафа Аранскага аб незаконным прыцягненні да свайго суда ў Петрыкаўскай каталіцкай плябаніі ў 1746 г. праваслаўных ляскавіцкага празбітара Прохара Забытневіча і петрыкаўскага пратапопа Грыгорыя Змаровіча, а таксама гвалтоўным прыцягненні да Петрыкаўскага касцёла прыхаджан Петрыкаўскіх Уваскрэсенскай і Мікольскай праваслаўных парафій. Без месца, 17.06.1747.

Подпіс: Грыг[оры] Ант[оні] Гімбут, пісар земскі п[авета] Стар[адубскага].

б) Рэляцыйны квіт енерала ЯКМ Навагрудскага ваяводства Андрэя Паўловіча аб падачы вышэйзгаданай позвы кс. Г. Яленскаму ў Петрыкаўскай плябаніі. Без месца, 16.09.1747.

Подпіс: Андрэй Паўловіч, енерал ЯКМ в[аяводства] Н[авагрудскага].

в) Нататка аб актыкацыі А. Паўловічам свайго рэляцыйнага квіта ў кнігах Мазырскага гродскага суда. Без месца, 18.09.1747.

Подпіс: Казімір Рудзінскі, р[эгент] г[родскі] м[азырскі], лянт[войт] м[еста] ЯКМ Мазыр[скага].

Арыгінал. Пол. м. Філіграні. 2 арк. (арк. 13—14).

8. а) Позва Старадубскага земскага суда макарыцкаму празбітару айцу Матэушу Бруяцы ў Камісарскі суд ЯКМ у Варшаве па скарзе слуцкага архімандрыта, намесніка Кіеўскай мітраполіі кс. Юзафа Аранскага аб гвалтоўным пераводзе ў 1742 г. ва ўніяцтва праваслаўнай царквы і прыхаджан у с. Макарычы Мазырскага пав., якія належалі да праваслаўнай Петрыкаўскай пратапопіі. Без месца, 17.07.1747.

Подпіс: Грыг[оры] Ант[оні] Гімбут, пісар зем[скі] п[авета] Старадубскага.

б) Рэляцыйны квіт енерала ЯКМ Навагрудскага ваяводства Андрэя Паўловіча аб падачы вышэйзгаданай позвы М. Бруяцы ў Макарыцкай плябаніі. Без месца, 16.09.1747.

Подпіс: Андрэй Паўловіч, енерал ЯКМ в[аяводства] Н[авагрудскага].

в) Нататка аб актыкацыі А. Паўловічам свайго рэляцыйнага квіта (б) у кнігах Мазырскага гродскага суда. Без месца, 18.09.1747.

Подпіс: Казімір Рудзінскі, р[эгент] г[родскі] м[азырскі], лянт[войт] м[еста] ЯКМ Маз[ырскага].

Арыгінал. Пол. м. Філіграні. Стар. сігн.: 13. 2 арк. (арк. 15—16).

9. а) Позва Мазырскага земскага суда мазырскаму маршалку Рафалу Аскерцы, мазырскаму абознаму Тэадору Антонію Яхімойчу (Яхімовічу) і мазырскаму гродскаму рэгенту і месцкаму лянтвойту Казіміру Рудзінскаму ў Камісарскі суд ЯКМ у Варшаве па скарзе слуцкага архімандрыта Юзафа Аранскага і Сільвестра Кахоўскага, пленіпотэнтаў ад імя Расійскай Імперыі, мазырскага пратапопа Тэадора Савіцкага і ўсіх праваслаўных святароў Мазырскай пратапопіі аб гвалтоўным захопе ва ўніяцтва Багрымовіцкай, Бабіцкай, Прудаўскай, Нараўлянскай, Каленкавіцкай, Цішкаўскай, Кажушкоўскай і Дзямідаўскай цэркваў у маёнтках Аскеркі і Міцкаўскай царквы ў маёнтку Яхімойча і аб інш. шкодах. Без месца, 10.07.1747.

Подпіс: Юзаф Вольбек, пісар земскі павета Мазырскага, с[тароста] д[аманавіцкі].

б) Рэляцыйны квіт енерала ЯКМ Мазырскага павета Гілярыя Рэпецкага аб падачы вышэйзгаданай позвы Р. Аскерцы, Т. А. Яхімойчу і К. Рудзінскаму ў м-ку Бабічы Мазырскага пав. Без месца, 25.09.1747.

Подпіс: Гіляры Рэпецкі, енерал ЯКМ п[авета] М[азырскага].

Арыгінал. Пол. м. Філіграні. Стар. сігн.: 5. 2 арк. (арк. 17—18).

10. Супліка (скарга) праваслаўных святароў Мазырскай пратапопіі да слуцкага архімандрыта, намесніка Кіеўскай мітраполіі з просьбай звярнуцца да караля аб прызначэнні камісіі ў сувязі з гвалтоўным пераводам ва ўніяцтва мясцовай шляхтай большасці праваслаўных цэркваў Мазырскай пратапопіі, здзяйсненні розных шкод і інш. Без месца, 20.07.1747.

Подпісы: Феадор Савіцкі, пратапоп мазырскі (стб.); Тэадор Міцюкевіч, празбітар спаскі мазырскі (пол.); Дзям'ян Сакуновіч, іерэй мікольскі м[азырскі] (стб.); Габрыэль Кунцэвіч, п[разбітар] п.(?) (пол.); Ігнаці Каранеўскі, п[разбітар] ельскі траецкі (стб.); Карп Пігулеўскі, празбітар капаткевіцкі (пол.).



Арыгінал. Пол. м. Філіграні. 2 арк. (арк. 19—20; арк. 20 чысты, з затылкам).

11. а) Скарга Ігнація Давідовіча, празбітара царквы ў в. Бортнічы, м-ка Кіеўскага Мікольскага манастыра, аб злых намерах супраць праваслаўя мазырскага пратапопа Тэадора Савіцкага. Без месца, канец ліпеня 1747 г.

Копія подпісу: іерэй Ігнацій Давідаў.

б) Анатацыя аб прадстаўленні гэтай скаргі ў Мазырскі гродскі суд. Без месца, 7.02.1748.

Подпіс: Т. Аскерка, с[уддзя] г[родскі] і войт мазыр[скі].

Арыгінал. Рус. м. (а), пол. м. (б). Філіграні. Стар. сігн. або фаліяцыя (у правым верхнім куце): 34. 1 арк. (арк. 21).

12. Выпіс з кніг Мінскага гродскага суда 12.08.1747. Рэляцыйны квіт енерала ЯКМ Навагрудскага ваяводства Андрэя Паўловіча аб падачы позвы ў Камісарскі суд ЯКМ у Варшаве Каралю Касцюшцы ў яго м-ку Пярошава (цяпер Пырашава) Мінскага ваяводства па справе слуцкага архімандрыта, намесніка Кіеўскай мітраполіі Юзафа Аранскага. Без месца, 11.08.1747.

Пячатка на кустодыі мінскага старосты Юзафа Міхала Іваноўскага (Мінскага гродскага суда).

Подпіс: у адсутнасці пана рэгента карыгаваў Пушкін, нам[еснік] грод[скі] мін[скі].

Арыгінал. Пол. м. Філігрань. Стар. сігн.: № 1. 1 арк. (арк. 22).

13. Выпіс з кніг Навагрудскага гродскага суда 14.08.1747. Рэляцыйны квіт енерала ЯКМ Навагрудскага ваяводства Андрэя Паўловіча аб падачы позвы ў Камісарскі суд ЯКМ у Варшаве аршанскаму падчашаму Антонію Крукоўскаму і ўніяцкаму каплану Базылю Сабіноўскаму ў м-ку Сцепкава Навагрудскага ваяводства па справе слуцкага архімандрыта, намесніка Кіеўскай мітраполіі Юзафа Аранскага. Без месца, 9.08.1747.

Пячатка на кустодыі навагрудскага падваяводы Антонія Юрыя Рдултоўскага (Навагрудскага гродскага суда).

Подпіс: у адсутнасці навагрудскага гродскага намесніка карыгаваў Юзаф Міхал Іздэбскі.

Арыгінал. Пол. м. Філігрань. 1 арк. (арк. 23).

14. Выпіс з кніг Мінскага гродскага суда 12.08.1747. Рэляцыйны квіт енерала ЯКМ Навагрудскага ваяводства Андрэя Паўловіча аб падачы позвы ў Камісарскі суд ЯКМ у Варшаве горбаўскаму старосце Бярнарду Аборскаму ў м-ку Горка Мінскага ваяводства па справе слуцкага архімандрыта, намесніка Кіеўскай мітраполіі Юзафа Аранскага. Без месца, 4.08.1747.

Пячатка на кустодыі мінскага старосты Юзафа Міхала Іваноўскага (Мінскага гродскага суда) кепскай якасці.

Подпіс: у адсутнасці пана рэгента карыгаваў Пушкін, нам[еснік] грод[скі] мін[скі].

Арыгінал. Пол. м. Філігрань. Стар. сігн.: № 3tio; 3. 1 арк. (арк. 24).

15. Выпіс з кніг Мінскага гродскага суда 12.08.1747. Рэляцыйны квіт енерала ЯКМ Навагрудскага ваяводства Андрэя Паўловіча аб падачы позвы ў Камісарскі суд ЯКМ у Варшаве айцу Яну Дзіліеўскаму ў Залужскай плябаніі Мінскага ваяводства па справе слуцкага архімандрыта, намесніка Кіеўскай мітраполіі Юзафа Аранскага. Без месца, 5.08.1747.

Пячатка на кустодыі мінскага старосты Юзафа Міхала Іваноўскага (Мінскага гродскага суда).

Подпіс: у адсутнасці пана рэгента карыгаваў Пушкін, нам[еснік] грод[скі] мін[скі].

Арыгінал. Пол. м. Без філіграні. Стар. сігн.: № 1mo; 9. 1 арк. (арк. 25).

16. Выпіс з кніг Навагрудскага гродскага суда 17.08.1747. Рэляцыйны квіт енерала ЯКМ Навагрудскага ваяводства Яна Садалеўскага аб падачы позвы ў Камісарскі суд ЯКМ у Варшаве манахам Слуцкага езуіцкага калегіума па справе слуцкага архімандрыта, намесніка Кіеўскай мітраполіі Юзафа Аранскага. Без месца, 4.08.1747.

Пячатка на кустодыі навагрудскага падваяводы Антонія Юрыя Рдултоўскага (Навагрудскага гродскага суда).

Подпіс: у адсутнасці навагрудскага гродскага намесніка карыгаваў Юзаф Міхал Іздэбскі.

Арыгінал. Пол. м. Філігрань. Стар. сігн.: № 1mo; № 99. 1 арк. (арк. 26).

17. Прыватны ліст (пісьмо) ігумена Пінскага манастыра Юзафа Храноўскага да [слуцкага архімандрыта, намесніка Кіеўскай мітраполіі Юзафа Аранскага] з паведамленнем аб атрыманні яго ліста разам з указам кіеўскага мітрапаліта аб тэрмінах пасяджэнняў Камісарскага суда ЯКМ у Варшаве наконт праваслаўных цэркваў, аб стасунках з пінскім земскім пісарам і земскай канцылярыяй для афармлення позваў і інш. Пінск, 23.08.1747.

Подпіс: Юзаф Храноўскі, ігумен пінскі.

Арыгінал. Пол. м. Філіграні. 2 арк. (арк. 27—28).

18. Выпіс з кніг Брэсцкага гродскага суда 26.08.1747. Рэляцыйны квіт енерала ЯКМ Брэсцкага ваяводства Антонія Юзафа Умястоўскага аб падачы позвы ў Камісарскі суд ЯКМ у Варшаве ўладзімірскаму і брэсцкаму [уніяцкаму] біскупу кс. Тэафілю Гадэбскаму ў м. Брэсце ў яго катэдральным двары па справе ігумена Пінскага брацтва пры царкве Богаяўлення айца Юзафа Храноўскага. Без месца, 26.08.1747.

(Брэсцкага гродскага суда).

Пячатка на кустодыі брэсцкага старосты.

Подпіс: карыгаваў Лышчынскі, ВРГВБ (віцэ-рэгент гродскі ваяводства Брэсцкага).

Арыгінал. Пол. м. Філігрань. 1 арк. (арк. 29).



19. а) Тэкст прысягі («роты юраменту»), якую павінен выканаць празбітар Капыльскай царквы Аляксей Ярашэвіч паводле дэкрэта Слуцкай капітулы ад 31.08.1747. Без месца і даты.

Подпіс: Стэфан Манькоўскі, празб[ітар] уваскрэсенс[кі], пісар капітулы Слуцк[ай].

б) Пасведчанне сведкаў аб выкананні згаданай прысягі айцом А. Ярашэвічам. Без месца, 11.09.1747.

Подпіс: іераманах Гілярыён Рудакоўскі; Арцемі Рыбец, празбітар уваздвіжанскі слуцкі; Мойзеш Бялькевіч, празбітар раждзественскі слуцкі; Міхал Скулоўскі, вікар[ы] цар[квы] Сабор[най] Сл[уцкай].

Арыгінал. Стб. м. (а), пол. м. (б). Філіграні. 2 арк. (арк. 30—31; арк. 31 чысты, з затылкам).

20. Супліка (скарга) мазырскага пратапопа Феадора Савіцкага да слуцкага архімандрыта, намесніка Кіеўскай мітраполіі, што Міхал Руцінскі, паабяцаўшы падаваць позвы ў Камісарскі суд ЯКМ шляхце Мазырскага пав., складзеныя ў Мазырскім гродскім судзе, і ўзяўшы задатку за працу 2 бітых талера, не выканаў свайго абяцання. Без месца, 31.08.1747.

Подпіс: Феадор Савіцкі, пратапоп мазырскі (стб. м.).

Арыгінал. Пол. м. Філіграні. 2 арк. (арк. 32—33; арк. 33 чысты, з затылкам).

21. а) Супліка (скарга) петрыкаўскага протапрэзбітара Грыгорыя Змаровіча да слуцкага архімандрыта, намесніка Кіеўскай мітраполіі аб адмове мазырскіх енералаў ЯКМ падаваць позвы ў Камісарскі суд ЯКМ шляхце Мазырскага пав., якія чыняць шкоды праваслаўным святарам Петрыкаўскай пратапопіі. Без месца, 31.08.1747.

Подпіс: Грыгоры Змаровіч, протапрэзбітар петрык[аўскі].

б) Пасведчанне мазырскага пратапопа Феадора Савіцкага, што петрыкаўскі пратапоп Г. Змаровіч прыязджаў да мазырскай гродскай канцылярыі для запрашэння енералаў для разносу позваў, аднак без ніякага выніку і вялікім грашовым накладам. Без месца, 31.08.1747.

Подпіс: Феадор Савіцкі, пратапоп мазырскі (стб. м.).

Арыгінал. Пол. м. Філіграні. 2 арк. (арк. 34—35; арк. 35 чысты, з затылкам).

22. а) Позва ў Галоўны Трыбунал ВКЛ Мінскай кадэнцыі слуцкаму архімандрыту, намесніку Кіеўскай мітраполіі Юзафу Аранскаму і ўсім манахам Траецкага манастыра ў Трайчанах пад Слуцкам, а таксама гомельскай старосцінай Зофіі з Сеніцкіх Красінскай і яе сынам Багуславу, Томашу і Яну Корвінам-Красінскім па справе рэктара Слуцкага езуіцкага калегіума кс. Францішка Бучынскага аб захопе адказчыкамі езуіцкай в. Ямінск. Без месца, 10.09.1747.

Копія подпісу: Станіслаў Быкоўскі-Лопат, стар[оста] бабр[уйскі], пісар Трыб[унала] Гал[оўнага] ВКЛ.

б) Рэляцыйны квіт енерала ЯКМ Навагрудскага ваяводства Рафала Мярэнскага аб падачы вышэйзгаданай позвы Ю. Аранскаму. Без месца, 30.09.1747.

Подпіс: Рафал Мярэнскі, енерал ЯКМ в[аяводства] Н[авагрудскага].

Тагачасная копія. Пол. м. Філіграні. Стар. сігн.: № 11; № 62. 2 арк. (арк. 36—37).

23. Вызнанне святароў Слуцкай капітулы аб выдатках у 2000 зл. на працягу шасці гадоў у справах Пырашаўскай царквы (судовых выдатках, утрыманні празбітара Яна Дылієўскага і вікарыяў і інш.). Слуцк, 11.09.1747.

Подпісы: Міхал Андрэеўскі, празбітар мікольскі слуцкі; Раман Казюліч, празбітар варварынскі слуцкі; Мойзеш Бялькевіч, празбітар раждзественскі слуцкі; Стэфан Манькоўскі, празбітар Уваскр[асення] П[анскага] К[апітулы] Слуц[кай]; Арцемі Рыбец, празбітар уваздвіжанскі слуцкі; Філіп Багуцкі, празбітар мікольс[кі](?) слуцкі.

Арыгінал. Пол. м. Філігрань. 1 арк. (арк. 38).

24. Выпіс з кніг Мазырскага гродскага суда, 18.09.1747. Рэляцыйны квіт енерала ЯКМ Навагрудскага ваяводства Андрэя Паўловіча аб падачы позвы ў Камісарскі суд ЯКМ у Варшаве грабавецкаму празбітару айцу Грыгорыю Яроцкаму па справе слуцкага архімандрыта кс. Юзафа Аранскага. Без месца, 14.09.1747.

Пячатка на кустодыі мазырскага падстаросты Віктара Яленскага (Мазырскага гродскага суда).

Подпіс: карыгаваў Рудзінскі, рэгент гро[дскі] мазыр[скі], лянт[войт] м[еста] ЯКМ Мазыр[скага].

Арыгінал. Пол. м. Філігрань. Стар. сігн.: 12. 1 арк. (арк. 39).

25. Выпіс з кніг Мазырскага гродскага суда, 18.09.1747. Рэляцыйны квіт енерала ЯКМ Навагрудскага ваяводства Андрэя Паўловіча аб падачы позвы ў Камісарскі суд ЯКМ у Варшаве макарыцкаму празбітару айцу Матэушу Бруяцы ў Макарыцкай плябаніі па справе слуцкага архімандрыта кс. Юзафа Аранскага. Без месца, 16.09.1747.

Пячатка на кустодыі мазырскага падстаросты Віктара Яленскага (Мазырскага гродскага суда).

Подпіс: карыгаваў Рудзінскі, рэгент г[родскі] мазыр[скі], лянт[войт] м[еста] ЯКМ Мазыр[скага].

Арыгінал. Пол. м. Філігрань. Стар. сігн.: 14. 1 арк. (арк. 40).

26. Выпіс з кніг Мазырскага гродскага суда, 18.09.1747. Рэляцыйны квіт енерала ЯКМ Навагрудскага ваяводства Андрэя Паўловіча аб падачы позваў у Камісарскі суд ЯКМ у Варшаве брэсцкай ваяводзінай Разаліі з Чапскіх Хадкевічавай, яе генеральнаму камісару Урбану Антонію Грабніцкаму і яе губернатару Петрыкаўскага графства Паўлу Ржэвускаму ў замку Петрыкаўскім, петрыкаўскаму плябану кс. Томашу Яленскаму ў Петрыкаўскай плябаніі, грабавецкаму плябану айцу Грыгорыю Яроцкаму ў Грабавецкай плябаніі, макарыцкаму празбітару айцу Матэушу Бруяцы ў Макарыцкай плябаніі і жыткавіцкаму празбітару айцу Стэфану Бруяцы ў Жыткавіцкай плябаніі па справе слуцкага архімандрыта, намесніка Кіеўскай мітраполіі кс. Юзафа Аранскага. Без месца, 16.09.1747.



Пячатка на кустодыі мазырскага падстаросты Віктара Яленскага (Мазырскага гродскага суда).

Подпіс: карыгаваў Рудзінскі, рэгент г[родскі] мазыр[скі], лян[твойт] м[еста] ЯКМ Мазыр[скага].

Арыгінал. Пол. м. Філіграні. Стар. сігн.: 23; № 2. 2 арк. (арк. 41—42).

27. Выпіс з кніг Слуцкай майдэбурыі. Скарга слуцкага архімандрыта, намесніка Кіеўскай мітраполіі айца Юзафа Аранскага на ксяндзоў Слуцкага езуіцкага калегіума аб нападах іх падданых і здзяйсненні шкод на палях і сенажацях падданых в. Малы Ямінск або Трайчаны, якія належаць Слуцкаму Трайчанскаму Свята-Траецкаму кляштару. Слуцк, 25.11.1747 (стары стыль).

Пячатка на кустодыі Слуцкай майдэбурыі («Пегас»).

Подпісы: Аляксандр Кучарскі, войт маг[істрата] ме[ста] Сл[уцкага]; Якуб Мелянтовіч, пісар майд[эбурыі] м[е]ста Слуцка.

Арыгінал. Пол. м. Філігрань. Стар. сігн.: № 69; № 28. 2 арк. (арк. 43—44; арк. 44 чысты, з затылкам).

28. а) Прыватны ліст (пісьмо) капітана ЯКМ N. Воляна да слуцкага архімандрыта з паведамленнем аб ад'ездзе ў Мінск па сваіх справах, а таксама з просьбай пазычыць «Volumina Legum» і інш. кнігі, за якімі пасылае пана Капцевіча. Грозаў, 29.12.1747.

Подпіс: Волян, капітан ЯКМ.

б) (на адвароце арк. 46). Распіска Рафала Капцевіча аб атрыманні ад слуцкага архімандрыта васьмі кніг. Без месца, 1747 г. (чысло і месяц не зразумелы).

Подпіс: Рафал Капцевіч.

в) (на адвароце арк. 45, уверсе, перавернута). Прыпіска генерал-ад'ютанта Вялікай булавы С. Б. Воляна, які прыехаў ненадоўга з Мінска [у Грозаў?], з зычэннямі здароўя, доўгіх гадоў і інш. пажаданняў для [слуцкага архімандрыта]. Без месца і даты.

Подпіс: С[тэфан] Б[агуслаў] Волян, ГАБВВКЛ (генерал-ад'ютант Булавы Вялікай ВКЛ).

Арыгінал. Пол. м. Без філіграні. 2 арк. (арк. 45—46).

29. а) Позва Мазырскага земскага суда айцам-езуітам Юровіцкай рэзідэнцыі Францішку Колерту і Мазырскай рэзідэнцыі Казіміру Лазінскаму, мазырскаму плябану кс. Бенядыкту Прэўлоцкаму, навагрудскай ваяводзінай Барбары з Завішаў Радзівілавай, мазырскаму стольнікавічу Мікалаю Аскерцы і інш. у Камісарскі суд ЯКМ у Варшаве па справе слуцкага архімандрыта Юзафа Аранскага і Сылівестра Кахоўскага, пленіпотэнтаў ад імя Расійскай Імперыі, мазырскага пратапопа Тэадора Савіцкага і ўсяго праваслаўнага духавенства Мазырскай пратапопіі аб гвалтоўным захопе праваслаўных цэркваў ва ўніяцтва. Слуцк, манастыр Св. Тройцы, 10.07.1747.

Подпіс: Юзаф Вольбек, пісар земскі мазырскі, с[тароста] дам[анавіцкі].

б) Рэляцыйны квіт енерала ЯКМ Мазырскага пав. Стэфана Браткоўскага аб падачы позвы вышэйзгаданым асобам. Без месца, 18.09.1747.

Подпіс: Стэфан Браткоўскі, енерал ЯКМ п[авета] М[азырскага].

Арыгінал. Пол. м. Філігрань. Стар. сігн.: 9. 2 арк. (арк. 47—48).

30. Аблігацыйны ліст капітана ЯКМ Яна Фрыдэрыка Фогта, дадзены слуцкаму архімандрыту, намесніку Кіеўскай мітраполіі Юзафу Аранскаму, на пазычаныя ў яго 400 зл., з тэрмінам вяртання пазыкі 1.01.1747 у Слуцкай архімандрыі Св. Тройцы. Слуцк, 17.07.1746.

Подпіс: Ян Фрыдэрык Фогт, капітан ЯКМ.

Арыгінал. Пол. м. Філігрань. 1 арк. (арк. 49).

31. Ліст-обліг слуцкіх абывацеляў Трафіма Шчурыка і яго сына Яна Шчурыковіча, дадзены слуцкаму архімандрыту, намесніку Кіеўскай мітраполіі Юзафу Аранскаму, на пазычаныя ў яго 800 зл. на набыццё тавараў у Кіеве, з тэрмінам аддачы пазыкі па вяртанні іх з Кіева. Без месца, [28.03.1747] (дата ў загалоўку).

Подпісы: Трафім Счурык; Ян Шчурыковіч; Ян М. Мелянтовіч.

Арыгінал. Пол. м. Філігрань. 1 арк. (арк. 50).

32. Супліка (скарга) петрыкаўскага пратапопа Грыгорыя Змаровіча і петрыкаўскага прэзбітара Якуба Загароўскага да слуцкага архімандрыта, намесніка Кіеўскай мітраполіі аб здзяйсненні розных шкод і крыўд петрыкаўскім святарам у кастрычніку і лістападзе 1746 г., падчас побыту архімандрыта ў Варшаве, з боку Урбана Антонія Грабніцкага, камісара брэсцкай ваяводзінай Хадкевічавай. Без месца і даты [1747 г.]

**Заўвага:** тэкст дакумента няпоўны, паміж арк. 51 і 52 не хапае аркушаў.

Подпісы: Грыгоры Змаровіч, пратапоп петрыкаўскі; Якуб Загароўскі, прэзб[ітар] петрык[аўскі].

Арыгінал. Пол. м. Філіграні. 2 арк. (арк. 51—52).

33. Рэестр дакументаў, якія датычаць Слуцкага Трайчанскага манастыра, цэркваў Слуцкай архімандрыі, становішча праваслаўнай царквы ў ВКЛ, каралеўскіх прывілеяў і міждзяржаўных дамоў, узятых [слуцкім архімандрытам] у падарожны архіў [пры паездцы ў Варшаву]. Без месца і даты.

Пячатак і подпісаў няма.

Тагачасная копія. Пол. м. Без філіграні. 2 арк. (арк. 53—54; арк. 54 чысты, з затылкам).

34. Супліка (скарга) святароў Слуцкай капітулы да слуцкага архімандрыта, намесніка Кіеўскай мітраполіі аб нявыплаце з 1732 г. з арэнды слуцкага мыта арандатарамі 16 камянёў воску слуцкім цэрквам паводле даўніх фундушаў. Без месца і даты.

Подпісы: Міхал Андрэеўскі, прэзбітар мікольскі слуцкі; Раман Казюліч, прэзбітар варварынскі слуцкі; Мойзеш Бялькевіч, прэзбітар раждзественскі; Філіп Багуцкі, прэз[бітар] ц[арквы] С[вя]та-Мік[алаеўскай] слуцкай; Стэфан Манькоўскі, прэзбітар уваскрасенскі П[расвятой?] К[апітулы] С[луцкай]; Арцемі Рыбец, прэзбітар уваздвіжанскі слуцкі; Базылі Бараноўскі, прэзбітар міхалаўскі слуцкі.



Арыгінал. Пол. м. Філігрань. 2 арк. (арк. 55, 58; арк. 58 чысты, з затылкам).

35. Пераклад на рускую мову зместу дакумента № 34. Без месца і даты [1-я пал. 19 ст.].

Арыгінал. Рус. м. Філігрань. 2 арк. (арк. 56—57; арк. 57 чысты).

36. Ліст-обліг слуцкага абывацеля Трафіма Шчурыка, дадзены слуцкаму архімандрыту, намесніку Кіеўскай мітраполіі Юзафу Аранскаму, на пазычаныя ў яго 254 зл. з тэрмінам вяртання пазыкі 23.03.1748 г. Без месца, [8.06.1747] (дата ў загалоўку).

Подпісы: Трафім Шчурык; Ян М. Мелянтовіч.

Арыгінал. Пол. м. Філігрань. 1 арк. (арк. 59).

37. а) Супліка (скарга) Кандрата Ката да [слуцкага архімандрыта] аб збіцці мазырскім пратапопам 20.08.1747 у Міхайлаўскай царкве яго бацькі Кірэя Ката, ад чаго той хутка памёр. Без месца і даты.

Копія подпісу: Кандрат Кот (крыжыкам).

Подпіс: 7.02.1748 канатаваў Г. Аскерка, староста судовы і войт мазырскі.

б) Супліка мазырскіх святароў да [слуцкага архімандрыта] аб недастойных паводзінах мазырскага пратапопа айца Савіцкага, які п'е па начах у карчме, з'яўляецца на службу нецвярозы, загадвае збіваць мяшчан і святароў і здзяйсняе іншыя крыўды. Без месца і даты.

Копіі подпісаў: Теадор Мітукевіч, прэзбітар спаскі мазырскі (пол. м.); Дзям'ян Сакуновіч, прэзбітар мікольскі мазырскі (стб. м.); Гаўрыіл Квіцэвіч, прэзбітар мазырскі (стб. м.).

в) Супліка ўдавы Настасіі, былой мазырскай мікольскай, а цяпер касцюковіцкай пападзі да [слуцкага архімандрыта] аб захопе мазырскім пратапопам Тэадорам Савіцкім плябанскіх будынкаў і выгнанні яе на вуліцу, а таксама аб тым, што дзеянні пратапопа былі прычынай смерці яе мужа айца Юрыя Назарэвіча. Без месца і даты.

Копія подпісу: Настасія (крыжыкам).

Подпіс: 7.02.1748 канатаваў Г. Аскерка, староста судовы, войт мазырскі.

Подпіс на арк. 60 і 61 унізе: Раман Капескі (стб. м.).

Копія тагачасная. Пол. м. Філіграні. 2 арк. (арк. 60—61; старая фаліяцыя (18 ст.): арк. 32—33).

38. а) Ліст мазырскага судовага старосты і войта Гервазія Людвіка Аскеркі да ўсяго насельніцтва места Мазыр і Мазырскай вол., праваслаўных парафіян, каб не падпарадкоўваліся былому мазырскаму пратапопу Тэадору Савіцкаму, які збег, не падпарадкаваўшыся судоваму выраку. Мазыр, 8.02.1748.

Копія подпісу: Гервазі Людвік Аскерка, староста судовы і войт места ЯКМ Мазыра.

б) Ліст мазырскага старосты Г. Аскеркі да слуцкага архімандрыта з паведамленнем аб адхіленні паводле выраку свайго войтаўскага суда ад пасады мазырскага пратапопа айца Тэадора Савіцкага і прызначэнні на гэтую пасаду айца Тэадора Мітукевіча да канчатковага вырашэння пытання айцом архімандрытам. Мазыр, 8.02.1748.

Копія подпісу: Г. Аскерка, ССМ (староста судовы мазырскі).

в) Ліст нейкага М. Лаўцэвіча да [слуцкага архімандрыта] аб выдачы з кансісторскага архіва ліста мазырскага пратапопа, пісанага да Лаўцэвіча, які ліст патрэбны для інквізіцыі (допыту) падчас антэкаміцыяльнага сойміка [Мазырскага пав.]. Бялавічы, 8.06.1748.

Копія подпісу: М. Лаўцэвіч.

Тагачасная копія. Пол. м. Філіграні. 2 арк. (арк. 62—63; старая фаліяцыя (18 ст.): арк. 36—37).

39—40. а) Супліка (скарга) мазырскага мікольскага празбітара Дзям'яна Сакуновіча да [слуцкага архімандрыта] аб збіцці яго і яго жонкі мазырскім пратапопам Тэадорам Савіцкім у Мікольскай царкве падчас богаслужэння ў храмавае свята Св. Міколы 17.12.1747. Мазыр, 24. [12].1747.

Копіі подпісаў: Дзям'ян Сакуновіч, празбітар мікольскі мазырскі; канатаваў 7.02.1748 Г. Аскерка, староста судовы і войт мазырскі.

б) Супліка мазырскага спаскага празбітара Тэадора Міцюкевіча да [слуцкага архімандрыта] аб няслушным трыманні яго ў турме, збіцці і разарэнні яго дома мазырскім пратапопам. Без месца, 6.02.1748.

Копіі подпісаў: Тэадор Міцюкевіч, празбітар спаскі мазырскі; канатаваў 7.02.1748 Г. Аскерка, староста судовы і войт мазырскі.

в) Супліка мазырскага мешчаніна і цэхмістра шавецкага цэха Аўрама Замыкі да [слуцкага архімандрыта] ад імя свайго і інш. мяшчан-парафіян Пятніцкай царквы аб абрабаванні і спусташэнні мазырскім пратапопам Тэадорам Савіцкім гэтай царквы, а таксама рэгулярным збіцці мяшчан у цэрквах падчас богаслужэнняў, паленні іх свячамі і г. д. Без месца, 25.12.1747.

Копіі подпісаў: Аўрам Замыка (крыжыкам); канатаваў 7.02.1748 Г. Аскерка, староста судовы і войт мазырскі.

**Заўвага:** дакументы знаходзіліся ў зборніку копій, а пазней аркушы раздзелены і сшыты ў іншым парадку. Цяпер пад № 40 знаходзіцца дакумент а) і пачатак дакумента б) (арк. 66—66 адв.), а пад № 39 — канчатак дакумента б) і дакумент в) (арк. 64—65 адв.).

Копія тагачасная. Пол. м. Філіграні. 3 арк. (№ 39 — арк. 64—65, старая фаліяцыя (18 ст.): арк. 29—30; № 40 — арк. 66, старая фаліяцыя (18 ст.): арк. 28).

41. Супліка мазырскага прачысценскага празбітара Габрыэля Кунцэвіча да [слуцкага архімандрыта] аб трыманні яго няслушна ў турме і збіцці мазырскім пратапопам Тэадорам Савіцкім. Без месца і даты.

Копіі подпісаў: Габрыэль Кунцэвіч, празбітар прачысценскі; канатаваў 7.02.1748 Г. Аскерка, староста судовы і войт мазырскі.



Копія тагачасная. Пол. м. Філігрань. 1 арк. (арк. 67; старая фаліяцыя (18 ст.): арк. 31).

42. Данясенне мазырскага пратапопа Тэадора Савіцкага ў Кіеўскую духоўную кансісторыю з тлумачэннем, што паводле прадстаўлення слуцкага архімандрыта Юзафа Аранскага збіраўся аформіць позвы крыўдзіцелям цэркваў сваёй пратапопіі праз Мазырскую гродскую канцылярыю, аднак, з-за небяспекі свайго жыцця ад мазырскіх старосты Гервазія Аскеркі і дзяржаўцы (падстаросты) Антонія Якімовіча, яму прыйшлося збегчы і хавацца, і тады ж быў разрабаваны яго дом з маёмасцю і дакументамі. Без месца і даты.

Копія подпісу: Феадор Савіцкі, пратапоп мазырскі.

Копія тагачасная. Стб. м. Філігрань. 1 арк. (арк. 68; старая фаліяцыя (18 ст.): арк. 26).

43. Выпіс з кніг Мінскага гродскага суда, 26.02.1748. Актыкацыя выпісу з кніг Варшаўскага гродскага суда 1747 г. Рэскрыпт караля Аўгуста III плоцкаму біскупу Антонію Себестыяну Дэмбоўскаму, перамышльскаму біскупу Геранімі Вацлаву Серакоўскаму і інш. духоўным і свецкім дыгнітарам Кароны Польскай і ВКЛ, прызначаным каралём камісарамі на Варшаўскую камісію ЯКМ у дзень 7.12.1746, аб пераносе пачатку пасяджэння Камісіі ў сувязі са смерцю грэка-ўніяцкага мітрапаліта на 6.11.1747, калі будзе абраны новы мітрапаліт. Канцылярыя ЯКМ Каронная [у Варшаве], 15.10.1747.

Пячатка на кустодыі Мінскага гродскага суда (кепскай якасці).

Подпісы: карыгаваў Яленскі, ГМРГВМ (гараднічы мазырскі (?), рэгент гродскі ваяводства Мінскага); звяраў з актамі Пушкін (на затылку).

Арыгінал. Пол. м. Філіграні. 4 арк. (арк. 69—72).

44. Аблігацыйны ліст старадубскага мастаўнічага Леапольда Славінскага, дадзены слуцкаму архімандрыту Юзафу Аранскаму, на пазычаныя ў яго 18 чырвоных злотых з тэрмінам вяртання ў дзень Яна Хрысціцеля ў 1748 г. у Трайчанах, у Слуцкай Архімандрыі. Слуцк, 23.04.1748.

Подпісы: Леапольд Славінскі, мас[таўнічы] стар[адубскі]; Ян Пянткоўскі; Міхал Данкоўскі.

Арыгінал. Пол. м. Філігрань. 1 арк. (арк. 73).

45. Ліст мазырскага старосты Гервазія Аскеркі да [слуцкага архімандрыта] з просьбай, каб выбраў сярод мазырскіх святароў і прызначыў новага пратапопа замест выгнанага за зладзействы пратапопа [Тэадора Савіцкага]. Мінск, 4.05.1748.

Копія подпісу: Г. Аскерка, ССМ (староста судовы мазырскі).

Копія тагачасная. Пол. м. Філігрань. 1 арк. (арк. 74; старая фаліяцыя (18 ст.): арк. 21).

46. Ліст мазырскіх магдэбурскіх ураднікаў ЯКМ да духоўных суддзяў Кіеўскай духоўнай кансісторыі з просьбай не верыць былому мазырскаму пратапопу Тэадору Савіцкаму ў яго няслушных абвінавачваннях мазырскіх спаска-

га святара Тэадора Міцюкевіча і мікольскага святара Дзям'яна Сакуновіча, так як сам Савіцкі асуджаны судом слуцкага архімандрыта Юзафа Аранскага за свае злачынствы супраць мазырскіх святароў і парафіян. Магдэбурыя ЯКМ [Мазырская], 11.05.1748.

Копіі подпісаў: Карп Рудкевіч, бурмістр места Яго Каралеўскай Міласці Мазыра (стб. м.); Канстанты Кантратовіч, пісар места Я[К]М Мазыра магдэбурскі (пол. м.).

Копія тагачасная. Пол. м. Філіграні. 2 арк. (арк. 75—76; старая фаліяцыя (18 ст.): арк. 22—23).

47. Ліст мазырскіх магдэбурскіхураднікаў ЯКМ да кіеўскага мітрапаліта пра тое ж, што апісана ў дакуменце № 46. Магдэбурыя ЯКМ Мазырская, 11.05.1748.

Копіі подпісаў: гл. № 46.

Копія тагачасная. Пол. м. Філіграні. 2 арк. (арк. 77—78; старая фаліяцыя (18 ст.): арк. 24—25).

48. Прыватны ліст (пісьмо) удавы пані Волянавай да айца слуцкага архімандрыта з пажаданнямі добрай дарогі ў Санкт-Пецярбург, а таксама просьбай наведаць перад ад'ездам яе дом і пачакаць з вяртаннем пазыкі. Без месца, 5.07.1748.

Подпіс: Волянавая.

Арыгінал. Пол. м. Філіграні. 2 арк. (арк. 79—80).

49. Ліст чашніка ВКЛ, мазырскага старосты Гервазія Людвіка Аскеркі да кіеўскага архіепіскапа (мітрапаліта) з просьбай, каб даў дазвол на прызначэнне мазырскім пратапопам айца Тэадора Мітукевіча замест адхіленага судом ад пасады пратапопа Тэадора Савіцкага, і каб надоўга не затрымлівалі ў Кіеве ў духоўным судзе мазырскіх святароў. Мазыр, 21.08.1748.

Копія подпісу: Гервазі Людвік Аскерка, чашнік ВК[Л], староста судовы мазырскі.

Копія тагачасная. Пол. м. Філіграні. 1 арк. (арк. 81; старая фаліяцыя (18 ст.): арк. 20).

50. а) Данясенне мазырскага пратапопа Феадора Савіцкага ў Кіеўскую духоўную кансісторыю, што па смерці былога кіеўскага мітрапаліта Рафаіла святар Мазырскай Мікалаеўскай царквы Дзям'ян Сакуновіч, абмінаючы духоўны суд, падаў няслушную скаргу на пратапопа мазырскаму старосце Гервазію Аскерцы, які, паводле свайго дэкрэта, спагнаў з пратапопа вялікую суму грошай; таму пратапоп просіць кансісторыю выращыць яго справу з айцом Сакуновічам. Без месца і даты.

Копія подпісу: Феадор Савіцкі, пратапоп мазырскі.

б) Паказанні мазырскага мікалаеўскага святара Дзям'яна Сакуновіча ў Канцылярыі Кіеўскай мітраполіі наконт данясення мазырскага пратапопа Феадора Савіцкага (гл. № 50-а). Без месца, 21.10.1748.

Копія подпісу: Дзям'ян Сакуновіч, іерэй мікольскі мазырскі.



в) Паказанні мазырскага пратапопа Феадора Савіцкага ў Канцылярыі Кіеўскай мітраполіі супраць мазырскага мікалаеўскага святара Дзям'яна Сакуновіча. Без месца, 5.11.1748.

Копія подпісу: пратапоп мазырскі Феадор Савіцкі.

г) Адказ Д. Сакуновіча на паказанні Ф. Савіцкага. Без месца, 5.11.1748.

Копія подпісу: іерэй Дзям'ян Сакуновіч.

Копія тагачасная. Стб. і стукр. м. Філіграні. 2 арк. (арк. 82—83; старая фаліяцыя (18 ст.): арк. 1—2).

51. Паказанні мазырскіх святароў па справе ў духоўным судзе ў Канцылярыі Кіеўскай мітраполіі.

**Заўвага:** цяпер некаторыя аркушы пераблытаны: арк. 84 павінен быць перавернуты наадварот і знаходзіцца паміж арк. 88 і 89, як паводле старой фаліяцыі.

а) Данясенне мазырскага пратапопа Феадора Савіцкага кіеўскаму мітрапаліту Цімафею Шчарбацкаму аб няслушных абвінавачваннях яго з боку святароў Мазырскіх Спаскай і Мікольскай цэркваў і іх прыхаждан, прыцягванні яго ў свецкі суд, мінаючы духоўны суд, і інш. шкодах. Без месца, 9.09.1748.

Копія подпісу: Феадор Савіцкі, пратапоп мазырскі.

Арк. 85—87 (старая фаліяцыя — арк. 4—6).

б) Паказанні святара Мазырскай Праабражэнскай царквы Феадора Міцюкевіча ў Канцылярыі Кіеўскай мітраполіі супраць данясення мазырскага пратапопа Феадора Савіцкага. Без месца, 22.10.1748.

Копія подпісу: Царквы Праабражэнскай Мазырскай іерэй Феадор Міцюкевіч.

Арк. 87 адв.—88 (старая фаліяцыя — арк. 6 адв.—7).

в) Паказанні святара Мазырскай Мікольскай царквы Дзям'яна Сакуновіча ў Канцылярыі Кіеўскай мітраполіі супраць данясення мазырскага пратапопа Феадора Савіцкага. Без месца, 22.10.1748.

Копія подпісу: Царквы Мікольскай Мазырскай іерэй Дзям'ян Сакуновіч.

Арк. 88—88 адв. (старая фаліяцыя — арк. 7—7 адв.).

г) Адказ мазырскага пратапопа Феадора Савіцкага ў Канцылярыі Кіеўскай мітраполіі на паказанні святара Дзям'яна Сакуновіча. Без месца, 29.10.1748.

Копія подпісу: пратапоп мазырскі Феадор Савіцкі.

Арк. 88 адв., 84 адв. (старая фаліяцыя — арк. 7 адв.—8).

д) Апраўдальнае паказанне святара Дзям'яна Сакуновіча на адказ пратапопа Феадора Савіцкага. Без месца, 17.11.1748.

Копія подпісу: Іерэй Дзям'ян Сакуновіч.

Арк. 84 адв., 84 (старая фаліяцыя — арк. 8—8 адв.).

е) Апраўдальнае паказанне святара Феадора Міцюкевіча на адказ пратапопа Феадора Савіцкага (гл. № 51-ж). Без месца, 17.11.1748.

Копія подпісу: Іерэй Феадор Міцюкевіч.

Арк. 84, 89 (старая фаліяцыя — арк. 8 адв.—9).

ж) Адказ мазырскага пратапопа Феадора Савіцкага ў Канцылярыі Кіеўскай мітраполіі па паказанні мазырскага праабражэнскага святара Феадора Міцюкевіча. Без месца, 29.10.1748.

Копія подпісу: Пратапоп мазырскі Феадор Савіцкі.

Арк. 89—89 адв. (старая фаліяцыя — арк. 9—9 адв.).

Копія тагачасная. Стб/стукр. м. Філіграні. 6 арк. (арк. 84—89; стар. фаліяцыя — арк. 8 (перавернуты), 4—7, 9).

52. а) Данясенне мазырскага пратапопа Феадора Савіцкага кіеўскаму мітрапаліту Цімафею Шчарбацкаму з просьбай, каб загадаў мазырскім святарам вярнуць яму ключы ад Спаскай царквы, а таксама яго дакументы на царкву, якіх святароў ён безвынікова чакаў у Слуцкай архімандрыі для судовага разбіральніцтва. Без месца, 5.10.1748.

Копія подпісу: Феадор Савіцкі, пратапоп мазырскі.

б) Паказанні мазырскіх праабражэнскага святара Феадора Міцюкевіча і мікольскага святара Дзям'яна Сакуновіча ў Канцылярыі Кіеўскай мітраполіі супраць данясення мазырскага пратапопа Феадора Савіцкага, што не з'явіліся на суд у Слуцкую архімандрыю з-за ад'езду слуцкага архімандрыта Юзафа Аранскага ў Кіеў. Без месца, 24.10.1748.

Копіі подпісаў: Іерэй Феадор Міцюкевіч, праабражэнскі; іерэй Дзям'ян Сакуновіч, мікольскі.

в) Адказ пратапопа Ф. Савіцкага ў Канцылярыі Кіеўскай мітраполіі на паказанні святароў Ф. Міцюкевіча і Д. Сакуновіча. Без месца, 29.10.1748.

Копія подпісу: Пратапоп мазырскі Феадор Савіцкі.

г) Апраўдальныя паказанні святароў Ф. Міцюкевіча і Д. Сакуновіча на адказ пратапопа Ф. Савіцкага. Без месца, 7.11.1748.

Копіі подпісаў: Іерэй С[вя]та-Праабражэнскай Мазырскай царквы Феадор Міцюкевіч; іерэй С[вя]та-Мікольскай Мазырскай царквы Дзям'ян Сакуновіч.

Копія тагачасная. Стб./стукр. м. Філіграні. 2 арк. (арк. 90—91; старая фаліяцыя — арк. 10—11).

53. а) Паказанні мазырскага пратапопа Феадора Савіцкага ў Канцылярыі Кіеўскай мітраполіі, што стары анцімінс, які некалі пажалаваў нябожчык кіеўскі архіепіскап Варлаам у царкву Св. Архістраціга Міхаіла ў Мазыры, да якой пратапоп рукапаложаны, ён перадаў па просьбе прыхаджан у царкву Св. Георгія ў сяле Зімовішча. Без месца, 16.11.1748.

Копія подпісу: Феадор Савіцкі.

б) Адказ мазырскага спаскага святара Феадора Міцюкевіча ў Канцылярыі Кіеўскай мітраполіі супраць паказанняў мазырскага пратапопа Феадора Савіцкага наконт старога анцімінса. Без месца і даты.

Копія подпісу: Іерэй Феадор Міцюкевіч, с[вя]таспаскі мазырскі.

Подпіс (які завярае копію): канцылярыст Раман Капескі.

Копія тагачасная. Стб./стукр. м. Філіграні. 2 арк. (арк. 92—93; старая фаліяцыя — арк. 38—39).



54. Прыватны ліст (пісьмо) ігумена Дзяцелавіцкага манастыра Іаасафа да ігумена Маларасійскага Гадзяцкага манастыра, наміната Слуцкай архімандрыі з віншаваннямі з новай пасадай (наміната), падзякай за дадзеныя Дзяцелавіцкаму манастыру грошы і абяцаннем у тэрмін вярнуць айцу Калісту грошы, пазычаныя ў Варшаве для вяртання дадому. Дзяцелавічы, 27.11.1748.

Подпіс: Кіева-Пячэрскай Лаўры прыпіснога Дзяцелавіцкага м[а]н[ас]т[ы]ра ігумен, саборны іераманах Іаасаф.

Арыгінал. Стб./рус. м. Без філіграні. 2 арк. (арк. 94—95).

55. Анатацыя з кніг паточных Слуцкага замкавага ўрада. Вызнанне жыдоў Міхеля Ляйбовіча, былога восаўскага арандатара, і Шэвеля Зараховіча, слуцкага купца і абываццеля, аб арандаванні на тры гады корчам і інш. у Пухавічах у намесніка Кіеўскай мітраполіі, слуцкага і капыльскага архімандрыта Юзафа Аранскага за 250 зл. у год. Слуцк, 15.10.1745.

Пячатка на кустодыі ўрада Слуцкага замка («Пагоня»).

Подпіс: Ін. Вейсенгоф, скарб[нік] інфлянт[скі], стар[оста] сл[уц]кі, кап[ыльс]кі.

Арыгінал. Пол. м. Філіграні. 1 арк. (арк. 98).

56. Прыватны ліст (пісьмо) нейкага Тэадора (прозвішча неразборліва) да ігумена Грозаўскага манастыра кс. Дзярдкевіча з прабачэннямі, што не можа сам прыехаць, і паведамленнем аб адсылцы кс. ігумену матэрыялаў інквізіцыі (допыту) былога мазырскага пратапопа Савіцкага ў справе з мазырскім старостай і шляхтай, якая адбывалася ў судзе слуцкага архімандрыта. Мазыр, 7.01.1749.

Пячатка на чырвоным сургучы (на адвароце арк. 97) і подпіс: Тэадор …. (прозвішча неразборліва).

Арыгінал. Пол. м. Філіграні. 2 арк. (арк. 97—97; арк. 97 чысты, з адрасам).

57. Адсутнічае.

58. Супліка (скарга) наміната Слуцкай архімандрыі, намесніка Кіеўскай мітраполіі Міхала Казачынскага да князя калятара [Радзівіла] аб крыўдах некаторым цэрквам Слуцкай архімандрыі, г. зн. аб адсутнасці святара ў Парэцкай царкве, аб захопе ўніяцкім святаром праваслаўнай царквы і яе фундушаў у Пырашаўскай Слабадзе і інш. Без месца і даты [1749 г.].

Подпіс: Міхал Казачынскі, намеснік архімандрыі Слуцкай, НМК (намеснік мітраполіі Кіеўскай).

Арыгінал. Пол. м. Філіграні. 1 арк. (арк. 100).

59. Ліст-прэзента (прадстаўленне) вялікага падчашага ВКЛ кн. Гераніма Фларыяна Радзівіла да праваслаўнага духавенства цэркваў і манастыроў Слуцкай архімандрыі і іх парафіян аб зацвярджэнні архімандрытам абранага намінатам Слуцкай архімандрыі айца Міхала Казачынскага ў сувязі з пераходам былога архімандрыта Юзафа Аранскага на пасаду пячэрскага архімандрыта, з рэка-

мендацыяй да благаслаўлення кіеўскім архіепіскапам Тыматэушам Шчарбацкім. Замак Бяльскі (Белая), 10.02.1749.

Друк подпісу: Г. Ф. кн. Радзівіл, падчашы в[ялікі] ВКЛ.

Арыгінал, друкаваны экзэмпляр. Пол. м. Без філіграні. Стар. сігн.: № 2. 1 арк. (арк. 101; аркуш вялікага фармату (in folio), перакладзены напалам).

60. Дэкрэт Галоўнага Трыбунала ВКЛ у справе кс. Юзафа Абрампальскага, рэктара, і ксяндзоў езуітаў слуцкага калегіума з слуцкім архімандрытам, намеснікам Кіеўскай мітраполіі кс. Юзафам Аранскім і манахамі Слуцкага Св.-Траецкага манастыра, а таксама з гомельскай старосцінай Зофіей з Сініцкіх Красінскай і яе сынамі Багуславам, Томашам і Янам Корвін-Красінскімі аб захопе трайчанскімі і баяніцкімі падданымі адказчыкаў зямель, лясоў і г. д. ад маёнтка скаржнікаў Ямінск Навагрудскага ваяводства. Навагрудак, 13.03.1749.

Пячатка на кустодыі галоўнага Трыбунала ВКЛ Навагрудскай кадэнцыі (пісара Трыбунала Антонія Рдултоўскага).

Подпісы: Ант[оні] на Рдултове Рдултоўскі, падв[аяво]да і дэп[ута]т в[аяводства] Н[авагрудскага], пісар Трыб[унала] Га[лоўнаг]а ВКЛ; карыгаваў Гутаровіч, РТГ ВКЛ (рэгент Трыбунала Галоўнага ВКЛ); звяраў з актамі Саванеўскі (на адвароце арк. 104).

Арыгінал. Пол. м. Філіграні. Стар. сігн.: № 136; № 13. 4 арк. (арк. 102—104; аркуш паміж арк. 102 і 103 не нумараваны).

Літаратура

1. Беларускі археаграфічны штогоднік. Мінск, 2004. Вып. 5. С. 47—72; Мінск, 2005. Вып. 6. С. 288—311; Мінск, 2006. Вып. 7. С. 225—237; Мінск, 2007. Вып. 8. С. 72—88; Мінск, 2008. Вып. 9. С. 194—214; Мінск, 2012. Вып. 13. С. 184—206.

*Артыкул паступіў у рэдакцыю 02.05.2013*



**І. П. Клімаў,**
*дацэнт кафедры беларускай філалогіі*
*Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў,*
*кандыдат філалагічных навук;*
e-mail: klimau@mail.ru

## ТЭМАТЫЧНАЯ ГРУПОЎКА ЛЕКСІКІ Ў ПЕРАКЛАДЗЕ ЕВАНГЕЛЛЯ В. ЦЯПІНСКІМ

Тэматыка евангельскіх апавяданняў даволі аднастайная, аднак утрымлівае шырокі спектр лексікі: асабовай, канкрэтна-прадметнай, абстрактнай, уласнай і інш. Разам з тым у Евангеллях адны тэматычныя групы і тэрмінасістэмы шырока прадстаўлены, іншыя — сціпла, а некаторыя не ўжываюцца зусім. Пры ўсёй абмежаванасці свайго аб'ёму (у сярэднім каля 1,5 тыс. слоў і 14 тыс. слоўжыванняў [3, s. 16, 20]) евангельскія творы могуць даволі шырока рэпрэзентаваць лексічную сістэму любой мовы, на якую ажыццяўляецца іх пераклад.

Евангельскі пераклад, здзейснены беларускім пратэстантам В. Цяпінскім на пачатку 1570-х гг. [1, с. 33—34, 192—193, 324], адлюстроўвае высокі ўзровень развіцця старабеларускай мовы. Тэматычная групоўка лексікі гэтага помніка характарызуе не толькі сам пераклад, але і здольна даць уяўленне пра старабеларускую лексіку іншых перакладных твораў Св. Пісьма. У дадзенай працы праведзена тэматычна-зместавая класіфікацыя амаль усёй знамянальнай лексікі перакладу. Задачай было вызначыць кола лексем, што складаюць характэрную асаблівасць пэўных прадметна-тэматычных падсістэм, і пры магчымасці выявіць структурныя агульнасці апошніх. Матэрыялам служыў тэкст евангельскага перакладу В. Цяпінскага, а таксама ўсіх маргіналій (заўваг выдаўца на палях кнігі), прадстаўленых у выданні (але без той лексікі, што цытуецца ў маргіналіях — такія словы ці выразы акрэслены В. Цяпінскім на палях выдання двукроп'ем. Гэтыя лексемы ўяўляюць сабой цытаты з іншых польскіх і царкоўнаславянскіх перакладаў (часам крыху змененыя), а таму іх аднясенне да старабеларускага лексікону далёка неадназначнае). Лексіка, што сустракаецца толькі ў маргіналіях, акрэслена літарай *м* у дужках: *(м)*.

Пры гэтым трэба ўлічваць шэраг асаблівасцей семантызацыі лексікі, прадстаўленай у «Евангеллі» В. Цяпінскага. Некаторыя лексемы выступаюць у Евангеллях толькі ў пэўным значэнні (напрыклад, *молитва* заўжды азначае вуснае звяртанне, але не жанр ці твор), паводле якога яны адносяцца да належнага (пад)разраду. Тыя лексемы, што прадстаўлены ў перакладзе адзінкава і толькі ў неасноўным ці нават пераносным сваім значэнні (напрыклад, *пена* — сакрэцыя чалавечых залоз), адносіліся да пэўнага (пад)разраду паводле дадзенага значэння. Лексемы, што маюць некалькі значэнняў, могуць уключацца ў некалькі разрадаў, хаця часцей за ўсё аднесены да аднаго з разрадаў. Многія канкрэтныя лексемы ў рэлігійным творы набывалі пераноснае значэнне (*кровъ*, *куколь*, *небо*, *семе*, *тело* і інш.), якое пры семантызацыі звычайна не ўлічвалася. Пры патрэбе ўказвалася дэнататыўнае значэнне амонімаў і тых лексем, якія адсутнічаюць у

сучаснай мове ці маюць у ёй іншую семантыку. З прычыны адрознення культур сэнсавае напаўненне некаторых слоў (*гробъ*, *море*, *печь*, *свирень*, *тискъ* і інш.) магло быць розным для беларусаў XVI ст. і яўрэяў Палесціны пачатку I ст. (у асобных евангелістаў). Таму пры аднясенні падобных лексем да таго ці іншага разраду прымалася тыповае менавіта для беларускай культуры значэнне (паколькі найбольш верагодна, што яно было вядома і Цяпінскаму).

Класіфікацыя лексікі праводзілася ў асноўным паводле яе часцінамоўнай прыналежнасці, якая вызначалася згодна з сінтаксічнай функцыяй слоў, але пры пэўным уліку марфемнай структуры. Ігнараваліся службовыя словы (каля 60), лічэбнікі (каля 35) і большасць займеннікаў (каля 30), пазбаўленых прадметнага значэння, а таксама прыслоўі (120) — класіфікацыю апошніх лепш праводзіць паводле іх структурных тыпаў, што зроблена ў асобнай працы [1, с. 128—129]. Дзеепрыслоўі адносіліся да дзеясловаў, таксама як і дзеепрыметнікі ў прэдыкатыўнай функцыі, але дзеепрыметнікі ў атрыбутыўнай функцыі (азначэнні) адносіліся да прыметнікаў.

У межах кожнага класа вызначаны шэраг тэматычных разрадаў, а ў межах асобных разрадаў — больш дробныя падразрады. Аднясенне лексем унутры груп да таго ці іншага разраду або падразраду (як і межы такіх аб'яднанняў) адбывалася логіка-інтуіцыйным шляхам, а таксама ў залежнасці ад колькасці адзінак. У тэхнічных мэтах малалікія разрады і падразрады лексікі далучаліся (паводле семантычнай блізкасці ці сумежнасці) да больш шматлікіх. Падача лексікі ў межах (пад)разраду — у алфавітным парадку, за выключэннем тых груп слоў, што аб'яднаны адзіным суфіксам. Пры гэтым гіперонімы ўключаліся ў адзін разрад са сваімі гіпонімамі. Блізкасць лексем унутры групы ці падгрупы розная, хаця сустракаюцца мікрагрупы, што фактычна пераходзяць у сінанімічныя рады.

Усяго сярод знамянальных слоў было вылучана некалькі вялікіх лексічных класаў з шэрагам разрадаў: сярод назоўнікаў — 1) лексіка са значэннем прадметнасці (16 разрадаў), 2) лексіка са значэннем абстрактнасці; сярод прыметнікаў — 3) лексіка са значэннем прыкметы ці ўласцівасці (5 разрадаў), 4) прыналежныя прыметнікі, 5) адносныя прыметнікі (5 разрадаў); сярод дзеясловаў — 6) дзеяслоўная лексіка (10 разрадаў).

1. Лексіка са значэннем прадметнасці (633) прадстаўлена назоўнікамі і субстантывамі, рэдка словазлучэннямі (бівербальнымі назвамі), што пазначаюць адзіную з'яву ці аб'ект. Найбольш адметнымі (пад)разрадамі тут з'яўляюцца назвы:

а) асоб (223):

— сакральных істот і асоб: *ангелъ*, *бесъ*, *богъ*, *духъ* (*светый*), *дьяволъ*, *злоститвый* 'д'ябал', *злый* 'д'ябал', *куситель* 'д'ябал', *сатана*, *светый* (*божий*), *Христосъ*;

— агульныя: *жона* 'жанчына, жонка; жыхарка', *мужъ* 'мужчына, супруг; жыхар', *чоловекъ*;



— сукупнасці людзей: *ироднияна*, *люди*, *людъ*, *народъ*, *поколенье*, *родина* 'сям'я, родныя', *родъ* 'пакаленне', *сыны* 'падданыя; прадстаўнікі', *тижба*; сюды таксама можна аднесці назвы вайсковых адзінак: *войско*, *рота*, *уфъ* 'легіён';

— паводле адносін роднасці: *братъ*, *вдова*, *дочка*, *женихъ*, *матка* і *мати*, *невестка*, *отецъ*, *свекровъ*, *сестра*, *сынъ*, *теща*; *домовникъ*, *другъ* 'сябар', *зродокъ* 'вырадак', *кровные*, *родители* 'бацькі', *свой*, *товаришъ*;

— паводле ўзросту: *девка*, *девица* (пра маці Хрыста), *детя* / *дитя*, *молодецъ* 'маладзён, юнак', *старший* 'стары' (Мц. 15:2, Мк. 7:3, 5);

— паводле паводзін, выканання дзеянняў ці фізічных якасцей: *апостолъ*, *вожъ* 'правадыр', *ворогъ*, *вязень*, *дедичъ*, *званый* і *возваный*, *зводитель* 'хлус', *креститель*, *лунатыкъ*, *наймитъ*, *поганинъ*, *приходень*, *пророкъ*, *светка* 'сведка'; з суф. *-ецъ*: *ловецъ*, *мертвецъ*, *слепецъ*, *чищенец* 'кастрат, еўнух'; з суф. *-ца*: *винопитца*, *выдавца* 'здраднік', *забойца*, *пъяница*; з суф. *-никъ/-ніца*: *вшеточникъ* 'распутнік', *грешникъ*, *кгвалтовникъ* 'гвалтаўнік', *лицемерникъ*, *сполечникъ* 'саўдзельнік', *спротивникъ* 'праціўнік, апанент', *чужоложница*; сюды таксама можна аднесці найменні постацей: *облуда* 'прывід', *особа*;

— паводле заняткаў, прафесіі ці пасады: *воротный* 'парцье', *евангелиста* (м), *жолнеръ*, *катъ*, *лекаръ*, *пастыръ* і *пастухъ*, *перекладачъ* (м), *пищик* (музыка), *рыболовъ*, *ратай* 'земляроб, працаўнік', *слуга*, *справца* 'аканом, распараджальнік', *сторожъ*, *тать* 'злодзей', *тесля*, *учень*, *учитель*; у тым ліку з суф. *-ей*: *злодей* 'злодзей', *саддукей*, *фарисей*; з суф. *-ецъ*: *жнецъ*, *купецъ*, *торговецъ*; з суф. *-никъ*: *белильникъ* 'той, хто фарбуе тканіны', *мытникъ*, *наставникъ*, *оферовникъ*, *роботникъ*, *розбойникъ*, *священникъ*, *сотникъ* 'цэнтурыён', *тисечникъ*, *ученикъ*;

— паводле сацыяльнага становішча: *воевода* 'кіраўнік', *господаръ (домовый)* / *чоловекъ домовый* 'гаспадар', *князь*, *королевая*, *король*, *панъ* 'спадар, уладар' / *панъ дому* 'гаспадар', *староста* 'губернатар' (пра Понція Пілата), *старший* 'уладар, старэйшына', *старший дому* 'гаспадар', *цесаръ*, *челядникъ* 'нявольнік, раб' і *челядница*;

— паводле геаграфічнага месца жыхарства ці прыналежнасці: *грекъ* (м) і *гречка* 'грачанка', *кананитъ*; *иродиянинъ*, *ерусолимлянинъ*, *киринеянинъ*, *назаренинъ*;

— субстантываваныя (дзее)прыметнікі: а) фізічныя рысы чалавека: *бешаный* і *бешоный*, *глухий*, *живый*, *здоровый*, *немоцный* 'хворы', *немый*, *маленький* 'немаўля', *мертвый*, *раслабленый* 'паралізаваны', *слепый*, *слышачий*, *ссущий* 'смактунок, немаўля', *стружоный* 'стомлены', *трудоватый* 'хворы на лепру', *уломный* 'калека', *форый* / *хорый*, *хромый* і да т. п.; б) інтэлектуальныя, паводзінныя, маральныя ці сацыяльныя якасці і стан асобы: *ближний* 'блізкі', *богатый*, *бологий* 'шчаслівы', *больший* 'галоўны', *великий* 'уплывовы', *(не)верный*, *выбраный* 'абраннік', *глупый*, *дурный*, *званый* і *возваный*, *згодливый*, *згубленый*, *злый*, *маловерный*, *малый* 'малазначны', *менший*, *мудрый*, *отпущоная* 'разведзеная жанчына', *оцененый*, *первый*, *переднейший* 'першы, галоўны', *перехо-*

*жий* ‘вандроўнік’, *погибший*, *последний*, *посторонний*, *преследованый*, *простый*, *разумный*, *(не)справедливый*, *стружоный* ‘стомлены’, *тихий*, *убогий* ‘жабрак’, *учоный* і г. д.; в) выканаўцы дзеянняў: *будуючий*, *веруючий*, *видевший*, *входячий*, *делаючий*, *живучий*, *идучий*, *ищучий*, *кленучий*, *кричачий*, *купуючий*, *любячий*, *мовечий*, *ненавидячий*, *пасучий*, *пославший*, *плачучий(се)*, *прагнучий*, *преследуючий*, *приносячий*, *продаючий*, *просячий*, *слышачий*, *сеючий*, *седячий*, *сподеваючийсе*, *стерегучий*, *стоячий*, *толкучий* ‘які стукае ў што-небудзь’, *унижаючийсе*, *хотячий*, *чтучий*, *чинячий покусы* (Мц. 5:44), *чинячий покой* (Мц. 8:9), *чинячий беззакония* (Мц. 13:41) і інш.;

б) частак або кампанентаў цела ці яго самога (35): *бедро* ‘сцягно’, *волосъ*, *голова*, *губа*, *душа*, *жила*, *зубъ*, *колено*, *кость*, *кровъ* ‘кроў’, *левица*, *лицо*, *нога*, *око*, *палецъ*, *пена* (чалавечая сакрэцыя), *перси* ‘грудзі’, *плечо*, *правица*, *разы* ‘рана’, *рука*, *слеза*, *сер(д)це*, *тело*, *трупъ*, *уста*, *ухо*, *черево*, *члонокъ* ‘орган чалавека’, *языкъ*; сюды таксама адносяцца найменні знешняга аблічча чалавека (*виденье* ‘аблічча’, *взростъ* ‘рост’, *обличье*) і спалучэнні кшталту *звязка языка* (Мк. 7:35), *мужский станъ* (м);

в) жывёл і іх гуртаванняў (30): *акрида* (від насякомых), *быкъ*, *верблюдъ*, *волкъ*, *голубъ*, *жеребя*, *зверъ*, *змей*, *козелъ*, *комаръ*, *курица* і *куръ*, *лисица*, *овца*, *орелъ*, *ослица*, *песъ*, *петухъ*, *пискля* ‘кураня’ (< *писклета*), *птаха*, *саранча*, *свинья*, *стадо*, *ужъ*, *укормленое* (падрыхтаваная да забойства свойская жывёла), *червякъ*; таксама *гнездо*, *крило*, *шерсть*;

г) раслін і іх форм, частак або пладоў (35): *бервено*, *ветье* ‘галлё’, *винница* ‘вінаграднік’, *голье* ‘галлё’, *голецъ* ‘галіна’, *гроно*, *дерево*, *дерево винное*, *зерно*, *колосъ* і *колосье*, *корень* і *коренье*, *краска* ‘кветка’, *кропъ*, *куколь* ‘пустазелле’, *кустъ*, *ленъ*, *листье*, *мята*, *овощъ* ‘плод’, *пшеница*, *репье*, *розга* ‘галіна’, *садъ*, *сено* ‘трава’, *семя* ‘насенне’, *сучокъ*, *тернье*, *тминъ*, *трава* ‘злак, расліна’, *тростье* ‘трыснёг’, *фига* (дрэва і плод); таксама *снопъ*;

д) адрэзкаў ці адзінак вымярэння (26):

— часу: *векъ* ‘эпоха’, *вечеръ*, *година*, *день*, *лето* ‘год; лета’, *ночь*, *полночь*, *ранье* ‘раніца’, *сторожа* (адрэзак ночы), *часъ*; сюды таксама можна аднесці выразы кшталту *новъ месеца* (Мц. 17:15), *о курехъ* ‘у час спявання пеўняў’ (Мк. 13:35);

— прасторы: *верхъ*, *внутреннее* ‘унутранае’, *долъ*, *зверховное* ‘вонкавае’, *край* ‘бок, канец’, *конецъ*, *локоть*, *миля* ‘міля’, *низъ*, *полъ* ‘палова’, *початокъ*, *часть* ‘частка’, *четвертина* і інш., выразы кшталту *головы углу* (Мц. 21:42, Мк. 12:10), *небо и земля* ‘свет’, *отъ чотырехъ ветровъ* (Мц. 24:31) і назвы бакоў свету: *всходъ*, *заходъ*;

е) з’яў прыроды (38):

— касмічных аб’ектаў: *звезда*, *месецъ*, *светъ*, *сонце*;

— кліматычных з’яў, стыхій і станаў прыроды: *буря*, *ветръ*, *волна*, *дожчъ*, *маланья*, *огонь*, *оболокъ*, *пекло*, *(не)погода*, *потопъ*, *светло*, *снегъ*, *скваръ* ‘спёка’, *тресенье* ‘землятрус’ і *взрушенье*, *темность* ‘цемра’ і інш.;



— аб’ектаў і дэталяў ландшафту: *берегъ*, *вода*, *гора*, *жерело* ‘крыніца’, *земля*, *камень* і *каменье*, *море*, *небо* і *небеса*, *песокъ*, *печора*, *попелъ*, *пустыня*, *река*, *суша*, *яма* і інш.;

ё) населеных пунктаў, геаграфічных артэфактаў і тэрытарыяльных аб’ектаў і адзінак (48): *весь* ‘вёска’, *винница* ‘вінаграднік (як дзялянка)’, *городъ* і *место* ‘горад’, *граница*, *дворъ*, *дорога*, *збежище* (*дорогъ*), *збожъе* ‘засеянае поле’, *земля* ‘краіна’, *королевство* і *полкоролевства*, *краина* ‘край’, *месцо* ‘мясціна’, *могила*, *отчизна*, *ролья* ‘ралля; вёска’, *ростань* ‘скрыжаванне; плошча’, *село*, *сеянье* ‘засеянае поле’, *стежка*, *сторона* ‘краіна’, *торгъ* ‘плошча, пляц’, *улица* і інш.; гэты разрад можа быць дапоўнены за кошт шматлікіх тапонімаў і харонімаў: *Акелдама*, *Аримафеи*, *Вифания*, *Вифсаида*, *Ви(ф)сфагия*, *Галилея*, *Гефсимани*, *Голгофа*, *Египтъ*, *Ерихонъ*, *Ерусолим(а)*, *Ерданъ*, *Идумея*, *Израиль*, *Июдея*, *Капернаумъ*, *Назаретъ*, *Сидонъ*, *Сирифиникея*, *Сирия*, *Содомъ*, *Тиръ*, *Хоразинъ*, *Цесарея* і інш.;

ж) пабудоў і памяшканняў, іх частак (28): *будованье*, *вороты*, *гумно*, *двери*, *домъ*, *закрилина* (частка Іерусалімскага Храма), *клеть* ‘пакой’, *ковчегъ* (карабель Ноя), *корма*, *кровля* ‘дах’, *олтаръ*, *плотъ*, *свиренъ*, *столецъ* ‘амбон, кафедра’, *столица* ‘столец; сталіца’, *токъ*, *уголъ*, *хоромъ* і *хоромина*, *церковъ* і г. д.; сюды таксама можна аднесці некаторыя назвы ўстаноў, суадносныя з назвамі памяшканняў ці пабудоў: *везенье* ‘турма’, *згромаженье* ‘збор, сінагога’, *мыто* ‘мытня’, *рада*, *сторожа* ‘варта’, *судъ*, *темница*, *хованье* ‘сховішча’;

з) прадметаў быту, гаспадарчых прылад і інструментаў (41): *гробъ* ’труна’, *губа* ‘губка’, *жорны*, *завеса*, *збанъ*, *ермо*, *каганецъ*, *кий* ‘кол, палка’, *ключъ*, *коровать* ‘ложак’, *котелъ*, *кошница*, *кошъ*, *ланцугъ*, *лихтаръ* ‘падсвечнік’, *лодья* ‘лодка’, *лопата*, *миса*, *неводъ*, *печъ*, *подножокъ*, *посохъ*, *пута*, *свеча*, *секира*, *серпъ*, *сеть*, *скленица* ‘шклянка, кубак’, *соленица* (від посуду), *столецъ* ‘сядзенне, пасад’, *столъ*, *судно* і *судье* ‘пасудзіна, начынне’, *сума* ‘торба’, *тайстра*, *тискъ* ‘давільня’, *трость*, *уда* ‘вуда’, *чаша*; сюды можна аднесці назвы зброі: *брони* ‘зброя’, *мечъ*;

і) рэлігійных і культурных аб’ектаў і артэфактаў (22): *брама* (рытуальная аблямоўка, надзяваная іудзеямі ў час малітвы), *жеребъе*, *заслона* і *накрытье* (назвы рытуальнага будана ва іудаізме), *книга*, *креска* ‘рыса’, *крестъ*, *листъ* (дакумент), *литерка*, *окрешенье* ‘пазнака’ (м), у тым ліку сакральных тэкстаў і звязаных з імі рэлігійных вучэнняў ды фармулёвак: *евангелие* / *евангелия*, *заветъ*, *объяв(л)ен(ь)е* ‘Апакаліпсіс’ (м), *писмо (пророцкое)*, *тастаментъ* (м), а таксама кампанентаў і відаў тэксту: *апракасъ* (м), *глава* ‘раздзел Евангелля’ (м), *зачало* ‘перыкопа’ (м), *стихъ* ‘евангельскі верш’ (м), *розделъ* (м), *строка* ‘радок’ (м), *тетръ* (м);

к) ежы, страў, харчавання (17): *вино*, *живность* ‘ежа’ (24:45), *жолчъ* (від гаркаты), *квасъ* ‘закваска’, *кормъ* ‘харчаванне’, *кроха*, *медъ*, *одробина* ‘кавалак’ (пра ежу), *олива* ‘алей’, *оцотъ*, *рыба* і *рыбка*, *соль*, *хлебъ*; сюды можна аднесці і назвы парфумы: *кадило* ‘ладан’, *мастъ* ‘алей для націрання’, *мира* ‘міра’;

л) вопраткі, абутку, матэрыялу, аксесуараў (15): *ботъ*, *венецъ*, *дира*, *мехъ* ‘лахі, лахманы’, *одежа* і *оденье*, *плащъ*, *полотно*, *поясъ*, *ремень* ‘раменьчык’ (на абутку), *сорочка*, *уставка* ‘латка’, *черевики*, *чересло* (кашэль у выглядзе паса), *шматъ* ‘кавалак, ануча, латка’;

м) грошай і відаў падаткаў ці плацяжоў (24): *галеръ*, *грошъ*, *гроши*, *дань*, *долгъ*, *заплата*, *монета*, *пенязь*, *дробный пенязь*, *податокъ*, *серебреникъ*, *статиръ*, *талантъ*, *цена*, *цынишъ*; сюды таксама можна аднесці назвы металаў і іх спалучэнняў: *золото*, *(и)ржа*, *серебро* ці назвы каштоўнасцей: *перло* і іх сукупнасцей: *кладъ*, *скарбъ*; назвы маёмасці: *достоиность*, *маетность*, *имение*, *собранье* ‘багацце, скарб’;

н) хвароб і фізічнага нездароўя (8): *болесть* ‘хвароба, цяжкасць’, *голодъ*, *моръ*, *немоцъ*, *огневая* ‘гарачка’, *плыненье крови* (Мк. 4:25), *трудъ* ‘лепра’, *фороба* / *хороба*;

о) чалавечых эмоцый ці ментальных працэсаў або станаў (24): *вера*, *воля* ‘жаданне’, *гневъ*, *животъ* ‘жыццё’, *зависть*, *злекненье* ‘спалох, жах’, *зрозуменье* (м), *милость*, *мысль*, *мука* ‘пакута’, *нареканье* ‘моцны плач’, *обида*, *память* ‘згадка’, *плачъ*, *помышленье* ‘думка’, *радость*, *розсудокъ* (м), *розумъ*, *сонъ*, *смерть*, *смыслъ*, *страхъ*, *утрапенье* ‘гора, туга’, *фрасунокъ* ‘смутак, цяжкасць’; таксама выразы кшталту *око злое* (Мк. 7:22);

п) чалавечых дзеянняў, учынкаў, працы ці заняткаў, рытуалаў і абрадаў (34): *великдень* (м), *вечера* ‘вячэра’, *война*, *дело*, *жниво*, *замешанье* ‘бунт, паўстанне’, *именины*, *крещенье*, *обедъ*, *отпоръ* ‘супраціў’ (м), *пасха* (свята і святочная вячэра), *плаванье*, *погребенье* і *погребанье*, *покой* ‘спакой, мір’, *постъ*, *празникъ*, *пресноки* (свята), *приготованье* (яўрэйская пятніца), *робота*, *розрухъ* ‘гвалт, бунт’, *свадьба*, *субота*, *сустреча*; сюды таксама можна аднесці дыскурсіўныя акты: *голосъ*, *голкъ*, *кгвалтъ*, *крикъ*, *клятва*, *мова* ‘прамова, маўленне’, *молитва*, *поздоровлянье* ‘прывітанне’, *присега*, *розмова*;

р) камунікатыўных ці грамадскіх установаў або з’яў (20): *ведомость* ‘звестка’, *весть* ‘вестка’, *выкладъ* ‘тлумачэнне’ (м), *даръ* ‘дарунак; ахвяра’, *имя*, *законъ*, *звычай* і *обычай*, *знаме* ‘знак, сігнал’, *зрада* ‘здрада, падман’, *корванъ* (від ахвяры і/ці зароку), *офера*, *перекладъ* (м), *поданье* ‘паданне, легенды’, *приказанье* ‘запавет’ і *росказанье* ‘запавет’, *слава*, *слово*, *слухъ*, *фала* / *хвала* і інш.

2. Лексіка са значэннем абстрактнасці (127) аб’ядноўваецца як паводле семантыкі, так і паводле суфіксаў ці фіналяў. Невялікая яе частка мае неспецыфічныя фіналі: канч. *-ø*: *кгвалтъ* ‘прымус, сіла’, *моцъ*, *новъ* ‘новае’, *полъ* ‘палова’, *речъ* ‘прадмет, сэнс’, *станъ*, *талантъ* (м), *честь* ‘пашана, гонар’ і інш.; суф. *-ок*: *збытокъ* ‘рэшта’, *останокъ* ‘рэшта’, *остатокъ*; канч. *-а*/*-я*(*е*): *беда*, *береме* ‘вага, ноша’, *згуба* ‘выдатак’, *лихва* ‘лішак, празмернасць’, *мера*, *наука*, *отмена* ‘замена’, *польга* ‘карысць, выгада’, *потреба*, *правда*, *причина* (м), *розница* (м), *тегиня* ‘цяжар’, *тишина*; канч. *-о*: *лихо*, *добро* і інш.; сюды можна аднесці асобныя субстантывы: *бывшое*. Большая частка непрадметнай лексікі мае тыповыя абстрактныя суфіксы:



суф. *-ость*: *владность*, *глубокость*, *гордость*, *достойность*, *злость* ‘зламыснасць’, *мерзкость*, *молодость*, *мудрость*, *офитость* ‘збытак, празмернасць’, *прикрость*, *скритость*, *(не)справедливость*, *таемность* ‘тайна, таямніца’, *твердость*, *темность* ‘цемра’, *хтивость* ‘прагнасць, жарсць’, *явность* ‘яўнае’;

суф. *-ство*/*-цтво*: *безумство*, *блюзнерство*, *богатство*, *вшеточенство* ‘распуста’, *дедицтво* ‘спадчына’, *детинство*, *драпежство*, *забойство*, *звитежство* ‘перамога’, *зводительство* ‘спакуса, падман’, *злодейство*, *купецтво*, *лакомство* ‘прагнасць, хціваcць’, *лицемерство*, *мнозство*, *недоверство*, *подобенство* ‘прыпавесць’, *пророцтво*, *сведоцтво* і *сведецтво*, *чужоложство*, а таксама вельмі пашыраныя ў ролі абстрактных аддзеяслоўныя суфіксы:

суф. *-ье*: *битье*, *омытье* (аддзеяслоўны назоўнік), *отыйтье* ‘адыход’, *милосердье*, *пришстье* ‘прыход’, *роспятье* (аддзеяслоўны назоўнік);

суф. *-ние*/*-нье*: *безаконие* і *беззаконье*, *виденье* ‘ўбачанае’, *возренье* ‘позірк’, *вскресенье*, *выгнанье*, *выживенье* ‘пражытак’ (Мк. 12:44), *выреченье* ‘вымаўленне’, *деланье* (аддзеяслоўны назоўнік), *домниманье*, *заложенье* ‘закладзіны, пачаткі’, *запроваженье* ‘перасяленне’, *заседанье*, *зведенье*, *згоршенье* ‘спакуса’, *згрешенье*, *зроженье* ‘нараджэнне’, *зрозуменье* (м), *мешканье* ‘жытло’, *милосердье*, *многомовенье*, *нароженье*, *омыванье*, *осуженье*, *отпущенье*, *очищенье*, *печалованье*, *писанье* (аддзеяслоўны назоўнік), *плаванье*, *пожадан(ь)е*, *показанье* (аддзеяслоўны назоўнік), *покаянье*, *помноженье* (м), *преследованье*, *приказанье* ‘запавет’, *проповеданье*, *прошенье*, *розмноженье*, *розрушенье*, *росказанье* ‘загад, запавет’, *седенье*, *скрапенье*, *сконченье*, *скригитанье* (зубам(і)), *споведанье*, *спотканье*, *спустошенье*, *створенье*, *тресенье*, *уподобанье* ‘прыхільнасць’, *успокоенье* ‘спакой’, *уруганье*, *утеканье*, *ученье*, *чиненье* (аддзеяслоўны назоўнік).

Галоўныя асаблівасці гэтай лексічнай групы — адсутнасць бівербальных назваў і панаванне слоў з фіналлю *-ье*. Апошняя рыса ўласціва таксама польскамоўным рэлігійным тэкстам (пераважна пратэстанцкім) XVI ст. і старабеларускай мове Нясвіжскага катэхізіса.

3. Лексіка са значэннем прыкметы ці ўласцівасці прадстаўлена прыметнікамі (129), што выражаюць:

а) фізічныя якасці чалавека (27): *бешаный*, *бешоный*, *глухий*, *гугнивый*, *жаркий* ‘палкі, страсны’, *живый*, *зголоднелый*, *здоровый*, *кровоплынливый*, *мертвый*, *моложавый* ‘малады’, *(не)моцный*, *немый*, *рослабленый* ‘паралізаваны’, *смысленый*, *слепый*, *старший* ‘старэйшы’, *стружоный* ‘стомлены’, *сухий* ‘хворы; высахлы’ (пра руку), *трудоватый* ‘хворы на лепру’, *уломный* ‘скалечаны’, *форый* / *хорый*, *хромый*, *шаленый* і да т. п., нязменныя фізічныя станы: *женский*, *мужский*;

б) станоўчыя або адмоўныя рысы характару ці паводзін чалавека або жывёлы (34): *бесчес(т)ный*, *бологий* ‘шчаслівы’, *(не)верный*, *глупый*, *грешный*, *добрый*, *доскональный*, *драпежный*, *дурный*, *зголдивый*, *злостивый*, *злый*, *леный*,

*лживый*, *лихий*, *милостивый*, *мудрый*, *незносный*, *непожиточный* ‘няварты’, *окрутный* ‘жорсткі, люты’, *простый*, *разумный*, *смутный* ‘засмучоны’, *справедливый*, *срогий*, *страшливый* ‘пужлівы’, *стыдливый*, *тихий* ‘лагодны, пакорлівы’, *умилованый*, (*не*)*чистый*, *чужоложный*, *щирый* і інш.;

в) сацыяльныя і рэлігійныя якасці ці станы (19): *бедный*, *бесклопотный*, *ближний* ‘блізкі’, *благословеный*, *богатый*, *больший* ‘галоўны’, *великий* ‘уплывовы’, *выбраный* ‘абраны’, *годный*, *дорогой* ‘каштоўны’, *збавеный*, *значный* ‘асаблівы, вядомы’, *малый* ‘малазначны’, *менший*, *нагий*, *невинный*, *ровный*, *свободный*, *святый* і г. д.;

г) якасці і ўласцівасці прадметаў ці з’яў, адносіны паміж аб’ектамі — пэўны парадак, паслядоўнасць (43): *великий*, *ветхий*, *внутреный*, *вышний*, *готовый*, *долгий*, *другий*, *иный*, *инший*, *каждый*, *лацный*, *легкий*, *лишний*, *малый*, *многий*, *мяккий*, *нижний*, *новый*, *околичный* ‘вакольны’, *оный*, *останочный* ‘апошні’, *первый*, *передний* ‘пярэдні, першы’, *полный*, *порожний* ‘пусты’, *последний*, *просторный*, *противный*, *пустой*, *розличный*, *свой*, *скрытый*, *соленый*, *старый* (м), *студеный* ‘халодны’, *тайный*, *таковой*, *тесный*, *тяжкий*, *узкий*, *чужий*, *широкий*, *явный* і інш.;

д) колеры (6): *белый*, *зеленый*, *светлый*, *темный*, *чорный*, *черленый* ‘чырвоны, алы’.

4. Прыналежныя прыметнікі (53) пазначаюць прыналежнасць пэўнай асобе ці супольнасці асоб. Такія прыметнікі ў мове перакладу Цяпінскага ўтвараюцца ад асабовых назоўнікаў (імёнаў уласных) з дапамогай шэрагу суфіксаў: а) суф. *-ов-*/*-ев-* ад асноў на зычны (*-ъ*/*-ь*, *-й*): *авраамовъ*, *альфеовъ*, *андреевъ*, *варахиновъ*, *давидовъ* / *давыдовъ*, *завулоновъ*, *зеведеовъ*, *израилевъ*, *иоановъ*, *иосиевъ*, *иродовъ*, *исааковъ*, *исусовъ*, *моисеовъ*, *неффалимовъ*, *ноевъ*, *петровъ*, *саломоновъ*, *симоновъ*, *тимеевъ*, *филиповъ*, *христовъ*, *юдовъ*, *якововъ* (сюды таксама паводле сваёй структуры можа быць аднесена слова *королевая*, што функцыянуе ў перакладзе як субстантыў), у тым ліку нават ад імёнаў агульных (*змиевъ*, *китовъ*) і неадушаўлёных назоўнікаў: *громовъ*, *овощовъ*; б) суф. *-ин-* ад асноў на галосны (*-а*/*-я*): *девчинъ*, *маринъ*, *иродыядинъ*, у тым ліку і ад назоўнікаў муж. р.: *иoнинъ*, *старостинъ*, *теслинъ*, в) суф. *-ьј-*: *божий*, *верблюжий*, *вдовий*, *княжий*, *овчий*, *пророчий*, *розбойничий*, *чоловечий*. Прыналежнасць асобе ці супольнасці асоб, названай агульным назоўнікам (часта — паводле пасады ці занятку), выражаецца звычайна з дапамогай суф. *-ск-*/*-цк-*, фарманта адносных прыметнікаў: *бесовский*, *израельский*, *людский*, *отцовский*, *поганский*, *панский*, *пророцкий*, *саддукейский*, *фарисейский*, *цесарский*, *юдский*. Як можна бачыць, гэта прыводзіць да ўтварэння паралельных з адноснымі прыметнікамі структур: *израилевъ* — *израельский*, *пророчий* — *пророцкий*, *юдовъ* — *юдский* і інш.

5. Адносныя прыметнікі (99), што выражаюць якасць ці прыкмету праз адносіны да:

а) матэрыялу, рэчыва, з якога зроблены прадмет ці праз прыналежнасць да іншых (гаспадарчых) прадметаў (18): *винный*, *гарнчарский*, *горчичный*, *гробовый*, *дивий* ‘дзікі, лясны’, *домовый*, *духовный*, *железный*, *жорновный*, *евангельский* (м), *еремный*, *мучный* ‘мучны’, *оливный* (у складзе тапанімічнай назвы: *гора Оливная*), *огненый*, *трубный*, *спиканардовый* ‘нардавы’ (нард — від расліны і парфумы, што вырабляецца з яе), *телесный*, *церковный* і інш.;



б) сацыяльных ці ментальных з’яў ці інстытутаў (5): *свадебный*, *скарбный*, *суботный*, *судный*, *цыншовый* і інш.;

в) прызначэння ці сутнасці прадмета (26): *безводный*, *збавеный*, *любязный* ‘распутны’, *оцененый*, *подобный* ‘падыходны, зручны’ і ‘такі самы, падобны’, *посторонний*; сюды можна аднесці і вялікі шэраг аддзеяслоўных і складаных прыметнікаў: *взгоржоный* ‘пакрыўджаны’, *досветчоный*, *друкованый* (м), *засмучоный*, *назначоный* (м), *незносный*, *неможный* ‘немагчымы’, *оболочоный* ‘апрануты’, *окрашоный* ‘упрыгожаны’, *оттятый* ‘адрэзаны’, *первородный*, *переворотный* ‘распутны’, *потребный* ‘патрэбны, дарэчны’, *проклятый*, *розводный*, *скрушоный* ‘зламаны’, *стривоженый*, *струхлелый*, *умилованый*, *чужоложный* і інш.;

г) месцазнаходжання (40): *земленый* (тое, што мае дачыненне да грунту) і *земский* ‘зямны’, *морский*, *небесный* і *небеский*, *пекельный*, *польный* ‘палявы’, *ролейный* ‘палявы’ (Мц. 13:36), *уличный*; сюды можна аднесці і вялікі шэраг прыметнікаў, што пазначаюць знаходжанне прадмета на пэўнай тэрыторыі (г. зн. утвораных ад назвы-тапоніма або хароніма): *аримафейский*, *вавилонский*, *гадаринский*, *галилейский*, *генисаретский*, *гергесинский*, *гоморский*, *далмануфанский*, *декапольский*, *ерданский*, *израелский*, *искариотский*, *назарейский*, *магдалинский*, *понтейский*, *самаританский*, *сидонский*, *сионский*, *содомский*, *тирский*, *хананейский*, *юдейский* і г. д.; іншыя ці больш сучасныя прыметнікі гэтага падразраду выступаюць у маргіналіях: *греческий* (м), *еврейский* (м), *латинский* (м), *московский* (м), *польский* (м), *руский* (м), *словенский* ‘царкоўнаславянскі’ (м), *сырийский* (м), *халдейский* (м);

д) часавых паняццяў (10): *будучий*, *вечный*, *дочасный* ‘часовы’, *завтрешний*, *ночный*, *повседенный*, *позный*, *полуденный*, *сегоднеш(н)ий*, *суботный*.

6. Дзеяслоўная лексіка (819) вельмі спецыфічная і ўмоўна можа быць падзелена на тры падкласы: 1) дзеянні чалавека (уласцівыя толькі чалавеку), 2) неперсанальныя дзеянні і станы (дзеянні, агульныя для чалавека і прыроды), 3) працэсы ў прыродзе. Аднак з прычыны спецыфікі евангельскага твора ў ім дамінуе лексіка першага падкласа, а лексіка двух другіх падкласаў прадстаўлена мінімальна. Таму яна вылучана толькі ў асобныя разрады (гэта два апошнія), тады як асноўная колькасць разрадаў адлюстроўвае дзеянні чалавека. У тэхнічных мэтах пры дзеясловах падаюцца таксама іх прэфіксныя і постфіксальныя (зваротныя) варыянты, калі іх семантыка абумоўлена толькі прэфіксам ці зваротным постфіксам. Трывальныя пары, як правіла, прыводзяцца разам.

Дзеяслоўную лексіку складаюць:

а) перцэптыўныя дзеясловы, што характарызуюць здольнасць чалавека ўспрымаць навакольны свет органамі пачуццяў (24):

— зроку: *(у)видети*, *(во-, по-, у)зрети*, *гледети* / *(на)гледати*, *обачити* (м), *огледити* / *огледати(се)*, *(по)смотрети*; сюды таксама можна аднесці *бачити* ‘сачыць, пільнаваць’, *досведчити* ‘убачыць, стаць сведкам’;

— слыху: *(вы)слухати* / *(вы)слушати*, *слухивати*, *(у)слышати*;

б) дзеясловы, што характарызуюць фізіялагічны стан чалавека (58):

— патрэбу арганізма ў ежы і пітве ды задавальненне такой патрэбы: *(вы-, на)поити*, *ести* / *зъедати* і *ядати* (м), *зголоднети*, *насытитисе*, *(на)кормити*, *кормити (персями)*, *(вы)пити*, *пожирати*, *прагнути* ‘асмагнуць’;

— задавальненне патрэбы арганізма ў сне: *вздрематисе*, *заснути*, *опочивати*, *спати*;

— хваробу і вылечванне: *беситисе*, (*о-, у)здоровети* (самому), *(у-, о)здоровити* / *(у-, о)здоровляти* (іншага), *мети сухую руку* (Мц. 12:10, Мк. 3:1, 3), *мучитисе*, *направитисе* (Мк. 8:25), *отворитисе* (вачам, вушам), *очищати(се)*, *прогледати* ‘станавіцца відушчым’, *прозрети*, *пены точити*, *розбивати* ‘сатрасаць хваробай’, *схнути* ‘нямець’;

— фізічнае існаванне: *жити*, *(з)мешкати*, яго пачатак: *(по)родити*, *(на)родитисе*, *(с)плодити* / *спложати* ‘даць, даваць патомнасць’ і заканчэнне: *вкусити смерти*, *(з)гинути*, *погребти*, *померти*, *удавитисе*, *умерети*, *утонути*;

в) дзеясловы, што характарызуюць псіхалагічны стан чалавека (83):

— эмацыянальны: *(уз)боятисе*, *(роз)гневатисе*, *(за)дивитисе* / *здивлятисе*, *згоршитисе* / *згоршатисе* ‘спакусіцца, падмануцца’, *зжалитисе*, *змиловатисе*, *(по-, рос)каятисе*, *лекатисе* / *злектисе* ‘(с)пужацца’, *надеятисе*, *нарекати* ‘моцна плакаць’, *(вз)ненавидети*, *озябнути* ‘ахаладаць’ (пра пачуцці), *печаловатисе* ‘турбавацца’, *(вс)плакати(се)*, *постыдитисе*, *прагнути* ‘хацець’, *(у)радоватисе*, *розмиловатисе* ‘палюбіць’, *смутитисе* ‘смуткаваць’, *сподеватисе*, *стривожитисе*, *(вы-, у)терпети*, *тривати*, *тужити* ‘смуткаваць’, *усоромитисе*, *уфати* ‘спадзявацца’, *(вс-, ус)хотети*, *умиловати*, *умилосердитисе*, *уподобати* ‘палюбіць’, *утешатисе*, *чути* ‘адчуваць’; сюды таксама адносіцца кампазіт *не за добро мети* ‘абурацца, злавацца’;

— ментальны ці інтэлектуальны: *ведати*, *(у)верити*, *вызнати* / *вызнавати*, *(з)вутпити* ‘(за)сумнявацца’, *дбати* ‘думаць, клапаціцца’, *домнимати*, *забыти*, *згажатисе* (м), *здатисе* / *здаватисе*, *(по)знати*, *значити* (м), *мети веру*, *мнимати* ‘думаць, меркаваць’, *мыслити*, *познати* ‘апазнаць’, *помнити*, *(вс)поменути* ‘згадаць’, *помышляти (въ собе*, *въ серцахъ* і да т. п.*)* ‘думаць, меркаваць’, *потерпети* ‘пачакаць’, *розмысляти*, *розсужати* ‘разгадваць, адрозніваць’, *(з)розумети*, *розуметисе* ‘значыць’ (м), *смыслити*, *уведати* ‘пазнаць’, *узведати* ‘здагадвацца, меркаваць’, *чути* ‘пільнаваць’;

г) дзеясловы, што пазначаюць дыскурсіўную актыўнасць чалавека (105):

— маўленне: *блюзнити*, *(за)верещати* ‘моцна крычаць’, *взвестити* / *взвещати* ‘паведаміць, паведамляць’, *взмовити* ‘прамовіць’, *взголосити* ‘прамовіць’, *возвати* ‘паклікаць’, *вызвати* ‘выклікаць’, *выкладати* ‘сказаць, выкласці’, *вымовляти* ‘дакараць’, *выпытати(се)*, *голчити* ‘гаманіць, шумець’, *доводити*



‘абгрунтоўваць’ (м), *засоромити*, *(при)звати*, *злословити*, *(за)кричати*, *змовитисе* ‘дамовіцца’, *(вс-, при)кликати*, *одповедити* / *оповедати* ‘адказаць, адказваць’, *отмовитисе* ‘адмовіцца’, *(про)мовити*, *мовляти*, *мовити на него* ‘сварыцца, абвінавачваць’, *обличити*, *подусчити* ‘намовіць’, *посведчити лживе*, *призвати*, *приректи* ‘паабяцаць, узяць абавязак’, *присегати(се)*, *проклинати(се)* ‘клясціся’, *проповедати(се)*, *прокляти*, *пророковати*, *(с)пытати*, *ректи* і *ректи въ собе*, *розмовляти*, *розмавлятисе* ‘спрачацца, дыскутаваць’, *(на)ругатисе*, *сведчити*, *сказати*, *(роз)славити*, *соромотити*, *споведати* ‘паведаміць’, *рознестисе* / *розношати слово*, *розславитисе* ‘быць пахваленым’, *урадити* ‘вырашыць, дамовіцца’, *ругати*, *шамрати* ‘абурацца’; сюды таксама могуць быць аднесены такія спецыфічныя дзеясловы, як *выложити* ‘перакласці’ (м) / *(вы-, пере)кладати* ‘перакладаць, тлумачыць’ (м); спецыфічны від маўлення пазначае такі дзеяслоў, як *запети* (пра птушку і пра чалавека), адсутнасць маўлення выражаюць дзеясловы *(за)молчати*, *умолкнути*; сітуацыю наймення, атрымання ці абвяшчэння свайго імя характарызуюць дзеясловы *звати* ‘называць’ (м) / *зывати* (м), *зватисе*, *назвати(се)* / *называти(се)*, *наректи* ‘даць імя’, *мовити* ‘назваць’;

— волевыяўленне: *блогословити*, *(за)боронити* / *бороняти* ‘забараняць’, *велети*, *допустити* / *допущати* ‘дазволіць, дазваляць’, *заказати* / *заказывати* ‘забараніць, забараняць’, *заприсегати* ‘заклінаць, загадваць’, *затеети* ‘даручыць’, *(по)молити(се)*, *поручити* ‘даверыць’, *потребовати*, *преложити* ‘прапанаваць’, *приказати* ‘загадаць, запавесці’, *(по-, у)просити*, *указати* ‘загадаць’, *росказати* ‘загадаць’ і інш.;

д) дзеясловы, што пазначаюць рух чалавека (162):

— рух чалавека ў цэлым — у Евангеллях часцей за ўсё гэтае значэнне перадаецца двума дзеясловамі: *ити* / *шол-* / *шод-*, *ходити*, якімі пры дапамозе прэфіксацыі і часам прыслоўяў пазначаецца таксама кірунак руху ці яго фазы: *ввойти* / *увойти*, *взыти*, *выйти*, *зайти*, *зойти* / *сойти* і *зойтисе* ‘сысціся; узяць заручыны’, *отыти*, *перейти*, *пойти*, *прийти*; *входити*, *выходити*, *обходити*, *отходити*, *приходити*, *проходити*, *сходити* ‘спускацца’; *разыстисе* (< *разыдутьсе* Мц. 26:31) і да т. п.; сюды таксама трэба аднесці кампазіты з прыслоўямі ці прыназоўнікамі кшталту *(впередъ, вследъ, мимо, назадъ, за нимъ) ити* / *ходити*; розныя значэнні перамяшчэння ў прасторы часта выражаюцца з дапамогай і іншых дзеясловаў: *бегти*, *(при-, о-, у)бежати* / *бегати*, *вернутисе* / *ворочатисе*, *збегатисе*, *кинутисе*, *минути*, *переступати*, *приближитисе*, *(в-, вы, при)ступити*, *собрати(се)* / *збирати(се)*, *упередити* / *упережати*, *усунутисе* ‘накіравацца’, *утекати* і інш.;

— рух у пэўным кірунку (у тым ліку аддаленне, набліжэнне, перамяшчэнне, спыненне і да т. п.): *(при)вести* / *(при)водити*, *взвести* ‘падняць; суправадзіць’, *влезти*, *встати*, *вывести*, *(вы)гнати* / *(вы)ганяти*, *напасти*, *навернутисе*, *обернутисе*, *отослати*, *(в-, с-, у)пасти* / *падати* (*въ яму* і да т. п.), *послати* / *посылати*, *пристати* ‘спыніцца’, *(вы-, от)пустити* / *отпущати*, *пустити*

‘аддаць, адпусціць’, *(вы)пхнути* ‘выкінуць; вывесці’, *рознестисе*, *розношати*, *росширяти*, (*в)сести* / *всядати*, *стретити*, *сустрети* і інш.;

— рух(і) органаў цела чалавека, розныя маніпуляцыі, фізічныя кантакты: *взложити руки*, *взнизнути* ‘насадзіць, начапіць’, *взяти* (*озм-*) / *брати*, *вернути* ‘аддаць’, *вкидывати*, *вкладати на плечи*, *вскинути (руки)* ‘захапіць’, *выволокти*, *выняти*, *высыпати*, (*з/с)вязати*, *(от-, при)вязати*, *(по)дати(се)* / *давати* і *придати* ‘дадаць’ (м), *иняти(се)* і *(по-, у)няти* ‘схапіць, схапіцца’, *(вы-, от)кинути* / *кидати*, *класти* (м) і *кластисе*, *(вз-, по-, при)ложити*, *(по)метати* / *вметывати*, *(при-, от)нести*, *обвити* ‘загарнуць’, *обернути* ‘павярнуць’, *обняти*, *опертисе*, *отдати* і *воздати* ‘вярнуць’, *пасти на ноги* / *при ногахъ* і *припасти къ ногамъ*, *поймати*, *показати*, *поклонитисе* / *клянятисе*, *поймати*, *покивывати* (галавамі), *покладати*, *поручити* ‘перадаць’ (Мц. 25:27), *поткнути* ‘спатыкнуцца’, *потоптати (ногами)*, *приложити(се)*, *приняти* / *принимати*, *прыпадывати* ‘нахіляцца’, *розп(р)остерти* (*руку* і інш.), *(до)ткнути(се)*, *выторгнути* / *(вы-, по)торгати* ‘рваць’; сюды могуць быць аднесены і дзеясловы сувязі: *прильнути*, *розлучити* / *розлучати*, *розвезатисе*, *спояти* і інш.;

е) дзеясловы, што пазначаюць учынкі, дзеянні чалавека (122):

— спецыфічныя ўчынкі чалавека: *взбудити* ‘прабудзіць’, *вздыхнути*, *в(з)ливати*, *вставляти уставку*, *задержати (въ собе)* ‘утрымаць’, *зажмурити*, *(з-, за)жечи* / *зажигати*, *заплевати* (*обличье* і інш.), *(о)крестити(се)*, *(на)мазати*, *(от)мерити(се)*, *носити (одежи)*, *оболочатисе* / *оболочитисе* ‘апрануцца’, *окрасити* / *окрашати* ‘упрыгожыць, упрыгожваць’, *омочивати* (напрыклад, *руку*), *осолитисе*, *(на)писати*, *пискати* ‘граць (на музычных інструментах)’, *плесати*, *плюнути*, *посвечати*, *поставити* / *постановити*, *постилати (одежи)*, *похмуряти (виденье)*, *поцаловати*, *пришивати*, *процеживати*, *резати*, *скригитати* (зубамі), *трубити*, *убелити*, *умести* ‘падмесці’, *умыти(се)* / *умывати* і інш.;

— мэтанакіраванае дзеянне: *взнестисе* / *взноситисе*, *выбрати* ‘абраць’, *выполнити(се)*, *(з)готовити*, *задержати* ‘ўтрымаць’, *закрытисе* ‘схавацца’ (Мц. 5:14), *заслонити*, *занехати* ‘пакінуць’, *запритисе* / *запертисе* ‘закрыцца, схавацца, унікнуць; адмовіцца, адрачыся’, *зготовати* ‘падрыхтаваць’, *зготоватисе* ‘прызначацца’, *зыскати* ‘адшукаць, знайсці’, *искати* ‘шукаць’, *назначити* ‘пазначыць, акрэсліць’, *найдовати* ‘знаходзіць’, *найти(се)* / *находити*, *оставити* / *оставляти* ‘пакінуць’, *отворити(се)* ‘адчыніць, адчыніцца’, *открыти*, *показати*, *скрити* / *зкрити*, *указатисе* ‘паказацца’, *утаитисе*, *(с)ховати* і інш.;

— прычыненне фізічнай шкоды чалавеку: *(з-, у)бити* ‘збіць, пабіць’ і *побити* (м), *(вы-, з-, по)губити*, *забити*, *зольжити* ‘катаваць’, *зранити*, *зчиститисе* ‘кастрыравацца’, *мучити*, *наругатисе*, *позабивати*, *пробити голову*, *розпяти* / *розопнути*, *сказити* ‘сапсаваць; кастрыраваць’, *(вы-, от-, с-, у)тяти* ‘адрэзаць, адсячы’, *ударити*, *(за-, у)плювати*, *утерпети*, *ушкодити* ‘пашкодзіць’ і інш.; сюды можна аднесці і невялікі шэраг дзеясловаў, што пазначаюць агульнае



ўздзеянне на чалавека: *гамовати* ‘перашкаджаць’, *принутити* ‘прымусіць’, *стиснути*, *угнетати* ‘сцісківаць’ і інш.;

ё) дзеясловы, якія характарызуюць паводзіны чалавека (65): *взгоржати* ‘прыніжаць, крыўдзіць’, *выдати(се)* ‘выдаць, здрадзіць, быць выдадзеным’, *гнати* / *ганяти*, *(з-, по)горшати* ‘спакушаць, падманваць, псаваць’, *згоршитисе* / *згоршатисе* ‘адрачыся, адмовіцца’, *(з)грешити*, *давити* ‘уціскаць, мучыць’, *держати (подання)* ‘прытрымлівацца’, *запритисе* ‘адмовіцца’ (таксама і *себе*), *зaховати* ‘выратаваць’, *збавити(се)* ‘выратаваць, выратавацца’ (ад бяды, грахоў і да т. п.), *звести* / *зводити* ‘уводзіць у грэх ці зман’, *зводитисе* ‘памыляцца, грашыць’, *(у)красти*, *наведити* ‘наведаць’, *напасти* ‘абрынуцца’, *обидети* / *обижати*, *обольстити въ слове* ‘спаймаць на слове’, *окротити* ‘змірыць’, *ослухатисе* ‘не паслухацца, праігнараваць’, *отметывати* ‘адхіляць’, *перестрашити* ‘спужаць’, *повстати* ‘узбунтавацца’, *(с)поганити*, *пождати* ‘пачакаць’, *(ус)покоити*, *покушати* ‘уводзіць у грэх ці зман’, *порожневати* ‘нічога не рабіць, не быць занятым працай’, *поститисе*, *преследовати*, *роздрапежити* ‘разрабаваць’, *рушати* ‘турбаваць’, *(у)слухати* / *слухивати* ‘паводзіць у адпаведнасці з дырэктывамі’, *спротивлятисе*, *стеречи* ‘вартаваць, пільнаваць, трымацца’, *стережитисе* ‘захоўваць сябе, берагчыся’, *толктисе каменьемъ*, *трудити* ‘турбаваць’, *угодити*, *улагодити*, *унижитисе* / *унижатисе*, *услухатисе*, *утаити*, *утвердити* ‘ахоўваць, пільнаваць’, *ухватывати* ‘рабаваць’, *учинити / уделати чужоложства*, *чужоложити*, *чути* ‘пільнаваць’ і інш.;

ж) сацыяльна-бытавыя дзеянні (73), якія адлюстроўваюць:

— сямейныя і палавыя адносіны: *(о)женитисе*, *мети (за жону)* ‘знаходзіцца ў шлюбе’ (Мц. 22:28, Мк. 12:23), *о(т)пустити* / *опущати* ‘даць развод жонцы’, *пойти за (иного)*, *познати* ‘ўступіць у палавыя адносіны’, *поняти* / *поймати* ‘авалодаць (жанчынай)’, *приняти (въ череве)* ‘зацяжарыць’, *розводитисе* і інш;

— сацыяльныя адносіны, акты, заняткі: *владети* / *владати*, *жебровати* ‘жабраваць’, *загадывати* ‘кіраваць’, *куповати*, *наняти (роботниковъ)*, *одедичити* ‘прыняць у спадчыну’, *обжаловати* ‘абвінаваціць’, *(о)судити(се)* / *осужати*, *осудитисе* ‘быць асуджаным’, *отдесетинньвати*, *отменяти пенези* (м), *оценити*, *пановати*, *поздоровляти* ‘вітаць’, *позычити*, *помиритисе*, *продати* / *продавати*, *(в-, по)садити (въ темницу)*, *святитисе* ‘праслаўляцца’, *скарбти* ‘збіраць скарбы’, *(по)служити* / *послуговати*, *усправедливитисе* ‘апраўдацца’, *учити(се)* / *научити(се)*, *ценитисе*, *чтити* / *читати* ‘чытаць’, *ч(с)тити* ‘шанаваць’ і інш.;

— працоўныя, фізічныя дзеянні: *(з)будовати*, *всеяти*, *(в-, вы)копати* і *подкопати* / *подкопывати*, *жати*, *направити* / *направляти* ‘ладзіць, рамантаваць’, *насадити* (напрыклад, *садъ*), *обирати* (плады), *огородити*, *отвалити (камень)*, *очищати* ‘чысціць’, *розсыпати* ‘засяваць; раскідваць’, *сеяти*, *стеречи*, *робити*, *упасти* ‘пасвіць’ і інш.;

з) дзеясловы стану, яго змены і «негатыўнага дзеяння» (97):

— існавання і быцця, здзяйснення, ажыццяўлення: *быти* / *бывати*, *взбудити* ‘стварыць’, *вскреснути*, *(по)встати* ‘з’явіцца’, *делати*, *деятисе*, *настати*, *остати* ‘застацца’, *перебыти* ‘заставацца’, *пригодитисе* ‘здарыцца, надысці’, *приложитисе* ‘ажыццявіцца, здзейсніцца’, *(вы-, с)полнитисе* ‘ажыццявіцца, здзейсніцца’, *статисе* ‘зрабіцца’, *уделати* ‘здзейсніць, ажыццявіць’, *ховати* ‘трымаць, паслядоўнічаць’, *(у)чинити*, *явити(се)* / *являтисе* і інш.; сюды таксама можна аднесці дзеяслоў валодання *(и)мети* і фазавыя дзеясловы: *(до-, с)кончити*, *перестати*, *почати* / *починати*, стадыяльныя дзеясловы: *занехати* ‘пакінуць’, *настати* ‘надысці, з’явіцца’, *одволокати* ‘марудзіць, спазняцца’, *отстати*, *повстати* ‘ўзнікнуць, з’явіцца’, а таксама мадальныя дзеясловы: *годитисе*, *(вз)могти*, *потребовати* ‘мець патрэбу’, *(у)слушати* ‘патрэбна, належыць, мусіць’, *смети*;

— знаходжання на месцы ці ў нерухомасці: *висети* ‘знаходзіцца’ (Мц. 22:40), *змещатисе*, *лежати*, *перебыти* ‘знаходзіцца’, *свесити*, *седети*, *стати* / *стояти*, *тривати* ‘знаходзіцца’ і інш.;

— змены стану, пераход у іншую фазу, хістанне ці ваганне: *валятисе*, *дрижати*, *занехати* ‘пакінуць’, *збыти* ‘набыць перавагу’ (Мц. 13:12), *моцоватисе* ‘ахапіць’, *обложити*, *обтяжати* (< *обтяжоны*), *объявитисе* ‘паказацца’, *отолстети* ‘патаўсцець, пакрыцца тлушчам’, *переменитисе*, *приподобатисе* / *приподобыватисе* ‘прыпадабняцца’, *приподобити(се)*, *пропукнути(се)* ‘прарваць, прарвацца’, *спустети* ‘апусцець, прыйсці ў заняпад’, *станути* ‘пацвердзіцца’, *(за)трестисе*, *усохнуть* і *усхнути*, *утвердити(се)* і інш.;

— дзеясловы «негатыўнага дзеяння» (разбурэнне, падзел, скарачэнне, недахоп): *зкрушатисе* ‘разбівацца, рвацца’, *(по)ламати*, *отметывати* ‘адхіляць, адмаўляць’, *отнятисе*, *пооброкидати*, *порушитисе* ‘разбурыцца’, *потеряти*, *розделити(се)*, *розодратисе*, *(роз)рушити(се)* ‘рушыць, рушыцца’, *розотнути* ‘разрэзаць’, *розпадатисе*, *розрушити(се)*, *розрыватисе*, *росторгати* ‘разарваць’, *скришити* ‘разбіць’, *стерти* ‘знішчыць, зламаць’ (< *стереть*), *травити* ‘псаваць, знішчаць’ (напрыклад, ежу), *укоротити(се)* ‘зменшыць, зменшыцца’ і інш.;

і) дзеянні, уласцівыя стыхіям, аб’ектам прыроды, жывёлам (30): *взвеети* (пра вецер), *вскиснути* (пра цеста), *выкоренитисе*, *выникнути* / *выникати* ‘вырасці, даць парасткі’, *гнездитисе* (пра *птахъ*), *дожчити*, *засветитисе (якъ сонце)*, *загорети* ‘звянуць пад сонцам’, *затмитисе* (пра сонца), *заходити* (пра сонца), *зветрети* ‘страціць свой смак’ (пра соль), *колыхати* (*ветромъ*, пра трыснёг), *окрыватисе* і *покрыватисе (волнами)*, *осякнути* ‘перастаць цячы’, *погружатисе*, *подавити* / *подавляти* ‘заглушыць, заглушаць’ (пра пустазелле), *позобати* ‘падзюбаць, паесці’ (пра *птахъ*), *пролитисе*, *созрети*, *приплодити* / *пріпложати* (пра расліны), *розсветитисе* (пра твар), *росвечати (светло)*, *(вз)рости*, *угасати* (пра агонь), *улегтисе* (пра вецер) і інш.

Як бачна, прадстаўленая ў Цяпінскага евангельская лексіка даволі разнастайная паводле сваёй тэматыкі. Аднак ёй уласціва і пэўная скіраванасць, пэў-



ная тэндэнцыя: ва ўсіх лексічных класах (асабліва ў дзеясловах) дамінуе лексіка, што характарызуе чалавека ў розных аспектах. Гэта звязана са зместам Евангелляў — твораў, звернутых да людзей і прысвечаных апісанню пэўнага фрагмента чалавечага свету. Найбольш разнастайнымі па колькасці вылучаных падразрадаў з’яўляюцца асабовыя назвы. Можна таксама адзначыць і пашыранае выкарыстанне абстрактнай лексікі (у тым ліку з аддзеяслоўным суф. *-нье*).

Разам з тым трэба адзначыць і пэўную ўмоўнасць прапанаванага размеркавання лексікі перакладу па тых ці іншых (пад)раздзелах. Нямала слоў, асабліва структурна простых (і, як правіла, праславянскіх паводле свайго паходжання), мае ў Цяпінскага некалькі значэнняў (як і ў грэчаскім тэксце Евангелля, гл.: [3, s. 169—181]). Прыкладам такіх шматзначных слоў могуць служыць многія лексемы: *година*, *жена*, *край*, *мужъ*, *панъ*, *прагнути*, *сынъ*, *часъ* і інш. Часам значэнні ў іх даволі далёкія, таму падобныя лексемы могуць быць аднесены да некалькіх разрадаў. Так, слова *семе* мае ў Цяпінскага наступныя, даволі адрозныя значэнні: 1) ‘насенне’, 2) ‘патомнасць, нашчадкі’; слова *земля* выяўляе такія значэнні: 1) ‘планета, зямны свет’, 2) ‘грунт, глеба’, 3) ‘краіна, тэрыторыя’, 4) ‘Ізраіль, зямля іудзеяў’. Таму лексемы прыводзіліся толькі ў адным (як правіла, асноўным) сваім значэнні, выключэнне рабілася толькі для значна адлеглых значэнняў, якія далёка разышліся паміж сабой. Гэта дазваляе бачыць у падобных выпадках аманімію, а не шматзначнасць.

У Цяпінскага зафіксавана 760 назоўнікаў, 281 прыметнік, 819 дзеясловаў, да іх трэба дадаць і каля 50 прыслоўяў і звыш 100 службовых слоў. Усяго ж у перакладзе ўжыта больш за 2 тыс. слоў і яшчэ каля 50 новых слоў сустрэлася ў тэксце маргіналій.

Свет, які ствараў Цяпінскі сваім перакладам, мала нагадвае Старажытную Іудзею. Хаця пераважная большасць імёнаў і тыпанамастыкону захоўваліся (але ў асноўным у царкоўнаславянскім абліччы) [1, с. 159—161], аднак астатнія сукупнасці лексікі выяўляюць выразную тэндэнцыю да змен. Перш за ўсё ён пазбягаў семітызмаў і лацінізмаў, прадстаўленых у евангельскім апавяданні, а таксама грэцызмаў, уласцівых царкоўнаславянскаму перакладу Евангелля (гэты пераклад і служыў Цяпінскаму асноўным арыгіналам [1, с. 184—187]. Гэтыя неславянскія лексемы перакладчык вельмі часта замяняў славянскімі адпаведнікамі, пераважна паланізмамі [1, с. 156—159, 162—163, 171—172, 264—265].

Разам з тым Цяпінскі захоўваў у сваім перакладзе і пэўную біблейную стылістыку, у цэлым пазбягаючы лексікі, выразна звязанай сваім ужыткам і паходжаннем з сучасным для беларускіх чытачоў ладам жыцця. Да такой лексікі ў яго можна аднесці нямнога слоў: *гумно*, *жолнеръ*, *рота*, *справца*, *уфъ*, *цыниъ* і інш. Але яна пранікла да Цяпінскага пад уплывам перакладу Буднага і іншых польскіх перакладаў. У сваім польскім перакладзе Біблії 1572 г. Будны смела ўжываў дастаткова мадэрнізаваныя эквіваленты, шчыльна звязаныя з ладам жыцця XVI ст. Гэта перш за ўсё многія асабовыя назвы: *bankierz* ‘мяняла, банкір’, *ceklarz* ‘служка, чыноўнік’, *celnik* ‘мытнік’, *drab* ‘конны воін’, *hetman*,

*mincarz* ‘мяняла’, *podczaszy*, *podkomorzy*, *rotmistrz*, *senator*, *spiegierz* ‘шпіён’, *sprawca*, *żołnierz*, — і назвы будынкаў ды звязаных з імі ўстаноў: *gumno*, *folwark* (для наймення поля ці пашы), *ratusz* (пра прэторыю — афіцыйную ўстанову рымскай улады ў заваяваных землях); нарэшце, назвы вайсковых адзінак: *rota* [2, s. 395, 411]. Вельмі мадэрнізаванай выглядае ў Буднага і сфера найменняў мераў ды вагі, якая заўжды спецыфічная для той ці іншай культуры і з цяжкасцю падлягае адэкватнай перадачы на іншую мову. Тут Будны смела ўводзіў сучасныя яму рэаліі: *baryła* ‘бочка’ (грэч. ‘ο κόρος), *funt* (грэч. ‘η λίτρα), *obrok* (грэч. ‘η χοῖνιξ — мера вагі сухіх рэчываў), [2, s. 411—412]. Падобнага падыходу Цяпінскі ў цэлым не практыкаваў, бадай за выключэннем назваў грошай і відаў падаткаў ці плацяжоў, якія ў яго перакладзе дастаткова мадэрнізаваныя: *галерь*, *грошъ*, *гроши*, *монета*, *пенязь*, *статиръ*, *талантъ*, *цыншъ*. Праўда, перадача падобных назваў заўжды складала праблему для перакладчыкаў Евангелля, якія звычайна вырашалі яе, звяртаючыся або да запазычанняў, або да ўласных найменняў эквівалентных рэалій са сваёй культуры і часу.

Да біблейных запазычанняў Цяпінскі звяртаўся рэдка — у яго прысутнічае самы мінімум экзатызмаў. Гэта добра бачна ў пэўных тэматычных групоўках (напрыклад, канкрэтнай лексікі). Так, у групе назваў жывёл і іх гуртаванняў з 29 да іх ліку могуць быць аднесесны толькі 3 словы (*акрида*, *верблюдъ* і, магчыма, *саранча*); з 34 назваў раслін і іх формаў, частак або пладоў гэта толькі *кропъ*, *тминъ*, *фига*. Практычна ўсе з гэтых экзатызмаў — запазычанні, зробленыя, аднак, не самім Цяпінскім, а ўжо прысутныя на той час у старабеларускай мове.

Відавочна, што Цяпінскі пры перакладзе не рабіў акцэнту на рознасці культур, не імкнуўся яе падкрэсліць. Але ён, безумоўна, заўважаў гэты аспект, што бачна па яго згадках у маргіналіях пра яўрэйскія, сірыйскія ці грэчаскія словы (гл.: [1, с. 303, 306—312]). Тым не менш у сваёй працы беларускі перакладчык яўна зыходзіў з ідэі ўніверсальнасці розных культур (хаця няясна пакуль, інтуіцыйна ці асэнсавана). Заслуга Цяпінскага ў тым, што ён знайшоў магчымасці і сродкі выразіць гэта ў сваім перакладзе, перадаць паўднёвы свет старажытнай Палесціны, наблізіць яго да сваёй паўночнай старабеларускай сучаснасці.

Літаратура


1. Клімаў, І. П. Евангелле ў перакладзе Васіля Цяпінскага / І. П. Клімаў. — Мінск, 2012.
2. Moszyński, L. Zur Sprache der Bibelübersetzung Szymon Budnys von 1572 / L. Moszyński // Budny S. Biblia, to jest Księgi Starego i Nowego Przymerza. Nieśwież; Zasław, 1571—1572 / hrsg. H. Rothe, F. Scholz. — Padeborn; München; Wien; Zürich, 1994. — Bd. 2. — S. 354—415. (Biblia Slavica. — Ser. 2. — Vol. 3).
3. Poniatowski, Z. Nowy Testament w świetle statystyki językowej / Z. Poniatowski. — Wrocław; Warszawa; Kraków; Gdańsk, 1971.


*Артыкул паступіў у рэдакцыю 20.02.2013*



**В. С. Пазднякоў,**
*загадчык аддзела археаграфіі БелНДІДАС;*
e-mail: vpmiensk@gmail.com

## ВАДЗЯНЫЯ ЗНАКІ СЛУЦКАГА ЕВАНГЕЛЛЯ І ПРАБЛЕМА ДАТАВАННЯ РУКАПІСУ

Слуцкае Евангелле цягам апошніх гадоў стала адной з самых знакамітых беларускіх кніг, чаму паспрыяла яго сапраўды цудоўнае вяртанне з небыцця. Рукапіс выдадзены на CD-ROM (фотаздымкі ўсіх старонак і наборны тэкст) [1] і надрукаваны (фотаздымкі старонак, наборны тэкст) [2; 3]. Гэта значна аблягчае далейшае даследаванне помніка, які ўтрымлівае яшчэ шмат таямніц. Галоўныя з іх — калі, дзе і кім створана гэта цудоўная кніга.

Просты адказ на гэтыя пытанні ўтрымліваецца на вокладачным аркушы IV, дзе знаходзіцца мемарыяльны запіс ад імя папа Малахвея:

«Не чꙋдисе благоразсꙋдителное Читателю | сее Светое Еvгелïе, которое самъ Све|тое памети Юрïи Юрïевичъ Олелкѡ | Кнѧжа Блгочестивое Слꙋцкое Рокꙋ: | Бжогѡ АФПВ (1582): самъ своею Рꙋкою | власною переписавъ, Что починаетъ | золотомъ, А далïе простимъ чернилом | и минѣею, Бо тое оучинилосе не ѡт скꙋ|пости, Але от ревности великои ко= | блгочестïю светомꙋ, дабы такое пе=|реписмо скоро до скꙋткꙋ своего прïи|шло; а зновꙋ Оутаеваючи праци свои и= | кошты предъ члвѣки; тое тотъ Кнѧзь | Оучинивъ ꙗкъ мисмѡ частѡ тамъ бы=|вали, и видали и слишали, А наивенце" | что оуже и хороба приближаласѧ;= | и тꙋрбацïѧ речи посполитой оукоро|тили жизнь тое кнеже$^{с}$ти, Оумеръ | АФПЅ (1586); погребенъ в Слꙋцкꙋ в Собор|нои ‖ нои Оуспенïе Пресветïѧ Бго Матере Црк=|ви Оу праваго крилоса положенъ. | свѣдчимъ многогрѣшныи попъ | Малахвѣи светое варвары в Слꙋцкꙋ | кнежети с: п. дꙋховныи оцъ».

Такім чынам, маем дату 1582 г. і ўказанне на асобу перапісчыка — слуцкага князя Юрыя Юр’евіча Алелькавіча.

Іншая дата напісання Слуцкага Евангелля стаяла на каваным сярэбраным абкладзе кнігі. Абклад не дайшоў да нашага часу. Згодна са сведчаннем архімандрыта Мікалая (1864), на абкладзе чытаўся такі тэкст: «Сіе святое Евангеліе рукою власною Юрій Юрьевичъ Олелько, княжа Слуцкое, во имя Пресвятыя Живоначальныя Тройцы, Отца и Сына и Св. Духа, вѣчными часы, до С. М. благочестиваго архимандріи Слуцкой, для вѣчнаго богомолія і спасенія души своея, во незабытную память прародителей своихъ К. С., родителей, самого себя Анно 1581 выписалъ, року Р. Х. 1582 Іюня 4 дня надалъ» [4, с. 110]. Гэты ж надпіс прыводзіць мітрапаліт Макарый, абапіраючыся, відаць, на кнігу архімандрыта Мікалая, але без спасылкі на яе [5, с. 474, прим. 466]. Невядома, што хаваецца за абрэвіятурамі С. М. і К. С., і хто іх уставіў — старажытны майстар ці сам архімандрыт Мікалай. Для скарачэння «С. М.» можна прапанаваць раскрыццё «Слуцкого монастыря», а для «К. С.» — «князей слуцкихъ».

Упершыню Евангелле Алелькі з аздобамі пераплёту ўпамінаецца ў вопісе маёмасці Слуцкага Троіцкага манастыра 1772 г.:

«Вѣдомость съ описаніемъ болшой церкви святыя Тройцы, въ самой архимандріи Слуцкой состоящей, яко то: іконостаса, намѣстныхъ іконъ, библіотеки, церковныхъ книгъ, церковныхъ сосудовъ, рызницы и другихъ церковныхъ вещей, составленна 1772 года. […] 6) Евангеліе писанное Олелкомъ княземъ 1582 года оправлено въ аксамитъ зеленый, въ сребро съ позолоткою, на которомъ распятіе, дванадесять апостоловъ и евангелисты четыре, зъ другаго боку пуговицъ 5, срѣбныхъ позолоченных …. обложено лиштвами сребнопозолоченными *(конца описания книги под № 6 и начала описания книги под № 7 нельзя разобрать, вследствие ветхости рукописи)*» [6, с. 1559].

Указанне на 1582 г. сведчыць, што складальнік вопісу карыстаўся мемарыяльным запісам папа Малахвея. Ніякі надпіс на абкладзе Евангелля ў гэтым дакуменце не адзначаны. Абклад не датрываў да канца XIX ст. У 1896 г. яго ўжо не было [7, с. 35]. Пра яго знікненне ўпершыню паведаміў у 1904 г. выкладчык Слуцкай гімназіі І. А. Глебаў: «В настоящее время это Евангелие переплетено в доски, обложенные бархатом, без всяких наружных украшений, а серебряный оклад увезен в Минский св.-Духов монастырь» [8, с. 29]. У гэтым жа годзе Слуцк наведаў Юзаф Смалінскі, які адзначыў, што Евангелле мае просты драўляны пераплёт, абцягнуты чырвоным аксамітам без аніякіх упрыгожванняў [9, s. 11—12]. Крыху падрабязнасцей дадаў архімандрыт Афанасій (Вячорка): «В настоящее время это Евангелие переплетено в доски, обложенные бархатом, без всяких наружных украшений, а серебряный оклад наместником Св.-Духова монастыря Игуменом Николаем варварским способом оторван от Евангелия и беззаконно увезен в Минский монастырь» [10, с. 12].

Адзначым, што ўсе тры аўтары казалі пра пераплёт з дошак. Дошкі таксама зніклі, або гэта была памылка — цяперашні пераплёт Евангелля з тонкага кардону, абцягнутага скурай, якая, у сваю чаргу, накрыта рудым (былым малінавым) аксамітам.

Каб праверыць дату напісання Слуцкага Евангелля, як яна падаецца ў гэтых запісах (1581 г. або 1582 г.), трэба звярнуцца да вадзяных знакаў кнігі. Гэту працу збольшага ўжо зрабіла Л. І. Станкевіч [11, с. 45—46]. Мы зробім некалькі ўдакладненняў.

Вадзяныя знакі рукапісу ў поўнай меры не апублікаваны. Л. І. Станкевіч прыводзіць іх славеснае апісанне. Ёю вылучаны два тыпы знакаў. Першы — літара M з крыжам на ёй, другі — сонца з шасцю закругленымі промнямі, над ім штанга з зоркай. Як адзначыла Л. І. Станкевіч, вадзяны знак першага тыпу мае дзве разнавіднасці: «1) адзін стрыжань злёгку выгнуты, 2) абодва стрыжні прамыя» [11, с. 45]. Пад стрыжнямі разумеюцца, пэўна, левая і правая мачты літары M.

Філіграні першага тыпу замаляваў у 1904 г. Ю. Смалінскі. Яго малюнкі апублікаваны ў 1996 г. [9, rys. 14—18] і могуць служыць пэўнай асновай для разважанняў, бо дакладнасць фіксацыі Смалінскага рукапісных помнікаў вельмі вялікая (мал. 1—5). Да таго, выкарыстоўваючы выявы старонак Евангелля, змешчаныя на CD-ROM, можна атрымаць выявы некаторых вадзяных знакаў, якія ў прынцыпе тоесныя тым, што падае Ю. Смалінскі. Змешчаныя тут выявы з CD-ROM апрацаваны ў праграме Adobe Photoshop, каб зрабіць іх больш кантраснымі (мал. 1—19). Для гэтай мэты найбольш прыдатнымі аказаліся знакі з аркушаў 7, 70, 75, 190, якія або чыстыя, або запоўнены тэкстам толькі часткова. На аркушы 7 літара M сапраўды мае ўвагнутую левую мачту. На аркушах 70 і 75 знаходзіцца другая разнавіднасць — M з больш-менш роўнымі мачтамі, аднак крыж на ёй праглядаецца дрэнна. Перакрыжаванне крыжа зусім не фіксуецца на апрацаваных фотаздымках, так што мы не можам узяць адказнасці за наяўнасць гэтага элементу, таму на прапанаваных выявах яго няма. Магчыма, ён «знойдзецца» пры натурным вывучэнні Евангелля. Цалкам верагодна, што канцы літар M у абодвух варыянтах павінны быць крыху даўжэйшымі, чым на атрыманых «узорных» выявах. Абазначым атрыманыя знакі як № 1-1 і 1-2. Л. І. Станкевіч указвае, што знакі M сустракаюцца ў першых 14 сшытках Евангелля, прычым абодва варыянты чаргуюцца [11, с. 46]. Прагляд фотаздымкаў старонак кнігі паказаў, што гэта сапраўды так, прычым у чаргаванні не назіраецца рэгулярнасці.



Вывучэнне вокладачных аркушаў кнігі паказала наяўнасць на іх знака M. Нагадаем, што кніга пачынаецца з чатырох вокладачных аркушаў, з якіх першы выглядае на XIX ст., другі мае вадзяны знак XVIII ст., а трэці і чацвёрты — самыя старажытныя, першапачатковыя. На абодвух гэтых аркушах выяўлены знак M першага варыянту (№ 1-1). Такім чынам, гэта дзве асобныя палавінкі вялікіх аркушаў, тых самых, якія былі ўжыты для напісання Евангелля. Куды былі ўладкаваны дзве адрэзаныя палавінкі без маркіровачных знакаў? У канцы Слуцкага Евангелля таксама ёсць чатыры вокладачныя аркушы, якія размяшчаюцца ў адваротным парадку: спачатку два самыя старажытныя, потым аркуш XVIII ст. і, нарэшце, аркуш XIX ст. Нечакана аказалася, што абодва заднія старажытныя аркушы таксама маюць вадзяныя маркіровачныя знакі, але нечаканасць была не ў гэтым (хоць яны павінны быць увогуле без знакаў, калі гэта тыя палавінкі, што былі адрэзаны ад пярэдніх вокладачных аркушаў) і не ў тым, што яны таксама мелі знак у выглядзе літары M з крыжам, а ў тым, што гэта асобны варыянт знака M (пазначым яго № 1-3). Ён адрозніваецца большай шырынёй і нізкім крыжам, на якім добра праглядаецца перакладзіна (мал. 14, 15). Выглядае так, што стваральнікі Слуцкага Евангелля наўмысна падрыхтавалі для вокладачных аркушаў экзэмпляры з маркіровачнымі вадзянымі знакамі, прычым на ўсіх аркушах — крыжы, універсальныя ахоўныя сімвалы.

На ўсіх старонках кнігі знакі з літарай M размяшчаюцца не ў цэнтры, а бліжэй да карашка. Відавочна, што папера з гэтым знакам прызначалася для кніг вузкага фармату, калі вялікі аркуш паперы складаўся ў чатыры столкі. Для Усходняй Еўропы такі фармат зусім не характэрны, але ў Цэнтральнай Еўропе быў досыць папулярны. У Польшчы кнігі такога фармату называюцца «дудкі». Адна такая «дудка» захоўваецца ў Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі.

Гэта актавая кніга Дагічынскага земскага суда 1416—1444 гг. — найстаражытнейшая актавая кніга архіва.

Пяройдзем да маркіровачных знакаў іншага тыпу. Са сшытка № 15 пачынаецца іншая папера, якая мае зусім іншы знак — з выявай сонца. Л. І. Станкевіч не вылучае яго варыянты. Але яны ёсць. Прынамсі, іх два. Самая лепшая па якасці выява бачна на адвароце арк. 190 (мал. 16, 17). Найлепшы парны знак можна разгледзець на пустым арк. 191. Але нават тут ён невыразны, так што правую палову сонца па фотаздымках выявіць зусім не ўдаецца, на астатніх старонках знак яшчэ горшы (мал. 18, 19) . Гэтыя знакі пазначым нумарамі 2-1 і 2-2.

Разгледзім, як размяркоўваюцца маркіровачныя вадзяныя знакі па сшытках і аркушах кнігі. Л. І. Станкевіч указвае, што ў рукапісе 263 аркушы. Яны да гэтага часу фізічна не пранумараваны, і прыходзіцца карыстацца «віртуальнай» нумарацыяй. На думку Л. І. Станкевіч, кодэкс складаецца з 32 сшыткаў, прычым колькасць аркушаў у іх аднолькавая — па 8 у кожным сшытку [11, с. 43]. Гэта, канешне, не так. Калі ад агульнай лічбы 263 адняць 8 вокладачных аркушаў, то астатнія 255 аркушаў не дзеляцца на 8. Намі зроблена спроба прадставіць структуру рукапісу па сшытках і аркушах і адлюстраваць яе ў прыведзеных ніжэй схемах. На гэтых схемах ніжні шэраг лічбаў — нумарацыя аркушаў, верхні — размеркаванне маркіровачных вадзяных знакаў, наколькі аказалася магчыма іх атаясаміць на падставе фотаздымкаў.

Выяўляецца, што першы сшытак кодэкса складаецца з 6 аркушаў, а ў канцы кнігі ёсць дадатковы аркуш па-за сшыткамі. На схемах усе сшыткі паказаны як сукупнасць неразрэзаных і перагнутых чатырох вялікіх аркушаў паперы (першы сшытак з трох аркушаў), але нельга выключыць і таго, што ў кнізе прысутнічаюць разрэзаныя аркушы. У сшытку 1 аркушы 1 і 6 дакладна не ўтвараюць адзін вялікі аркуш, бо кожны з іх нясе маркіровачны вадзяны знак. Магчыма, аркушы 2 і 5 таксама не ўтвараюць адзін вялікі аркуш паперы, бо разгледзець на іх вадзяныя знакі не ўдаецца. Увогуле, на шмат якіх аркушах кнігі вадзяныя знакі не праглядаюцца, таму на схемах не прастаўлены адпаведныя нумары, або калі разнавіднасць знака ўстанавіць немагчыма, выкарыстоўваецца пытальнік. Нестандартная схема сшытка 1, канешне, адлюстроўвае пераробку пачатковай часткі кодэкса, якая нечым не задаволіла заказчыка ці майстра.








| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | 1-1 | 1-2 | 1-1 | | | | 1-2 |
| № 11 | 79 | 80 | 81 | 82 | 83 | 84 | 85 | 86 |
| | | | | | | | 1-1 | 1-2 |
| № 12 | 87 | 88 | 89 | 90 | 91 | 92 | 93 | 94 |
| | | 1-2 | | 1-1 | | 1-2 | | |
| № 13 | 95 | 96 | 97 | 98 | 99 | 100 | 101 | 102 |
| | 1-1 | 1-2 | | | 1-2 | | | |
| № 14 | 103 | 104 | 105 | 106 | 107 | 108 | 109 | 110 |
| | | | | 2-1 | | | 2-1 | |
| № 15 | 111 | 112 | 113 | 114 | 115 | 116 | 117 | 118 |
| | | | | 2-1 | | 2-1 | 2-? | 2-1 |
| № 16 | 119 | 120 | 121 | 122 | 123 | 124 | 125 | 126 |
| | | | 2-? | | | | 2-1 | 2-? |
| № 17 | 127 | 128 | 129 | 130 | 131 | 132 | 133 | 134 |
| | 2-? | | | 2-? | | 2-1 | 2-? | |
| № 18 | 135 | 136 | 137 | 138 | 139 | 140 | 141 | 142 |



| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | 2-? | | | 2-? | | | 2-? |
| № 19 | 143 | 144 | 145 | 146 | 147 | 148 | 149 | 150 |
| | | | | 2-1 | | 2-1 | 2-1 | 2-1 |
| № 20 | 151 | 152 | 153 | 154 | 155 | 156 | 157 | 158 |
| | | 2-? | | | 2-1 | 2-1 | | 2-1 |
| № 21 | 159 | 160 | 161 | 162 | 163 | 164 | 165 | 166 |
| | | | 2-? | | 2-? | | 2-? | 2-1 |
| № 22 | 167 | 168 | 169 | 170 | 171 | 172 | 173 | 174 |
| | | | | | 2-1 | 2-1 | 2-? | 2-1 |
| № 23 | 175 | 176 | 177 | 178 | 179 | 180 | 181 | 182 |
| | | | | 2-? | | | | 2-1 |
| № 24 | 183 | 184 | 185 | 186 | 187 | 188 | 189 | 190 |
| | 2-? | 2-? | | 2-? | | | | |
| № 25 | 191 | 192 | 193 | 194 | 195 | 196 | 197 | 198 |
| | | | | 2-? | | 2-? | 2-1 | 2-1 |
| № 26 | 199 | 200 | 201 | 202 | 203 | 204 | 205 | 206 |




Знакі ў выглядзе літары M з крыжам сустракаюцца ў першых чатырнаццаці сшытках, прысутнічаюць на двух пярэдніх і двух задніх вокладачных аркушах. Усяго знойдзена 25 знакаў № 1-1, таксама 25 знакаў № 1-2 і два знакі № 1-3 (абодва — на задніх вокладачных аркушах).

Падлікаў знакаў у выглядзе сонейка прыводзіць не будзем, бо вялікая частка такіх знакаў не распазнана на фотаздымках.

Аналагі знакаў Слуцкага Евангелля адзначыла Л. І. Станкевіч [11, с. 45—46], так што дадаць можна няшмат. Знак у выглядзе літары M з крыжам Л. І. Станкевіч датуе 1514 г., спасылаючыся на альбом вадзяных знакаў М. П. Ліхачова [12, № 1410, 1411]. У альбоме Ш.-М. Брыке тоесных знакаў няма, але Л. І. Станкевіч адзначае блізкія [13, p. 451, № 8370—8374]. На наш



погляд, блізкі толькі адзін знак з гэтага шэрагу — № 8372 (мал. 20), усе астатнія — гэта проста літара M, без крыжа. У каментарыях да знака № 8372 Брыке адзначыў, дзе і калі была выкарыстана адпаведная папера (Мадэна, 1484 г.) і ўказаў аналагі — знакі з альбома М. П. Ліхачова № 1410 і 1411.

Сапраўды, найбольш блізкія аналагі знака з выявай літары M і крыжам сустракаюцца ў альбоме М. П. Ліхачова. Да яго звестак варта паставіцца больш уважліва, тым больш што прыведзеная ім пара знакаў, відаць, тоесная пары са Слуцкага Евангелля (паўнавартаснае параўнанне немагчыма, бо ў яго прыведзены перамалёўкі, а ў нашым распараджэнні фотаздымкі). М. П. Ліхачоў узяў выявы знакаў з рукапісу Румянцаўскага музея № CCIX — «Евангелля вучыльнага» патрыярха Каліста, якое было напісана ў Кіеве ў 1514 г. Кніга і цяпер зберагаецца ў Расійскай дзяржаўнай бібліятэцы [14, с. 17; 15, с. 276—277; 16, с. 318—319]. Яна створана Сергіем, манахам Мікольска-Пустынскага манастыра ў Кіеве. Калі і можна было дапусціць, што Слуцкае Евангелле і кніга Сергія напісаны адным чалавекам, то параўнанне почыркаў сведчыць, што гэта не так — почыркі зусім розныя.

Блізкага знака з выявай сонца ў альбоме М. П. Ліхачова няма, аднак Л. І. Станкевіч знайшла іх альбомах Брыке, дзе яны датуюцца 1522 г. (Брусель) і 1531 г. (Кальмар) [17, № 13908] (мал. 22) і Г. Пікара, дзе прадстаўлены адзін знак 1523 г. (Шчэцін) [18, № 41226] (мал. 23). Знак Брыке № 13908 сапраўды вельмі падобны да тых, якія бачны ў Слуцкім Евангеллі, а знак Пікара, магчыма, тоесны знаку Слуцкага Евангелля № 2-2.

Падводзячы вынікі, можна сцвярджаць, што знак з выявай літары M з крыжам больш ранні, чым знак з сонцам. Калі папера з першым на ўсходнеславянскіх землях ужывалася ў 1514 г. (Кіеў), то папера з другім магла трапіць сюды ў сярэдзіне — другой палове 1520-х гг. і ўжывацца да пачатку 1530-х гг.

Існуе яшчэ адзін рукапіс, дзе выкарыстана папера са знакам у выглядзе літары M з крыжам. Ён яшчэ больш цікавы, таму што іншы знак гэтага рукапісу — сонца з зоркай над ім. Магчыма, гэта менавіта тая пара знакаў, якая сустракаецца ў Слуцкім Евангеллі. Размова ідзе пра не менш знакаміты рукапіс — Віленскі кодэкс 262, які захоўваецца ў Бібліятэцы Акадэміі навук Літвы. Кодэкс даўно прыцягвае ўвагу даследчыкаў, якія неаднаразова звярталі ўвагу на яго вадзяныя знакі [19, с. 2; 20, p. 25; 21, с. 10; 22, с. 292; 23, с. 91]. Аднак выявы знакаў Віленскага кодэкса 262 дасюль не апублікаваны. Указваецца толькі, што знак з літарай M ідэнтычны знакам альбома М. П. Ліхачова № 1410—1411, а знак з сонцам амаль ідэнтычны знаку з альбома Брыке № 13908. Тыя ж самыя аналагі падабрала Л. І. Станкевіч да знакаў Слуцкага Евангелля. Так што даследчыкі беларускіх рукапісаў маюць унікальны выпадак — дзве рукапісныя кнігі з адным наборам вадзяных знакаў, прычым ёсць яшчэ трэці рукапіс з адным з гэтых знакаў, напісаны ў Кіеве ў 1514 г. Не памылімся, калі выкажам меркаванне, што два першыя рукапісы паўсталі прыкладна ў адзін час і ў адным месцы, да і трэці рукапіс недалёка ад іх знаходзіцца. У адносінах да Віленскага

кодэкса 262 С. Ю. Цемчын у якасці магчымага месца і часу называе Луцк або Супрасльскі манастыр (каля 1517—1530 гг.), пры гэтым без падстаў адводзіць «кандыдатуру» Кіева [22, с. 296—297]. А між тым Кіеў — найбольш верагоднае месца паўстання ўсіх трох разглядаемых рукапісаў. Нельга выключыць з ліку магчымых месцаў напісання Слуцкага Евангелля і Віленскага кодэкса 262 горад Слуцк з яго Троіцкім манастыром. Супраць гэтай версіі сведчыць тое, што іншыя слуцкія Евангеллі пачатку XVI ст. былі напісаны ў іншых месцах — Лаўрышаўскім манастыры і Морацкім Мікольскім манастыры [24, с. 98—99].

У любым выпадку, меркаванне аб напісанні Слуцкага Евангелля рукой князя Юрыя Юр'евіча Алелькавіча ў 1581/1582 г. трэба адкінуць, бо гэтаму пярэчаць і старажытная папера кодэкса, і адносна новая мова прыпіскі «княскага спавядальніка папа Малахвея», і найноўшы надпіс на металічным абкладзе кнігі, да і сама асоба слуцкага князя Ю. Ю. Алелькавіча, якому проста не было адпушчана часу засвоіць кірылічнае пісьмо.

Лінгвістычны аналіз «прыпіскі Малахвея» правёў І. П. Клімаў [25]. З яго галоўнай высновай — прыпіска значна пазнейшая за само Евангелле — трэба пагадзіцца. Аднак некаторыя моманты патрабуюць удакладнення.

Для датавання запісу І. П. Клімаў прыцягнуў комплекс прыкмет як палеаграфічнага, так і агульнагістарычнага характару. Па-першае, І. П. Клімаў звярнуў увагу на выкарыстанне знака пераносу слоў у выглядзе =. На яго думку, такі знак звычайна ўжываўся ў друкаваных выданнях, прычым у XVI ст., толькі ў заходнееўрапейскіх выданнях, але яшчэ не ў кірылічных. Аднак для разгляду гэтай прыкметы трэба прыняць пад увагу, перш за ўсё, асаблівасці кірылічных рукапісаў, а не друкаваных выданняў. Так, у беларускіх кірылічных рукапісах з канца XVI ст. знак пераносу ў выглядзе = ужываецца даволі актыўна. Самы яскравы прыклад гэтага — рукапісныя кнігі Метрыкі Вялікага Княства Літоўскага. Таму ўжыванне знака = у якасці знака пераносу ў запісе папа Малахвея ніяк не сведчыць пра яго неаўтэнтычнасць. Выкарыстанне ў адным месцы знака = пасля кропкі з коскай не сведчыць ні за, ні супраць аўтэнтычнасці запісу — памылкі дапускаліся ў любы час. Ужыванне прыназоўніка «от» замест формы «ѡт» падаецца І. П. Клімаву малаверагодным для старабеларускага пісьменства XVI ст., але такая форма сустракаецца і не можа сведчыць супраць аўтэнтычнасці разглядаемага запісу. Не можа сведчыць у гэтых адносінах і выкарыстанне ў запісе паланізмаў і лацінізмаў, бо да пачатку XVII ст. беларуская пісьмовая мова ўвабрала багата такой лексікі. Аднак колькасць іх у адносна невялікім тэксце празмерная для праваслаўнага святара XVI ст., што сведчыць не на карысць разглядаемай прыпіскі. Не могуць сведчыць супраць аўтэнтычнасці таксама моўныя хібы, такія, як недапасаваныя словы ў звароце «благоразсꙋдителное Читателю». Моўныя памылкі пісары рабілі ва ўсе часы. Памылковае слова «кнеже$^{с}$ти» ўзнікла, відаць, пад уздзеяннем выразу «княжацкай міласці», што таксама магло адбыцца ў любы час у XVI—XIX стст. Недарэчным уяўляецца І. П. Клімаву выкарыстанне выразу «рꙋкою власною» ў значэнні «асабіс-



та», хоць менавіта такі выраз быў пашыраны ў старабеларускай пісьменнасці ў XVI—XVIII стст. Немагчымым для аўтэнтычнага запісу лічыць І. П. Клімаў слова «Багамацеры» замест больш уласцівай для праваслаўных той эпохі «Багародзіцы». Аднак слова «Багамацер» неаднойчы сустракаецца ў пісьмовых помніках XVI ст. (гл., напрыклад, матэрыялы «Гістарычнага слоўніка беларускай мовы»). Іншыя сумненні І. П. Клімава ў аўтэнтычнасці разглядаемага носяць верагоднасны характар.

На падставе гэтых моўных і арфаграфічных недарэчнасцей І. П. Клімаў не лічыць «прыпіску Малахвея» сапраўдным запісам XVI—XVII стст., а разглядае яго як фальсіфікацыю пазнейшага часу, хутчэй за ўсё XIX ст. Пры гэтым за рамкі разгляду выйшла XVIII ст. Тое, што запіс існаваў раней за XIX ст., сведчыць вопіс манастырскай бібліятэкі 1772 г. Таму, калі лічыць «прыпіску Малахвея» фальсіфікатам, то трэба знайсці такія асаблівасці запісу, якія не маглі ўзнікнуць у канцы XVI — пачатку XVII ст., а былі ўласцівы больш позняму часу, але не пазней за 1772 г. Гэта задача няпростая, бо ў XVI—XVIII стст. беларуская культура, і пісьмовасць у тым ліку, развівалася ў падобных умовах. Галоўнае сведчанне адносна позняга паходжання «прыпіскі Малахвея» палягае ў яе нехарактэрнай для XVI—XVII стст. графіцы. «Прыпіска Малахвея», канешне, напісана стылізаваным шрыфтам, гэта значыць пісар намагаўся пісаць паўуставам, але не валодаў ім як след, таму збіваўся на больш знаёмы яму скарапіс. Да таго, пісар пісаў почыркам, заснаваным на друкарскіх шрыфтах. Значыць, гэта адбывалася ў час, калі ўстойлівая традыцыя кнігапісання ўжо не існавала. Аднак грунтоўны лінгвістычны аналіз «прыпіскі Малахвея», як і ўсяго Слуцкага Евангелля, яшчэ наперадзе.

Літаратура і крыніцы


1. Слуцкае Евангелле: беларускі рукапіс XVI ст. [электронны рэсурс] / Нац. б-ка Беларусі, Ін-т мовазнаўства імя Я. Коласа НАН Беларусі, Бел. рэспубліканскі фонд фундаментальных даследаванняў; аўтары: Н. В. Паляшчук і інш.; складальнік Т. І. Рошчына; адказны за выпуск Г. У. Кірэева. — Электронныя даныя і праграма. — Мінск: Нац. б-ка Беларусі, 2008.
2. Святое Евангелие. Слуцк, 1582 / [Предисловие Митрополита Минского и Слуцкого, патриаршего экзарха всея Беларуси Филарета]. — Минск: Бел. правосл. церковь; Нац. б-ка Беларуси, 2009. — [574] с. факсим.
3. Святое Евангеліе. Слуцк: Узноўлены тэкст. — Мінск: Бел. правасл. царква, 2009. — 255 с.
4. Историко-статистическое описание Минской епархии / Составленное ректором Минской духовной семинарии Архимандритом Николаем. — СПб., 1864. — 315 с.
5. Макарий, архиепископ. История Русской Церкви / Макарий, архиепископ. — СПб., 1879. — Т. IX: Период разделения Русской Церкви на две митрополии. Кн. IV. История Западно-русской или Литовской митрополии. — XX, 689 с.
6. Памятники православия и русской народности в Западной России в XVII—XVIII вв. / Издание Киевской духовной академии, под редакцией проф. священника Ф. Титова. — Киев, 1905. — Т. 1: Акты по истории заграничных монастырей Киевской епар-

хии XVII—XVIII вв. Ч. III. (С указателями и 5 картами) — С. LXVII—XCVII, [I], 1137—1771, I—CXIX.

7. Серно-Соловьевич, Ф. Ф. Древне-русский город Слуцк и его святыни: Исторический очерк, с шестью гравюрами / Ф. Ф. Серно-Соловьевич. — Вильна, 1896. —38 с.
8. Глебов, И. А. Город Слуцк: (Исторический очерк) / И. А. Глебов. — Вильна: Типография «Русский Почин», 1904. — 31 с.
9. Kałamajska-Saeed, M. Portrety i zabytki książąt Olelkowiczów w Słucku: Inwentaryzacja Józefa Smolińskiego z 1904 r. / M. Kałamajska-Saeed. — Warszawa, 1996. — 96 s.
10. Афанасий (Вечорко), архимандрит. Блаженная Слуцкая Княгиня София Юрьевна Олелько († 19 марта 1612 года): Юбилейное приложение к «Минскому Слову» / Афанасий (Вечорко). — Минск: Электро-типография С. А. Некрасова, 1912. — 13 с.
11. Станкевіч, Л. І. Слуцкае Евангелле (XVI ст.) як помнік кніжнай культуры Беларусі / Л. І. Станкевіч // Беларуская кніга ў кантэксце сусветнай кніжнай культуры: зб. навук. артыкулаў / Бел. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў; рэд. калегія: М. А. Бяспалая [і інш.]. — Мінск, 2006. — Ч. 1. — С. 43—52.
12. Лихачев, Н. П. Палеографическое значение бумажных водяных знаков / Н. П. Лихачев. — СПб., 1899. — Ч. III: Альбом снимков. — DCXXXV табл.
13. Briquet, C.-M. Les filigranes: Dictionnaire historique des marques du papier, dès leur apparition vers 1282 jusqu'en 1600, avec 39 figures dans le texte et 16,112 facsimilés de filigranes / C.-M. Briquet. — Genève; Paris: Alphonse Picard et fils, 1907. — T. 3: L—O. — P. 427—620.
14. Лихачев, Н. П. Палеографическое значение бумажных водяных знаков / Н. П. Лихачев. — СПб., 1899. — Ч. II: Предметный и хронологический указатели. СПб., 1899. — 424, 248, IV с.
15. Востоков, А. Описание русских и славенских рукописей Румянцовского музеума / А. Востоков. — СПб., 1842. — III, 899, 3 с.
16. Запаско, Я. П. Пам'ятки книжкового мистецтва: Українська рукописна книга / Я. П. Запаско. — Львів: Світ, 1995. — 478 с.
17. Briquet, C.-M. Les filigranes: Dictionnaire historique des marques du papier, dès leur apparition vers 1282 jusqu'en 1600, avec 39 figures dans le texte et 16,112 facsimilés de filigranes / C.-M. Briquet. — Genève; Paris: Alphonse Picard et fils, 1907. — T. 4: P—Z. — P. 621—836.
18. Wasserzeichenkartei Piccard // Hauptstaatsarchiv Stuttgart [Electronic resource]. — Mode of access: http://www.piccard-online.de/start.php. — Date of access: 01.03.2013.
19. Перетц, В. Челобитная о благословении на Киевскую и всея Руси митрополию архиеп. полоцкого Ионы Глезны / В. Перетц // Университетские известия. — 1904. — № 10. — С. 1—6.
20. The Five Biblical Scrolls in a Sixteenth-Century Jewish Translation into Belorussian (Vilnius Codex 262) / With Introduction and Notes by Moshé Altbauer. Concordance compiled by Moshe Taube. — Jerusalem: Epy Israel Academy of Sciences and Humanities, 1992. — 421 p.
21. Галенчанка, Г. Я. Францыск Скарына: Спадчына і пераемнікі: Анатаваны бібліяграфічны паказальнік / Г. Я. Галенчанка. — Мінск, 2002. — 175 с.
22. Темчин, С. Ю. Схария и Скорина: об источниках Виленского ветхозаветного свода (F 19-262) / С. Ю. Темчин // Senoji Lietuvos literatūra. — Vilnius, 2006. — 21 knyga. — С. 289—316.



23. Кириллические рукописные книги, хранящиеся в Вильнюсе: каталог / сост. Н. Морозова. — Vilnius, 2008. — 243 с.
24. Галенчанка, Г. Я. Невядомыя і малавядомыя помнікі духоўнай спадчыны і культурных сувязей Беларусі XV — сярэдзіны XVII ст. / Г. Я. Галенчанка. — Мінск: Беларуская навука, 2008. — 458 с.
25. Клімаў, І. П. Да пытання аб атрыбуцыі і датавання Слуцкага Евангелля XVI ст. / І. П. Клімаў // Здабыткі: Дакументальныя помнікі на Беларусі / Нац. б-ка Беларусі. — Мінск: НББ, 2009. — Вып. 11. — С. 41—49.

*Артыкул паступіў у рэдакцыю 16.09.2013*




Мал. 1. Малюнак Ю. Смалінскага адной са старонак Слуцкага Евангелля (у цэнтры вадзяны знак М).



Мал. 2. Малюнак Ю. Смалінскага адной з заставак Слуцкага Евангелля (у цэнтры вадзяны знак М).





Мал. 3. Малюнак Ю. Смалінскага адной з заставак Слуцкага Евангелля (у цэнтры вадзяны знак М).



Мал. 4. Малюнак Ю. Смалінскага адной з заставак Слуцкага Евангелля (у цэнтры вадзяны знак М).



Мал. 5. Малюнак Ю. Смалінскага адной з заставак Слуцкага Евангелля (у цэнтры вадзяны знак М).





Мал. 6. Слуцкае Евангелле. Вадзяны знак № 1-1 (аркуш 7).



Мал. 7. Слуцкае Евангелле. Вадзяны знак № 1-1 (аркуш 7).



Мал. 8. Слуцкае Евангелле. Вадзяны знак № 1-2 (аркуш 70).



Мал. 9. Слуцкае Евангелле. Вадзяны знак № 1-2 (аркуш 70).





Мал. 10. Слуцкае Евангелле. Вадзяны знак № 1-2 (аркуш 75).



Мал. 11. Слуцкае Евангелле. Вадзяны знак № 1-2 (аркуш 75).



Мал. 12. Слуцкае Евангелле. Вадзяны знак № 1-1 (аркуш III).



Мал. 13. Слуцкае Евангелле. Вадзяны знак № 1-1 (аркуш III).





Мал. 14. Слуцкае Евангелле. Вадзяны знак № 1-3 (аркуш V).



Мал. 15. Слуцкае Евангелле. Вадзяны знак № 1-3 (аркуш V).



Мал. 16. Слуцкае Евангелле. Вадзяны знак № 2-1 (аркуш 190).



Мал. 17. Слуцкае Евангелле. Вадзяны знак № 2-1 (аркуш 190).





Мал. 18. Слуцкае Евангелле. Вадзяны знак № 2-2 (аркуш 191).



Мал. 19. Слуцкае Евангелле. Вадзяны знак № 2-2 (аркуш 191).




Мал. 20. Вадзяны знак № 8372 з альбома Ш.-М. Брыке.




Мал. 21. Вадзяныя знакі № 1410 і 1411 з альбома М. П. Ліхачова.








Мал. 22. Вадзяны знак № 13908 з альбома Ш.-М. Брыке.

Мал. 23. Вадзяны знак № 41226 са збору Г. Пікара.

**А. М. Латушкін,**
*дацэнт кафедры крыніцазнаўства гістарычнага факультэта БДУ,*
*кандыдат гістарычных навук;*
e-mail: archives@tut.by

## РОДАВЫЯ АРХІВЫ БУЙНЫХ ЗЕМЛЕЎЛАДАЛЬНІКАЎ ДАСАВЕЦКАГА ПЕРЫЯДУ І ІХ МЕСЦА Ў АРХІЎНАЙ СПАДЧЫНЕ БЕЛАРУСІ: ТЭАРЭТЫЧНЫЯ АСПЕКТЫ

Адной з найбольш каштоўных частак архіўнай спадчыны Беларусі з'яўляюцца родавыя архівы. Прыкладам іх могуць выступаць архіў Нясвіжскай ардынацыі Радзівілаў, архіў Сапег з Дзярэчына, архівы Хадкевічаў і інш. Нягледзячы на дастаткова працяглую гісторыю вывучэння збораў указанага тыпу ў айчыннай гістарыяграфіі дадзеная тэма пакуль застаецца на ўзроўні збору і сістэматызацыі факталагічнага матэрыялу, абмяжоўваецца даследаваннем гісторыі і складу асобных прыватных архіваў (гістарыяграфія пытання раней намі ўжо асвятлялася [2; 3]). Дадзены артыкул — спроба абагульнення накопленага матэрыялу, распрацоўкі і вынясення на абмеркаванне асобных тэарэтычных аспектаў праблемы.

У дачыненні да разглядаемага перыяду і тэмы пад родам трэба разумець пэўную выдзеленую цэласнасць, уласна больш шырокую чым сям'я (што ахоплівае сваякоў першай і другой ступені сваяцтва), злучаную ў большай ступені прыналежнасцю да аднаго прозвішча і герба, чым кроўнымі сувязямі. У межах такой цэласнасці існуе ўнутранае дзяленне на лініі і галіны па прыкмеце блізкасці і далёкасці генеалагічных сувязей. Акрамя таго, для землеўладальніцкіх родаў ВКЛ і Рэчы Паспалітай другой прыкметай, на падставе якой можна адрозніць той ці іншы род, і, што для нас найбольш важна — архіў роду, з'яўляюцца канкрэтныя «родавыя» маёнткі, якія забяспечваюць матэрыяльную базу існавання іх уладальнікаў, у прыватнасці, тыя, у якіх размяшчалася галоўная рэзідэнцыя — т. зв. родавыя гнёзды. У выпадку з разгалінаванымі родамі — гэта адзіная магчымасць адрозніць архівы розных адгалінаванняў аднаго роду (архіў Радзівілаў з Нясвіжа, архіў Радзівілаў з Няборава і інш.). Дадзены падыход прапанаваны польскай архівісткай Тэрэзай Зялінскай [9, с. 105—106].

Адной з прыярытэтных задач выступае высвятленне *фактараў, якія ўплывалі на фарміраванне архіваў* асабістага паходжання на розных этапах гісторыі, і, у прыватнасці, у перыяд зараджэння буйных родавых архіваў Беларусі.

Асобны чалавек, як тып патэнцыйнага архіваўтваральніка ў грамадстве, заўжды колькасна пераважае. Разам з тым, большы аб'ём архіўнай спадчыны, што дайшла да нашага часу, складаюць архівы іншых тыпаў стваральнікаў — органаў улады, устаноў, арганізацый і да т. п. Гэта можа тлумачыцца наступным: калі для любой арганізаванай адзінкі дакументаванне дзейнасці з'яўляецца неабходнай умовай і, нават, самой формай функцыянавання, у прыватнай асобы незаўсёды існуюць адпаведныя знешнія ўмовы, што выклікаюць неабходнасць рэгулярна ствараць і працяглы час захоўваць дакументы. Гэта сцвярджэнне не датычыцца творчых і навуковых дзеячаў, у якіх існуе «натуральная» патрэба ў фіксацыі сваёй дзейнасці, абумоўленая ўнутранымі фактарамі (такіх, аднак, не так шмат). Існуе шэраг знешніх фактараў, якія ўплываюць на фарміраванне архіваў асабістага паходжання ў грамадстве той або іншай дзяржавы, а менавіта:



узровень развіцця эканомікі;

форма гаспадарча-эканамічнага ладу (наяўнасць прыватнай уласнасці на сродкі вытворчасці і свабоды распараджэння ёю);

наяўнасць спадчыннага права на зямельную і іншую прыватную ўласнасць;

ступень развітасці прававой культуры, судова-працэсуальнай сістэмы дзяржавы, механізмаў абароны правоў прыватнай уласнасці і ўрэгулявання іншых пытанняў, што тычацца прыватнай асобы;

узровень развіцця навукі і культуры;

даступнасць адукацыі і ступень адукаванасці грамадства;

значэнне ў грамадстве родавых сувязей і прыналежнасці да таго або іншага роду, дынастыі, што можа станоўча ўплываць на лёс чалавека (пагроза ўплыву паходжання чалавека на яго становішча ў грамадстве, наадварот, не спрыяла захаванню архіваў);

ступень развіцця інстытутаў дзяржаўнай улады ў частцы механізмаў захавання створанай ёю дакументацыі (уплывае на магчымасць адкладання службовых дакументаў у прыватных архівах асоб, што займаюць дзяржаўныя пасады);

моц дзяржаўнай улады на ўсіх узроўнях (магчымасць уплываць на лёс афіцыйнай дакументацыі і кантраляваць яе захаванасць);

развітасць тэхналогій і сродкаў фіксацыі рэчаіснасці і праваадносін (ад пісьмовых да аўдыёвізуальных, электронных), а таксама іх даступнасць для радавога чалавека.

Можна заўважыць, што прыватныя архівы могуць з'яўляцца адным з паказчыкаў узроўню развіцця таго або іншага грамадства як у цэлым, так і асобных яго сфер, у прыватнасці.

Найбольш спрыяльнымі для фарміравання буйных прыватных архіваў — родавых — сталі перыяды працяглага існавання гаспадарча-эканамічнага ладу, заснаванага на прыватнай уласнасці. У гісторыі Беларусі ўзнікненне асноўнай масы такіх збораў адносіцца да перыяду ВКЛ і, у цэлым, дарэвалюцыйнага перыяду. Наяўнасць у «архіўнай сістэме» ВКЛ архіваў асабістага паходжання была абумоўлена грамадска-палітычным, гаспадарчым ладам гэтага дзяржаўнага ўтварэння, заснаваным на прыватнай уласнасці на зямлю, вядучай ролі прывілеяваных станаў у палітычным жыцці краіны. Іх стваральнікамі з'яўляліся прадстаўнікі розных саслоўяў — шляхты, духавенства, мяшчан, купцоў, заможных рамеснікаў. Аднак найбольш буйныя і багатыя архівы фарміраваліся магнатэрыяй. Архіўныя зборы дадзенага тыпу ўзніклі, як правіла, на аснове даку-

ментаў маёмасна- і сацыяльна-прававога характару, захоўванне якіх тлумачылася неабходнасцю доказу сваіх правоў і прывілеяў. Асноўныя, найбольш раннія віды дакументаў, якія станавіліся «ядром» будучых фамільных збораў феадалаў ВКЛ, гэта: 1) акты, якія падцвярджалі правы на зямельныя ўладанні і іншую маёмасць, што знаходзілася ва ўласнасці чалавека, сям'і, роду; 2) прывілеі на тытулы (княжацкі, графскі), на шляхецтва, нададзеныя прадстаўнікам роду; 3) «намінацыі» на дзяржаўныя пасады і іншыя дакументальныя сведчанні, што падцвярджалі высокае палітычнае становішча іх уладальніка, яго дзяржаўныя, ваенныя заслугі.

Асаблівасцю дакументаў дадзеных відаў з'яўлялася і тое, што патрэба ў іх не абмяжоўвалася часам жыцця іх уладальніка, а магла распаўсюджвацца на ўсіх яго нашчадкаў або правапераемнікаў. Азначаныя дакументы выступалі гарантам сацыяльнага становішча і матэрыяльнага дабрабыту іх уладальніка і яго спадкаемцаў, старанна аберагаліся, перадаваліся з пакалення ў пакаленне, фарміруючы спачатку сямейны, а з часам і родавы архіў.

Калі характарызаваць склад прыватных архіваў землеўладальнікаў азначанага перыяду ў цэлым, то можна вылучыць некалькі найбольш буйных груп дакументаў:

1) дакументацыя, што датычыцца гаспадарча-эканамічнай сферы жыцця і дзейнасці феадала (прывілеі манархаў на маёнткі, акты падзелу спадчыны, тэстаменты, шлюбныя кантракты, дамовы аб куплі-продажы ўласнасці, застаўныя, арэндныя акты і г. д. у комплексе з суправаджальнай дакументацыяй — інвентарамі на рухомую і нерухомую маёмасць, актамі ўвядзення ў правы ўласнасці, распіскамі, квітанцыямі і г. д.);

2) дакументацыя, створаная ў працэсе выканання службовых абавязкаў, што адносіцца да дзяржаўнай, палітычнай дзейнасці асобы;

3) дакументацыя, што датычыцца сямейных, сваяцкіх узаемаадносін і сувязей (матэрыялы па генеалогіі роду, дакументы, што падцвярджалі факты нараджэння, шлюбу, смерці або адносіліся да дадзенай тэмы, карэспандэнцыя, альбомы з сямейнымі партрэтамі, фотаздымкі членаў сям'і);

4) асабістыя дакументы творчага характару ўладальніка архіва, членаў яго сям'і (дзённікі, мемуары, літаратурныя, музычныя творы і да т. п.).

Акрамя таго, у родавых архівах буйных землеўладальнікаў, уплывовых дзяржаўна-палітычных дзеячаў маглі захоўвацца такія дакументы, як

5) асобныя дзяржаўныя акты або цэлыя іх комплексы, што ўяўлялі сабой часткі архіва дзяржавы (дакументы афіцыйнага характару, што ствараліся ў межах той або іншай дзяржаўнай пасады, якую займалі прадстаўнікі роду, і што адносіліся да дзяржаўнай уласнасці, напрыклад, кнігі Метрыкі ВКЛ, акты ўній паміж ВКЛ і Польшчай, земскія прывілеі, міравыя пагадненні ў складзе архіва Нясвіжскай ардынацыі Радзівілаў);

6) калекцыйныя зборы гісторыка-літаратурнай тэматыкі, архівы іншых родаў, што набываліся спецыяльна або разам з маёнткамі (дакументы, што мелі



навукова-гістарычнае, культурнае значэнне, да працэсу ўзнікнення якіх уласнік архіва мог не мець адносін, быць храналагічна значна аддаленым ад часу іх узнікнення, што збіраліся, як правіла, свядома і паслядоўна).

Трэба адзначыць, што асноўная маса дакументаў разглядаемых збораў адносілася ўсё ж да маёмасна-прававых, гаспадарчых, фінансавых пытанняў кіравання маёмасцю, вытворчымі структурамі, што знаходзіліся ва ўласнасці феадала. У сувязі з гэтым у іх назвах, асабліва на ранніх этапах вывучэння, як правіла, выкарыстоўваліся словы, што падкрэслівалі гэту якасць: «поместные», «помещичьи», «маёнткавыя» і да т. п. Разам з тым, відавочна, што разглядаемыя архівы ўяўляюць унікальны інфармацыйны комплекс свайго часу.

Сярод *асаблівасцей родавых архіваў* дадзенага перыяду з пункту гледжання іх навуковай і культурнай каштоўнасці можна вылучыць наступныя:

асноўная частка дакументаў мае жорсткую тэрытарыяльную прывязку (датычыцца рэгіёнаў, дзе знаходзіліся маёнткі роду), што робіць іх каштоўнай крыніцай па лакальнай гісторыі;

дакументы родавых архіваў храналагічна ахопліваюць, як правіла, больш буйныя перыяды, чым іншыя тыпы архіваў (у асобных выпадках — не менш за 400 гадоў);

у дадзеных архівах адкладалася дакументацыя, што адносіцца да гісторыі іншых сем'яў і родаў, звязаных з іх стваральнікамі сямейнымі, маёмаснымі адносінамі, або матэрыялы, зусім не звязаныя з гісторыяй роду, але што патрапілі ў яго склад у якасці калекцыйных матэрыялаў;

у родавых архівах дадзенага перыяду ўтрымліваюцца звесткі аб шырокім коле асоб, што знаходзіліся ва ўласнасці (прыгонныя сяляне і да т. п.), на службе або мелі іншую форму падпарадкаваных ці сяброўскіх адносін са стваральнікам архіва;

у адрозненні ад дзяржаўных архіваў, дакументацыя якіх адлюстроўвала афіцыйны пункт гледжання і мэтай стварэння якіх было задавальненне знешніх, грамадскіх патрэб, мэтай стварэння прыватных архіваў было задавальненне «ўнутраных», сямейных ці родавых інфармацыйных патрэб, у іх уваходзіла дакументацыя, якая магла супярэчыць афіцыйнай, раскрываць схаваныя прычыны, абставіны, наступствы ўвядзення тых або іншых пастаноў дзяржаўнай улады, утрымліваць канфедэнцыйную ці іншую інфармацыю абмежаванага доступу;

стваральнікі і ўладальнікі родавых архіваў, як правіла, усведамлялі іх гістарычнае і навуковае значэнне, свядома захоўвалі найбольш каштоўныя дакументы, што сведчылі аб выдатных заслугах прадстаўнікоў роду, мяркуючы выкарыстоўваць іх для выхавання новых пакаленняў, для фарміравання гістарычнай памяці роду.

Ключавымі фактарамі, што садзейнічалі фарміраванню прыватных архіваў ва ўказаны перыяд, выступалі такія найважнейшыя для свайго часу інстытуты сацыяльнай і юрыдычнай прыроды, як:

род і шанаванне на ўзроўні грамадскай свядомасці і дзяржавы прыналежнасці да таго або іншага старажытнага роду (княжацкага, шляхецкага);

прыватная ўласнасць на зямлю як аснову матэрыяльнага дабрабыту;

спадчыннае права, перш за ўсё на зямельныя ўладанні і сацыяльны статус (прыналежнасць да прывілеяванага стану, княжацкага, графскага тытула, шляхецкага звання);

існаванне права «вечнага» валодання маёмасцю;

развітыя прававая культура і інстытуты судовай улады ў дзяржаве.

*Тэрміналагічны аспект пытання.* Нягледзячы на параўнальна працяглы перыяд гісторыі даследаванняў архіваў асабістага паходжання ў цэлым і родавых, у прыватнасці, тэрміналогію ў дадзенай галіне пакуль нельга лічыць усталяванай [1]. Гэта сцвярджэнне тычыцца як айчыннай, так і замежнай гістарыяграфіі. Асобнай праблемай выступае таксама ўзгадненне паняційнага апарату, што прымяняецца ў розных краінах — захавальніцах агульнай архіўнай спадчыны. У беларускай архівазнаўчай літаратуры для абазначэння архіваў асабістага паходжання прымяняюцца наступныя паняцці:

*прыватнаўласніцкія архівы* (рус. — частновладельческие архивы) — тэрмін, што перайшоў у спадчыну ад савецкага архівазнаўства, дзе выкарыстоўваўся для абазначэння памешчыцкіх ды і ўсёй масы архіваў прадстаўнікоў прывілеяваных саслоўяў; у беларускім архівазнаўстве прымяняецца пераважна ў дачыненні да архіваў (як буйных, так і дробных) шляхты, магнатаў перыяду Вялікага Княства Літоўскага, арыстакратыі перыяду Расійскай імперыі [7, с. 111—115];

*родавыя/фамільныя архівы* — фактычна сінанімічнае паняццю прыватнаўласніцкі архіў, але ўжываецца пераважна ў дачыненні да буйных родавых збораў кіруючай эліты ВКЛ (архівы Радзівілаў, Сапег, Хадкевічаў і інш.);

*сядзібныя архівы* (рус. усадебные) — архівы, больш познія за родавыя па часе ўзнікнення і менш значныя за іх па складу дакументаў, існавалі ў XIX — пачатку XX ст. пры сядзібах цэнтральных маёнткаў землеўласнікаў, ствараліся адным чалавекам або сям'ёй, утрымлівалі дакументы аб кіраванні маёнткамі, а таксама асабістыя дакументы землеўладальніка, выконвалі эканамічныя, сацыяльна-прававыя функцыі, часта выступалі цэнтрам зберажэння гістарычных дакументаў і творчай спадчыны дзеячаў навукі, культуры, мастацтва.

Больш унармаванай у адносінах да тэрміналогіі разглядаемай праблемы з'яўляецца ўласна айчынная архіўная справа. Галіновая нарматыўна-метадычная дакументацыя вызначае наступныя паняцці, звязаныя з прыватнымі архівамі:

*фонды асабістага паходжання* — ужываецца для адрознення фондаў юрыдычных (устаноў і арганізацый) і фізічных асоб, абазначае ўсю сукупнасць фондаў, сфарміраваных з дакументаў, што ўтварыліся на працягу жыцця і дзейнасці грамадзян (іх сям'і, роду) [5, с. 60]. У залежнасці ад гэтага ў дзяржаўных архівах, як правіла, адрозніваюць:



*асабісты фонд* — фонд, сфарміраваны з дакументальнай спадчыны адной асобы;

*сямейны фонд* — дакументы сям'і да трох пакаленняў;

*фамільны фонд* — фонд, што ўключае дакументы прадстаўнікоў роду (больш за тры пакаленні) [6].

У архівазнаўстве суседніх краін, у склад архіўных фондаў якіх таксама ўвайшлі падобныя зборы, нярэдка часткі тых, якія захоўваюцца ў Рэспубліцы Беларусь, склалася наступная тэрміналогія.

Расія: *поместно-вотчинные архивы* — у адносінах да архіваў феадалаў, што фарміраваліся з XVI ст.; *помещичьи архивы* — пераважна архівы, што фарміраваліся ў XIX ст. пры сядзібах маёнткаў.

Украіна: *фамільні архіві* — архівы некалькіх пародненых сем'яў/родаў палітычнай, ваеннай, эканамічнай, культурнай эліты, час узнікнення якіх адносіцца да перыяду ВКЛ і Рэчы Паспалітай, з дакументамі прыватна-прававога, гаспадарча-эканамічнага, статыстычна-апісальнага, палітычнага, асабістага і інш. характару; *магнастське родові (магнатське, родові) архіві* — архівы, што складаюцца пераважна з дакументаў аднаго роду прадстаўнікоў пануючага саслоўя перыяду ВКЛ і Рэчы Паспалітай [4, с. 57—59]; *маєтковий архів* — архіў землеўладальніка з дакументацыяй па кіраванню маёнткамі, у літаратуры 20—30-х гг. XX ст. часта ўжываецца пад сінонімам «*поміщицький архів*».

Польшча: *archiwa prywatne* — архівы прыватных асоб, у тым ліку землеўладальнікаў; *archiwa podworskie* — тэрмін, што ўзнікае ў працэсе адзяржаўлення зямельнай уласнасці ў пасляваенны час і ўключэння панскіх прыватных архіваў у склад дзяржаўных збораў Польшчы, азначае архівы, створаныя пры родавых і сямейных гнёздах, пераважна — сядзібах маёнткаў прадстаўнікоў прывілеяваных саслоўяў ВКЛ і Рэчы Паспалітай, арыстакратыі перыяду Расійскай імперыі, землеўласнікаў перыяду другой Рэчы Паспалітай, складаліся з прыватнай маёмасна-прававой, гаспадарчай, асабістай, сямейнай дакументацыі; паняцце часцей выкарыстоўвалася ў пасляваенным польскім архівазнаўстве, пазней (ад пач. 1960-х гг. ) было выцеснена тэрмінам «archiwa rodzinno-majątkowe»; *archiwa rodzinno-majątkowe* (бел. — сямейна-маёнткавы архіў) — тэрмін, уведзены, як мяркуецца, архівістамі Б. Смаленскай і Т. Зялінскай у пач. 1960-х гг., больш позні варыянт паняцця «archiwa podworskie»; *archiwa majątkowe* (бел. маёнткавы архіў) — сінонім тэрмінаў «archiwa podworskie», «archiwa rodzinno-majątkowe»; *archiwa magnackie* — від архіваў «rodzinno-majątkowych», якія створаны прадстаўнікамі магнацкіх родаў Рэчы Паспалітай [8, s. 24].

Германія: *Gutsarchiv* — архіў дакументаў, што адносяцца да прыватных зямельных уладанняў.

У цэлым можна адзначыць, што існуючы набор тэрмінаў пакуль не ахоплівае ўсёй фактычнай разнастайнасці архіваў, што мелі месца ў гісторыі. Адсутнасць уласных «найменняў» шэрагу аб'ектаў, а таксама некаторая ўзаемазамяняльнасць, неканкрэтнасць вызначэнняў — праява незавершанасці яшчэ эмпі-

рычнага этапу даследавання праблемы. Часткова прычыну можна патлумачыць і тым, што ў айчынным (ды і замежным) архівазнаўстве пакуль адсутнічае навукова абгрунтаваная класіфікацыя прыватных архіваў, а гэта — аснова для тэрміналогіі.

Адносна тэрміналогіі ў дачыненні да разглядаемых намі родавых архіваў хацелася б пазначыць наступнае. Па свёй прыродзе гэта архівы, якія могуць быць утвораны, як правіла, толькі ва ўмовах працяглага існавання саслоўнага грамадства, пераважна прадстаўнікамі яго прывілеяваных станаў, кіруючай элітай, якая на працягу многіх пакаленняў здольная ўтрымліваць сваю палітычную, ці, як мінімум, эканамічную моц. Такім умовам у айчыннай гісторыі адпавядала пераважна толькі саслоўе землеўладальнікаў. У сувязі з адзначаным, калі мы кажам родавыя архівы — пад гэтым, амаль без выключэння, трэба разумець прыватныя архівы родаў буйных землеўладальнікаў дасавецкай Беларусі.

*** У Расіі ў гэты час былі ўжо выдадзены працы М. В. Калачова (Архивы, их государственное значение, состав и устройство, 1877), І. Я. Андрэеўскага (Наука об архивах. Лекции, читанные в Санкт-Петербургском Археологическом институте в 1885—1887 гг., 1887), пазней Д. Я. Самаквасава (Централизация государственных архивов Западной Европы, в связи с архивной реформой в России, 1899), якія, як адзначалася, абапіраліся на вопыт французскага архівазнаўства.

«Архівы гісторыі Францыі» (1891, 1893)*. Апошняя праца з'яўляецца ўнікальнай, бо ўтрымлівае інфармацыю не толькі пра дакументы, што захоўваюцца ў Францыі, але і пра дакументы па гісторыі Францыі, якія знаходзяцца за яе межамі. У гэтым бачыцца тэарэтычная аснова, на падставе якой будуецца сучаснае паняцце «Нацыянальнага архіўнага фонду», уключаючы т. зв. замежную частку. Больш таго, далей Ланглуа разглядае паходжанне прынцыпу цэнтралізацыі архіўных дакументаў і адносіць яго да XVIII ст., калі т. зв. Кабінет хартый пад кіраўніцтвам гістарыёграфа Маро арганізаваў пошук і капіраванне дакументаў, што датычацца гісторыі Францыі ў замежных сховішчах.

Сітуацыя з архіўнымі перыядычнымі выданнямі, на думку Ланглуа, з'яўлялася дастаткова сумнай, бо ўсе яны да 1895 г. спынілі сваё існаванне, а выданне «Часопіса архіваў, бібліятэк і музеяў», у якім і быў надрукаваны разглядаемы артыкул, з'явілася нічым іншым, як спробай ліквідаваць існуючы прабел. Асноўнай задачай такіх выданняў, паводле Ланглуа, з'яўлялася — перыядычная фіксацыя інфармацыі аб стане архіўнай справы, новых правілах і паступленнях. Звычайна ў французскіх, нямецкіх, італьянскіх, іспанскіх перыядычных выданнях архівазнаўства закраналася толькі ў адным з раздзелаў разам з бібліятэказнаўчай, музеязнаўчай ці непасрэдна гістарычнай тэматыкай.

Такім чынам, была зроблена выснова, што стан навукі пра архівы на 1895 г. характарызаваўся амаль поўнай адсутнасцю перыядычных выданняў, але наяўнасцю дастатковай колькасці пералікаў і практычных дапаможнікаў, канчатковым усталяваннем у большасці еўрапейскіх краін асноўных архівазнаўчых прынцыпаў павагі да фонду і публічнасці архіваў. Да асноўных праблем архівазнаўства на гэты час аднесены: арганізацыя архіўнага захоўвання, архіўныя памяшканні, апісанне дакументаў, доступу да архіваў, цэнтралізацыі архіўнай справы. Асноўнай задачай архівіста бачылася — апісанне і сістэматызацыя дакументаў. Апошняя праблема разглядалася найбольш падрабязна. Нягледзячы на тое што этап цэнтралізацыі архіўная справа Францыі прайшла першай сярод еўрапейскіх краін, тым не менш і тут меліся пэўныя аспекты для абмеркавання: выяўленне і захоўванне дакументаў па гісторыі Францыі, што знаходзяцца ў замежных сховішчах, прыватная ўласнасць на шэраг дакументальных комплексаў, якія не трапілі ў склад Нацыянальнага архіва Францыі, доступ да дакументаў і інфармацыі аб іх, пэўная незавершанасць цэнтралізацыі. Двума асноўнымі метадамі цэнтралізацыі архіўнай справы Ланглуа лічыў выраб копій ці гвалтоўную канфіскацыю, прычым другі метад падаваўся для яго найбольш дзейсным і распаўсюджаным у Еўропе. У 1928 г. Ланглуа як дырэктар Нацыянальнага архіва Францыі пры наведванні СССР даў дастаткова высокую ацэнку арганізацыі архіўнай справы ў гэтай краіне [12], аддаючы перавагу жорсткай і прымусовай цэнтралізацыі, якая адбывалася ў СССР, перад цэнтралізацыяй ліберальнай, якая ажыццяўлялася ў Францыі. Кожны з дадзеных відаў меў пэўныя перавагі і хібы.

* Па дакументах беларускіх архіваў у 1872 г. выдадзены даведнік М. Гарбачэўскага (Каталог древним актовым книгам губерний: Виленской, Гродненской, Минской и Ковенской, также книгам некоторых судов губерний Могилевской и Смоленской, хранящимся ныне в Центральном архиве в Вильне — Вильно, 1872. — 861 с.)



У артыкуле звярталася ўвага на пытанне наўпрост звязанае з цэнтралізацыяй — пытанне размежавання функцый паміж архівамі, бібліятэкамі і музеямі. Яно вырашалася на працягу ўсяго XX ст. і з'яўляецца актуальным да гэтага часу. Рашэнне Ланглуа бачыў у прадстаўленні грамадскасці інфармацыі аб дакументах незалежна ад месца іх захоўвання. Праблема ўсеагульнага апісання архіўных дакументаў, хуткага пошуку дакументаў і доступу да іх — гэта глабальная праблема архівазнаўства, якую акрэсліў Ланглуа, але якая канчаткова не вырашана і сёння нават пры дапамозе сучасных тэхналогій.

Такім чынам, у канцы XIX ст. французскі вопыт у асэнсаванні архівазнаўчых праблем з'яўляўся адным з самых значных у Еўропе і дазволіў казаць пра пачатак новага «тэарэтычнага» этапу развіцця архівазнаўства, які характарызаваўся наяўнасцю гістарыяграфічнай і метадычнай базы, замацаваннем асноўных прынцыпаў, заканамернасцей, метадаў навукі пра архівы і функцый архіваў. Гаворка ў гэты час ішла не толькі пра пачаткі архівазнаўства як навуковай дысцыпліны, «інтэрнацыянальнай» па сваёй сутнасці, але і пра пэўны этап у развіцці крыніцазнаўства, гістарыяграфіі і гістарычнай навукі. Больш таго, ці не ўпершыню гэтыя накірункі былі пастаўлены ў адзін узаемазвязаны шэраг і абгрунтаваны ў межах пазітывісцкага падыходу. Далейшае развіццё навукі аб архівах у XX і нават XXI ст. паказала жыццяздольнасць прапанаваных падыходаў і дазваляе казаць аб эвалюцыйным, а значыць актуальным характары архівазнаўчых праблем, якія паўставалі перад архівістамі ў розныя часы.

Сучасная сітуацыя ў межах гістарычнай навукі, архівазнаўства і цэлага шэрагу гуманітарных дысцыплін характарызуецца пошукам новых накірункаў развіцця, існаваннем шматлікіх парадыгм, метадалагічных падыходаў і інтэрпрэтацый, імкненнем да міждысцыплінарнасці, а таксама спробамі пэўнай інстытуцыяналізацыі і легітымацыі ў беларускай рэчаіснасці. Менавіта яна патрабуе глыбокага вывучэння і асэнсавання незаслужана забытага і неасэнсаванага з прычыны пэўных гістарычных абставін. Праца Ланглуа з'яўляецца актуальнай для вывучэння тэарэтычных асноў архівазнаўства, разгляду эвалюцыі асноўных архівазнаўчых прынцыпаў і паняццяў, пошуку новых шляхоў развіцця архівазнаўства з улікам якасна новага вітка яго існавання і наяўных задач.

Літаратура


1. Langlois, Ch.-V. La science des archives // Revue Internationale des Archives, des Biblioteques and des Musees. — Series: Archives. — № 1. — 1895. — P. 7—25.
2. Михайлов, Е. В. Методологические проблемы истории архивного дела в современном французском архивоведении // Вопросы критики методологии и теории буржуазного архивоведения. — М., 1980. — С. 110—119; Старостин, Е. В. Западноевропейская историография архивоведения (конец XIX века — первая треть XX в.) // Советские архивы. — 1985. — № 3. — С. 70—77; Кальсина, Е. А. Французское архивоведение: история, теория, методология (конец XIX века — XX век): Дис. … канд. ист. наук:

05.25.02. — М., 2004. — 301 с.; Мацяш, І. Б. Архівознавство: методологічні засади та історія розвитку. — К., 2012. — С. 190—192.

3. Muller S., Feith I. A., Fruin R. Handleiding voor het ordenen en beschrijven van archiven. — Groningen, 1898. Праца была перакладзена на асноўныя еўрапейскія мовы: у 1905 — на нямецкую, у 1908 — італьянскую, 1910 — французскую, 1940 — англійскую. У пасляваенны час праца была перакладзена Р. Мяніцкім на польскую мову, але так і не была выдадзена і захоўваецца ў рукапісе.
4. Кальсина, Е. А. Французское архивоведение: история, теория, методология (конец XIX века — XX век): Дис. … канд. ист. наук: 05.25.02. — М., 2004. — С. 32—33, 37.
5. Dilthey Wilhelm, Archive der Literatur in ihrer Bedeutung für das Studium der Geschichte der Philosophie // Archiv für Geschichte der Philosophie. Band II. — S. 343—367; Дильтей, В. Литературные архивы и их значение для изучения истории философии // Вопросы философии. — 1995. — № 5. — С. 124—136.
6. Дильтей В. Собрание сочинений: В 6 т. / Под ред. А. В. Михайлова и Н. С. Плотникова. — Т. 3. Построение исторического мира в науках о духе. 1909—1910 / Пер. с нем. под ред. В. А. Куренного. — М.: Три квадрата, 2004. — 413 с.
7. Копп-Оберштебринк Г., Шипке К. Понятие «архив» между теорией и практикой // Trajekte. — № 34, April 2012. — S. 16—20 (пераклад на http://www.urokiistorii.ru/memory/arc/51650).
8. Кальсина, Е. А. Французское архивоведение: история, теория, методология (конец XIX века — XX век): Дис. … канд. ист. наук: 05.25.02. — М., 2004. — С. 59.
9. Эрнст, В. Архивация: архив как хранилище памяти и его инструментализация при национал-социализме // Новое литературное обозрение. — 2005. — № 74 / Пер. А. Нестерова по: *Ernst Wolfgang.* Archival action: the archive as ROM and its political instrumentalization under National Socialism // History of the Human Sciences. — 1999. — Vol. 12. — P. 13—34 (http://magazines.russ.ru/nlo/2005/74/ern9.html).
10. Харузин, Н. Взгляд Langlois на архивное дело // Древности. Труды Имп. Археологического общества. — М., 1898. — Т. 1. — С. 130—138.
11. Олевская, В. В. Некоторые тенденции развития современного французского архивоведения // Проблемы классификации в архивоведении и документоведении: сборник научных трудов. — М.: Главархив СССР, ВНИИДАД, 1987. — С. 169.
12. Архивное дело. — 1928. — № II (15). — С. 72—73.

## Ш.-В. Ланглуа «Навука пра архівы»*

*Пераклаў Мікалай Бусел*

Архівамі называюць сховішчы** розных аўтэнтычных актаў і дакументаў, якія ўяўляюць цікавасць для дзяржавы, правінцыі, горада, дзяржаўнай ці прыватнай установы, кампаніі ці прыватнай асобы. З гэтага азначэння вынікае, што ва ўсе часы былі і ва ўсіх краінах ёсць «архівы». Ва ўсіх грамадствах урад, карпарацыі і сем'і адчувалі і адчуваюць патрэбу захоўваць свае акты, дакументы,

* *Апублікавана ў арыгінале: Langlois, Ch.-V. La science des archives // Revue Internationale des Archives, des Biblioteques and des Musees. — Series: Archives. — № 1. — 1895. — P. 7—25 (заўв. публікатара).*

** *У арыгінале dépôts, у шэрагу рускамоўных даследаванняў выкарыстоўваецца транслітарацыя «дэпо» (заўв. публікатара).*



якія могуць прыдацца дзеля абароны іхніх правоў ці для іхняй гісторыі. Заўважым тут, што ідэя захоўваць «для гісторыі» старадаўнія помнікі, практычная карыснасць якіх яўна састарэла, даўней была мала пашырана. І хоць у нашы дні павага да дакументаў уласціва людзям адукаваным, старыя паперы часта знішчаюцца як непатрэбныя і грувасдкія. Колькі муніцыпалітэтаў адправілі б свае гістарычныя архівы на знішчэнне, калі б закон не абавязваў іх захоўваць? Гэта тлумачыць, чаму велізарная колькасць старадаўніх архіўных сховішчаў бясследна знікла, а большасць існуючых сёння архіўных сховішчаў мае не надта даўнюю гісторыю. Гэта таксама тлумачыць, чаму некалі архівы былі сакрэтнымі: гэта былі арсеналы, куды ўладальнік лічыў лепшым забараніць доступ.

Усе архіўныя сховішчы некалі былі прыватнымі, закрытымі, як каралеўскія, так і іншыя. У мінулым стагоддзі іх было безліч, такіх, як архівы свецкіх ці рэлігійных карпарацый, багатых сем'яў і г. д., больш за дзесяць тысяч толькі ў Францыі, больш за чатыры сотні ў Парыжы. Гэтыя архівы грамат большай часткай былі занядбанымі, дрэнна класіфікаванымі, без вопісаў, «больш абароненыя ад працы даследчыкаў, чым ад крадзяжу». Тое ж было ва ўсёй Еўропе. Не існавала «навукі пра архівы», якая займаецца эканомікай, арганізацыяй тэорыі, апісання, параўнання і гісторыяй архіўных сховішчаў, якая б склала пералік гэтых сховішчаў і стварыла б іх каталогі*.

Зараз архівы падзяляюцца на дзяржаўныя, заснаваныя дзяржаўнай уладай, і прыватныя, якія належаць юрыдычным ці фізічным асобам. Апошнія ўсё яшчэ даволі шматлікія, амаль усе яны, як і пры Старым Рэжыме**, застаюцца закрытымі і неўпарадкаванымі. У супрацьлегласць, архівы дзяржаўныя, якія ў выніку палітычных рэвалюцый паглынулі праз канфіскацыі, секулярызацыі, арышты і інш. шмат некалі прыватных архіваў, зараз, у прынцыпе, адкрыты ўсім***. Іх цяпер не разглядаюць толькі, ці пераважна, як арсеналы юрыдычных доказаў, а як захавальнікі гістарычных звестак****. Захавальнікі гэтых архіваў за апошнія

* Справа не ў тым, што архівісты таго часу займаліся захоўваннем дакументаў невытворчай сферы і сярод іх не было тэарэтыкаў. Але працы гэтых тэарэтыкаў зараз маюць толькі гістарычную цікавасць. У шматлікай нямецкай літаратуры XVII—XVIII стст. паняцце Archivwesen (веды аб архівах) выкарыстоўвалася Г. Хольцынгерам у працы Catechismus der Registratur- und Archivkunde, с. 117; Ф. фон Лоерам — Archivlehre, с. 179; Б. Баніфацыям — De archivis liber singularis, 1672 і інш.

** *Да 1789 года (заўв. публікатара).*

*** Усе дзяржаўныя архівы Еўропы — выключаючы архівы Канстанцінопаля — нават архівы Міністэрства замежных спраў у Парыжы і архівы Ватыкана, якія былі апошнімі, у прынцыпе, сталі даступнымі для грамадзян. Тым не менш нядаўнія дакументы маюць іншую не «гістарычную» каштоўнасць; пачынаючы з пэўнага года, архіўныя дакументы застаюцца недаступнымі і гэты «спецыяльны тэрмін» змяняецца ў залежнасці ад краіны (гл. Хелферт. Staatliches Archivwesen, с. 32 і інш.).

**** Тут будзе ісці гаворка аб архівах як крыніцах гістарычных звестак, аднак зразумела, што большая частка архіваў захоўвае юрыдычныя звесткі. Па-першае, большая частка сховішчаў (дэпо) дзяржавы адкрыты для пацвярджэння эканамічных правоў і служаць

сто год шмат зрабілі, каб іх узбагаціць, забяспечыць іхні фізічны стан, каталагізаваць звесткі, рэканструяваць гісторыю розных фондаў, якія там знаходзяцца. Менавіта яны стварылі навуку пра архівы такой, якая яна ёсць сёння.

Я не маю на мэце разглядаць этапы развіцця гэтай навукі, яшчэ менш мой намер рабіць папярэднія высновы. Я толькі паспрабую паказаць той інструментарый навукі, які ёсць на 1895 г.

## I

I. — Не існуе ніякага «падручніка», дзе былі б метадычна выкладзены і параўнаны дзейсныя ў розных краінах свету правілы і практыкі адміністравання дзяржаўных архіваў. Нататкі Г. Хольцынгера (*Katechismus der Registratur- und Archivkunde*. Leipzig, 1883, in-8) і Франца фон Лоэра (*Archivlehre. Grundzüge der Geschichte, Aufgaben und Einrichtung unserer Archive*. Paderborn, 1890, in-8) тычацца амаль выключна архіўнай справы[*] нямецкіх зямель. Яны, несумненна, утрымліваюць заўвагі і самыя агульныя тэарэтычныя правілы, але ў бібліяграфіі, нават нямецкай, гэты прадмет там вельмі нязначны; правілы не аказваюць належных паслуг навуцы пра архівы, такіх, якія аказала навуцы пра бібліятэкі маленькая кніжка Арніма Грэзэля.

— Кніга М. Шампальёна-Фіжака (*Manuel de l'archiviste des préfectures, des mairies et des hospices*… Paris, 1860, in-8), якая была напісана, каб сабраць і пракаменціраваць «законы, дэкрэты, распараджэнні, рэгламенты, цыркуляры і іструкцыі, што тычацца архіўнай справы» ў Францыі, страціла сваю вартасць. Яе выгадна замянілі працы Ж. Рышу *(Traité historique et pratique des archives publiques*. Paris, 1883, in-8; асобнае выданне *Répertoire du droit administratif* de Béquet et Dupré) і Э. Лелонга *(Répertoire général alphabétique du droit français,* v° *Archives*. Paris, 1889, in-4). Але Рышу і Лелонг, пішучы ў слоўніках права, непазбежна прытрымліваліся спецыфічнага погляду, погляду адміністратыўнага і юрыдычнага. Лелонг падрабязна разглядае кожную катэгорыю архіўных сховішчаў, арганізацыю і працаўнікоў гэтых сховішчаў, усталяваныя правілы перадачы дакументаў і выдзялення непатрэбных папер, класіфікацыі, вопісу, перамяшчэння і вырабу выпісак і копій, уліку і г. д. Тэорыю архіўнай справы[**] ён абмінае. Усе пытанні звязаны з тым, як найлепшым чынам стварыць бяспеку сховішчаў і зручнасць даследчыкам. Зрэшты, і без гэтага зразумела, што Рышу і Лелонг ведаюць і знаёмяць найперш з арганізацыяй архіваў у Францыі. Аднак Лелонг змясціў адзін раздзел пра «замежныя архівы», перад якім падаў багатую, вельмі каштоўную і вельмі карысную бібліяграфію.

выкананню практычных задач. Па-другое, дакументаў архіваў у Францыі не дастаткова і трэба звяртацца да архіваў Англіі і Швейцарыі (P. Schweizer. Geschichte des Zurcher Staatsarchives, Zurich, 1894, p. 5). «Сапраўдны архіў, — кажа М. Швейзэр, — павінен аб'ядноўваць тэорыю і практыку, мінулае і сучаснасць». Тут мая цікавасць тычыцца пытанняў гістарычнага боку архіваў; у мяне няма прафесійнай кампетэнцыі разважаць пра навуку аб рэгістратуры (Registraturkunde).

[*] *У тэксце дакладна «archiveconomie», такія аўтары, як Е. Кальсіна і І. Мацяш выкарыстоўваюць дадзены панятак у транслітарацыі як «архіваэканомія». Даслоўны пераклад з французскай «вядзенне архіваў» не мае, на нашу думку, супярэчанняў з традыцыйным паняткам «архіўная справа» (заўв. публікатара).*

[**] Гэтыя пытанні коратка раскрыты ў працы Лоэра, ч. XII і інш.



— Тое, што на цяперашні час найбольш падобна да параўнальнага трактата міжнароднай архівістыкі, дык гэта брашура фон Хэльферта *«Staatliches Archivwesen»* (Wien, 1893, *der K. K. Central commission für Kunst and histor. Denkmale*). Фон Хэльферт, які працуе над рэарганізацыяй дзяржаўных архіваў Аўстрыі[*], у гэтай брашуры робіць кароткі, але дакладны агляд правіл, прынятых у розных краінах Еўропы, што тычацца архіваў, дзеля таго, каб у Аўстрыі можна было скарыстаць набыты ў іншых досвед. Рубрыкі, па якіх выкладаліся звесткі, былі наступнымі: *1. Агульная арганізацыя. 2. Архіўныя фонды, захоўванне, забеспячэнне захаванасці. 3. Архіўныя працаўнікі. 4. Архіўная тэхніка. 5. Знешнія і ўнутраныя сувязі архіваў. 6. Архіўная служба. 7. Навуковае даследаванне ці выкарыстанне для іншых мэт. 8. Публікацыя. 9. Адбор.* Можна дадаць, што брашура фон Хэльферта мае 48 старонак[**].

У Парыжы (Школа хартый), у Палерма, у Рыме, у Фларэнцыі, у Мадрыдзе, у Вене і, зусім нядаўна, у Марбурзе тэарэтычнае архівазнаўства і міжнароднае архіўнае заканадаўства сталі стальмі прадметамі для навучання. Наколькі нам вядома, па гэтах курсах яшчэ не выйшла ніводнай кніжкі[***].

II. — Пасля «падручніка» — даведнік. Зразумела, што было б карысна і неабходна стварыць даведнік па міжнародным архівазнаўстве, які б задаволіў усе патрэбы, бо ўтрымліваў бы ўсе нацыянальныя даследаванні, якія прыводзіліся і Лоэрам, і Лелонгам. Аднак было б няправільна пісаць гісторыю ці агульную міжнародную статыстыку архіваў цэлага свету. Самыя агульныя звесткі, якія можна надзейна падаць пра эвалюцыю архіваў ва ўсе часы і ва ўсіх краінах рэзюмуюцца ў некалькіх радках і фігуруюць ва ўсіх энцыклапедыях. Пра гісторыю архіваў якой-небудзь краіны ці раёна, якія перажылі звычайныя нягоды лёсу, лягчэй і цікавей разважаць, і большасць трактатаў па нацыянальным архівазнаўстве (A. Champollion-Figeac, Introduction; Löher, ch. I—VIII; Lelong, ch. I)

[*] *Cf. Mittheilungen ans der dritten (Archiv-) Section*…, II, p. 271—306.

[**] Артыкул *«Archives»* М. А. Жыры ў т. III *«Grande Encyclopédie»* (p. 747—762 ) дае дакладнае вызначэнне «гісторыі, стану, арганізацыі захоўвання» ў Еўропе і асабліва ў Францыі, з'яўляецца першым агульным вызначэннем. Гл. таксама артыкул М. Л. фон Рокінгера *«Staatswörlerbuch de Bluntschli et Brater»*, I, 310. Ведаю таксама толькі пра назву кнігі Ф. і Р. Хуідобра, *Disertacion sobre archivos y reglas de su coordination*, Madrid, 1830, in-4.

[***] Гл. С. Лупі «*Gli archivi e le scuole paieografiche in Frarcia e in Italia*», Pisa, *1872.* У дакладзе М. Г. Дэс'ярдынса для навучэнцаў Школы хартый, апублікаванага пад назвай: *Le servise des archives départementales,* Paris, 1890 (выпрымка з *Archives historiques, artistiques et litteraires).*

зусім слушна пачынаецца з гістарычных звестак[*]. Але найперш не толькі важна ведаць канкрэтную гісторыю кожнага сховішча, таксама важна ведаць хоць бы ў агульных рысах у межах класіфікацыі гэтых дакументаў, што звычайна існуюць у архівах якой-небудзь краіны, а таксама што менавіта ёсць у кожным асобным сховішчы. Адсюль вынікае неабходнасць мець бібліяграфічныя каталогі, у якіх былі б паказаны пад назваю кожнага архіўнага сховішча: 1) усе кнігі, навуковыя даследаванні, артыкулы і інш., якія былі апублікаваны па гісторыі дадзенага сховішча; 2) вопісы і каталогі калекцый гэтага сховішча, даступныя для публікі. Гэтыя бібліяграфічныя каталогі, якія будуць мець, сярод іншага, звесткі пра існуючыя архіўныя сховішчы праз прыкладзены спіс і гэта будуць, вядома, нацыянальныя каталогі[**]. Іх павінна быць столькі, колькі існуе дзяржаў. Відавочна, што для людзей, якія будуць працаваць у архівах, таксама як і для саміх архівістаў, падобныя інструменты былі б надзвычай каштоўнымі. На жаль, іх няма ні ў адной краіне, а ўсе дагэтуль апублікаваныя, не з'яўляюцца вычарпальнымі.

А. Х. Буркхарт апублікаваў вельмі кароткі апісальны бібліяграфічны пералік, дзе ў алфавітным парадку дадзены галоўныя дзяржаўныя і прыватныя архівы, што захаваліся ў нямецкіх землях і на некаторых суседніх тэрыторыях: *«Hand- und Adressbuch der deutschen Archive im Gebiete des deutschen Reiches, Luxemburgs, Oesterreich-Ungarns, der russisechen Ostseeprovinzen und der deutschen Schweiz»*, Leipzig, 1887. Можна параўнаць: Ф. Цымерман. *Ueber Archive in Ungarn, ein Führer durch ungarlândische und siebenbûrgische Archive*, Hermannstadt, 1891 (апубл. у *1'Archiv des Vereins für siebenbürgische Landeskunde*, *t. XXIII).*

Няма ні пераліку, ні бібліяграфіі архіваў, што знаходзяцца ў Англіі[***]. Даводзіцца задавальняцца скупымі звесткамі, якія пададзены па некалькіх, адвольна выбраных Р. Сімсам *(A Manual for the genealogist, topographer, antiquary and legal professor,* London, 1888, in-8) і В. Раем (*Records and record searching,* London, 1888, in-8), сховішчах.

[*] Гістарычныя паняцці знаходзяцца таксама ў некаторых працах па дыпламатыцы. Гл., напрыклад, *Handbuch der Urkundenlehre fur Deutschland und Italien* de M. H. Bresslau, Leipzig, 1889, 1, p. 120—150; не забыта гэтая тэма М. А. Жыры ў *Manuel de Diplomatique*, Paris, 1894.

[**] Акрамя гэтага, у *Répertoire des sources historiques du moyen age; Topobibliographie*, першы выпуск якога быў апублікаваны ў 1894, а другі ў 1895, абат У. Шэвалье кажа, між іншым, аб публікацыях, што тычацца архіваў правінцый, аддзелаў, гарадоў, манастыроў і інш. з усёй Еўропы. М. Х. Эстэрлі меў намер пералічыць таксама спісы і зборнікі надрукаваных дакументаў архіваў, якія былі апублікаваны ў Еўропе (*Wegweiser durch die Literatur der Urkundensammlungen, Berlin*, 1885—1886, 2 vol. in-8). Гэтыя даволі аб'емныя працы аднак не даюць для нашага даследавання значнай інфармацыі.

[***] Праца пра архівы за межамі сталіцы *«Index to the records, with Directions to the several places where they are to be found…»*, London, 1759.



У Бельгіі была складзена *«Кароткая табліца дзяржаўных архіваў у правінцыях, прадстаўленая міністру ўнутраных спраў галоўным архівістам»*, Брусель, 1876; у Італіі — *«Пералік дзяржаўных італьянскіх архіваў»,* Рым, 1883. Але, як паказваюць назвы, гэтыя працы змяшчаюць састарэлыя звесткі толькі аб некаторых архіўных сховішчах Бельгіі і Італіі. Ні ў Бельгіі, ні ў Італіі, ні тым больш у Англіі, Іспаніі ці Расіі не існуе ні пералікаў, ні агульнай бібліяграфіі дзяржаўных ці прыватных архіваў.

У Францыі М. Бардз'е ў 1855 г. у Парыжы выдаў кнігу пад назвай *«Архівы Францыі або гісторыя архіваў Імперыі, архіваў міністэрстваў, дэпартаментаў, шпіталёў, судовых канцылярый, натарыусаў і інш., з вопісам часткі гэтых сховішчаў»*. Гэтая выдатная праца не дае ўсяго таго, што было абяцана ў назве; яна амаль цалкам прысвечана гісторыі і кароткаму вопісу нашых нацыянальных архіваў і іншых сховішчаў Парыжа (с. 284—325). «Публікацыя, — піша Бардз'е (с. 356), — спіса ўсіх нашых сховішчаў (дзяржаўных і прыватных, што існуюць у Францыі) з паказальнікам, хоць і вельмі кароткім, галоўных фондаў, з якіх яны складаюцца, будзе вельмі карысным гістарычным даведнікам і добрым сродкам захоўвання. Ён абмяжоўваецца кароткімі звесткамі аб 185 архіўных сховішчах, што знаходзяцца ў гарадах, мястэчках, замках Францыі, размешчаных у алфавітным парадку». Праз дваццаць год М. Л. Панье ў т. XXXVI *«Бібліятэкі Школы хартый»* надрукаваў *«Спіс кароткіх пералікаў і іншых прац, што тычацца розных архіваў Францыі на 1 студзеня 1875 г.»*. Гэта добра складзены пералік усіх сховішчаў, якія да гэтай даты былі аб'ектам гістарычных ці апісальных публікацый, афіцыйных ці прыватных.

Нарэшце, Ш.-В. Ланглуа і Г. Штэйн паставілі перад сабой задачу: 1) дапоўніць і ўдакладніць бібліяграфію Панье; 2) скласці спіс усіх сховішчаў, па якіх былі ці не былі створаны пералікі (тое, што Бардз'е ў 1855 г. лічыў невыканальным). Гэтая праца *«Архівы гісторыі Францыі»* выйшла трыма выпускамі ў 1891 і 1893 гг. Яна была добра ўспрынята; недахопы, якія маюцца (мы іх вельмі добра ведаем), пры нагодзе можна будзе лёгка выправіць у другім выданні[*]. У выніку, менавіта Францыя мае сёння найбольшы і найлепшы агульны пералік сваіх гістарычных архіваў[**].

[*] Зразумела, што ў гэтым выданні шмат памылак, якія могуць быць выпраўлены ў другім выданні. План выдання будзе лепшым пасля ўнясення пэўных змен. Напрыклад, можа быць дададзена частка, якая тычыцца дэпартаменцкіх архіваў на падставе *Tableau général numérique par fonds des archives départementales antérieures à 1750,* 1848, каб не адсылаць да невядомай публікацыі, якую немагчыма знайсці. Мы ўпэўнены, што не памыліліся, прапанаваўшы пералікі апублікаваных дакументаў, што захоўваюцца ў архіўных калекцыях. Была зроблена вялікая бібліяграфічная праца. Назва працы з'яўляецца слушнай. М. Бардз'е прапанаваў назву «Архівы Францыі», таму што меліся на ўвазе архівы, што знаходзяцца ў Францыі. Мы былі першымі, хто апісаў архівы, што тычацца гісторыі Францыі і захоўваюцца за мяжой.

[**] Параўнайце: *Archivio storico ilaliauo,* ser. V, t. XIV (1894), p. 573.

— Спецыялізаваныя часопісы, як падручнікі ці каталогі, з'яўляюцца неацэннымі для прагрэсу навукі пра архівы. У розных краінах былі заснаваны часопісы, прысвечаныя выключна навуцы пра архівы. Іх мэтай было сістэматызаваць і пашырыць тэхнічныя звесткі. Тут мы разгледзім іх змест. Трэба з жалем адзначыць, што за выключэннем аднаго, усе яны спынілі сваё існаванне. «*Zeitschrift für Archivs- und Regislraturwissenschaft*» Остэррайхера і Дзёлінгера з'явіўся на свет у 1806 г. і спыніў існаванне праз чатыры нумары. «*Zeitschrift für Archivkunde, Diplomatik und Geschichte*» Л. Ф. Хёфэра, Х. А. Эрхарда і Ф. Л. Б. фон Медэма (Гамбург, Фр. Пертэс) праіснаваў два гады (1834—1836); калекцыя «*Zeitschrift für Archive Deutschlands*» Фрыдмана (Гот, Пертэс, 1847—1853) налічвае ўсяго два тамы; збор «*Kornspondenzplatt der deutschen Archive, Organ für die Archive Mittel-Europa's*», выдадзены С. А. Х. Буркхартам (Лейпцыг), налічвае тры тамы (1878—1881). Толькі «*Archivalische Zeitschrift*», орган каралеўскіх архіваў Баварыі, заснаваны Ф. фон Лоэрам у 1876 г., выходзіў з таго часу амаль бесперапынна*. У Францыі «*Cabinet historique*», які актыўна займаўся архівістыкай, пасля даволі працяглага існавання быў заменены на «*Bulletin des Bibliothèques et des Archives*», узнік у 1883 г., спыніў існаванне ў 1886 г. У Іспаніі «*Revista de Archivos, Bibliotecas y Museos*» публікаваўся з 1871 па 1883 г., ягоны збор складаецца з 9 тамоў. Нарэшце абвешчана, што з 1895 г. «*Rivista delle biblioteche*»ператворыцца ў часопіс бібліятэк і архіваў Італіі**.

У гэтых умовах вельмі цяжка здабыць інфармацыю аб новых правілах, якія з'яўляюцца ў архіўнай справе, аб новых паступленнях ў сховішчы вопісаў дакументаў, што з'яўляюцца, адным словам, у «архіўнай хроніцы». Існавала ідэя выдаваць архіўныя штогоднікі; але даўно знік «*Штогоднік бібліяфіла, бібліятэкара і архівіста*» Луі Лакура (Парыж, 1860—1863, 4 тамы), «*Штогоднік архівіста*» М. Шампальёна-Фіжака (Парыж, 1861—1879, 17 тамоў) і « *Штогоднік факультатыўнага корпуса архівістаў*» (Мадрыд, 1881—1882, 2 тамы). «*Штогоднік бібліятэк і архіваў*», што выдаваўся ў Парыжы, друкаваў толькі пералік французскіх афіцыйных архіваў і іх вопісаў. З-за адсутнасці спецыялізаванага часопіса — «*Archivalische Zeitschrift*» дае няшмат новага — і адпаведнага штогодніка цяпер даводзіцца карыстацца агульнанацыянальнымі ці рэгіянальнымі часопісамі па гісторыі, такімі, як «*Bibliothèque de l'Ecole des chartes*», «*Mitteilungen des Instituts für ostereichische Geschichtsforschung*», «*Revue historique*», «*Deutsche Zeitschrift für Geschichtswissenschaft*»,»*Zeitschrift für die Geschichte des Oberrheins*» і інш., якія часам выдзяляюць трохі месца для хронікі і бібліяграфіі архіваў, часам агульнай архівістыцы*. У рэальнасці імі карыстаюцца не часта, прапускаючы новую інфармацыю**.

* Новая серыя «*Archivalische Zeitschrift*» складаецца з 5 тамоў. Наконт змены скіраванасці, якое адбылося 5 гадоў таму, гл. «*Archivalische Zeitschrift*», 1894, с. 290.

** Трэба раздзяліць часопісы, якія маюць пералікі ў тэкстах, і часопісы, якія публікуюць дакументы, частковыя пералікі і нават кавалкі гістарычных прац. Напрыклад, *Giornale storico degli archivi toscani (1857—1863), Meddelanden fran Svenska Riks-Arkivet, l'Archivo do distrito fédéral* de Rio-de-Janeiro, часопісы з агульнай архівістыкі. «*Archivalische Zeitschrift*» часопіс з агульнай архівістыкі, яе інтарэс аб сховішчах дакументаў рэгіёна, а таксама Усходняй і Цэнтральнай Еўропы. Што тычыцца *Mittelungen aus der dritten (Archiv-) section der K. K. Central-Commission fur Kunst-und histor. Denkmale*, то ён мае аналагічны характар з «*Archivalische Zeitschrift*».



**II**

Ні часопісаў, ні штогоднікаў, толькі невялікая колькасць пералікаў і падручнікаў — вось такі сучасны інструментарый навукі пра архівы. Нядзіўна, што архівы ўсюды, нават у Германіі, з'яўляюцца складамі кепска арганізаваных дакументаў. Калі сёння захаванасць архіўных матэрыялаў у большасці буйных гарадоў забяспечана належным чынам, то існуе значна менш архіваў, чым бібліятэк, памяшканні якіх абсталяваны належным чынам для зручнасці працаўнікоў архіваў і публікі. Апісанне архіўных дакументаў прасунулася наперад нашмат меней, чым апісанне дакументаў бібліятэк. Архівісты не праяўляюць такога імкнення, як бібліятэкары, у абмеркаванні на кангрэсах прафесійных пытанняў, якія іх цікавяць. Зусім нядаўна канчаткова ўсталяваліся пэўныя элементарныя прынцыпы (такія, як прынцып павагі фонду і прынцып публічнасці гістарычных архіваў); дагэтуль «яшчэ вельмі часта захоўваюцца састарэлыя правілы, нават у сховішчах, выключна гістарычны характар якіх трывала ўсталяваўся, захоўваюцца перажыткі часоў, калі кожны даследчык быў аб'ектам зняваги; стасункі ў іх падпарадкаваны складаным фармальнасцям і нагадваюць эпоху, калі яны былі прывілегіяй» (М. А. Жыры). Карацей кажучы, навука пра архівы і практыка архівістаў знаходзяцца яшчэ ў пачатковым стане. Але сітуа-

* Гэтыя два апошнія часопісы, гэта тыя, што інфармуюць лепш за ўсё і найбольш рэгулярна. Рубрыка «Літаратура і крыніцазнаўства, артыкулы ў бібліятэках, архівах, музеях» як дадатак публікуецца ў «*Deutsche Zeilschrift*», рубрыка «*Архівалії*» ў газеце «*Zeitschrift für die Geschichte des Oberrheins*»таксама заслугоўвае ўвагі. Таксама трэба адзначыць існаванне часопісаў універсальнай перыядычнай бібліяграфіі, такіх, як *Polybiblion*, дзе знаходзіцца рубрыка «*Архівы*».

** Тут трэба адзначыць, што захавальнікі большасці буйных архіўных сховішчаў штогод друкуюць справаздачы, даклады, у якіх змяшчаецца падрабязная хроніка згаданых сховішчаў. Гэтыя справаздачы часам суправаджаюцца частковымі вопісамі, часта яны вельмі цікавыя, але на сёння імі нідзе нельга зручна карыстацца і дагэтуль іх нідзе не выкарыстоўваюць стала. У Францыі ў адпаведнасці з агульнымі правіламі дэпартаменцкіх архіваў ад 6 сакавіка 1843 г., якія былі ўдакладнены ўрадавымі інструкцыямі ад 23 чэрвеня 1875 г., архівісты кожны год накіроўваюць прэфекту свайго аддзела справаздачу, разам са справаздачамі іншых супрацоўнікаў. Гэтыя справаздачы застаюцца нявыкарыстанымі, а іх поўны збор існуе толькі ў Парыжы. Іх можна параўнаць з англійскімі Annual reports, галандскімі Verslagen, польскімі Sprawozdanie і інш. Было б карысна выкарыстаць усе гэтыя справаздачы. Цэнтралізаваць іх у адным месцы і прааналізаваць. Гэта можна зрабіць з матэрыяльнымі архіўнымі сведчаннямі ў розных краінах, аднак пачнём мы з Францыі.

цыя змяняецца да лепшага. У другой частцы гэтага артыкула я хацеў бы пералічыць галоўныя прагрэсіўныя здабыткі, якія ўжо маюцца ў архівістыцы, і тое, што нас яшчэ чакае ў выніку гэтага будучага прагрэсу.

Навукоўцы патрабуюць, каб архіўныя дакументы дастаўляліся ім хутка, без цяжкасцей, у зручныя залы і, пры неабходнасці, выдаваліся на рукі, як зараз звычайна выдаюцца рукапісы ў большасці бібліятэк*. Асабліва яны патрабуюць, каб, наколькі магчыма, гістарычныя архівы былі цэнтралізаваныя і каб архівісты публікавалі падрабязныя вопісы.

I. — Ці варта доўга гаварыць, што цэнтралізацыя вялікай колькасці фондаў, якія існуюць у невялікай колькасці сховішчаў, з'яўляецца неабходнай для даследчыкаў? Калі ў Францыі было дзесяць тысяч асобных гістарычных архіваў, было фізічна немагчыма наведаць іх усе, нават, калі публіцы доступ туды не быў забаронены і пэўныя навуковыя працы, як Каталог актаў, напрыклад, былі абсалютна невыканальнымі. Раскіданасць архіўных фондаў ставіць пад пагрозу іх захоўванне і вымушае даследчыкаў да паездак, перапіскі, да зусім непатрэбнай траты часу і грошай. Гэта стала зразумела даўно і вось ужо амаль сто пяцьдзесят год усюды працуюць, каб рознымі спосабамі цэнтралізаваць гістарычныя архівы. Спосабы, якія выкарыстоўваюцца ў Францыі, з'яўляюцца тыповымі.

Я ўжо згадваў, спасылаючыся на Л. Дэліса і Х. Шарма**, гісторыю стварэння і развіцця Кабінета хартый, што знаходзіўся ў мінулым стагоддзі пад кіраўніцтвам гістарыёграфа Маро. Маро паставіў задачай цэнтралізаваць дакументы, раскіданыя па розных архівах каралеўства, праз аўтэнтычныя копіі. Трэба было цалкам скапіраваць усе важныя дакументы сховішчаў, куды можна было атрымаць доступ, каб перадаць іх ў Парыж ў распараджэнне вучоных. «Паколькі ўрад, — пісаў 30 верасня 1762 г. міністр Бертэн, — павінен клапаціцца, каб уладальнікі самі дбалі пра захоўванне дакументаў, якія цікавяць публічнае права, кароль жадае, каб вы знялі дакладныя копіі з усіх хартый і важных актаў, якія вы знойдзеце ў спецыяльных сховішчах. Гэтыя копіі, сабраныя ў (публічныя) сховішчы, змогуць калі-небудзь замяніць арыгіналы, у выпадку,

* Па пытанні сувязі архіўных дакументаў і архіваў гл. «Les Archives de l'histoire de France», с. 16. Пералікі Канцылярыі Францыі не вядомы ў нацыянальных архівах і па-за іх межамі. Некаторыя з іх выпадкова трапілі ў Нацыянальныя бібліятэкі Бруселя і Санкт-Пецярбурга і сталі вядомымі. Адзін з аргументаў выказаны тымі, хто не так даўно пратэставаў супраць перадачы архіўных дакументаў з бібліятэк — гэта, што «дакументы там былі б менш карысныя для архіваў, таму што выкарыстанне дакументаў у архівах падлягае значным абмежаванням». Гэты аргумент з'яўляецца актуальным. Аднак прафесіяналізм архівістаў дазваляе пратэставаць супраць гэтага. Гл. [P. Schweizer], *Geschichte des Züricher Staatsarchives*, p. 7. *Archivalische Zeitscbrift*, 1894, p. 297.

** L. Delisle. *Le Cabinet des manuscrits* (1868), t.. 1, p. 557—575; X. Charmes. *Le Comité des travaux historiques* (1886), t. I; H. Omont. *Inventaire des manuscrits de la Collection Moreau*, Paris, 1891.



калі яны будуць страчаны і складуць збор, дасяжны вучоным, якія будуць мець патрэбу працаваць з паперамі, невядомымі ім альбо з тымі, пра якія яны толькі чулі, калі б яны былі параскіданы па спецыяльных сховішчах». З 1764 па 1789 г. супрацоўнікі Кабінета хартый наведалі некалькі сотняў сховішчаў у Францыі. Адначасова Бертэн і Маро арганізавалі аналагічныя пошукі ў замежных сховішчах, каб згрупаваць комплексы поўных архіваў нашай гісторыі. «Яго Вялікасць, — пісаў Брэкіны ў лістападзе 1773 г., — стварыў сховішча, каб змясціць там рукапісныя дакументы, якія ён загадаў шукаць і перапісваць як у Францыі, так і ў замежных краінах, і іх ужо багата сабралі. У адной Англіі іх знайшлася вялікая колькасць. Кароль скіраваны на тое, каб падобныя пошукі былі праведзены ў іншых краінах і асабліва ў тых, якія па сваіх старадаўніх сувязях з Францыяй, здаецца павінны захоўваць вялікую колькасць актаў, прыдатных для асвятлення нашай гісторыі». Усе копіі, якія цэлая армія палеографаў трыццаць год пастаўляла ў Кабінет хартый, зараз знаходзяцца ў Нацыянальнай Бібліятэцы. Зразумела, яны прадстаўляюць усяго толькі нязначную частку збораў, якія існавалі ў XVIII ст. у Францыі і за мяжой. Перапісаць цалкам усе захаваныя дакументы ва ўсіх архіўных сховішчах, насамрэч, было справай, што перавышала людскія сілы: капіравалі «важныя» дакументы і не займаліся іншымі.

Рэвалюцыя зрабіла больш. Яна канфіскавала і перадала народу архівы сеньярыяльнага судаводства, акты царкоўнай маёмасці, архівы ранейшых правінцыйных адміністрацый, рэлігійных ордэнаў, рознага кшталту карпарацый, князёў, эмігрантаў, кароны. Закон 7 месідора II года ўстанаўлівае «цэнтральнае сховішча для ўсёй Рэспублікі»; у ім адзначана, што ўсе сховішчы актаў належаць да Нацыянальнага архіва і абавязаны па першым патрабаванні Архіўнага камітэта фізічна перамясціцца туды. Па праўдзе сказаць, месідорскі закон быў выкананы ў вельмі няпоўным аб'ёме. Фактычна Нацыянальны архіў, створаны ў Парыжы, сабраў усяго толькі большую частку сховішчаў, якія існавалі ў Парыжы і Версалі пры Старым Рэжыме. Па законе 5 брумера V года ў цэнтральных гарадах кожнага дэпартамента былі, урэшце, сабраны архівы, канфіскаваныя ў правінцыі, перад гэтым сканцэнтраваныя ў галоўных месцах акруг. На тое, што шматлікія архіўныя фонды, якія дзяржава магла б законна патрабаваць, засталіся ў прыватных руках, закрылі вочы. Але, якой бы няпоўнай ні была гэтая аперацыя, якімі цяжкімі ні былі б страты, зрэшты, непазбежныя, да якіх яна прывяла, галоўным з'яўляецца тое, што Рэспубліка «цэнтралізавала ў некалькіх месцах арыгінальныя дакументы, раскіданыя па вялікай колькасці сховішчаў». Гвалт тады зрабіў паслугу, якую толькі і можа зрабіць гвалт.

Сабраць у Парыжы ўсе архівы Францыі, якія належаць народу, гэта грандыёзная ідэя, якую заканадаўцы II года ўяўлялі сабе цьмяна, але яна не была абсурднай. З-за недахопу часу, месца і методык працэс зацягнуўся. Ён спыніўся на паўдарозе цэнтралізацыі ў дэпартаментах. Але Напалеон падхапіў ідэю і энергічна пашырыў яе. У лютым 1810 г. ён пісаў: «У Версалі, у Рыме і ў дэпартаментах ёсць шмат дакументаў, якія можна было б сабраць у цэнтральным

архіве». Ён распарадзіўся перавезці ў Парыж у гатэль «Субіз» каралеўскія архівы Іспаніі, што захоўваліся ў Сіманкас, папскія архівы, архівы Свяшчэннай Імперыі, архівы Тасканы, П'емонта, Савоі, Галандыі і інш. 12 сакавіка 1812 г. ён загадаў збудаваць паміж мастом Д'ены і мастом Канкорд на левым беразе Сены велічэзны Палац архіваў, каб змясціць там не толькі архівы Францыі, але і архівы пераможанай Еўропы. Напалеон ілюзорна верыў, што здолее «ў экспедыцыях здабыць сродкі, дастатковыя для пакрыцця выдаткаў установы». Але здарыўся 1814 г. і архівы Еўропы, якія архівісты Імперыі ледзь толькі пачалі распакоўваць, былі адпраўлены на месцы, адкуль іх забралі заваёўнікі.

Як вынік, гісторыя архіваў у Францыі сведчыць, што ёсць два шляхі дамагчыся такой жаданай цэнтралізацыі дакументаў: перапісванне і канфіскацыя. Рэвалюцыйны метад даў выдатныя вынікі не толькі ў нас, але і ў Германіі, у Бельгіі (1830), у Італіі (1860), у Швейцарыі* ды ў іншых месцах ад Рэфармацыі да нашых дзён: метад яшчэ не цалкам вычарпаў сябе. Але і метад Маро добры: у мірныя часы яго выкарыстанне непазбежна.

У краінах, узброеных законам неад'емнага права патрабаваць пэўныя архівы, што мусілі быць змешчаны ў іхніх сховішчах, найпершы абавязак архівістаў зрабіць, па магчымасці, найбольш поўную рэінтэграцыю. Кожны год дэпартаменцкія архівы Францыі ўзбагачаюцца дакументамі, права ўласнасці на якія ім перадаў закон 5 брумера V года і якія цягам амаль цэлага стагоддзя заставаліся ў неналежным стане на гарышчах субпрэфектур ці ў лясной варце, у судовых канцылярыях і г. д. Калі б дзейнічалі ў гэтым накірунку заўсёды энергічна, згодна з законам, архівы Клюні не заставаліся б занядбанымі да такога стану, у якім іх знайшлі, калі яны набылі прыстанішча ў Нацыянальнай бібліятэцы: яны б былі ў архіве Сены-і-Луары на сваім належным месцы. Чаму архівы марскога флоту ў Сен-Серване, у Дзюнкерку, у Рашфорце, у Марселі, у Ла Сьёта не сабраны ў Міністэрстве марскога флоту ў Парыжы? Чаму былы архіў Міністэрства марскога флоту і архівы іншых міністэрстваў (вайсковага, замежных спраў) не змешчаны ў Нацыянальным архіве, у той час як арт. 13 дэкрэта за 14 траўня 1887 г. прадпісвае цэнтральным адміністрацыям «здаваць у Нацыянальны архіў усе дакументы, якія больш непатрэбныя для бягучай офіснай працы»? Чаму старыя натарыяльныя арыгіналы гніюць у канцылярыях? Хіба ў Францыі яны не «сабраны ў архівах дэпартаментаў» у сілу закона, які можна было б лёгка зрабіць, паколькі аналагічныя законы арганізавалі ў Італіі і іншых мясцінах абавязковую здачу натарыяльных архіваў? Фізічная цэнтралізацыя архіваў яшчэ далёка ад завяршэння нават у той меры, як гэтага хацелі рэвалюцыйныя законы, або можна было б прыняць новыя законы не выклікаючы законных пратэстаў.

Зрэшты, колькасць прыватных архіваў увесь час змяняецца, таму што ўласнікаў старых актаў часта лёгка пераконваюць перадаць іх у афіцыйныя

* Цэнтралізацыя, несумненна, больш паспяхова можа ажыццяўляцца ў маленькіх дзяржавах, чым у вялікіх. Гл. P. Schweizer. *Geschichte des Zürcher Staatsarchives*, p. 4, 6. *Archivalische Zeitscbrift*, 1894, p. 296.



ўстановы ці то на ўмовах бясплатнага дару, ці то захоўваючы права карыстання*. Таксама ў шматлікіх дэпартаментах (Азерон, Карэз, Дуб, Лазер, Тарн, Вaклюз і інш.) збор натарыяльных арыгіналаў у галоўных месцах дэпартаментаў адбываецца сам па сабе. Шэраг камун праявілі ініцыятыву адпраўляць свае дакументы, з якімі яны не ведаюць што рабіць, у архівы дэпартаментаў. Усе шпітальныя архівы Тарна знаходзяцца ў сховішчы прэфектуры. Створаныя дзяржаўныя архівы маюць, вядома, у запасах большую частку айчынных дакументаў некалі безлічы сеньярыяльных архіваў, якія ўсё яшчэ знаходзяцца ў абарачэнні. Яны маглі б увабраць усё у сябе, калі б ім, архівам, было дазволена набываць іх за грошы; але, калі іх выстаўляюць на продаж, яны трапляюць у чужыя рукі бо, як правіла, архівістам у прынцыпе купля не дазволена. За выключэннем архіва дэпартамента Жыронды, Каралеўскага архіва Бельгіі і Галандыі, якім нядаўна дазволілі папаўняцца за грошы дакументамі, некалі выкрадзенымі з іхніх збораў, і якія сэр Томас Філіпс сабраў у сваёй бібліятэцы ў Чэлтанхэме.

Дакументы і архіўныя фонды, выстаўленыя на продаж, звычайна набываюцца публічнымі бібліятэкамі, дзе ўжо між ранейшых набыткаў знаходзіцца вялікая колькасць падобных дакументаў. Некалі ў Францыі ўзнікла спрэчка паміж Нацыянальным архівам і Нацыянальнай бібліятэкай наконт таго ці не лепей «перадаваць архіву рознага кшталту і рознай формы дакументы, якія ўтрымліваюць літаратурныя звесткі і якія маюць іх вялікую колькасць, г. зн. з бібліятэкі»**. Большасць членаў Камісіі, дакладчыкам якой быў Ф. Равасон, сказала «так», але верх узяло меркаванне меншасці. Сёння ніхто не збіраецца аспрэчваць права бібліятэк карыстацца архіўнымі дакументамі, якімі яны валодаюць. Ці так ужо важна, што архіўныя дакументы знаходзяцца ў той ці іншай грамадскай установе, пры умове, што яны сабраны разам, лёгкадаступныя і вядома, дзе яны знаходзяцца?***

Калі б уся магчымая рэінтэграцыя была б зроблена, калі б усе ранейшыя архівы былі, урэшце, размешчаны і сабраны ў некалькіх публічных установах, пакуты адміністрацый яшчэ б не скончыліся, бо ёй належыць узяць іх на сябе, каб вызваліць ад іх вучоных. Ізноў надышоў бы момант скарыстаць метад Маро.

* У Англіі, дзе каралеўскія архівы і архівы вышэйшых дзяржаўных устаноў былі нядаўна цэнтралізаваны, за выключэннем царкоўных архіваў, М. А. Джэсап (*The Nineteenth Century,* XXV, 1889, p. 84—103) прапанаваў не так даўно аб'ядналь «царкоўныя, правінцыйныя і юрыдычныя дакументы» кожнай епархіі «ў адзіны правінцыйны дакументальны цэнтр». Тут, канешне, не ідзе гаворка аб законным раскраданні; аўтар спадзяецца толькі на неабыякавасць ці добрую волю ўладальнікаў архіваў.

** Гл. *Les Archives de l'histoire de France*, p. 849.

*** Невядома, аднак, якімі з'яўляюцца архіўныя фонды, што захоўваюцца ў кабінетах рукапісаў. Мы паспрабавалі (*Les Archives de l'histoire de France,* трэцяя частка) аб'яднаць некаторыя звесткі ў гэтых адносінах.

Патрэбна было б, каб кожнае архіўнае сховішча мела копію ці падрабязны аналіз усіх архіўных дакументаў датычна раёна, дзе яно знаходзіцца, дакументаў, ці некалі скрадзеных з уласных фондаў, ці тых, што сталі неад'емнай уласнасцю якой-небудзь французскай ці замежнай бібліятэкі, ці тых, што заўсёды належалі іншым сховішчам. У архівах Ватыкана знаходзяцца дакументы, якія цікавяць кожную каталіцкую дзяржаву. У англійскіх архівах ёсць дакументы, якія цікавяць французскую гісторыю, а ў Нацыянальным архіве Францыі дакументы, якія цікавяць гісторыю Англіі, і гэтак далей. Да прыкладу, трэба было б, каб мы ў Францыі мелі копію ці аналіз усяго таго, што ў архівах цэлага свету цікавіць нашу гісторыю. Ці ж хімерычныя намеры Маро і Бертэна, сфармуляваныя ўжо сто год таму? Ні ў якім разе. Усюды працуюць над гэтым. У бягучым стагоддзі дзяржавы Еўропы і Амерыкі паслалі адна да адной значную колькасць спецыялістаў, каб высветліць, што маюць архівы суседніх дзяржаў па іх нацыянальнай гісторыі. Некаторыя ўсталявалі сталыя місіі, якія займаюцца метадычнымі пошукамі. Сёння Францыя, Аўстрыя, Прусія, аўстрыйская Польшча маюць у Рыме гістарычныя інстытуты, супрацоўнікі якіх рэгулярна абследуюць багацці ватыканскіх архіваў. *Gorres-Gesellschaft*, венгерскае таварыства, якім кіруе Фракно, англійскі ўрад, Венская акадэмія навук і інш. субсідзіруюць супрацоўнікаў, занятых публікацыяй ці проста капіраваннем дакументаў ватыканскіх архіваў, што датычацца Германіі, Венгрыі, Англіі і інш. У архівах Канады зараз знаходзяцца транскрыпцыі дакументаў, звязаных з гісторыяй Канады, якія захоўваюцца ў Марскім архіве ў Парыжы. У нас, у Парыжы, ёсць копія дакументаў Архіва Венецыі, якія наўпрост закранаюць Францыю. У лонданскім Паблік Рэкард Офіс сабрана выдатная калекцыя копій, выкананая ва ўсіх буйных сховішчах Еўропы. Бельгія, Галандыя, Бразілія, Швейцарыя, ідучы на выдаткі, займаюцца падобным разборам. Надыдзе час, калі копіі ці фатаграфіі, афіцыйна сабраныя ў кожным дзяржаўным архіўным сховішчы, пазбавяць людзей, што ставяць мэтай вывучэнне нацыянальнай ці рэгіянальнай гісторыі, неабходнасці ехаць у іншыя сховішчы*.

II. — Па-другое, архівісты склалі падрабязныя вопісы з паказальнікамі калекцый, арыгінальных і ў копіях, якія яны захоўваюць. З-за недахопу вопісаў і паказальнікаў публіка марнуе час і сродкі на нудныя пошукі, часам доўгія і часам няпоўныя. Колькі фондаў было перабрана сто разоў з аднаго канца ў другі — часта чыстая страта часу — коштам працы і значнага расчаравання даследчыкаў, якія шукалі прыватную даведку, хаця было б даволі адзін раз зрабіць вопіс і паказальнік, каб дазволіць даследчыкам за пяць хвілін дазнацца, што там ёсць і чаго няма!

